быть письменное соглашение, где необходимо оговорить равные права, возможности и обязанности каждой из соглашающихся сторон. Это значит, что должен быть признан БНФ, хотя бы в городском масштабе, коль речь идет о горсовете. Фронту необходимо предоставить в таком случае равность с КПБ. Речь идет о сознательном и равном распределении должностей в исполнительных органах, как практикуется во всем цивилизованном мире. Следует также оговорить принципы, от которых, соответственно, не может отступить ни БНФ, ни КПБ, хотя они и блокируются в коалицию. Мы за деполитизацию прессы, органов правопорядка, производства — этот принцип и станет предисловием принципиального компромисса. Речь также о муниципализации имущества, ведь нельзя согласиться со всевозможными хитростями партийных комитетов, на которые они теперь идут.

*— Вы недвусмысленно говорите о праве новых людей на власть. Кто, по-Вашему, может быть политическим лидером в сегодняшних условиях?*

— В первую очередь, это человек образованный и честный. Почему? Здесь не все просто, однозначно. Вот хотя бы еще один миф, с которым постоянно приходится бороться: наши коммунистические лидеры привыкли именовать политикой откровенное политиканство. Они привыкли к тому, что заниматься политикой — значит обманывать. Например, придумали сиюминутный закон, позволивший протащить им выгодных людей, нужное решение. Но народ через год раскусил сей обман. Нет, это не политика, ибо она — принцип, система взглядов, которые человек защищает вместе со своими единомышленниками. А в понимании политики на манер КПБ не обойтись без хитрости, без умения прятать свои мысли, говорить не то, что думаешь — на самом же деле подобные качества немыслимы для настоящих политиков! Я утверждаю на первом месте среди прочих достоинств политического деятеля именно безукоризненную честность в союзе с широким образованием.

Революции в Восточной Европе в целом подтверждают эту мысль. И дополняют ее таким существенным в условиях краха тоталитаризма специфическим штрихом в портрете лидера, как способность пострадать за народные интересы. С этой точки зрения наше движение имеет нужного человека. Это Пазьняк.

*— А что Вы думаете о темпераменте политического деятеля?*

— Да, конечно, зажечь можно лишь огнем. Иное дело, насколько долгое то горение. Бывают, бывают случаи, когда люди тянутся за человеком с набором горячих фраз, а потом убеждаются: кумир тот — обыкновенный мастер лозунга, не более. И такие удальцы встречаются не только среди партократов, примазываются они и к Фронту. Возьму, правда, для примера далеко не характерную в этом отношении личность, но в чем-то, пусть и отдаленно, схожую.

Журавлев, народный депутат СССР,— личность очень колоритная. Я далек от мысли, что он политический флюгер — нет, конечно. Этот человек придерживается системы определенных взглядов, которые излагал и тогда, в горячую предвыборную кампанию. Но он не очень твердый в своих убеждениях, он легко модернизируется. А вот это людям очень не нравится, я часто слышу на митингах критику в его адрес. Почему? Уж слишком видно отступничество от бээнэфовских принципов. Критикуют нещадно, хотя прошедшего параллельно с ним в парламент страны и фактически там совершенно незаметного Лобунова почти не трогают — никого не интересует. А Журавлеву достается, хотя он выглядит, несомненно, выигрышнее многих депутатов, ставленников аппарата. Дело ведь в том, что Журавлев победил благодаря поддержке БНФ, выезжая на наших лозунгах...

*— Это весьма любопытный нюанс. Выходит, с людей, заявивших о своей приверженности к платформе радикалов, спрос особый, в чем-то даже предвзятый. А как думаете Вы?*

— Я бы сказал — принципиальный, народ не хочет обмануться в очередной раз и держит на прицеле тех, с кем связал когда-то свои надежды на лучшее. Тут многое объясняется степенью долголетнего политического вранья. Под его напором пружина общественного мнения так сжалась, что когда предохранитель высвободили и она получила возможность распрямиться, то прошла на скорости и положение равновесия. Сегодня массы разбираются, кто есть кто и что почем. Посмотрите: несмотря ни на что поддерживаются последовательные радикалы — Ельцин, Попов, Собчак.

Хотя, повторюсь, есть и люди, выезжающие на волне популизма. Но они обречены на уход в тень, на отведенное им Богом и судьбой место.

*— Вы стремитесь к будущему, которое устроит только*

*Вас и сотоварищей, или же там найдется место и для сегодняшних противников БНФ?*

— Вопрос интересный своей внутренней противоречивостью. Если бы мы боролись за общество «для себя», то нам не следовало выступать против существующей системы — требовалось просто внедриться в нее, вытеснив из толпы возле кормушки более слабых. Конечно же, мы боремся за новое общество для всех, оно безусловно удовлетворит даже сегодняшних противников, когда они смирятся с утратой своих привилегий и ощутят себя равными среди равных.

— *А найдется ли в том будущем место сегодняшним социалистическим ценностям? Или Вы начисто отвергаете все связанное с социализмом?*

— Мне не нравятся игры в термины — «гуманный, демократический социализм», но я убежден, что человеческая культура дает нам образцы общества именно двух типов — одно более социалистическое, другое более индивидуалистическое. Это факт. И наша традиционная культура, кстати говоря, имеющая массу средневековых пережитков, показывает, что те общества, которые, с моей точки зрения, носили характер социалистических, создавали для духовной жизни человека более благоприятные условия, чем общества индивидуалистические. О чем, кстати, свидетельствуют социальные болезни, которым подвержены современные буржуазные общества,— изолированность человека, неуютность его существования, низкий уровень культуры, особенно художественной — от этого же никуда не денешься. Запад фактически паразитирует на культуре более социалистических, социализированных обществ, создающих более выигрышные условия для развития высокодуховной культуры. Сие применимо и к нашему своеобразному социализму. Даже в его условиях существует система очень льготной подготовки, например, классных музыкантов, танцоров. А капитализм не хочет вкладывать деньги, скажем, для подготовки балерин в массовом порядке. Им выгоднее купить танцовщиц у нас. Понимаете — вы-год-не-е. В этом отношении то общество очень циничное. Взгляните, капиталистическое общество реально эволюционирует в сторону социализации. Поэтому и говорят сегодня о том же шведском социализме, начинавшемся с нормального капитализма, построенного на последовательной реализации принципа частной собственности, свободы воли, каких-то иных своих преимуществ. А сейчас

шведы создали целую систему социальной страховки — уже вполне социалистические черты. Они, конечно, не дошли до мировоззрения социалистического общества. Поэтому, скажем, их духовная культура и страдает — с нашей точки зрения, а с их, может быть, она видится как раз культурой идеальной.

— *Сейчас много спорят о судьбах Октября: в противовес классической его оценке появилась новая — мол, событие века было искусственным...*

— Революция семнадцатого года, как ни прискорбно, видится мне именно закономерной. Понимаете, переход России к другому типу общества был слишком быстрым. Он, выражаясь современной терминологией, осуществлялся методом шоковой терапии. В результате социальное напряжение стало столь высоким, что и большевикам, и эсерам оставалось лишь умело использовать крутую ненависть масс к новоявленным мироедам, ожиревшим на грабеже и обмане обездоленных. Достичь своих политических целей в подобной обстановке Ленину и поддерживающим его не составляло особого труда.

Кстати, революция наших дней просто обязана учитывать уроки своей далекой предшественницы: пытаясь строить новое общество, следует максимально уважать социальные принципы, к которым привык уже народ. Иначе...

— *А какое, по-Вашему, общество мы должны построить, к чему следует идти?*

— Несомненная цель — конфедерация суверенных государств. Ибо имперские амбиции России самодержавной сохранились в имперской природе Союза. Сегодняшняя ситуация в стране напоминает ту, которую зафиксировала Библия. Вспомните миф-притчу о Вавилонской башне: никакие человеческие усилия, даже высокие — а в Вавилоне строительство затеяли с благой целью, дабы дотянуться до господа Бога,— не обернутся успехом, коли они направлены на унификацию, единообразие. Потому что это уже не уважение к Богу, а богохульство. Послевавилонское разнообразие человеческих культур — дар божий. Мы же пытались унифицировать сотни народов, стереть их неповторимость — вот и переживаем безрезультатное вавилонское столпотворение. Пора понять — это трагедия, когда исчезает народ, нация. Отсюда и первая цель БНФ: демократизация общества, избавление его от имперского комплекса.

— *В таком случае попытайтесь спрогнозировать будущее: что там, впереди?*

— Переход КПБ в оппозицию вынудит коммунистов избавиться от скомпрометировавших партию функционеров, лжелидеров. Так что в любом случае нет смысла завидовать сегодняшней верхушке партократии, возглавляемой Соколовым.

Но прежде чем это произойдет, всем нам предстоит увидеть углубление политического и, увы, экономического кризиса. Апогей придется не позже девяносто второго года. Таково мое мнение, оно может быть и ошибочным. Куда важнее не ошибиться в другом — кризис пройдет в цивилизованной форме. А для этого нужно одно условие — каждодневный рост политической культуры все более политизирующихся людей.

*Сентябрь, 1990*

# АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ

## Ідэі сацыяльнай дзяржавы, сацыяльнай справядлівасці — адвечныя



Я паляшук. Нарадзіўся на мяжы Пінскага і Ганцавіцкага раёнаў, на хутары. Ведаю свой род да пятага калена. Усе мае продкі аралі зямлю. Праўда, надта разжыцца з яе так і не змаглі, таму амаль ўсе мужчыны былі някепскімі майстрамі — цеслярамі, мулярамі, клалі печы, сталярылі. Гэта давала дадатковы заробак.

Хутар наш існаваў да 52-га года, хоць падарвалі яго яшчэ ў 48-м, калі пачалі ствараць калгас. Наіўнаму майму дзеду сказалі: зжатае трэба здаць у калгасны свіран, не бясплатна, разлічацца, маўляў, па-боску. Дзед і завёз сваё жыта, потым з мяшкамі пайшоў у вёску, а вярнуўся ні з чым... Стрыечны дзядзька, які жыў на другім канцы таго самага хутара, сустрэў актывістаў новага жыцця з сякераю — разгадаў, з кім мае справу. Але не абараніўся, мусіў здацца. У рэшце рэшт уся наша хата апынулася ў гарадах.

Я рос без бацькі, маці — хворая, таму гадавалі мяне спачатку бабуля, з чатырох да дзевяці год — цётка, а затым трапіў у дзіцячы дом. З шаснаццаці — на сваім хлебе. Школу, універсітэт канчаў завочна, завочна вучыўся і ў аспірантуры. Абараняцца не схацеў, бо навязалі тэму з развітым сацыялізмам. Адукацыя па дыплому — філосаф, выкладчык філасофскіх навук і грамадазнаўства.

— *І як складвалася прафесійная кар'ера?*

— Ну, куды ж беспартыйнаму на філасофскай кафедры? Хоць пэўны час і працаваў у Беларускай сельгасакадэміі. Але не ўпісаўся. Не ў вучэбны працэс — у калектыў. Потым мне ўжо перадавалі, што казалі за спінай: «З ім цяжка». Не дасць схлусіць Зіновій Прыгодзіч, цяперашні рэдактар «Советской Белоруссии», а тады памочнік сакратара ЦК КПБ па ідэалогіі Кузьміна Аляксандра Трыфанавіча. Дык вось, высокую партыйную інстанцыю БСГА паінфармавала: Сідарэвіч — алкаголік. Тады гэта быў самы распаўсюджаны метад расправы з тымі, хто, як кажуць, не прыйшоўся да двара. Прыніжалі чалавека самым трывіяльным, найпрасцейшым спосабам. Хоць, як казаў Маркс, нішто чалавечае мне не чужое. І чаркі не цураюся. Але зноў жа: у нашым сялянскім родзе не было алкаголікаў. Мужчыны ўмелі выпіць, але ж і працавалі як чорныя валы. Не прыстала хвароба слабых і да мяне. Па спадчыннасці.

— *Няўжо ва ўсёй акадэміі Вы не знайшлі чалавека, блізкага сабе па душы?*

— Чаму ж... Напрыклад, зблізіўся з доктарам філасофскіх навук, прафесарам Валянцінам Пятровічам Шкорынавым. Мы разам прыйшлі ў БСГА, разам вымушаны былі і пакінуць тую шаноўную кухню кадраў для сацыялістычнай вёскі. Майго высокаадукаванага калегу спецыяльна запрасілі ў Горкі, каб неяк падняць прэстыж кафедры філасофіі. А я значыўся ў яго асістэнтам. Калектыў наш склаўся з моладзі, абяцаў стаць моцным, перспектыўным, але хлопцы не вытрымалі атмасферы навуковай пратухласці і паступова хто ўцёк, хто зламаўся.

— *Даваў знаць сябе правінцыялізм глыбіннага гарадка, у межах якога філасофскай думцы было цесна?*

— Не без гэтага: ідыятызму вясковага жыцця, кажучы зноў жа словамі класіка, хапала і хапае. Там склаліся сваяцка-сяброўскія кланы. Суцэльныя мацерыкі кумоў, братоў, свёкраў, бацькоў... Вельмі жахлівая абстаноўка.

— *Тут бы нейкі прыклад...*

— Ладна мы, прыбітыя ў Горкі выпадковым ветрам, ра-

давыя навукоўцы. Але ж на той зямлі сямейшчыны, ва ўсякім разе менавіта ў мой час, не маглі прыжыцца нават свяцілы, раней знаёмыя з БСГА, яе норавамі, укладам жыцця. Так, досыць памучыўся член-карэспандэнт Акадэміі навук рэспублікі Усевалад Борматаў — былы выпускнік акадэміі. Рэктарства там было для яго... Ну, не ведаю чым! Вярнуўся ў Мінск, у сваю лабараторыю. Заўважце: сярод выпускнікоў БСГА такія зоркі беларускай навукі, як Альсмік, Мухін, іншыя. Але ў альма-матэр яны не прачыталі аніводнага курсу лекцый! Генетыку, селекцыю там выкладаюць людзі, навуковаму свету невядомыя або, скажам так, не надта вядомыя. Сітуацыя надзвычай цяжкая.

За год працы я ўдосталь пабачыў, як падседжваюць талентаў, як правакуюць людзей на нейкія безразважныя ўчынкі дзеля наступнай расправы з імі. А калі ты, дзівак, яшчэ і думаеш інакш, глядзіш на свет іншымі вачамі — справы твае зусім дрэнь.

— *А што значыў у той навуцы шчыт пад назвай партбілет?*

— Барані божа кінуцца ў бой, не маючы яго,— у рыцары-пераможцы табе нізашто не выбіцца, ёсць адзіны толькі шанц — быць выбітым з сядла. З партыйным жа білетам... Быў на кафедры адзін чалавек. І напіваўся ён, і валяўся, але не выганялі яго. Па-першае, камуніст. Па-другое, не вытыркаўся са сваёю думкаю. Я не вінавачу яго: атмасфера такая, што або ўцякай, або прыстасоўвайся да шэрай будзённасці, або співайся. Спіўся там не адзін чалавек, не адзін камуніст.

— *Ці меліся магчымасці ўступіць у КПСС?*

— Зрабіць гэта мне прапаноўвалі на самым пачатку майго свядомага жыцця. Тады я, дваццацідвухгадовы карэспандэнт райгазеты, адмовіўся. Стрымлівалі два меркаванні. Не мог згадзіцца з аднапартыйнай сістэмай. Гэта першае. І другое — адмаўляў вынікаючую адсюль ідэалагічную манаполію КПСС. У прыватнасці, мяне вельмі абуралі адносіны партыі і дзяржаўных органаў да рэлігіі і царквы. З такімі поглядамі, якія ў далейшым толькі паглыбіліся, ісці ў партыю не мела сэнсу.

— *Ну, а дзеля асабістай кар'еры?*

— Ніколі не меў на мэце высокіх пасад і званняў. Вышэй за ўсё цаню асабістую свабоду. Далей тлумачыць?

— *Дзякуй. Тады так: гэта выпадковасць, што ў іменным пераліку «зоркавых» выпускнікоў акадэміі не ўзгадаліся прозвішчы тых многіх, што сталі вядомымі партыйнымі*

*работнікамі Беларусі? Напрыклад, першы і другі сакратары ЦК Сакалоў і Камай...*

— Я меў на ўвазе выдатных вучоных, хоць акадэмія дае кадры для самых розных сфер жыцця. Між іншым, як і ва ўсякай навучальнай установе, у БСГА ёсць факультэты прэстыжныя і не вельмі. Дык вось, таварыш Сакалоў скончыў самы бадай непрэстыжны... Той, куды заўсёды была і ёсць магчымасць паступіць. Іншая справа, скажам, аграфак. Там у некаторых хлопцаў я здзіўлена пытаўся: «Як вы сюды трапілі?» Бо не кожны студэнт філасофскага аддзялення універсітэта мог стаць нароўні з імі. Калі адсюль выходзяць грамадскія функцыянеры — гэта яшчэ не загубленыя людзі. Хоць вельмі многіх таленавітых, жывых юнакоў кансерватыўная атмасфера акадэміі ў рэшце рэшт прыгінала, як непагадзь збажыну. І атрымлівалася: па вясне колас налівауся добра, а па восені зерне падвяло...

Ну, што вы хочаце, калі, памятаю, адзін студэнт назваў Троцкага Львом Давыдавічам, дык яго за тое ледзь не вытурылі з аўдыторыі — во зламыснік! Не кажу пра якасць выкладання той жа партыйнай гісторыі. Хоць не ўцярплю, дам яшчэ штрых: чалавек у прафесарскім званні казаў, што ў прэамбуле да Канстытуцыі СССР 77-га года расстаўлены ўсе кропкі над «і» ў вучэнні аб развітым сацыялізме... Прафесар Шкорынаў не стрываў, выступіў: па-першае, калега, не ўсе кропкі расстаўлены; па-другое, яшчэ трэба паглядзець на сутнасць таго развітога сацыялізму! Натуральна, такі прафесар і такі асістэнт, які падзяляў гэткія ж «ерэтычныя» погляды, прыжыцца ў кузні інжынерна-заатэхнічна-партыйных кадраў не маглі.

*— Дзякуючы рабоце, я нямала пабачыў грамадскіх лідэраў, за плячамі якіх была сельгасакадэмія. Кінеш пра спецыфіку эканомікі і пачнеш пра сацыяльныя працэсы — толькі дзівішся, адкуль гэтыя даўнія ваяўнічыя стэрэатыпы ў сённяшніх «інжынераў чалавечых душ»? Не кажу, што такімі былі ўсе мае субяседнікі, але — многія, многія, многія... І ёсць іх добрая віна ў прыглушанасці вясковага, раённага жыцця. Аказваецца, тут усё лагічна?*

— Не зусім, бо не заўсёды невуцтва студэнта тлумачыцца яго толькі няздольнасцю ці гультайствам. Адказнасць падзяляе і выкладчык. А што чакаць ад таго агрэсіўна-дагматычнага складу горацкіх грамадазнаўчых кафедраў? Адно гора... Хіба ж чалавеку са здаровай свядомасцю было тады не зразумела: тое самае вучэнне аб развітым сацыялізме не што іншае як звычайная затычка —

ну, не дасягнулі абяцанага камунізму, вось і... А тут — на поўным сур'ёзе давай лупіць ідэалагічных адступнікаў, нацкоўваць на іх, распускаць плёткі, ламаць лёсы... Не, не заўсёды студэнт вінаваты ў сваім невуцтве.

— *Добра, сітуацыю ў стылі анекдатычнага «дацэнта па прозвішчу Тупы» будзем лічыць абмаляванай. Але ж хіба толькі падобнымі да яго заняты вакансіі нашых ВНУ?*

— Асабіста мне ў студэнцкім жыцці вельмі пашанцавала на лектараў высокага прафесійнага ўзроўню і да таго ж ліберальнага складу. Таму, дарэчы, з самага пачатку не прыняў навуковае асяроддзе сельгасакадэміі — вельмі ўжо кантрастны малюнак. З тым жа Іванам Мікалаевічам Лушчыцкім, цяпер нябожчыкам. Да гэтага часу мы яшчэ не ўсведамляем, якую ролю ў развіцці беларускай філасофскай думкі адыграў ён. Яго вучні Альберт Апанасавіч Бірала, Вячаслаў Францавіч Шалькевіч — спецыялісты ў гісторыі філасофіі, аўтары даследаванняў. Ужо калі быў на апошнім курсе, да нас прыйшоў малады выкладчык Генадзь Грушавы, знаўца, якога мы пабойваліся. Той самы Грушавы, які стаў потым народным дэпутатам БССР, старшынёй камітэта БНФ «Дзеці Чарнобыля». А на першым курсе нас вучыў абаяльны Міхаіл Іванавіч Іоська, аўтар работы «Маркс, Энгельс і Беларусь», з якой выразана аж тры аркушы — семдзесят дзве старонкі тэксту.

— *І ён згадзіўся?*

— Супраціўляцца нельга было: хоць Інстытут марксізму-ленінізму ў Маскве даў станоўчую рэцэнзію, але яго беларускі філіял — Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ зрабіў зусім іншае заключэнне. Справа ў тым, што Міхаіл Іванавіч грунтаваўся на чатырнаццатым томе «Архіва Маркса і Энгельса», дзе фактычна выкладзена гісторыя Беларусі. А нашы сталічныя «мудрацы» прызналі погляды славутых класікаў «занадта нацыяналістычнымі»...

— *Сурова яны з папярэднікамі. І з гэтай нагоды...*

— ...чыкнулі тры сэрцавінныя аркушы. Адсюль можна рабіць вельмі пэўныя высновы пра тое, што ўяўляе сабой бальшавіцкая навука. Яна ў стане рэвізаваць нават Маркса з Энгельсам! Калі, зразумела, погляды атлантаў не адпавядаюць палітычным мэтам і ўстаноўкам сённяшніх карыятыдаў менавіта ў гэты вось момант. Або яшчэ. Зірніце: Ленін піша, што Беларуская сацыялістычная грамада была дробнабуржуазнай нацыянальнай партыяй леванародніцкага кірунку. А што ў каментарыях да такога выказвання Уладзіміра Ільіча? Іншае, зусім іншае: Беларуская сацыя-

лістычная грамада не нацыянальная, а нацыяналістычная партыя, якая абараняла памешчыкаў, кулакоў і буржуазію. Ленін дае адну палітычную ацэнку, а каментатары ад партнавукі — іншую. Бо так трэба было.

— *Чаму? Каму?*

— Дык жа калі пахваліць БСГ, аўтаматычна трэба сказаць добрае слова і пра яе стваральнікаў, вядомых дзеячаў. А гэта Луцкевіч, Ластоўскі... У сваю чаргу пасля такой бадзнакі ўжо нельга па-ранейшаму груба і брыдка лаяць Беларускую Народную Рэспубліку, прэм'ер-міністрамі якой былі абодва *«опальные»* дзеячы. Вось такі ланцуг. Каб ён не замкнуўся, пайшлі на перагляд і Маркса, і Энгельса, і Леніна, не кажучы ўжо пра звычайнага, зямнога Іоську.

— *Зараз, мабыць, самы час вярнуцца на філасофскае аддзяленне Белдзяржуніверсітэта...*

— Маім прафесарам там быў цяперашні дырэктар Інстытута філасофіі Акадэміі навук СССР Вячаслаў Сцёпін.

— *Той самы, якога скандальна папрасілі з Беларусі?*

— Але. Яго тут ніяк не дазвалялі выбраць членам-карэспандэнтам Акадэміі рэспубліканскай, а ў Маскве не ўзнікла і пытанняў, чалавека ацанілі за талент. Гістарычны і дыялектычны матэрыялізм мне таксама выкладалі добрыя вучоныя. Адно бяда: ледзь толькі яны абаранялі доктарскія — ішлі загадчыкамі кафедраў у іншыя навучальныя інстытуты горада, што абядняла непасрэдна філасофскае аддзяленне БДУ.

— *Якой моваи Вы карысталіся ў той час?*

— Усе свае курсавыя і кантрольныя работы я прынцыпова выконваў па-беларуску, дыпломную таксама.

— *Мэтры нічога не мелі супраць?*

— Тут ёсць нюанс: Іоська, Бірала, Шалькевіч, пра якіх я ўжо казаў, вылецелі з аднаго гнязда — гэта выхаванцы Лушчыцкага Івана Мікалаевіча. Яны ў любую мінуту гатовы былі да пераходу на беларускамоўнае чытанне лекцый, толькі падобная «вольнасць» строга забаранялася. Хоць і неафіцыйна. А калі быць сумленным да канца, трэба сказаць і пра звычайную асабістую боязь навукоўцаў — ім маглі ўшпіліць нацыяналізм. Затое яны з прыхільнасцю ставіліся да маёй пазіцыі.

Добрых слоў удзячнасці заслугоўвае і выдатны, бліскучы эстэтык-філосаф Мікалай Ігнатавіч Крукоўскі. Яго прызналі ва ўсім Савецкім Саюзе, яго цытуюць у кандыдацкіх і доктарскіх, яго кнігі высока ацэнены за мяжой... Пры ўсім тым сутыкаемся яшчэ з адным балючым парадок-

сам: ён не член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі.

— *Прарок у сваёй айчыне... Тыповы выпадак. Ці не зашмат у нас неацэненых вучоных?*

— Што рабіць — шэрасць куды байчэйшая, пустая бочка грыміць чутней за поўную.

— *Неаднойчы чуў: Сідарэвіч — выдатны знаўца гісторыі рэлігіі. Гэта плён самаадукацыі або нейчы ўплыў?*

— Па-першае, у маёй радні шмат рэлігійных людзей. Па-другое, я ўдзячны Віталю Аляксандравічу Молакаву, спецыялісту ў філасофіі праваслаўя.

— *Ён разглядаў атэізм як зброю нашай ідэалогіі? Пытанне з практыкі асабістай вучобы ў тым жа універсітэце...*

— Гэты чалавек імкнуўся пазітыўна выкладаць як рэлігію, так і атэізм. Хоць пытанне зразумеў: на Молакава неўзабаве напісалі данос. Маўляў, выкладае, прапагандуе рэлігію! Разумнікі: карцела пазмагацца з ідэяй, зусім не ведаючы яе, хацелася перамагчы нахрапам, наскокам: «Бога няма!» — і ўсё тут... Не атрымалася. І не магло атрымацца. Так што нецікавых выкладчыкаў у мяне амаль не было.

Ну, а потым ужо на аддзяленні пачалі адбывацца прыкрыя рэчы. Гэта звязана перш за ўсё з імем Анатоля Круглова, аўтара ваяўніча-атэістычных прац. Даходзіла нават да выключэння, разгону студэнтаў-«разумнікаў». А ў 81-м годзе і зусім дадумаліся: каб паступіць на факультэт, патрабавалі рэкамендацыі абкома партыі! Ну, хто ў такім разе мог паступіць — або па блату, чыйсьці сынок, дачушка, або нейкі кар'ерыст. Пры нас прынцып быў іншы: мець веды. Але яшчэ колькі слоў пра бязглуздае кіраўніцтва філасофскай навукай: з Беларусі на аддзяленне прымалася толькі пяць чалавек, а астатнія — дваццаць — з саюзных рэспублік. Міхась Іванавіч Іоська, выдатна ведаючы рэаліі Узбекістана, казаў: тады студэнцкі білет каштаваў там дзесяць тысяч рублёў. Можаце ўявіць сабе, што за людзі прыходзілі на вучобу. І толькі гады з два назад недарэчную сістэму ліквідавалі.

Пазнавата: урон навуцы нанесены страшэнны. Бо не здольныя, не тыя, у каго ёсць прызванне, хто з маладосці цікавіўся грамадскай думкай, а зусім-зусім іншыя ішлі ў яе. Маладыя выкладчыкі, памятаю, баяліся весці семінарскія заняткі з нашым курсам — засыпалі пытаннямі: а потым чуў ад іх жа пра нашых наступнікаў расчараванае: «Няма з кім працаваць».

— *Калі ласка, лозунгава: што дала вучоба?*

— Дух нашага курса выявіўся ў тым, што некаторыя мае аднакурснікі сталі актывістамі Народнага фронту. Што яшчэ? Вучоба дысцыплінавала розум і ўзброіла метадам. Метадам!

— *На чыім вучэнні ён грунтуецца?*

— На гегелеўскім. Мае настаўнікі выхавалі павагу да аўтара «Навукі логікі», «Фенаменалогіі духу», іншых твораў. Мікалай Крукоўскі, Вячаслаў Сцёпін...

Між іншым, Крукоўскі распрацаваў вучэнне аб прыгожым, карыстаючыся метадам Маркса. Аднак калі выйшла першая яго кніга — «Логика красоты», марксісты, нашы марксісты, не зразумелі ўсёй яе стройнасці. Яны кінуліся абвінавачваць аўтара ў... гегельянстве, зусім забыўшы: пад такое абвінавачванне можа трапіць і сам Маркс! Самае страшнае: дыялектычную логіку вучылі не па Ге-ге-лю. Хоць што ж тут дзіўнага: у сельгасакадэміі я пераканаўся — выкладчыкі палітэканоміі не чыталі «Капіталу»... А Крукоўскі ішоў ад Гегеля менавіта праз «Капітал», яго логіку.

— *І няўжо «шчырыя марксісты» таго не заўважылі?*

— Пры Сталіне філасофіі як навукі ў вышэйшых навучальных установах практычна не было. Быў дадатак да «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Хто ж дэталёва вывучаў Маркса і Энгельса? Усё, у тым ліку нават спадчына Леніна, ішло праз Сталіна. А той Гегеля і «Капіталу» не ведаў, ён быў кепскім палітыканам і філосафам — мы ясна бачым гэта. Паглядзіце: на XV з'ездзе ВКП(б) марксісты-эканамісты старой загартоўкі, у тым ліку Бухарын, сцвярджалі: пры сацыялізме забяспечваецца больш-менш планамернае, больш-менш бяскрызіснае развіццё. Бо яны былі дыялектыкамі, ведалі, што абсалюту на зямлі не бывае, што паміж рэальным і належным вялікая дыстанцыя. А правадыр усіх народаў гэтыя «больш-менш» ліквідуе і, калі ласка,— сацыялізму на доўгія-доўгія гады было забяспечана выключнае планамерна-бяскрызіснае развіццё. Гэты тэарэтычны пастулат ператвараецца ў догму. А сапраўдны марксісцкі палітэканом не мог так мысліць. Са сталінскіх гадоў мы прывыклі да ацэнак у духу «або — або»: або чорнае, або белае. Ніякай табе вясёлкі...

— *Філасофска-палітычны дальтанізм, зусім не дыялектычная логіка — у гэтым сутнасць сталінізму. Тым не менш адказныя мужы і сёння кіруюцца прывычнай ацэначнай сістэмай.*

— Схаластычнай па сваёй сутнасці.

— *Ці не азначае ўпартая прывязанасць да сталінскіх догмаў тое, што марксізму больш не падняцца? Суперкрытыкі ўвогуле сцвярджаюць, што яго нават і не было...*

— Ай-я-яй! Ужо і ў дамавіну паклалі, і вечкам клапатліва прыкрылі, засталося хіба цвікамі пакарыстацца ды хаваць. Не ганіце, паважаныя, гісторыю ў кар'ер, у яе мерная хада. Што цікава, больш за ўсіх лаюць, ганяць марксізм маладыя, тыя, хто Маркса і Энгельса сур'ёзна не чыталі.

— *Хачу нагадаць раней сказанае: не заўсёды адны толькі студэнты вінаватыя ў сваім невуцтве.*

— У невуцтве — дапускаю. Але ж тут іншае, тут агрэсіўнае невуцтва, нежаданне вывучыць тое, пра што гаворыш. Наогул трэба сказаць, што моладзь цяпер мала чытае. І зусім мала — творы Канта, Гегеля, Феербаха, Маркса, іншых гігантаў духу, а на мітынгах зухавата «распякае» бязмоўных класікаў.

— *Нездарма кажуць: тэорыя сухая. А сухое добра загараецца. Па-Вашаму, тут агонь навукі ці інквізіцыі?*

— Я лічу сябе сацыялістам, і лічу, што чыніцца аўтадафэ. Але, прызнаючы метад Маркса, прызнаючы, што гістарычны матэрыялізм ёсць інструмент пазнання грамадскіх працэсаў і з'яў, я адначасова кажу: гістмат у грамадскай навуцы тое ж, што ў фізіцы вучэнне Ньютана, Галілея, што ў біялогіі дарвінізм.

— *Паважаю філосафаў ужо за адно іх уменне казаць мудрона. Тым не менш: можна прасцей?*

— Паспрабую: на ўзроўні макраструктур (класаў, фармацый) марксізм выдатна працуе. Але! Дарвінава тэорыя ў свой час стала пярэчыць генетыцы, бо нельга было даказаць, кіруючыся вучэннем аб спадчыннасці і зменлівасці, як чалавек стаў чалавекам з малпы. А Дарвін, як мы ведаем, быў узведзены нашымі ідэолагамі ў абсалют, бо Энгельс напісаў сваю «Ролю працы ў працэсе ператварэння малпы ў чалавека». І калі генетыка не пацвярджала тэорыю Дарвіна, значыць, яна не пацвярджала і тэорыю Энгельса! Таму і стала навукай варожай, яе дзеля абароны прэстыжу Энгельса трэба было разбіць.

Праходзіць, аднак, пэўны час, доктар Лікі знаходзіць у Афрыцы косткі выкапнёвага прачалавека і выяўляецца: нам з вамі зусім не мільён гадоў — эвалюцыя заняла часу ў чатыры разы больш. Вось цяпер ужо генетыка цалкам адпавядае дарвінізму, цяпер яна не варожая навука! Ну, не анекдот?

Дзеля чаго гэты прыклад? Калі дарвінізм працуе на нейкім макраўзроўні, то сам па сабе растлумачыць развіццё форм жыцця без цыталогіі, без генетыкі, без малекулярнай біялогіі, без біяхіміі ён не зможа. Трэба яшчэ дзесятак ці больш навук, каб зразумець жыццё ва ўсёй яго складанасці, ва ўсіх яго ўзаемасувязях. Дарэчы, і сама механіка яшчэ нічога не тлумачыць. Яна можа казаць нам пра планеты, пра макрацелы, але патрэбна ядзерная фізіка, атамная фізіка, дзесятак іншых фізічных навук, каб даць цэласную карціну навакольнага рэчыўнага свету.

Гэтаксама марксізм тлумачыць на макраўзроўні класы, фармацыі, але патрэбны яшчэ сацыяльная псіхалогія, сацыялогія, этнапсіхалогія і дзесятак іншых навук, каб зразумець грамадскія працэсы і з'явы ва ўсёй іх складанасці і ўзаемасувязях, ва ўсёй іх паўнаце.

— *Я правільна зразумеў: у грамадскім усведамленні марксізм звязваецца з усемагчымымі нашымі бедамі таму, што ён араў поле жыцця адным толькі плугам, без сучаснага комплексу прычапных «інструментаў» і «агрэгатаў»?*

— Мала таго. Некаторыя тыя «агрэгаты» дрэнна стыкаваліся з асноўным «механізмам» — маю на ўвазе марксісцкую тэорыю. Так, у шэрагу работ Ленін не прызнае сацыялогію навукай, нават бярэ гэтае слова ў іранічнае двукоссе. Важнейшай для яго была класавая псіхалогія. І амаль адсутнічала сацыяльная псіхалогія ва ўсім яе багацці, этнапсіхалогія. Апошняя практычна забаронена нават сёння. Як гэта мы будзем казаць пра псіхалогію армяніна ці псіхалогію беларуса — крый Божа, мы ж нацыяналізм, варожасць паміж народамі можам насадзіць!

Дык вось, марксізм працуе на макраўзроўні, і ніхто гэтага аспрэчыць не можа. Нельга ж, напрыклад, не прызнаваць класавай барацьбы, класавых інтарэсаў, яны ёсць.

— *А агульначалавечыя вартасці?*

— Немагчыма адмаўляць ні аднаго, ні другога. А што да класавай барацьбы, то ў нашай краіне яна заўважаецца сёння ці не на кожным кроку.

— *Маецца на ўвазе барацьба з бюракратыяй?*

— Бюракратыя валодае ўсімі адзнакамі класа, якія вызначыў Ленін. Што б вы там ні казалі. З другога боку, цяпер няма прывычнага дзялення на рабочых, сялян і мыслячую праслойку, прыходзіць новае разуменне сацыяльнай структуры грамадства. Памятаю з часоў студэнцтва, як крылі тэорыю стратаў, а менавіта слаёў. Таму бедная акадэмік Заслаўская мусіла ўцякаць у Сібір. Узвядзенне нейка-

га пастулату, нейкага тэзісу ў абсалют цалкам супярэчыць дыялектычнаму метаду, марксізму. І нашыя абаронцы марксізму нечакана выявіліся найгоршымі яго праціўнікамі, яны найгорш яго дыскрэдытавалі. Як, дарэчы, і сацыялізм. А я, паводле сваіх перакананняў, сацыяліст.

— *Мушу прасіць прабачэння, але склалася ўжо нейкая абстрактная грамадская думка, што вядомы беларускі публіцыст Анатоль Сідарэвіч — выразнік шчыра антыкамуністычных поглядаў. Ні больш, ні менш.*

— Тое і яно: кажу людзям, што я за менавіта сацыялістычную ідэю — у адказ смяюцца, маўляў, разумеем гумар...

— *Гэта рэакцыя на Вашу прыналежнасць да БНФ?*

— Так, я бээнэфавец, але прычым тут Фронт? Нашы традыцыйныя марксісты скампраметавалі і вучэнне свайго настаўніка, і яго самога, і ідэю сацыялізму, бо ўзвялі ў абсалют толькі адзін бок марксізму-ленінізму. Яны зблыталі сацыялізацыю сродкаў вытворчасці з іх этатызацыяй, адзяржаўленнем. Грамадскімі сродкі вытворчасці становяцца праз кааператывы, акцыянерныя таварыствы, праз свабодныя асацыяцыі вытворцаў. Маркс заўважыў гэтую з'яву, але не вывучыў, бо засяродзіўся на «Капітале». Між тым факты пацвярджаюць: асабістая буйная ўласнасць саступае месца ўласнасці кааператыўнай, акцыянернай. Нараджаецца нарэшце народны капіталізм, калі рабочыя купляюць акцыі. Паглядзіце на кааператыўны рух у Скандынавіі, Германіі. Там жа, па сутнасці, ўсю сельгаспрадукцыю вырабляюць фермеры, але — маслабойні кааператыўныя, малочні кааператыўныя, крамы кааператыўныя, спажывецкая кааперацыя магутная... Гэта дало магчымасць сялянству выжыць і падняць узровень сельскай гаспадаркі. Вось вам цывілізаваная кааперацыя — Швецыя, Данія, Нідэрланды, Нямеччына, Аўстрыя.

Нам жа замест аграмаджання сродкаў вытворчасці паднеслі этатызацыю, замест калектыўнага распараджэння ўласнасцю стала дзяржаўнае, дырэктыўнае распараджэнне. Вытворца стаў падначальвацца дзяржаўнаму кіраўніку, чыноўніку. Дзе ў нас свабодныя асацыяцыі вытворцаў? Ці не ў калгасах? Які ж тут навуковы сацыялізм? Адкуль быць грамадскай павазе да яго?

— *Сказана так страсна, быццам ідэя рэстаўрацыі першазадуманага цалкам адпадае?*

— Чаму ж, я не думаю, што працэс набыў незваротны характар. Трэба толькі не сядзець, не чакаць, не спа-

дзявацца на заклёны, а дзейнічаць у рэчышчы, пракладзеным сусветнай практыкай, зразумела, улічваючы пры гэтым нацыянальную, дзяржаўную спецыфіку.

— *Напрыклад?*

— Возьмем праблемы фермерства і калектыўнага гаспадарання. Не варта ставіць іх у плоскасць ўзаемавыключэння. Што да калгасаў, то я перакананы толькі ў неабходнасці пусціць з малатка гаспадаркі-банкруты, лёс астатніх хай вырашаюць самі хлебаробы. Адно толькі: не абысціся без пераўтварэння калгасаў у кааператывы, не абысціся без дэмакратызацыі калгаснага жыцця.

— *Ваша ацэнка ідэі суцэльнага фермерства ў рэспубліцы? У яе тыя ж выдаткі, што і ў суцэльнай калектывізацыі?*

— Як ва ўсякай абсалютызацыі. Дарэчы, фермеры неўзабаве проста мусяць перайсці да стварэння супольных прадпрыемстваў, вытворча-збытавой, спажывецкай каапераацыі. Між іншым, пачынаць працэс фермезацыі лепей за ўсё на базе слабых распушчаных калгасаў, дзе зноў, ад нулявога цыкла, рана ці позна народзяцца ўсё тыя ж кааператывы. Нам не мінуць кааператыўнага сацыялізму. Галоўнае — адмовіцца ад дзяржаўнага рэгулявання самой працоўнай дзейнасці. Заахвочваць вытворчасць трэба гнуткімі цэнамі, падаткамі, кампенсацыямі.

— *Гэтыя думкі асабістыя або...*

— Гэтыя думкі сусветнай сацыял-дэмакратыі.

— *А ці падзяляюцца яны паплечнікамі па БНФ?*

— Я ніколі не размаўляў з дзеячамі Беларускага народнага фронту на такую тэму. Упэўнены: сярод іх ёсць людзі, якія больш-менш вывучалі гісторыю сацыял-дэмакратычнай і марксісцкай думкі. Склаліся новыя ўмовы, і сацыял-дэмакратыя практычна адмовілася ад класічнага марксізму. Але гэта не значыць, што ён памёр. Ніводны сур'ёзны грамадазнавец не можа абмінуць Маркса. Ён зрабіў у даследаванні капіталізму тое, што ніхто пасля яго не паправіць. Таблічкі з «Капіталу» вельмі стройныя, іх нельга абвергнуць.

— *Аднак прырода капіталізму перарадзілася, ці не так?*

— Класавая барацьба, часамі звышжорсткая, навучыла яго, што куды танней рабіць уступкі рабочаму класу. У былой царскай Расіі да пралетарыяў пачыналі ўжо звяртацца так: *«Господа рабочие!»* І кваліфікаваныя рускія рабочыя ўжо атрымлівалі прыстойныя грошы — тры рублі на дзень. Гэта не цяперашнія «рыжанькія», палічыце колькі...

— *З веданнем курсаў дзвюх гэтых валют у мяне асабіста тугавата...*

— Хм, варта нагадаць Горкага: што купіў Павел Уласаў з першай сваёй палучкі? Адрэз на сукенку маці, боты хромавыя, гармонік, атласную кашулю, напіўся сам і напаіў сяброў ды яшчэ прынёс рэшту ў кішэні. А што купіць наш малады рабочы з першай сваёй зарплаты?

— *Хопіць хіба на выпіўку са старэйшымі, з «настаўнікамі»...*

— Калі талоны знойдзе. Дык вось: застаючыся сацыялістам, крытычным марксістам, а не адэптам Маркса, я адначасова выступаю ў апазіцыі да бальшавікоў. За іх прыхільнасць да «або — або», за іх абсалютызаваную бескампраміснасць.

— *Нехаця згадваю зусім нядаўна яшчэ вельмі славутую кніжку, дзе пад адной вокладкай сабраны хіба ці не ўсе знакамітыя радыкалы. Назва яе — «Иного не дано».*

— Э-э, не, нашы радыкалы гавораць там якраз пра трэцяе, пра канвергенцыю двух палюсоў. У гэтым зняцці напружанасці паміж імі — чысцейшы гегелеўскі метад. Не барацьба, а зняцце супярэчнасцей — у Гегеля ёсць такое паняцце: «аўфнэмэн». Размова пра тое, каб адно знялося ў другім. Новае не бывае без старога. Гэта бальшавікі вырашылі стварыць цалкам новае грамадства, адпрэчыўшы ўсё «старое» — рэлігію, прыватную ўласнасць і нават цэлыя класы, у тым ліку сялянства. Бальшавікі зрабілі ўпор на пералом, а сацыял-дэмакраты — на эвалюцыю, рэформы, паступовасць. Так развіваюцца ўсе дэмакратычныя краіны. Сусветную буржуазію напалохала Кастрычніцкая рэвалюцыя. А сталінізм — наша трагедыя — аказаў неацэнную паслугу сусветнаму рабочаму класу: пабачыўшы, што творыцца ў СССР, што працоўныя жывуць тут бедна, што яны пазбаўлены палітычнага выбару,— рабочыя падтрымалі буржуазію ў пошуках трэцяга шляху, па якім і рухаецца свет сёння,— гэта дэмакратыя. А бальшавікі не ўбачылі, прамаргалі новыя палітычныя змены. Такія выразныя, што напрошваецца думка аб палітычнай слепаце бальшавізму. Хоць, напрыклад, выхадзец з рабочага асяроддзя Андрэй Платонаў усё зразумеў і не прыняў каштоўнасцей прапанаванага імі сацыялістычнага «раю». Бяда партыі таго часу ў тым, што яна зрабіла стаўку не на самы адукаваны, кваліфікаваны пралетарыят, не на самы развіты, а на ўчарашніх сялян, беднячкоў-паўпераў, людзей прамежкавых, маргінальных. У гэтым адрозненне бальшавікоў ад сусветнай

сацыял-дэмакратыі, ад меншавікоў у тым ліку. Сацыяльнаю базай сацыял-дэмакратаў з'яўляюцца перадавыя, кваліфікаваныя рабочыя. У гэтых рабочых ужо выпрацавана агульная і палітычная культура. Услед за адным марксістам называю бальшавікоў блуднымі дзецьмі сацыял-дэмакратыі, якія супрацьпаставілі сябе ёй, сваёй прамаці. Хоць у Камуністычным Маніфесце сказана надзвычай дакладна: камуністы не проціпастаўляюць сябе іншым партыям рабочага класа.

— *А калі перайсці ад гістарычных праблем да сённяшніх клопатаў?*

— Зноў тое ж самае пацвярджэнне старой ленінскай ісціны: усякая манаполія вядзе да гніення. Між іншым, тут дарэчы сказаць аб маіх адносінах да правадыра. Ён рабіў няправільныя высновы са свайго ж бліскучага аналізу гісторыі і рэчаіснасці. Да таго ж Ленін узяў у Маркса адзін толькі бок цэласнага вучэння. І бяда была страшная. Рэаліст у палітыцы, ён у ідэалогіі застаўся дагматыкам. Ленін як рэаліст — гэта прыхільнік прадастаўлення нацыянальным рэспублікам максімуму самастойнасці; гэта — аўтар новай эканамічнай палітыкі, ідэі вяртання да класічнай уласнасці, свабоднага гандлю; гэта — аўтар ідэі рэгулюемага рынку; гэта — чалавек, які разумеў бязмежныя магчымасці кааперацыі... Аднак ленінская партыя не была гатова ўспрыняць вучэнне свайго лідэра. У тым ліку такія яе прадстаўнікі, як Зіноўеў, Каменеў, Сталін і нават Бухарын.

— *Ну, а ў чым, па-Вашаму, выявіўся ленінскі дагматызм?*

— Нагадаць хоць бы яго філасофскі запавет «Аб значэнні ваяўнічага матэрыялізму», дзе рашуча аб'яўлена вайна ўсім іншадумцам. Выгнанне выдатных вучоных-філосафаў у 22-м годзе — першы яе акт. Плюралізм форм уласнасці ў перыяд НЭПа, наступны рост дабрабыту і адукаванасці народа з неабходнасцю патрабавалі між тым якраз палітычнага плюралізму. Бо нельга будаваць плюралістычную эканоміку без палітычнага, ідэалагічнага плюралізму. Усё грамадства ішло да нейкіх ідэалагічных структур, да барацьбы ідэалогій без зброі ў руках. А тут мала аб'яўлення іншых светапоглядаў па-за законам, дык яшчэ падключаецца грубая сіла. Вось з гэтага ленінскага непрымання іншадумства і пачаў сталінізм. Сталін заўсёды мог працытаваць Уладзіміра Ільіча. Сталінізм, такім чынам, бярэ пачатак з Леніна.

Ленін аб'явіў вайну не толькі Бярдзяеву, Сарокіну, Лос-

каму, Струвэ, ён, зноў жа, забыў Маркса і Энгельса, а менавіта: камуністы не павінны супрацьпастаўляць сябе іншым рабочым партыям. Ён ваяваў і з іншадумцамі-марксістамі, з меншавікамі. Ды не толькі з імі. А з партыяй сацыялістаў-рэвалюцыянераў? Ленін бярэ на ўзбраенне ў Дэкрэце аб зямлі эсэраўскую аграрную праграму і разам з тым змагаецца з імі. Была выдатная магчымасць стварыць сацыялістычны кааліцыйны ўрад ў 17-м годзе, аднак адбываецца процістаўленне адных сацыялістаў другім — гэта таксама вяло да грамадзянскай вайны. Пачаткам яе стаў разгон Устаноўчага сходу.

— *Гэта ў Расіі ў цэлым. Ну, а як зрэагавалі на такі сігнал ускраіны?*

— Нам, у прыватнасці, нельга забывацца пра разгон Усебеларускага з'езда, калі адны сацыялісты не змаглі дамовіцца з другімі. Мяснікоў жа, Кнорын і Ландэр арыштавалі на тым з'ездзе не толькі правых, але і Чарвякова, іх ворагам стаў эсэр Тамаш Грыб. Не было ў беларускім сацыялістычным руху ніводнага чалавека, які не хацеў, каб зямля належала сялянам,— не было. Я чытаў архіўныя дакументы — беларускія сацыялісты Луцкевіч, Смоліч і іншыя нічога не маюць супраць сацыяльнай праграмы бальшавікоў, яны супраць нацыянальнай і ідэалагічнай палітыкі бальшавікоў супраць тэрору. Калі ж Ленін супрацьпаставіў сталінскаму плану аўтанамізацыі тое, пра што марылі беларусы, беларускія сацыялісты сталі прыхільнікамі Савецкай улады; калі Ленін пачаў НЭП, калі Беларусь і Расія пачалі эканамічна адраджацца, на яе бок сталі многія эмігранты, яны вярнуліся сюды; а каб да гэтага дадалі плюралізм ідэалагічны, то наступіў бы грамадзянскі мір, і Бог ведае, чым бы ўсё завяршылася, якімі б мы былі сёння. Але — з'явілася ўстаноўка на палітычную, ідэалагічную непрымірымасць.

Вось што значыць узвядзенне ў абсалют ідэі класавай барацьбы і вучэнне аб дыктатуры пралетарыяту, якая па сваёй сутнасці з'яўляецца дыктатурай адной партыі, адной ідэалогіі. Яна ўстанавілася, і на ёй пагарэла ўся аграрная ленінская палітыка — не ведаў правадыр, якую міну заклаў сваім філасофскім запаветам; згарэла ўся нацыянальная палітыка... Ну, а цяпер мы, калі глядзім на ўсе бедствы нашага аграрнага сектару, на міжнацыянальную вайну, павінны шукаць карані менавіта там, у гэтай непрымірымасці. Нішто народы так не прымірыць, як супольнасць свабоднага ад ідэалагічных догмаў эканамічнага

жыцця. Колісь у беларускіх мястэчках беларусы свабодна размаўлялі па-яўрэйску, па-польску, а яўрэі — па-беларуску, па-польску, палякі — па-беларуску і па-яўрэйску. Успомніце, дзе нарадзіўся Змітрок Бядуля... Або дзе нарадзіўся выдатны даследчык нашай літаратуры татарын Сцяпан Александровіч... Цяпер жа многае загублена незваротна.

— *У чым, па-Вашаму, прычыны павароту ўправа на пачатку дваццатых гадоў?*

— У лёгкасці, з якой удалося ўзяць уладу ў Кастрычніку, з якой вырваліся з грамадзянскай вайны,— яна неўзабаве ператварылася ў эйфарыю пераможцаў: навошта нам усякія там НЭПы? Вырасла ўпэўненасць: мы не памыляемся! Адсюль і песні: «Партыя мудрая...» Самі сябе ўзвялічвалі, праслаўлялі, аж няёмка было слухаць. Было і засталося невыкараненым тое, што Ленін трапна назваў камуністычным чванствам, фанабэрыстасцю — «мы не памыляемся!»

— *Сёння высновы з тых памылак зроблены?*

— Паўтару, што застаюся сацыялістам, але не б'ю лоб, не малюся на Маркса. Я ведаю: не Маркс стварыў этыку — гэта заслуга хрысціянства. Маркс не растлумачыў дзве вялікія таямніцы, пра якія пісаў Кант: зорнае неба над намі і маральны закон унутры нас. Таму, застаючыся сацыялістам, застаюся яшчэ і хрысціянінам, католікам. Не бачу тут ніякай супярэчнасці.

Дык вось пра эйфарыю. Убілі народу ў галаву: *«Учение Маркса всесильно, потому что оно верно»*. І ўсё тут! Тады, прабачце, я адразу ўспамінаю тэзісы папы рымскага Рыгора VII: «Святая каталіцкая царква ніколі не памылялася, не памыляецца і ніколі памыляцца не будзе». А чым адрозніваліся камуністы?

Гляньце, што атрымалася? Вось Беларусь. Працавіты, спакойны народ, даволі разумныя кіраўнікі... Хоць бы ўзяць Машэрава — ён быў яркай фігурай, але ён не любіў побач з сабой іншых яркіх асоб. У тым, што мы сёння маем безаблічнае кіраўніцтва, віна Машэрава. Ён памёр, наступаюць новыя часы, і колішнія выканаўцы ягонай волі — людзі, якія зазіралі яму ў рот, сталі самастойна вырашаць лёс рэспублікі. Людзі, якія — я ўпэўнены — не прачыталі нават сур'ёзных марксавых работ цалкам. Не ўпэўнены, што яны сістэматычна, паслядоўна чыталі Леніна...

І вось, засвоіўшы нейкі мінімум догмаў, вывучыўшы Маркса і Леніна па цытатніку, гэтыя людзі сталі перад складанай сітуацыяй. Рэспубліка развівалася стабільна, ім здавалася, што ўсё ў парадку — «сацыялізм развіваецца

планамерна і бяскрызісна». А куды ж падзелася Марксава вучэнне аб супярэчнасцях? Манаполія ў галіне ідэалогіі, палітыкі неўзабаве прывяла да гніення, застою, у тым ліку інтэлектуальнага. І мне вельмі брыдка слухаць, калі адзін член бюро ЦК не валодае ні рускай, ні беларускай мовамі, другі член бюро ЦК гаворыць на жаргоне — партыйным жаргоне, які зусім не з'яўляецца рускай мовай, а па-беларуску, здаецца, ніхто ўвогуле двух слоў звязаць не можа... Не выпадкова большасць з іх скончыла сельгасакадэмію. Адсюль няведанне як сусветнай, так і беларускай культурнай спадчыны. Ды што там «культурнай» — гісторыі партыі, здаецца, толкам не ведаюць, ва ўсякім разе не бачна, каб рабілі з яе правільныя высновы, пра што вы пыталіся. А чаму адсутнічаў стымул да інтэлектуальнага самаўдасканалення? З-за ідэйна-палітычнай сваёй манаполіі. «Дзякуючы» ёй партыя і страціла ініцыятыву.

— *У вылучэнні тых жа ідэй, якія б адпавядалі новаму часу?*

— Таксама, гэта непазбежна. Але тут кепскую падмогу дадаткова саслужыла няведанне рэалій жыцця рэспублікі — па інерцыі лічылася, што Беларусь развіваецца без асаблівых праблем. Не бачылі важкіх, істотных супярэчнасцей часу. Самаўпэўнена думалі, што ў адрозненне ад усіх іншых нам удасца пераскочыць напаткаўшую краіну прорву. Між іншым, сённяшні эканамічны крызіс рэспублікі быў закладзены тымі самымі Машэравым і Мазуравым: будаўніцтва Наваполацка, Салігорска, хімічных гігантаў Магілёва, Гомеля, Гродна — усе буйныя цяперашнія экалагічныя праблемы закладваліся пры іх, імі. Давайце не будзем ідэалізаваць папярэднікаў цяперашняга бюро ЦК КПБ. Не будзем забываць, як ганілася пры Кірылу Трафімавічу аповесць «Дабрасельцы» Аляксея Кулакоўскага, як пры ім грамілася праўда пра «Нашу Ніву»... Што было, тое было: благаслаўляў ён тыя пагромы. А хіба не пры Мазураве і Пятру Міронавічу Машэраве закладвалася аснова сённяшніх прамысловых супермонстраў? Каб рэспубліка стала «індустрыяльна-аграрнай»... Ішла пагоня за колькасцю. А цяпер маем вынік. Не ўбачылі, што перадавая Еўропа любіць сярэднія прадпрыемствы. А заслуга таварыша Сакалова — у працягу палітыкі гігантаманіі, ён закладваў, множыў свіныя суперкомплексы. Хоць уся Еўропа нацэлена зусім на іншыя памеры, куды больш сціплыя. І бяспечныя.

— *У чым зноў-такі прычына імкнення да падобнай авангарднасці?*

— Сказвалася бязмежная ўлада лідэраў, іх манаполія на валоданне ісцінай у апошняй інстанцыі. Ім не было каму запярэчыць — вось дзе карані... Праўда, было, што і пярэчылі. Але Машэраў не стаў і слухаць тых, хто крытыкаваў спосабы і маштабы асушкі балот, выкарыстання тарфянікаў. І брэсцкі сакратар таварыш Сакалоў не прыслухаўся як след...

Машэраў гнаў іншадумства. Гэта пры ім нападалі на Быкава, Караткевіча, пры ім ваявалі з «нацыяналістамі» ў Акадэміі. Праўда, Машэраў быў хітры палітык, ён не выключаў кампрамісаў. На жаль, яго наступнікі такога розуму не выявілі.

У 88-м дзякуючы Курапатам у грамадскай свядомасці адбываецца рэвалюцыя. У момант была парушана традыцыя бязмоўнасці народа, наступіла эпоха галоснасці. Упэўненасць ва ўласнай беспамылковасці, у сваёй незачэпнасці, пачуванне сябе алімпійскімі багамі саслужыла кіраўніцтву партыі кепскую паслугу — праігнаравалі нават сход у Чырвоным касцёле, куды для ўтварэння «Мартыралога Беларусі» і аргкамітэта БНФ сабраўся цвет беларускай культуры. Прыслалі туды трэцярадную асобу, не з'явіўся ніводны лідэр КПБ. Недарэчна атрымалася, але замест таго, каб назаўтра пайсці на спробу кампрамісу, абралі шлях канфрантацыі. І самае страшнае —пачалі хлусіць. Аднак зноў жа не ўлічылі: хлусню цяпер можна развеяць, бо з'явілася свабодная ад цэнзуры прэса. Так падрывалася вера да партыі ў народа. Страх, у якім семдзесят гадоў трымалі яго, стаў пераадольвацца, асабліва маладым пакаленнем. А партыйная вярхушка круціла ранейшую пласцінку: запалохвала і хлусіла.

Не ўлічылі і псіхалогію: я не хаджу на мітынгі, калі яны дазволены, і іду, калі ёсць забарона,— мне цікава, што ж там будзе. Гэта псіхалогія тысяч і тысяч. Я ведаю: улада безразважная. Я выдатна ведаю: прызнаныя ерэтычнымі думкі Алеся Адамовіча праз год-два агучваюцца ўжо Генеральным сакратаром, Прэзідэнтам, а значыць, мне зразумела, хто мысліць цывілізавана, перспектыўна, а хто па-дзікунску, учарашнімі катэгорыямі. І становіцца зразумелым, каго мне трэба падтрымліваць, за кім мне трэба ісці, каму верыць. Дагматыкі і догмы ўвесь час адстаюць.

— *Вядома, што Вы — адзін з тых, хто падаў ідэю стварэння Народнага фронту, распрацоўваў яго першы дакумент...*

— На Устаноўчым з'ездзе БНФ я выступіў з рэфера-

там на тэму «Суверэнітэт». Суверэнітэт народа, нацыі, дзяржавы. Заклікаў да Саюзу дзяржаў. Прапанаваў: калі мы не можам пакуль што стварыць такі саюз, як Агульны рынак, дзе маленькі Люксембург мае голас, роўны голасу Нямеччыны або Францыі, і калі не дасягнуты кансенсус, то пастанова не прымаецца, дык давайце зробім гэтак, як у ЗША. Там, калі 35 штатаў, або дзве трэці, не прагаласуюць «за», закон не праходзіць. Я гаварыў: «Выклікае здзіўленне выступленне Гарбачова, калі ён адмаўляе права эстонскага народа на валоданне сваёй зямлёй, яе нетрамі і ўсімі рэсурсамі — хто ж павінен валодаць імі, як не эстонскі народ? А ў Беларусі хто? Хіба не беларускі народ?» «Звязда» ж абвінаваціла мяне ў закліку да знішчэння Саюзу рэспублік. Вось як! Хоць я стаяў менавіта за Саюз суверэнных дзяржаў. А праходзіць няпоўныя паўтара года, і Вярхоўны Савет БССР прымае Дэкларацыю аб суверэнітэце, дзе бачу тыя даўнія свае тэзісы, прынцыпы. Чаму ж мне на правах аднаго з аўтараў ідэі не плацяць аўтарскі ганарар? Мала таго, афіцыйнае кіраўніцтва выдае гэтыя ідэі за свае! Але давайце пачытаем ранейшую партыйную прэсу — суцэльныя абвінавачанні ў нацыяналізме, сепаратызме за ўсё тыя ж ідэі. Так што кожны раз афіцыйныя структуры ідуць за падзеямі... У якім жа страшным крызісе апынулася партыйная навука! Варта нагадаць іх адпор праграме БНФ, многія пункты з якой цяпер выдаюцца ЦК за ўласныя думкі-адкрыцці. Так адбываецца заўсёды, калі навука становіцца палітычнай служанкай. Менавіта тады яна самавызваляецца ад важнейшай функцыі — прагназавання. А значыць, становіцца бескарыснай для самой партыі. Яна нічога, апроч шкоды, партыі цяпер не прыносіць, бо ставіць яе ў няёмкае становішча.

— *Якая партыя маецца на ўвазе?*

— Паводле Оруэла, яна называецца ўнутранай. Ядром. У такіх вось умовах партыю пачынаюць пакідаць інтэлектуальныя сілы, далёка не самыя горшыя камуністы-рабочыя. Мы стаім зараз перад неабходнасцю адрадзіць Беларускую сацыялістычную грамаду. Гэта была партыя інтэлектуалаў, партыя перадавых рабочых, партыя сялян, адукаваных, мыслячых, якая дала КПБ і Алеся Чарвякова, і Усевалада Ігнатоўскага, і Цішку Гартнага і многіх іншых выдатных дзеячаў эпохі НЭПа. Дзякуючы ім беларускія навука і культура дасягнулі высокага росквіту, але потым ён, праўда, спалохаў. Бо ў Кампартыі пераважалі людзі, выхаваныя на прынцыпах непрымірымай класавай барацьбы,

дыктатуры пралетарыяту. Увесь час Чарвякоў, іншыя беларускія сацыялісты, што далучыліся да Кампартыі, вымушаны былі змагацца, і нарэшце іх адолелі. Зараз, я перакананы, КПБ працягвае найгоршыя традыцыі Кнорына, Мяснікова — традыцыі нацыянальнага нігілізму, абсалютызацыі змагання.

*— Чаму — ідуць жа і заклікі да кансалідацыі?*

— На якой платформе? Можна кансалідавацца на платформе нацыянальнай культуры, нацыянальнай асветы, на платформе нацыянальнай дэмакратыі... Мне цяпер смешна чуць, як у Вярхоўным Савеце камуністы, асабліва ветэраны, так крычаць пра дэмакратыю... Слухаю, як стаіць за яе, напрыклад, таварыш Шабашоў, як ён стаіць за сацыялізм, і ўспамінаю работу ў ганцавіцкай райгазеце. Тады Сяргей Міхайлавіч прыязджаў да нас у рэдакцыю сакратаром абкома і харчаваўся ў асобным кабінеціку раённай сталовай, куды неслі не з агульных катлоў... Ад сацыялізму гэты чалавек шмат чаго меў, і яму гэты сацыялізм, канешне, хацелася б абараніць. Бо гэты сацыялізм вельмі выгодны для яго асабіста. Ды і зараз Шабашоў атрымлівае персанальную пенсію, не ходзіць у звычайную паліклініку, дзе ў чарзе да лекара трэба адсядзець некалькі гадзін...

Дык вось, мы думаем: настаў час на глебе дэмакратыі, беларускай дзяржаўнасці, беларускай культуры адрадзіць традыцыі Сацыялістычнай грамады.

*— Можна нагадаць яе гісторыю? Гэта трэба зрабіць, бо дзейнасць Грамады альбо замоўчвалася, альбо скажалася...*

— Лідэры яе былі адукаваныя людзі. Успомнім хоць Антона Луцкевіча. Ён пісаў па-французску, па-нямецку, па-польску, па-руску, па-беларуску... І размаўляў на гэтых мовах, перакладаў яшчэ з ангельскай і лацінскай. Каб я пабачыў зараз на чале беларускага ўрада такога чалавека з білетам Камуністычнай партыі ў кішэні, я б адразу падаў заяву ў такую партыю. Урэшце, на Беларусі з часоў Скарыны не было магната, палітыка, які не мог размаўляць на лацінскай мове — скажам, Сапега, скончыўшы Лейпцыгскі універсітэт, пісаў па-старабеларуску, ведаў лацінскую, нямецкую мовы. Карскі піша, што такія людзі былі зусім не адзінкавымі. Дзе ж, калі яны страціліся? А тады, калі былі знішчаны вышэйназваныя былыя сацыялісты. Пад корань — Ігнатоўскі, Ластоўскі, Смоліч... Выдатныя вучоныя. Піянеры.

А сённяшнія функцыянеры? Зусім не шырокая адука-

ванасць ім патрэбна — вернасць прынцыпам, вернасць ідэі, інакш кар'еры не зрабіць. І ў сельгасакадэміі мы нарабілі інжынераў, аграномаў, заатэхнікаў. З апошніх першы сакратар ЦК КПБ Сакалоў. Якая ж цана ўсім гэтым кіраўнічым дыпломам? Ні эфектыўнай эканомікі, ні экалогіі, ні ідэалогіі...

— *Вывад?*

— Адзін — трэба вяртацца. Найлепшая ўмова развіцця эканомікі — канкурэнцыя. І ў ідэалогіі павінны канкурыраваць ідэі. Увогуле, дэмакратыя немагчымая без канкурэнцыі палітычных платформаў, ідэалогій. Ніякі прагрэс не рэальны пры манаполіі аднае партыі — гэта, здаецца, ужо ўсе зразумелі, але паглядзіце, як чапляецца за сваё Кампартыя Беларусі. Як яна не захацела запісаць у Дэкларацыю, што ў Беларусі ліквідуецца манаполія на сродкі масавай інфармацыі; а як дэпутаты-камуністы супрацьстаяць рэгістрацыі БНФ... Цяперашняя КПБ няздольная вылучыць нейкую прагрэсіўную ідэю. Пра яе ўзровень гаворыць і тое, што беларуская дэлегацыя на XXVIII з'ездзе КПСС прапанавала на пасаду намесніка Генсека Ягора Лігачова. Куды далей? Для горшай яе характарыстыкі больш нічога не трэба.

І таму ў бліжэйшым КПБ чакае выхад інтэлектуальных, сумленных сілаў. Калі яна не адумаецца, не стане, як Кампартыя Літвы, Бразаўскаса, на нацыянальную глебу, ёй пагражае, ну, не ведаю нават што... Паглядзіце, Бразаўскас пасля Прунскене другая асоба ў рэспубліцы, рэйтынг яго папулярнасці такі, што каб зараз выбіралі Прэзідэнта, перавагу атрымаў бы менавіта лідэр Кампартыі, а не Саюдзіса.

А згадайце, якім аўтарытэтам карысталіся камуністы — потым іх назвалі нацыянал-ухілістамі — Чарвякоў, Ігнатоўскі, Баліцкі... Яны здолелі спалучыць культуру, адукаванасць, разуменне своеасаблівых інтарэсаў беларускага народа, павагу да сялянства... Магчыма, бяда іх ў тым, што яны былі надта ўжо культурныя, надта талерантныя. Не маглі і ўявіць, як можна падняць супраць апанента зброю — гэта «хвароба» ўсіх беларускіх сацыялістаў. У надта жорсткі век, у надта жорсткіх умовах, якія стварылі бальшавікі, яны былі надта мяккія. І перамаглі цвярдзейшыя.

Але вось цяпер гэтыя цвярдзейшыя апынуліся ў вельмі незайздросным становішчы. Менавіта таму, што яны сталі цвердалобымі. Ім усё ўдавалася сілаю, якую так цэняць падлеткі. Калі ж казаць, што грамадства, як і людзі, пера-

жывае пэўныя перыяды сталення, то, здаецца, мы выйшлі з малалецтва; юнацтва ж паважае розум, сталыя людзі наогул розум шануюць. А нам жа 70... Значыць, калі КПБ хоча павагі, яна павінна стаць разумнай партыяй. Ці ўдасца? Ці перастане выбіраць з гісторыі толькі тое, што падабаецца, ці будзе глядзець на яе аб'ектыўна? Не ведаю.

Я перакананы: партыі патрэбна пакаянне. За тое, што яна цярпела Сталіна, моўчкі згадзілася на рэвізію саюзнага Дагавора 1922 года, на перадачу Вільні і Беластока суседзям, што дапусціла Курапаты.

— *Не толькі ж камуністы стралялі — іх таксама.*

— Пажалі пасеянае: я не ўпэўнены, што хоць адзін следчы той пары быў без партыйнага ці камсамольскага білета. Такіх на такую работу не бралі.

А хіба можна дараваць партыі хаванне праўды аб чарнобыльскай трагедыі на працягу трох гадоў? Каб не Народны фронт і сумленная прэса, то...

А хто падняў праблему беларускай нацыі — можа, партыя? Не. Памятаеце, неўзабаве пасля стварэння БНФ пачалося цкаванне інтэлігенцыі, і ў газетах змясцілі выказванне аб ёй нейкага шахцёра: пісакі кніжкі чыталі, смачней елі, а рабацягі спіны гнулі, хлеб ім зараблялі! Я спрабаваў выступіць у партыйным друку — мне не далі нават слова сказаць. Пра тое, што такое мог заявіць або няздатны да навукі чалавек, або гультай ці п'яніца. Бо вось я, дзетдомавец, у шаснаццаць год пайшоў на свой, а не яго хлеб, працаваў рабочым, нават грузчыкам, нажыў хваробу, але здолеў скончыць і школу, і універсітэт... Каб было ў гэтага шахцёра імкненне чытаць кніжкі, як ён кажа, яму ніхто не замінаў ісці пасля работы ў бібліятэку, аўдыторыю. Нішто не замінала!

А што партыя без інтэлігенцыі? Без высокакваліфікаваных рабочых? Без сумленных працавітых сялян? Няўжо яна зноў хоча застацца партыяй люмпен-пралетарыяў, партыяй паўпераў, якія пазіраюць на тое, што сусед жыве багацей, і мараць аб тым, як прыйсці да гэтага суседа з наганам і забраць тое дабро? Такая партыя — не прыхільніца дэмакратыі.

Не думаю, што яна ўпішацца ў будучае дэмакратычнае грамадства.

— *А якім яно бачыцца Вам?*

— Ва Усходняй Еўропе сацыялізм дыскрэдытаваны: у Польшчы правацэнтрысты, правыя, па сутнасці, у Чэхаславакіі, хоць на чале стаіць выдатны палітычны дзеяч Вац-

лаў Гавел, правацэнтрысты кантралююць Балгарыю, раней ці пазней правыя прыйдуць да ўлады і ў Румыніі. А Заходняя Еўропа, здолеўшы анігіляваць, змякчыць усе вострыя супярэчнасці, прыйшла калі не да класавага міру, то да міру без вострых канфліктаў. Нават у 68-м там была не класавая барацьба, а хутчэй канфлікт пакаленняў. І ў Чэхаславакіі была тады добрая сацыяльная перспектыва, аднак яе задушылі нашы танкі. Мне, між іншым, заявілі тады: «Ты — антысаветчык». Гэта за выказванне ў тым сэнсе, што дабром такое не канчаецца, абавязкова адгукнецца.

Але вернемся да Еўропы: сацыялісты, сацыял-дэмакраты стаяць на чале дзяржаў і ўрадаў у Францыі, Швецыі, Іспаніі, Партугаліі, Аўстрыі, самым шырокім аўтарытэтам карыстаюцца Вілі Брант, Фогель, Ляфантэн. У Нямеччыне сацыял-дэмакраты, сацыялісты — процівага правацэнтрызму, бо сацыял-дэмакратыя стаіць на левым фланзе, абараняе інтарэсы рабочых, працоўных. Але абараняе цывілізавана, маючы палітычную, прававую культуру! Вось навучыцца б камуністам, якія абвяшчаюць сябе абаронцамі інтарэсаў народа, гэтай культуры — палемікі, паводзін... Калі КПСС хоча стаць на чале грамадства, яе павінны ўзначаліць людзі накшталт нябожчыка Улафа Пальмэ, які казаў, што ведае 72 вызначэнні сацыялізму і пры жаданні мог бы прыдумаць 73-е... Накшталт такіх разумнікаў, як Мітэран, як Марыу Саарыш. Гэта людзі еўрапейскай адукаванасці, шырыні кругагляду, якія валодаюць некалькімі мовамі. Нагадаем: былы прэзідэнт Італіі Перціні з рабочай сям'і, партызан у часе вайны. Які гэта інтэлігентны чалавек, як шанавала і шануе яго нацыя, якая ў яго абаяльнасць, культура, у гэтага сына рабочага! Якая выдатная асоба!

Не думаю, што хоць бы адна партыя сацыялістычнага кірунку можа дазволіць сабе перакручванне фактаў, самую звычайную ману, паклёп у палеміцы з палітычнымі апанентамі. Дык чаму ж гэта можна знайсці ў выданнях КПБ — «Звяздзе», «Советской Белоруссии», «Вячэрнім Мінску»?.. Я не кажу ўжо пра «Политический собеседник». Вось калі мы дажывём да такой культуры міжпартыйнай барацьбы, барацьбы за ўладу паміж партыямі, барацьбы за існуючыя класавыя інтарэсы, і калі Камуністычная партыя дажыве да гэткай культуры, тады мы будзем казаць, што ў яе ёсць будучыня. Ну, паглядзіце на Кампартыю Заходняй Нямеччыны — яна памерла, бо трымалася на грошы Хонекера. І як толькі кармушку прыкрылі — усё, капут! Праўда, больш разумная частка гэтай партыі выжыла пад кіраў-

ніцтвам Модрава і Гізі — а яны былі іншадумцамі, дысідэнтамі ў сваёй роднай САПГ... А які лёс напаткаў Венгерскую сацыялістычную рабочую партыю — здолела выстаяць, атрымаць месцы ў парламенце, упісацца ў новую палітычную структуру толькі тая частка, якая стварыла Венгерскую сацыялістычную партыю. Чаму здолела? У ВСП прыйшлі людзі, якія не цураліся дэмакратычных традыцый.

Партыі, што мінімілізуюць значэнне палітычных кампрамісаў і абсалютызуюць барацьбу, партыі, нецярпімыя да сваіх апанентаў, схільныя да маны і паклёпаў,— такія партыі ў будучым дэмакратычным грамадстве не знойдуць сабе прыхільнікаў, памруць. Дэмакратыя не церпіць як фізічнага, так і ідэалагічнага гвалту, нават яго спробы, замаху на яго.

Чаму ў Мінску перамаглі на выбарах кандыдаты, ухваленыя Народным фронтам? Бо КПБ не зразумела: на ўсякае дзеянне ёсць супрацьдзеянне. Народ, асабліва моладзь, запалохваць больш не ўдаецца. Зараз іншыя пагражаюць ваенным пераваротам. Аднак я гутарыў з афіцэрамі: маладыя камандзіры паўстануць у такім выпадку супраць авантурных генералаў. З новым пакаленнем нельга размаўляць, праломваючы кулаком стол,— з ім можна размаўляць толькі сілай аргументаў, кажучы шчырую праўду, а не хлусячы.

Але — але я не бачу, хто сёння можа ўзначаліць КПБ, павесці за сабой людзей...

— *Ну, а якія перспектывы Беларускай сацыялістычнай грамады? Ці можа яна адрадзіцца?*

— Не ведаю. Бальшавікі скампраметавалі ідэю сацыялізму. Людзі слова «сацыялізм» палохаюцца. Хрысціянскія дэмакраты, дэмакраты, нацыянальна-дэмакратычная партыя маюць сёння большыя шанцы, чым сацыялісты. Паўтаруся: я не антыкамуніст. Чалавек мае права верыць у камунізм ці ў што там яшчэ. Я супраць метадаў КПБ, КПСС. Не навязвайце сваю веру гвалтам, сілай, зброяй...

— *Адмоўцеся ад манаполіі?*

— Безумоўна. Адмоўцеся ад манаполіі на ўладу, а не ад прэтэнзій на ўладу. Змагайцеся за яе цывілізавана. Не кампраметуйце, таварышы камуністы, сацыялізм.

— *А як жа быць у такіх умовах сацыялістам?*

— Не зважаць ні на што і адстойваць ідэі сацыяльнай справядлівасці, сацыяльнай дзяржавы — гэта адвечныя ідэі, яны не памруць ніколі. І ці будзе Сацыялістычная грамада — пакажа час.

*Верасень, 1990*

## АЛЕСЬ ЕМЯЛЬЯНАЎ

### Жыве Беларусь! — вось сьвяты лозунг нацдэмаў...



З 52-га года нараджэньня, беларус. Каб мы жылі ў іншай, не ў савецка-бальшавіцкай сістэме, мажліва, мела б значэньне інфармацыя пра адукацыю. У нас жа яна нікуды ня вартая бяз самаадукацыі... Добра, ёсьць у мяне дыплом аб завочным заканчэньні філфака Белдзяржунівэрсітэта. Вясковец, з Магілёўшчыны. Жонка філолаг, зараз займаецца фальклёрам. Дачку хто-ніхто кліча ў школе нацыяналісткай: носіць вучням і настаўнікам фронтаўскія газэты, ёй дзесяць гадоў. Мая палітычная пазіцыя? Член Нацыянальна-дэмакратычнае партыі Беларусі.

Калі гаварыць пра нейкія захапленьні, інтарэсы і гэтак далей, само сабой найперш адзначу літаратуру, бо я сам літаратар. Яшчэ — гісторыя і, безумоўна, фальклёр. Некалі маляваў, вучыўся граць на гармоніку, зрабіў для свае хаты мэблю. Любіў і люблю пасядзець з вудамі.

Але за апошняе лета нікуды ня выбраўся: няма часу. А тое, што па-расейску завецца «пристрастием», гэта... Тут у мяне адмоўныя эмоцыі. Скажу шчыра, быў час, калі я мог добра прыкласьціся да чаркі...

Аднак прыйшоў момант, калі я запытаўся ў сябе: хто я ёсьць? Зразумеў, гэтая зямля мяне нарадзіла і ёсьць я сын яе — беларус! Па генах, па крыві. А па розуму? Што ведаў пра сваю Бацькаўшчыну? Лічы, нічога. Жахнуўся тады. Стала страшна за ўнутраную пустэчу, крыўдна і балюча за бязважкасьць. Пачаў цікавіцца гісторыяй, вывучаць мову, бо ў школе гэтыя заняткі неяк абмінулі мяне, і ў атэстаце насупраць графы «Бел. мова» стаіць адпрасаваны русіфікацыяй прочырк. Вось тады і «пристрастия» зьмяніліся.

*— Ты, даўні гараджанін, назваў сябе вяскоўцам, але пакуль ні слова не сказаў пра ўплыў на сваё жыццё роднага кутка.*

— Вось пра гэта якраз і хачу зараз сказаць... Не ўяўляю, якім бы стаў без звычайных вясковых дзядзькоў, бабак, звычак майго Забалацьця. Там, дарэчы, вельмі своеасаблівы дыялект, асобныя слоўцы і цэлыя пласты якога практычна не распрацаваныя, ня ўведзеныя ў літаратурную мову. Сучасная лексіка распрацоўвалася на менска-маладзечанскіх гаворках, а мы, усходнія беларусы, такім чынам засталіся калі не пакрыўджанымі, то ў нейкай ступені абдзеленымі філалагічнай увагай. Праўда, лямантаваць тут ня трэба, як гэта робяць прадстаўнікі «Збудзіньня» з Палесься. Ня трэба забываць, што мы сыны адной зямлі-маткі, што крыжаваньне спакутаванай Бацькаўшчыны на карысьць каму хочаце, толькі не беларусам. Проста такое становішча трэба разумна выпраўляць, адчыніць шлюзы, пусьціць у падруселую сучасную беларускую літаратурную мову пругкі крынічны струмень дыялектаў. Ад гэтага выйграюць абодва бакі. І нашая зьнітаванасьць падужэе. А петушыныя наскокі накшталт «прызнайце нас, палешукоў, а то мы пярэйдзем да Украіны,.. дайце нам аўтаномію!» падаюцца мне, прабачце, не дзіцячай нечаканасьцю. Хутчэй прадуманай, мэтанакіраванай палітыкай уладаўтрымальнікаў з філасофіяй *«разделяй и властвуй!»* Шкада, асобныя прадстаўнікі «Збудзіньня» яшчэ і дасёньня не зразумелі, на чый млын яны льюць ваду. А млын гэты — камандна-камуністычна-бюракратычны апарат. І толькі разам, усёй Беларусьсю, мы можам яго зламаць.

А што тычыцца палешукоў, калі ўжо зайшла гаворка, я

ня чуў яшчэ з боку дэмакратычных сілаў рэспублікі, каб іх не прызнавалі ці замахваліся на іх існаваньне. Патрабаваць жа сёньня аўтаноміі — ўсё адно, што патрабаваць асобнай камеры ў вялікім астрозе... Пра дзіцячыя пагрозы «выйдзем у склад Украіны»... Калі ня здолеем зьмяніць сістэму, ці ёсьць разумнае ў зьмене шыльды на варотах астрога? Думаю, што палешукам, як і кожнаму з нас, патрэбная свабода вытворцы, незалежнасьць гаспадара...

— *Ну вось: я пра магілёўскі дыялект, родную вёску, а ён пра палешукоў...*

— Разумееш, мне страшэнна баліць, калі нашую Вялікую Бацькаўшчыну разьдзіралі і разьдзіраюць па жывому. Маю на ўвазе таксама Беласточчыну, Браншчыну, Смаленшчыну, Віленшчыну...

Але пра Забалацьце. Не магу абмінуць увагай маіх аднагодкаў. Старэйшыя трошку, маладзейшыя — усе мы дружна, як я зараз разумею, каціліся ўніз. Вечарынка, танцы ў клубе — абавязкова патрэбна расьпіць бутэльку... І ўвогуле, культура абмінала маё пакаленьне. Практычна ішло забіцьцё душы. А калі хто і вырываўся з гэтага пякельнага кола, то, думаю, нават не па сваёй волі. Не баюся падацца містыкам: ёсьць знак Зямлі і знак Космасу. Сістэма ж дамагалася, каб мы забыліся пра сваю чалавечую сутнасьць і сталіся толькі вытворцамі. А прасьцей — рабамі.

Вось так, паміж глыбінным пластом унутранай культуры народа, якую несьлі вясковыя старажылы, і маладой бяздумнай разбэшчанасьцю якраз і ўскалыхвалася маё «Я». На сьцяжынах лапленага-пералапленага маленства ўсходне-беларускага хлопца.

— *Ты сказаў: была ўнутраная культура народа. Што грэла душу, высвечвала чалавечую годнасьць? Нарэшце, у чым яно, беларускае, светаўспрыманне?*

— Культура ня проста была, але і засталася. Выціснуць і забіць яе немагчыма, як немагчыма да канца закрэсьліць чалавечае ў чалавеку. Ты дамагаешся канкрэтыкі? Можна згадаць мараль. Ваяўнічы марксізм здолеў разбурыць, зьбэсьціць храмы (нашыя неацэнныя помнікі дойлідства). Але застаўся шкадобна-малым перад Храмам Душы. Узгадваю сваю бабку Маланьню, нябожчыцу Маланьню. Неадукаваная жанчына, якая ведала толькі адну літару «О», зьдзіўляла сваёй спагадлівасьцю, манерай гаварыць, абыходжаньнем зь людзьмі. Уражвала тактоўнасьцю, далікатнасьцю, павагай да іншых. Яна ніколі не павышала голас, заўсёды, можа і не ўсьведамляючы, што гэта такое, з нейкім блага-

веньнем брала ў рукі вышываны ручнік, бачыла ў ім нешта сьвятое, зьвязанае і з хлебам, і з мастацтвам, і зь сялянскай душою. Цалавала хлеб. Астатнім са стала дзялілася з Птаствам Божым — з прыродай.

Далей. Ад бабкі перакідваюся да аднагодкаў, моладзі. У нас ніколі ніхто ня біў удвух, утрох аднаго. Павагу выклікалі своеасаблівыя двубоі — дуэлі. І гэта ішло не ад нейкага там рыцарства — ад павагі да сябе і суперніка...

— *Ну а сёння што змянілася?*

— Тое глыбіннае, што яшчэ заставалася ў вясковым жыцьці майго маленства, неадступна і па-зьвярынаму зацята нішчылася (ды і нішчыцца!) с і с т э м а й. Вось чаму такім балючым сэнсам напоўнены для мяне паняцьці: адраджэньне нацыі, вяртаньне гістарычнае памяці. Народ заўсёды супраціўляўся глуму. У нашай паставе была царква. Не пры маёй памяці, але бабка расказвала, як з тае царквы здымалі званы і крыжы. Нікога не маглі знайсьці на гэтую справу. І тады партыйным «трэба» загналі на гару аднаго вясковага камуніста... А далей — гэта ўжо сам добра памятаю — ад таго ці не дзядзька-верхалаз лёсу ня меў, шчасьце абмінула яго.

А ў абезгалоўленай царкве безгаловыя зрабілі клуб. Толькі ён вельмі доўга пуставаў — няйшлі людзі і ўсё тут. Мне заўсёды пачувалася там трывожна і няўтульна. А зараз, калі надараецца бачыць, крыўдна і ваяўніча. Вось яно, супраціўленьне глуму над сваёй культурай. У вёсцы зь сімбалічнай назвай — Забалацьце. На руйнаваньні адвечнага ніколі не паўстане нейкая новая культура, як яе не паджэньшэньвай ідэялёгіяй сьветлае будучыні.

— *Якія, дарэчы, твае адносіны да атэізму ці, дакладней, бязбожніцтва нашага?*

— Вынішчаць рэлігійны сьветапогляд народа бальшавікам неабходна было, каб сьцьвердзіць сваю, камуністычную ідэялёгію. Рушыліся Храмы. Дратаваліся целы. Адліваліся кулі. Чорнае крыльле калыхалася над нашай асірацелай Зямлёю. Мільёны жыцьцяў гвалтоўна вырываліся зь Вянца Існасьці. І ўсё рабілася дзеля аднаго — каб запалохаць душу, зламаць яе, сьцерці ў труху і пусьціць у бязьмежнасьць прывіднага д'ябла камуністычнай ідэялёгіі, каб зрабіць з чалавека прымітыўнага біялагічнага робата.

На вялікі жаль, бальшавікі шмат пасьпелі. Асабліва ў фізічных практыкаваньнях. А вось душу да канца вынішчыць, утапіць яе ў чорным віры страху ды бязьвер'я ня здолелі. І дзякаваць Богу! Памяць наша яшчэ жывая, і

душа цяплеецца. Ваяўнічы атэізм не пасьпеў вынішчыць наш генны духоўны пачатак. Хаця і стаім мы сёньня над безданьню бесчалавецкасьці.

— *Адсюль, па тваёй ваяўніча антыкамуністычнай логіцы, такая пільная неабходнасць нацыянальнага адраджэння, вяртання былых святыняў?*

— І адсюль таксама. Каб мець будучыню, чалавек павінен стацца чалавекам.

Палітычная, культурная, экалагічная актывізацыя людзей сёньня жывіць надзеяй: уваскрэсьне Айчына. Але радавацца, начэпліваць на нос ружовыя акуляры не выпадае. Нельга забываць гісторыю. У дваццатых гадах мы ўжо мелі магутную нацыянальна-адраджэнскую хвалю. А што было потым? Кіруючая купіна спалохалася вольнай народнай стыхіі. І была зроблена стаўка на ўтаймаваньне. Людзей гвалтоўна зацуглялі ў камуністычныя аброці і сталі вазіць на іх ваду... Хто сёньня можа даць гарантыю, што не паўторыцца гісторыя НЭПа? Ніхто! Больш таго, прыкметы вяртаньня на гістарычныя кругі ўвачавідкі праступаюць у палітыцы нашага кіраўніцтва. Так, агонія бальшавізму пачалася. Але ці ёсьць крытычная маса, якая ня дасьць магчымасьці рэанімацыі? Мне падаецца, што яшчэ кіруючай партакратыяй ня выкарыстаныя астатнія рычагі. Зараз мы канстатуем, як яны пасьпешліва перапампоўваюць палітычна-камандны багаж у эканамічныя мяхі. А народ зноў застаецца з падранай торбаю. А яшчэ ж ёсьць ідэя новага саюзнага дагавору, прэзідэнцкае кіраваньне, урэшце — агульнасаюзнае войска... І ў гэтых варунках проста фізічна неабходна нітаваць кожнае каліва дэмакратычных, нацыянальна-адраджэнскіх сілаў у адзіную сілу. Хто не разумее гэтага сёньня, той самотна памыляецца!

— *У цябе намячаўся выхад, дакладней, пераход ад сферы частай ідэалогіі да нечага зусім іншага і ў той жа час вельмі роднаснага ёй — да эканомікі. Як уплывае яна на нацыю, у які бок падштурхоўвае грамадства?*

— Існуючая сёньня фабрычна-заводзкая сістэма падзяліла цэласны арганізм на цэнтр і перыферыю, вымушае ўсіх нас працаваць на клас бюракратыі, што вырас і ўзмацнеў за савецкі час. Задавальненьня ад гэтага мала. Ураўнілаўка, стрыманьне ініцыятывы, адкрытае рабаваньне, калі рабочы атрымліваў 8—15 капеек з заробленага рубля, падзёншчына і г. д. зрабілі сваю справу. Чалавек ня хоча працаваць на некага, але, і гэта становіцца тэндэнцыяй, і на сябе таксама, бо перастаў быць гаспадаром свайго плёну

і развучыўся працаваць. Беларус у працы быў Бог, а стаў звычайным дзяржаўным парабкам.

Зараз нярэдка можна чуць, што нас падштурхоўваюць назад да капіталізму. Ну, па-першае, не назад! Бо пад лозунгам: дагнаць і перагнаць, мы ўзялі такі тэмп, што не заўважылі, як апынуліся, мякка кажучы, у сярэднявеччы. Па-другое, арыентуючыся на Захад, мы не павінны быць сьляпымі і безгаловымі: на Захадзе свае праблемы, свае цяжкасьці і накладкі. (Дазволю сабе адступленьне: я за любы «...ізм», каб толькі чалавеку ў ім было ўтульна і добра.) І па-трэцьцяе, каб не атрымалася зноў, як у 17-ым — *«разрушим, а затем...»* — відаць, трэба адштурхоўвацца ў разьвіцьці ад таго, што маем. Нешта ж мы ўсё-такі набудавалі, набылі нейкі вопыт. І ў гэтым вопыце ня толькі, як ня трэба. Ёсьць, павінны быць і здаровыя зерняткі. Хоць у народзе кажуць, што будаваць нанова лягчэй, чым перабудоўваць. Але гэта тады, калі ёсьць пад рукою будаўнічы матэрыял. А пры нашым выключным жабрацтве не скарыстацца хай сабе адзінай здаровай бэлькай з гнілога гмаху — недапушчальная раскоша.

— *Ці не малавата навізны?*

— Гэта прэамбула. А цяпер мая канцэпцыя: на базе фабрычна-заводзкай сістэмы, як у горадзе, так і ў вёсцы, даць магчымасьць ствараць малыя прадпрыемствы, дзе чалавек найперш працаваў бы на сябе, а потым ужо на дзяржаву. Дакладней, праз сябе на дзяржаву.

Сёньня, на маю думку, неабходна рашуча і да канца правесьці дэцэнтралізацыю і дэманапалізацыю ўсёй вытворчасьці. Перавесьці знак роўнасьці са сьферы галотна-спажывецкай у сьферу вытворчасьці, дэманціраваць піраміду эканамічных адносінаў і пабудаваць з яе асобных структураў адзіную гарызантальную эканамічную структуру. (Дарэчы, тое ж самае трэба зрабіць і з дзяржаўнай уладаю: перавесьці з піраміды ў плоскасьць.) Іншымі словамі, паставіць вытворцаў (дзяржаўныя, кааператыўныя прадпрыемствы, калгасы, прыватныя гаспадаркі і г. д.) у роўныя ўмовы. Задача дзяржавы не ў стрымліваньні адных і ў падтрымцы-датацыі другіх. Хопіць нам будаваць заўтрашні дзень зьверху, навязваць вытворцу-спажыўцу нейкія пэўныя структуры. Яны павінны ўзьнікнуць у працэсе вольнае канкурэнтнае вытворчасьці, пры ўмове не кастрыраваных рыначных адносінаў. І хопіць палохаць нас хаосам! Яго ня будзе. Хаос — гэта прыдумка бальшавікоў, каб апраўдаць сваю палітыку насільля.

Я не прыхільнік ні правага, ні левага ўхілу, у якой бы сьферы ён не адбываўся. Шмат хто (калі ня большасьць) з левых зараз выступаюць за прыватную ўласнасьць. Я ж сёньня стаю на пазіцыі роўнасьці ўсіх формаў уласнасьці, у роўных умовах існаваньня. Толькі працэс вытворчасьці можа даць адказ, якая форма больш прагрэсіўная. Прынамсі тут, на Беларусі. Мне падаецца, што пры выкананьні гэтых умоваў, заўтра не тэарэтычна, а на практыцы мы зможам падысьці да вырашэньня пытаньня, якая форма ўласнасьці больш прагрэсіўная. Дарэчы, пытаньне ўласнасьці — ключавое пытаньне ўсіх эканамічных адносінаў.

Я думаю, ты разумееш, што гэта толькі тэзы, кожная з якіх патрабуе расшыфроўкі...

— *Разумею...*

— ...Урэшце, неабходна пераарыентацыя вытворчасьці на спажываньне, а не так, як сёньня, на бясконцае ўзнаўленьне ўсё таго ж вытворчага працэсу. Я за формулу: чалавек — дзяржава — чалавек.

— *А якая яна па-твойму зараз?*

— ДЗЯРЖАВА — чалавек — ДЗЯРЖАВА.

— *Мудрона, але слухаю далей.*

— Мы яшчэ ніяк не выцісьнем зь сябе страх, які тэарэтычна і практычна (а дакладней, ідэалягічна і фізічна) у нас напампоўвалі. Мы яшчэ доўга, да прыкладу, будзем баяцца «эксплуатацыі чалавека чалавекам». Ніяк ня ўсьведамляючы таго, што ў 17-ым бальшавікі ня толькі не скасавалі гэтае паняцьце, а, наадварот, сто разоў памножылі яго. Чалавеку ніяк ня стала лягчэй, што эксплуатацыя індывідыума ў класе была заменена эксплуатацыяй класу (тут «індывідыум у класе» — буржуа, «клас» — клас бюракратыі). Дарэчы, пры капіталізьме дзяржава выконвае пэўныя функцыі буфера паміж эксплуататарам і аб'ектам эксплуатацыі. Іншымі словамі, дзяржава пры капіталізьме выступае трэцім зьвяном у структуры ўзаемаадносін членаў грамадства.

Пасьля 17-га года гэтае «трэцяе» зьвяно было насільна зьнітавана са зьвяном эксплуататарскім. Эксплуататар-буржуа заменены больш жорсткім эксплуататарам — класам бюракратыі. І толькі! Груба кажучы, сёньня мы маем такую структуру, калі чалавека эксплуатуе не чалавек, а дзяржава. Гэта больш гібкае, закамуфляванае, але і больш жорсткае насільле. У працоўнага адабралі яго адзіную магчымасьць — выбар рынку збыту сваіх здольнасьцяў...

Я ніякім чынам не выступаю за эксплуатацыю, якія б

формы яна ні прыймала. (Хаця з дзвюх бедаў выбіраюць меньшую.) Будучыня, на маю думку, за малымі прадпрыемствамі, якія найперш будуць завязаныя ў гарызантальныя структуры. Відаць, толькі праз іх Беларусь здолее вырвацца з эканамічнага крызісу, знайсьці сваё адметнае аблічча.

— *Гэтая думка асабіста твая, альбо ты выказваеш сутнасць эканамічнага раздзела праграмы Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі, да стварэння якой Алесь Емяльянаў мае самае непасрэднае дачыненне?*

— НДПБ выпрацавала пакуль што толькі праграмныя накірункі дзейнасьці, што не тоеснае партыйнай праграме. Яна распрацоўваецца. І тое, пра што зараз кажу,— мае думкі, якія я буду адстойваць на Кангрэсе пры абмеркаваньні праекту праграмы.

— *Якімі ж будуць пераўтварэнні ў сельскай гаспадарцы?*

— Ня супраць фермерства. Але паралельна бачу неабходнасьць стварэньня малых кааператыўных гаспадарак. На базе, скажам, аднае вёскі.

— *А падпарадкаваныя вярхам калгасы і саўгасы?*

— Іх трэба распусьціць. Толькі, зразумела, гэта пытаньне часу. Спатрэбіцца нейкі разумны пераходны перыяд. Для наладжваньня новых узаемаадносінаў, новых сэрвісных варункаў, сувязяў з рынкам матэрыяльна-тэхнічных сродкаў, нарэшце, для псіхалягічнае пераарыентацыі сялянства.

Толькі ня трэба вёсцы перашкаджаць, дыктаваць ёй, калі сеяць, ці калі вывозіць гной, а галоўнае, ня лазіць бюракратычна-загатоўчымі рукамі ў яе вясковую торбу. Адзінае, што мы маглі б зрабіць для вёскі, дык гэта сплаціць даўгі. Але як і чым?!

— *А ты ўпэўнены, што рэакцыя сялянства на твае ідэі будзе вітальна-станоўчай?*

— Адстойваючы сваё, ня варта, зразумела, пагардліва ставіцца да думкі іншых. Галоўнае — забясьпечыць свабоднае развіцьцё вёсцы. Свой шлях хай выбірае сама. Я зразумею яе нават тады, калі перавага будзе аддадзеная тым жа калгасам. Адно ведаю пэўна: без свабоды мы зноў і зноў будзем вяртацца да пустых прылаўкаў.

— *Зараз вернемся крышачку назад. Прабач за рванасць размовы — змена рытму, тэмы вызваляе эмоцыі. Дык вось, якім чынам паўплывала на цябе выхаванне школы, ВНУ, войска?*

— Калі я скончыў дзесяць класаў, то ў характарыстыцы

толькі і было станоўчага, што канстатаваўся факт заканчэньня школы. Астатняе нагадвала радкі прысуду: з калектывам ня можа паладзіць, не чытае, не цікавіцца, ня ўдзельнічае, схільны да... Ня ведаю, чаму мяне ня выгналі з такімі «параметрамі»? Хутчэй таму, што школа трымала так званы прэстыж — як жа, дайшоў да выпускнога класа. Ды й спрацаваў вал па адукацыі. А можа настаўнікі душой адчувалі маю няўсьвядомленую непавагу, нават агіду да такой сістэмы «адукацыі», да такога хлусьлівага выхаваньня.

Толькі не падумай, што я быў нейкім паталагічным хуліганам альбо закончаным дурнем... Каб даказаць і настаўнікам, і сабе, што я ўсё ж нечага варты, падаў дакументы ў Горацкую сельгасакадэмію, на мехфак. І пры конкурсе недзе 18 чалавек на мейсца, на дзіва паступіў.

— *Атрымліваецца, сённяшні паэт Алесь Емяльянаў у той час і не думаў аб літаратуры?*

— Больш таго! Урокі яе ну проста не выносіў! Чаму? Ды паслухай: «Я мужык-беларус, пан сахі і касы, белы сам, чорны вус...» Гэта што, Купала?!

— *А дзе наш Янка?*

— У «Тутэйшых», вось дзе! У нас нібы сьпецыяльна для хрэстаматыі адбіраюць самую што ні ёсьць... Дадай сюды яшчэ якасьць выкладаньня.

— *Няўжо нават Багдановічам не захапіўся? Не маглі ж з'явіцца сённяшнія твае вершы ніадкуль!*

— Дык жа і Багдановіча школа не давала!

— *Ой? «І тчэ, забыўшыся рука замест пярсідскага ўзору цвяток радзімы васілька...»*

— Не дайшоў, не дапамаглі дайсьці да разуменьня гэтае моцы. А табе, мабыць, з настаўніцай пашанцавала, вось і ўсё.

— *Затое сёння...*

— ...партрэт Багдановіча ў маім пакойчыку...

— *...як святы абраз?*

— Калі хочаш, так! Бачыш, няма тут ні Чыгрынава, ні Навуменкі. Не выпадкова. Бо я раблю ня іх — а яго, Максімаву, справу. Ён быў грамадзянінам і барацьбітом, вось і стаў маім, з дазволу сказаць, хросным бацькам.

— *А для мяне асабіста гэта найвялікшы Паэт...*

— Кажуць, калі гавораць гарматы — музы маўчаць, так? Напружанасьць нашых дзён і падзей нагадвае гарматнае рэха, і таму я згадаў Багдановіча ў першую чаргу як грамадзяніна і, прабач, забыў слова Паэт. А радкі яго — як стрэл. Сіла тых жа «Слуцкіх ткачых» вунь як сягае праз

леты. Трапляе ў самае сэрца, запальвае, накіроўвае, трымае, жывіць і ўсё, што хочаш... Хіба ж гэта не змагар? Змагар словам, паэзіяй і, найперш сёньня важна, адданасьцю Бацькаўшчыне.

— *Са школай разабраліся — бяром акадэмію, га?*

— Юнацкі пратэст, як я цяпер разумею, дасягнуў сваёй кульмінацыі менавіта там. Падсьвядомая надзея вырвацца з пеклавага кола ня спраўдзілася. Горад таксама быў зацугляны ў д'ябальскія цуглі. Толькі, можа, больш крута. А можа, я проста стаў больш чаго разумець?.. Задумаўся: хто я і чаго хачу ў гэтым жыцьці? Пачалося вяртаньне да гісторыі, культуры, да бацькавай зямлі і мамінай мовы. Пачаўся той працэс, які так пільна сьцерагла камуністычная ідэялёгія. Адбывалася ўсё няпроста: здаралася, у паняверцы апускаўся на самае дно... Сумна, горка, балюча! Столькі часу змарнаванага засталося ў школьных гадах, столькі сілаў патрачана было!

Калі крыху ачомаўся, надумаў узяцца за вучобу. Але бязбожна запушчанае навярстаць не ўдалося. Ня здолеў ні маральна, ні фізічна настроіцца. Вынік — з другога курсу мяне выгналі. Прыехаў дахаты. Моўчкі залез на печку і лёг. Маці нічога не распытвала, толькі доўга глядзела на мяне, а потым: «Ай, сынок, рукі ёсьць, ногі ёсьць, галава цэлая — даб'ешся свайго». І ўсё. Памятаеш, мы шмат гаварылі пра культуру беларусаў? Пра іх спагадлівасьць, чалавечую мудрасьць? Во, во яна! Глыбінная, векавая, простая, як чысты глыток паветра.

Вяртаньне да сябе. Усьведамленьне сябе беларусам. І пытаньні, пытаньні... Як паўстаць? Як абараніць сябе? Як дапамагчы нязьлюдзець землякам?.. Прызнаюся, быў час, калі паставіў мэту дапяць нейкіх вяршынь і ўжо тады паспрабаваць штосьці значыць. Навучыўся прыстасоўвацца, хітрыць, змоўчваць, калі трэба, пралічваць варыянты... І ўжо не бяздумна плыў — гроб і азіраўся, нешта кеміў... Доўжылася тое, мо, гадоў пяць — войска, пасьля... Але зразумеў: зноў не туды, зноў ня так. Бо ў нашым грамадстве, у нашым жыцьці, калі хочаш нечага дапяць — пераступі сябе сьпярша. І раз, і другі, і трэці... Тады прыйшоў да вечнае высновы: жыць ня заўтрашнімі планамі, а сёньняшнімі дзеямі.

— *Дыскрэдытацыя грамадзянскай годнасці асобы адбываецца па такой сістэме: адступленне, уступка, звычка, стыль?..*

— Так. І я гэта адчуў на сваёй скуры.

— *У цябе было калі-небудзь жаданне ўступіць у партыю?*

— Было. Я цудоўна разумеў, каб нешта мець, трэба стаць членам КПСС. Толькі, дзякаваць Богу, пакуль было жаданьне, ня ўпісваўся ў партыйную разнарадку. А потым... Тройчы прапаноўвалі, угаворвалі, дражнілі партыйным білетам, як квітком-пропускам у кола выбраных.

— *Дзе ты працаваў?*

— У сваёй раёнцы, няштатнікам радыё, «Чырвонка», «Піянер Беларусі», рэдактарам тэлебачаньня. Потым — літкансультант Саюза пісьменьнікаў. Чым удзячны карэспандэнцкай працы, дык гэта выразным бачаньнем нашае сістэмы і мейсца ў ёй чалавека-вінцікa. Навучыўся адчуваць унутраны імпульс калектыву, пралічваць варыянты разьвіцьця падзей.

— *Што ты думаеш пра людзей, якіх звалі «антысаветчыкамі»?*

— Раней? Нічога. Калі шчыра, я вельмі і вельмі мала ведаў гэты бок жыцьця. Цяпер жа... Ды я сам хаджу пад шыльдай «антысаветчыка», «нацыяналіста» і г. д.

Дысідэнты ня проста бачылі, як многія з нас, усю гэтую калатнечу. Яны стараліся нешта зрабіць, будзілі іншых. Чаму мяне раней не прыбіла да іх? Відаць, ня толькі няведаньне. Хутчэй, сьцерагла сялянская абачлівасьць. І зараз нешта раблю, але імкнуся не перагнуць палку: разумею, што тут, на волі, больш здолееш, чым за кратамі. Хаця, з другога боку, сёньня іншы час. Але разумнае павінна заставацца заўсёды.

Памятаю, вучыўся на філфаку. Як мог, прыкрываў хлопцаў. Якім чынам? Недзе на пачатку першага курса мяне вылічылі, як былога пагранічніка... Выклікаюць у дэканат. Зьдзівіўся, чаму? Але пайшоў. У дэкана на стале заўважыў краем вока пісульку, дзе запісана маё і яшчэ тры прозьвішчы. Дэкан мне сказаў, што ёсьць там нейкія непаладкі з маімі вайсковымі дакументамі і што мне трэба зайсьці... Я зайшоў. Са мной доўга гаварылі, «прашчупвалі», а потым прапанавалі быць сексотам КДБ. Першае было жаданьне паслаць іх на... Але згадаў падзеі на філфаку, калі выключылі Разанава, узгадаў той сьпіс на стале дэкана і зразумеў: мейсца пустым не застанецца. Прыняў рашэньне і падпісаў дамову аб захаваньні тайны і супрацоўніцтве.

— *І?*

— Тайну я захаваў. А вось супрацоўніцтва... Яно атрымалася аднабаковым. Стараўся на сустрэчах (а яны заўсёды

былі тайнымі) высьвятляць-здагадвацца, кім і чым цікавіцца гэбіст, і як мог, папярэджваў падзеі і паводзіны хлопцаў.

— *А аднакурснікі — няўжо нічога не заўважалі?*

— Спачатку злаваліся, што я надта нешта перабольшваю ці суну нос не ў свае справы, але потым, відаць, зразумелі, што я ведаю больш і адчуваю сітуацыю глыбей. А хутчэй, здагадаліся. Але, дзякуй ім, давер да мяне ня толькі не паменьшыўся, а, наадварот — узрос. Не задавалі лішніх пытаньняў, часьцей сталі слухацца...

— *Няўжо КДБ цябе не «раскусіў»?*

— Відаць, «раскусілі». Я ведаў, што рызыкую і што мяне ў любым часе могуць выгнаць з універсітэту. Але ж рабіцца стукачом, шасьцёркаю, даносчыкам на сваіх жа аднадумцаў,— прабач! Часам было невыносна цяжка. Павуціна на «тайных сустрэчах» плялася тонкая, густая, з веданьнем справы. Невядома, якое пытаньне атрымаеш у наступны момант, якая сітуацыя высьвятляецца кантэкстуальна... Часта лаяў сябе: навошта, дурань, пагадзіўся? У сваіх адносінах я выбраў тактыку «шланга», іграў ролю гэткага даўбні-няведальніка...

Калі перавёўся на завочнае і пайшоў працаваць у «Чырвоную змену», ад мяне адчапіліся. Ты не ўяўляеш, як гэта бязьмежна добра: адчуць сябе нарэшце вольным чалавека!

— *Так усё і скончылася?*

— Сьмяешся? Быў яшчэ адзін раунд майго «супрацоўніцтва». Выклікалі, абяцалі залатыя горы, малочныя рэкі і кісельныя берагі. Адмовіўся. Сталі пагражаць, палохалі... Адмовіўся. Бо я ўжо тады працаваў у «Чырвонцы» і не баяўся, што мяне выганяць з універсітэту, а весьці двайную гульню ня бачыў неабходнасьці. Папрасілі добра падумаць. Колькі разоў яшчэ тэлефанавалі, а потым... Неяк выклікае мяне рэдактар да сябе і прапануе напісаць заяву «па ўласным жаданьні». Я ўсё зразумеў і... застаўся без працы.

— *Не баішся расказваць?*

— Па-першае, не «расказаў», а толькі назваў. Не апавядаючы падрабязнасьцяў.

Па-другое, раблю гэта сьвядома. Справа ў тым, што зараз па сродках масавай інфармацыі прайшло: нібыта НДПБ — легальная зарэгістраваная арганізацыя.

— *А што ў гэтым дрэннага?*

— I я напачатку думаў: нічога крыўднага, але... Паралельна па горадзе папаўзьлі чуткі, што НДПБ створаная КДБ і працуе пад яго кантролем. Бачыш, які тонкі разьлік,

з аднаго боку — нібыта бяскрыўдная памылка «зарэгістраваная» (што звычайная няпраўда), з другога — створаная КДБ. І народ уведзены ў зман. Народ насьцярожана глядзіць на НДПБ. Дык вось. Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі — не вынік працы КДБ, яна — вынік нашага болю і ўсьвядомленай непазьбежнасьці стварэньня моцнае структуры, калі мы хочам нешта перайначыць.

— *«Мы» — гэта...*

— Беларусы! Найперш — беларусы! І апошняе, каб адказаць, ці баюся... У архівах КДБ можна знайсьці толькі адзін мой пісьмовы дакумент «супрацоўніцтва», калі я падрабязна апісаў, як узьнімаў чарку з англічанамі. І ўсё.

Ведаю, што КДБ сур'ёзная і глыбокая арганізацыя. І ад яе можна чакаць рознага. Але не баюся, а спадзяюся, веpую, калі хочаш, што сыны нашае Бацькаўшчыны, дзе б яны ні служылі, застаюцца сёньня беларусамі. Павінны заставацца! Інакш пра якое адраджэньне нацыі, Беларусі можна гаварыць? Наша сіла ў еднасьці. А хто ня супраць нас, той з намі.

— *Мы пазнаёміліся з табой на падрыхтоўчым факультэце універсітэта, і тады, у сямідзесятых, твая звычка гаварыць па-беларуску звяртала на сябе ўвагу, выклікала здзіўленне і здавалася ненатуральнай, нейкім фальшывым найгрышам. Цяжка пераносіць такія адносіны?*

— Зразумела. Часам, напачатку, абараняючы сябе, даводзілася нават і кулакі ў ход пускаць. Потым прызвычаіўся, ці што? Так, агрызьнешся калі, ды і ўсё. А ўрэшце зразумеў: не віна гэта народу, такія адносіны, а нашая агульная бяда. І дачку сваю выхоўваю адпаведна.

— *Вось пра малечу можна сказаць і больш падрабязна. Як жылося дарослым «нацдэмам», ведаю. А малым? Ты, бацька, разумееў, чым можа тое беларускае слова адгукнуцца ёй?*

— Разумеў. Як і тое, што некаму ж трэба памятаць: беларусы мы! Да таго ж, выхаваньне дачкі не было неяк арганізавана, яно было натуральным. У нас у доме ўсе размаўлялі і размаўляюць па-беларуску, і яна шчабятаць стала. І яшчэ, да часу нараджэння дачкі я звыкся з касьцюмам «нацыяналіста» настолькі, што касыя позіркі і пагардлівыя кпіны ўжо не краналі. Таму, прызнаюся шчыра, нават не вельмі падумаў, што псіхіка дзіцяці зусім іншая, што яна куды з большай эмацыйнасьцю будзе ўспрымаць адпаведныя адносіны да сябе.

— *І як жа ёй жылося ў нацыянальнай школе?*

— Яна не ў нацыянальнай... Але прапаную пачаць з садочка. Прыходжу аднойчы, а яна плача: «Мяне пабілі». «За што?» «Таму, што гавару па-дзеравенску»... І так, памятаю, крыўдна стала. Гляджу на тых дзетак і думаю: як жа так, ну як жа так?! Але ж ці яны, малыя, вінаватыя? Не! А дачка пасьля гэтага стала прыстасоўвацца: дома па-беларуску, на людзях старалася быць, як усе... Сёньня яна спакойна пераходзіць на расейскую, калі застаецца на вуліцы, бо цудоўна разумее: адна, у адрозьненьне ад мяне, яна не абароніцца. У другім класе, памятаю, прыходзіць дамоў вельмі сумная, заплаканая... Не сказала — чаму. А потым ужо, тыдні праз два, калі супакоілася, расказала: прычапіліся хлопцы — *«ты что выпендриваешься?»* І ў твар — кулаком...

Хоць і чакаў нечага гэткага, але ж балюча перажываю, бачу: у яе практычна няма дзяцінства. Рана, вельмі рана пачала аналізаваць, рабіць свае высновы пра гэтае грамадства...

— *Карацей кажучы, у яе заўчасна пачаўся працэс сацыялізацыі?*

— Абсалютна. Бачыць навідавоку расслаеньне нашае, сама змушана жыць у двух вымярэньнях, у двух сьветах.

— *Як, дарэчы, яе завуць?*

— Тацьцяна... Хоць прапаноўваў жонцы беларускае імя — Міхаліна.

— *Гм... Скажы, калі ласка, Алесь, як уплывае на адносіны да тваёй дачкі з боку іншых твая ўласная рэпутацыя? Ведаюць жа настаўнікі, што ты адзін з прыкметных у Народным фронце, а зараз і старшыня Каардынацыйнай Рады НДПБ?*

— Скажам так: самыя няшчасныя людзі на гэтай зямлі — нашыя настаўнікі. Яны настолькі забітыя, настолькі затурканыя, хоць у душы, можа, і сьвятлей за нас двух разам узятых. Асабліва на вёсцы... Неабходнасьць вучыць таму, у што і сам не заўсёды верыш, штодзённая кара паўтараць стандартны набор хлусьні псіхалагічна прыгнятае іх, горбіць больш за іншых. Але ж людзі яны! І ім хочацца пагрэцца каля праменя праўды... Ва ўсякім разе, даччына настаўніца Алена Васільеўна ня толькі не імкнулася «абразуміць» мяне ці дачку, а наадварот: час ад часу прасіла малую прынесьці фронтаўскія газэты. Хоць шырока і не гаварыла пра тое. І па-чалавечы яе можна зразумець.

— *З нашай гутаркі вынікае, што я быў бы апошнім*

*дзіваком, каб задаў табе пытанне аб адносінах да абноўленага сацыялізму...*

— А што такое «абноўлены сацыялізм»? Ці не чарговая казка для немаўлятак? Сацыялізм — ён ёсьць, або яго няма! Паўтараю, я за любы «...ізм», толькі людзі пры ім павінны жыць добра.

— *Зноў хачу выцягнуць цябе на развažанні аб нацыянальным адраджэнні — што яму замінае і як можна паскорыць гэты працэс?*

— Прысьпешыць яго няўдасца, як бы гэтага ні хацелася. Увогуле, варта было б паставіць пытаньне так: а ці ёсьць ён, гэты працэс адраджэньня? І адказаць: ёсьць! І быў! Прыклад таму я сам. Зараз ён толькі набывае больш шырокія формы. Уліваецца ў больш шырокае рэчышча. Паскараць тыя гаючыя струмяні — толькі ваду каламуціць. Гэта ўсё адно, што браць у рукі дубіну і гнаць людзей няведама куды. Іншая справа — спрыяць. Больш выпускаць цікавых беларускіх кніжак. Дабіцца, каб не беларускамоўным, а беларускім стала радыё і тэлебачаньне. Прывучыць чалавека, хаця б візуальна, да роднага слова — памяняць расейскія шыльды, зьмяніць мову гукавой рэкламы. Зьменшыць да мінімуму вадаспад расейскамоўнай інфармацыі... Думаю, чалавек не стане насіць акуляры, калі пачытае не *«масло стоит 8 рублей», а «алей каштуе...»*. Іншая справа, дзе той алей узяць?

— *Іншымі словамі: не толькі праз душу да адраджэння, але і праз страўнік?*

— Безумоўна! Не змаруся паўтараць: бальшавікі аддзялілі цела ад душы і змусілі нас маліцца на фізічны абраз. І малітву гэтую большасьць з нас разумее сёньня, як духоўны бок чалавечай існасьці. Што ёсьць выключная лухта!

— *А з другога боку...*

— З другога? Нельга, памятаючы пра душу, ні на хвілю забываць пра цела. Нельга дзяліць цэлае! Нельга крыжаваць адзінае! Колькі б мы ні напампоўвалі цела фізічнай энергіяй, яно ніколі ня стане чалавекам без сканцэнтраванай энергіі душы і розуму.

— *Ты хочаш сказаць...*

— Я хачу сказаць, што сёньня мы, сьвядома ці падсьвядома, наблізіліся да існасьці, чалавек ёсьць найбольш выяўлены кандэнсатар энергіі душы. І таму мы ні на момант не павінны забывацца пра сапраўды такі унікальны носьбіт высокаарганізаванай энергіі — чалавечае цела. І на

дадзеным этапе разглядаць чалавека як АДЗІНАЕ, а не як АДЗІНСТВА...

Усё-усё!.. Яшчэ адна тэза і спускаюся на зямлю. Пра зьліцьцё моваў. Тэарэтычна гэта магчыма, а фактычна? Калі не сказаць рэзка: шлях на зьліцьцё моваў — здрадны для чалавецтва шлях: зьліўшы мовы, мы сьмяротна ранім нацыі, тым самым зьвёўшы да мінімуму варыянты пазнаньня асноўнага — высокаарганізаванай энергіі. Зараз нам трэба быць ня проста гадавальнікамі і пастаўшчыкамі гэтае энергіі, скажам, космасу, а самім прызнаць існаваньне яе. Найперш навучыцца фіксаваць, разумець яе, карыстацца ёю. Заўтра чалавек павінен стаць ня столькі вытворцам, колькі спажыўцом высокаарганізаванай энергіі — таго, што сёньня мы, не задумваючыся, называем душою. І тады выраз «разумець адзін аднаго бяз слоў» стане паўсядзённай рэчаіснасьцю. Гэта будзе новы віток у разьвіцьці чалавецтва. Скачок і ў эканамічным, і ў экалагічным, і ў энергетычным і г. д. планах...

— *Ты пішаш вершы, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Як адчуваеш сябе на Парнасе?*

— Пісаць вершы і тым больш быць членам — яшчэ ня значыць быць на Парнасе. А адчуваю я сябе ня лепшым чынам. Апошні час вельмі рэдка зьвяртаюся да паэтычнага слова. А што рабіць, калі вакол такое... Калі палітыка палітыкаў не задавальняе ні рабочага, ні селяніна, ні тым больш паэта. І таму даводзіцца займацца далёка ня тым, чым хацелася б...

— *Цябе зневажае чытацкая пагарда менавіта беларускім друкаваным словам?*

— Гэта хутчэй можна назваць набытай хваробай пабудаванага сацыялізму... А не пагардай... Не, не абражае. Можна абурацца, крыўдзіцца, злавацца, але трэба зразумець: пакуль не перайначым усю гэтую сістэму, пакуль ня будзе адраджэньня нацыі, народу, то ніколі каля беларускіх паліц ня будуць стаяць людзі.

— *Каму ты ўдзячны ў літаратуры?*

— Усім, каго калі-небудзь чытаў. Адны паказваюць, як варта пісаць, другія (іх больш) — як лепш не пісаць.

— *Закончым літаратурную размінку і зноў вернемся да чыстай палітыкі. Як пачыналася тваё лідэрства ў гэтым кірунку?*

— Я не лічу сябе лідэрам. Актыўны ўдзельнік — так. Але... Пра сваю актывізацыю. Яшчэ напярэдадні прыбалтыйскага абуджэньня адчуў: настаў момант, калі можна і

трэба нешта рабіць больш актыўна, гісторыя дае шанец. Паспрабаваў сабраць у гэтай вось будыніне сваіх хлопцаў-аднадумцаў і стварыць нешта накшталт таварыства, якое б пад прыстойнай чырвонай шыльдай вяло работу на карысьць Адраджэньня. На жаль, тады мне гэтага не ўдалося.

— *Думаў над асечкай?*

— Думаў. Ня здолеў пераканаць, давесьці неабходнасьць пачатку, відаць, прапанаваў ня той шлях... А тут яшчэ невядомасць першапраходцаў: страх толькі-толькі пачынаў з нас выціскацца, краіна толькі набірала паветра, каб сказаць першы гук дэмакратызацыі... Радуе, што потым большасьць з тых хлопцаў увайшлі ў аргкамітэт Беларускага народнага фронту за перабудову «Адраджэньне».

— *А ты?*

— Мяне каапталі ў аргкамітэт.

— *Твае погляды на станаўленне і праблемы БНФ?*

— Гэта асобная вялікая гаворка... Скажу тэзісна. Ня верыў і ня веру ў хуткую і лёгкую перамогу дэмакратычных сілаў на Беларусі. Але яна абавязкова будзе! Мы марудна падымаемся, але важка ідзем. Мы разважліва ўступаем у бойку, але выходзім з яе або пераможцамі, або на шчыце. Мы цяжка робім першыя крокі, але ніколі ніхто і нідзе ня бачыў сьпіны беларусаў.

Праблемы БНФ. Іх багата. Як аб'ектыўных, так і суб'ектыўных. Ёсьць памылкі і пралікі, тактычныя асечкі. Што ж, мы жывыя людзі, і нам уласьціва памыляцца...

— *А калі на фактах?*

— *Мне все же хотелось бы возвратиться еще раз к волнующей всех проблеме межнациональных отношений. Откуда такая национальная нетерпимость? Откуда этот совершенно неожиданный для многих и многих людей переход от всеобщей «дружбы народов» к чуть ли не всеобщей взаимной ненависти?*

— Ничего неожиданного нет. Нынешний кризис в межнациональных отношениях — прямое следствие имперской политики, которую проводила КПСС. Провозгласив на бумаге «Союз нерушимый республик свободных», мы на деле лишили их какой бы то ни было самостоятельности. Это привело к грубейшим перекосам в структуре экономики, разграблению природных богатств центральными ведомствами, массовой миграции населения, серьезным деформациям в демографических процессах, обострению экологической обстановки. Республики, в сущности, были лишены права распоряжаться результатами своего труда, проводить собственную социальную политику. Централизованное управление культурой, народным образованием привело к духовной унификации, утере национальных обычаев и традиций. Политика «слияния наций» имела своим следствием массовое закрытие национальных школ, вытеснение национальных языков из вузов, сферы делопроизводства. В результате многие из них оказались на грани умирания. Так что же вы хотите?

Усугубляется все это и тем, что пять лет перестройки не внесли никаких существенных изменений в отношения Центра и республик. И дело тут совсем не в том, что мы «опаздываем». Мы просто не хотим коренным образом здесь что-либо менять. Возьмите хотя бы Закон о разграничении полномочий между Союзом ССР и субъектами федерации. И слепому видно: он ориентирован на сохранение унитарного государства. А нежелание КПСС пойти на федеративный принцип организации? Как, скажите Бога ради, сможет республика осуществить свой суверенитет, если КПСС, продолжающая пока удерживать власть, сохраняется как унитарная, строго централизованная партия?

Я уже говорил, что в Белоруссии мы будем добиваться

реализации идеи суверенитета в полном объеме, а не так, как кому-то хотелось бы ее толковать.

— *А что Вы предлагаете в области государственного строительства? Каким видите будущее суверенного государства?*

— Это трагедия, если, обретя реальный суверенитет, мы перенесли бы на белорусскую землю ту форму государственности, которая существовала и продолжает сохраняться в Союзе. Ни для кого не является уже секретом, что СССР не только унитарен, но и тоталитарен. И сформировался он таким в результате реализации центральной идеи марксистско-ленинской концепции социализма — идеи диктатуры пролетариата. Огосударствление общественной жизни, сращение партийной и государственной власти, ее жесткая централизация, превращение человека в «винтик» — все это не деформация социализма в марксистском его истолковании, в чем нас пытаются уверить. Речь идет о деформациях жизни, вызванных насильственным внедрением этой самой идеи в жизнь. Правовое государство, гражданское общество несовместимы с идеологией марксизма-ленинизма. С решительного отказа от нее и начинается переход к цивилизованным формам человеческого общежития.

Создание правового государства — вот наша конечная цель. Мы будем добиваться скорейшего принятия новой Конституции Белоруссии на основе «Всеобщей декларации прав человека» и других международных правовых актов, тех международных обязательств, которые республика взяла на себя как член ООН. В Белоруссии должен править Закон, и не всякий закон, а тот Закон, который основан на приоритете прав человека.

— *Какими видятся Вам изменения в сфере экономики?*

— Наша сегодняшняя экономическая система покоится на трех блефах. Блеф первый — в ее основе лежит общественная собственность на средства производства. Никакой общественной собственности у нас отродясь не водилось. Есть государственная монополия на собственность, порождающая ситуацию, суть которой можно было бы выразить так: всем все до лампочки. Плановость экономики — это второй блеф. Ни один народнохозяйственный план не выполнен. Более того, практика пока-

зала, что планируемая таким образом экономика как раз и порождает настоящую анархию производства, ибо в ее основе лежат не экономические законы — лежит власть предержащих, возведенная в закон. Централизованно планируемая экономика порождает одно следствие: формирование громадной армии бюрократического аппарата. Гуманность этой экономики — третий блеф. Она антигуманна по самому своему существу, ибо ориентирована не на человека, а на план. Именно она, эта экономика, плодит социальную несправедливость, так как условия жизни людей, их благополучие зависят здесь не от результатов труда, а от места, занимаемого человеком в иерархической структуре управления (и распределения). Ее неизбежный спутник — монополизм, диктат производителя над потребителем. Она — питательная среда коррупции и теневой экономики. И наконец: именно эта экономическая система являлась все долгие советские десятилетия основой имперских амбиций КПСС, стремления перекраивать мир, согласно своей «самой передовой теории».

Отсюда и стратегическая задача: существующую систему необходимо сломать, прежде всего ликвидировать монополию государства на средства производства. Все разговоры о рынке и рыночных отношениях останутся пустыми, пока не будет создана для этого необходимая экономическая основа: многообразие форм собственности, включая частную. Все разговоры о свободе и правах человека останутся чисто вербальными упражнениями, пока не будет обеспечена экономическая независимость человека от государства.

— *Говорят ведь не просто о рыночной экономике, а о регулируемой рыночной экономике...*

— А как сие прикажете понимать? Если мы намерены регулировать рынок с помощью экономических механизмов, то с Богом — это делается давно уже во всем цивилизованном мире. Если же так, как думает Рыжков, с помощью экономического диктата, то нечего и начинать огород городить. То мы уже проходили на протяжении более 60 лет. Все велеречивые разговоры об «учете реальных условий», необходимости «сначала стабилизировать, оздоровить экономическую ситуацию», которыми потчуют нас Премьер и Президент, имеют одну цель: сохранить систему.

— *Ваши действия в области международных отношений?*

— Если коротко, то они в следующем: деидеологизация внешнеполитической деятельности, переход от конфронтации «двух систем» к политике конструктивного сотрудничества со всеми государствами на условиях взаимной безопасности, экономической выгоды и духовного взаимообогащения. Здесь также следует ликвидировать последствия 1917 года.

— *Что имеется в виду?*

— Именно октябрьский переворот положил начало глубокому расколу мира, военно-политическому противостоянию «двух систем». Его специфика и особая опасность заключались в том, что в его основе лежали причины не экономические или какие-то иные, связанные с реальными государственными интересами, а чисто идеологические, делавшие это противостояние хронически неустранимым. Пропагандистской фразой является тиражировавшееся нами долгие годы положение об особом «миролюбии социалистического государства». Идеологизированное государство агрессивно по самому своему существу. Тем более государство, идеология которого объявляет насилие «повивальной бабкой истории». История нашей внешней политики — бесконечная цепочка вмешательства в дела других стран, прямое или косвенное. Собственно, это прямо декларировалось и освящалось в программных документах КПСС под фальшивым предлогом «интернациональной солидарности». Маниакальная идея «мировой революции» дорого обошлась нашему народу. И не только экономически, но и морально.

— *Предполагается ли делегировать часть функций Центру?*

— В принципе — нет. Как член ООН Белоруссия должна быть суверенна в вопросах своей внешней политики. Речь может идти только о координации действий. Ни одно международное соглашение не может иметь для нас юридической силы, пока оно не ратифицировано нашим Верховным Советом. А то ведь что получается? Мы ломаем себе голову, как найти средства, чтобы вывезти умирающих людей из Чернобыльской зоны, а правительство Рыжкова щедрой рукой продолжает финансировать антинародные, прогнившие режимы типа кубинского. Вообще мне не нравится та возня, которая происходит в Кремле вокруг нового Союзного договора. Боюсь, что люди, сидящие там, пребывают не в реальном мире, а в порожденном больной имперской фантазией.



7. Зак. 5493.

*— Валентин Леонидович, из сказанного Вами следует, что идет достаточно серьезная работа по созданию крепкой, жизнеспособной партии. И в то же время мы, журналисты, мало что о ней знаем. Это тактика или просто перекрыты информационные каналы?*

— Есть и то, и другое. На мой взгляд, Демплатформа в КПСС после XXVIII съезда заняла какую-то странную позицию и упустила тем самым время для организационного оформления в качестве самостоятельной партии. В Москве я говорил: идея выходить из Компартии, оставляя при себе партийные билеты, дабы потребовать часть собственности КПСС,— отнюдь не верх политической мудрости. Ну, хотя бы потому, что тем самым автоматически санкционируется законность этой собственности.

*— Вы рассчитываете, что основу новой партии составят люди, выходящие из КПСС? А не кажется ли Вам, что многие, порвав с ней, вообще не будут торопиться пересесть в другую лодку?*

— Лично меня такая перспектива вполне устроила бы. Мне уже пятьдесят пять лет. Это не тот возраст, когда пускаются в бурный, изобилующий бермудскими треугольниками, океан политики. Да и счеты свести со своей теоретической совестью надо. Но политическая индифферентность ныне очень опасна. Общество стоит на историческом раздорожье. Куда оно пойдет? Ведь вот они, боевые фаланги, готовые хоть завтра, «еще теснее сплотив ряды» и пристроившись в авангард, вести общество в никуда... Когда-то, на заре создания КПСС, Ленин говорил: «Дайте нам организацию революционеров, и мы перевернем мир». Между прочим те, кто никак не хочет «поступиться принципами», по-прежнему убеждены, что им удалось перевернуть мир. Они просто не замечают: не мир они перевернули, сами стоят на голове.

Это опасно. И именно поэтому я не могу сказать сей капризной даме, именуемой политикой: «довольно, и так пожертвовал я годы твоей улыбке и глазам». Мы уже начали выпуск своей газеты «Господин Народ». Подготовили программные документы. В октябре состоится съезд, где и конституируемся как партия. Сейчас люди, выходя из КПСС, просто не знают, что делать. Думаю, многие примкнут к нам. И не только бывшие коммунисты — вообще люди с обостренной гражданской совестью.

*— А Вы как заместитель редактора не боитесь скомпрометированного «Господин» в названии газеты?*

— Оно не более скомпрометировано, чем слово «товарищ». Ну, скажите на милость, какой мне товарищ, например, редактор «Вечернего Минска»? Или я ему? И потом — слово «господин» предельно точно выражает философию нашего движения: в центре — не аморфная масса, лишь по недоразумению именуемая коллективом, а человек-личность, хозяин своей судьбы.

— *Ваше отношение к Ленину?*

— Очень неоднозначное. Но прежде хочу сказать, что внутренне не приемлю нашего язычества: еще вчера низко стелились у каждого его монумента, а сегодня готовы всю эту «монументальную пропаганду» спустить по Днестру... Это не психология свободного человека, это психология раба. Однако ж и то сказать: неужели у правительства не хватило сообразительности понять — сим дело в конце концов и кончится. Хрущев со Сталиным поступил умнее. И из мавзолея прах нужно убрать, похоронить по-человечески. Если я не ошибаюсь, со времен египетских фараонов ничего подобного в истории не практиковалось.

Теперь по существу вопроса. Как философа ценю его мало. И я не одинок в своем мнении. Плеханов, например, всегда подтрунивал над «философской беззаботностью» Ленина. Основная философская работа Ильича «Материализм и эмпириокритицизм» — из разряда ученических. Даже при всей ее агрессивности. Там видны и текстуальные заимствования из Плеханова. Вообще теория, в особенности, как это ни покажется странным, диалектика, не были сильной стороной вождя.

Что касается Ленина как политика. Здесь он, безусловно, силен. Хотя эта сила тоже весьма своеобразного свойства. Имею в виду его абсолютную неразборчивость в средствах для достижения цели. Политика — вообще такая область, которая не отличается стерильной чистотой. Однако же и в ней есть определенные границы, переступать которые нельзя. Ленина такое обстоятельство мало заботило. Тут он по-своему следовал принципу Наполеона: ввязался в бой — подавай победу.

Не подлежит сомнению, что субъективно это был честный человек, что называется, бессребреник. Но он был дьявольски самолюбив, тщеславен и фанатичен. А фанатизм в политике — всегда трагедия для тех, кто попадает в орбиту такой политики. Когда говорят, что Ленин породил Сталина — в этом заключена большая правда. Конечно, если бы Ленин предвидел, чем обернется затеянный им

эксперимент, он, думаю, никогда бы на него не пошел. Об этом свидетельствуют, в частности, сомнения, одолевавшие создателя Советского государства в последние годы жизни. Но так уж принято, что в политике не рассуждают по формуле: хотел — не хотел. Политиков судят не по их намерениям, а по реальным результатам их деятельности.

Вообще это весьма и весьма противоречивая историческая фигура. И брать ее надо во всей противоречивости. Но это дело будущего. Мы слишком пристрастны сегодня — и те, кто продолжает считать Ленина ангелом, и те, кто хотел бы сделать из него дьявола.

*Октябрь, 1990*

# ВІКТАР ІВАШКЕВІЧ

## Перамога дэмакратыі непазбежная, як смерць...



Нарадзіўся я ў Менску ў 1959 годзе. Пасля заканчэння васьмі класаў 79-й школы пайшоў у прафесійна-тэхнічную вучыльню, дзе набыў спецыяльнасць слесара механазборачных работ. Пасля войска восем год быў грузчыкам-стропальшчыкам на чыгунцы і адначасова завочна вучыўся на факультэце журналістыкі Белдзяржуніверсітэта.

У канцы 81-га года я пазнаёміўся з актывістамі «Майстроўні». Тыя хлопцы і дзяўчаты ставілі сабе на мэце адраджэнне нацыянальнай культуры. Гэта мяне зацікавіла, і я хутка стаў там «нашым чалавекам». Калі неўзабаве аб'яднанне разагналі, то знайшлі прытулак у клубе Караткевіча, а потым выраслі ў добра вядомую «Талаку».

Ма́ю жонку і сына, ён вучыцца ў першым класе беларускай, зразумела, школы.

— *Віктар, а з якой сям'і ты?*

— Тэхнарскай — бацька і маці інжынеры.

— *Адкуль цяга да беларушчыны?*

— З малых год, недзе з класа чацвёртага-пятага, я вельмі зацікавіўся гісторыяй. Не беларускай — тады наогул не ведаў яе, бо не трапляліся добрыя кніжкі, а сусветнай. Звычайная цікаўнасць да таго, як, калі, хто і каго перамог, паступова вырастала ў нешта большае, штурхала да асэнсавання нашага паўсядзённага жыцця як нечага недарэчнага, нязграбнага. Такое адчуванне смактала спачатку на ўзроўні пачуццяў, а потым яно заглыбілася ў канкрэтна ўсвядомлены апазіцыйны настрой. Гэта адчуванне ўвесь час шукала выйсце: як жа прымяніць сябе ў змаганні з тым, што не задавальняе? А «майстроўцаў» пасля вяртання з войска мне атэставалі даволі сур'ёзна — «нацыяналісты». За такім вызначэннем пачувалася вельмі пэўная работа, палітычная барацьба. І падаўся туды, каб знайсці нейкую апору, паплечнікаў у змаганні з шэрасцю, якая ўсё больш і больш абвалаквала мяне, засмоктвала ў свой сумны побыт з нейкімі мітуслівымі, дробнымі клопатамі на ўзроўні жывата. Хоць куды больш цікавіўся пытаннямі агульнапалітычнага плана, але прыняў і праблематыку нацыянальнага адраджэння, у якім разглядзеў рэальную альтэрнатыву беамяшчанскай бессэнсовасці жыцця большасці знаёмых. Беларушчына стала для мяне нейкай урадлівай глебай, маральнай базай, сумясцілася з унутранай прагай насычанай дзейнасці. Такім чынам і пачаў актыўнічаць у гэтым напрамку.

— *Атрымліваецца, у «нацыяналізм» цябе прывёў выпадак?*

— Так. І дзякуй, што ён аказаўся шчаслівым. Тут, аднак, не проста збег акалічнасцей — да новых надзейных сяброў падводзіла фактычна ўся логіка майго ўнутранага развіцця. Не тады, дык пазней усё роўна прыбіла б менавіта да таго берага.

— *Паўнацэнная беларушчына — гэта перш за ўсё прыярытэт роднай мовы. Не думаю, каб ты валодаў ёю...*

— Правільна, я адразу зразумеў: у «Майстроўні» немагчыма быць аўтарытэтным без ведання беларускага слова, з якім мы ўпэўнена размінуліся яшчэ ў школе... Куды дзявацца — пачаў вывучаць. Разам з жонкай. Адразу выключна дзеля магчымасці праводзіць праз аб'яднанне свае палітычныя ідэі. Але паступова адчуў арганічную неабходнасць думаць, размаўляць менавіта па-беларуску.

*— Як рос слоўны запас, зразумела — праз кнігі, прэсу. Ну, а самае галоўнае — моўная практыка: якім чынам шліфавалася яна?*

— Саромеючыся здацца смешным, спачатку размаўляў толькі з самым блізкім чалавекам, з жонкай. Затым толькі з раднёй, знаёмымі... Прыблізна праз паўгода адчуў: перыяд «трасянкі», калі рускамоўная традыцыя выразу суседнічае з беларускай канструкцыяй ці то нейкім увогуле незразумелым сімбіёзам, нарэшце пройдзены. Вось тады і перайшоў на паўсюднае карыстанне словам, менавіта сваім, родным, а не пазычаным у суседзяў.

*— Што датычыць літаратуры, магу спрачацца: пачаў з Караткевіча, так?*

— Тут і пракам не трэба быць! Зразумела ж, «Каласы пад сярпом тваім», апавяданні... Затым, непазбежна, Быкаў — я не арыгінальны. З маладзейшых і маладых люблю Дайнеку, Арлова. Што датычыць мажлівасцей майго новага асяроддзя, то «майстроўцы» пазнаёмілі з перафатаграфаваным «Адвечным шляхам» Абдзіраловіча — гэта рэдкае заходнебеларускае выданне, іншымі філасофскімі, мастацка-публіцыстычнымі творамі так званых нацдэмаў.

*— Ты казаў, шмат дапамагала жонка — хто яна?*

— Я толькі паступаў на завочны, калі Алена была на чацвёртым курсе журфака. Ведала мову хай не выдатна, то як мінімум добра.

*— Прызнайся: «родненькая-каханенькая» дапамагала і дыпломную работу пісаць?*

— А вось тут памылачка. Я добрасумленна адвучыўся шэсць гадоў, здаў усе іспыты і заставаўся ўжо апошні «бой», як «Талака» правяла мітынг у абарону Верхняга горада ў сувязі з будаўніцтвам метро. Рэакцыяй гарадскіх улад стала з'яўленне ў «Вечернем Минске» вялікага пагромнага артыкула пад загалоўкам «Позиция или поза», дзе шчодра паліваліся брудам «талакоўцы» за іх нібыта экстрэмізм. У тых радках «па заказу» нагадваўся і я, абвешчаны распаўсюджвальнікам антысавецкай літаратуры і г. д. Вельмі натуральна, што на дзяржаўным іспыце па навуковаму камунізму мне ўпэўнена паставілі «пару».

*— Хто ж гэта так сурова?*

— Не памятаю.

*— А што трапілася?*

— Зараз нагадаю, чакай... Прамова Леніна на III з'ездзе камсамола.

— *Дык лёгкі білет!*

— Мяне зарубілі не па сутнасці пытання, прыдзерліся да таго, што пераблытаў сёе-тое ў цытатах правадыра краіны і лепшага сябра яе моладзі...

— *З табой зводзілі рахункі?*

— Самому гаварыць пра тое няёмка, ва ўсякім разе аднакурснікі ў вочы выказалі навукоўцам сваё абурэнне іх непрыхаванай тэндэнцыйнасцю. На пытанне: «Што мне рабіць далей?», метадыстка адказала: «Ты ж ведаў, якая сітуацыя... Чаму лез напралом? Трэба было напісаць заяву ў дэканат аб гадавой адтэрміноўцы, каб перачакаць «ідэйную» навальніцу».

З той пары кожную вясну збіраюся пераздаваць «навуковы камунізм», але кожны раз тады адбываецца нешта такое, што... Адным словам, пакуль без дыплома.

— *Да слова: за пяць гадоў вучобы на журфаку ў мяне былі адны пяцёркі, акрамя... навуковага камунізму! «Дзякуючы» яму застаўся без чырвоных «корак». Так што не ты адзін. Ну, гэта жарт, у мяне іншая гісторыя. А калі сур'ёзна, то — калі, чым, як дапамагла табе бездыпломная адукацыя?*

— Журфак даў шмат. У адрозненне ад саманавучання ён сістэматызаваў мае веды. Я вельмі ўдзячны універсітэту за высокую літаратурную «нагрузку» — без жорстка кантралюемай праграмы сам шмат бы чаго недабраў.

— *Ну, а прафесійная падрыхтоўка?*

— Тут чаго вартая адна толькі набытая магчымасць актыўнага ўдзелу ў выпуску газеты Фронту. Напачатку арганізацыі «Навін» кожнае пяро ў нас, сапраўды, прыраўноўвалася да штыка.

— *Ці дапамагала нейкім чынам у сцвярджэнні твайго антыкамуністычнага светапогляду сістэматызаванае вывучэнне афіцыйнага грамадазнаўчага цыкла — гісторыі КПСС, палітэканоміі сацыялізму і да т. п.?*

— Безумоўна. Як? Напрыклад, у кожным раздзеле той жа палітэканоміі асобна разглядаліся пазіцыі, скажам, правых апартуністаў, рэвізіяністаў... Яны разбіваліся аўтарамі падручніка, але пры жаданні студэнт мог па-свойму ацаніць нават схематычна выкладзеныя альтэрнатыўныя ідэі. А ў спісе дадатковай літаратуры даваліся першакрыніцы — заставалася толькі не ленавацца. Я, у прыватнасці, выйшаў такім чынам на чэшскага даследчыка Шыка, тэарэтыкаў польскай «Салідарнасці» і іншых. Як аднаму з арганізатараў Фронту мне шмат дало таксама дэталёвае вывучэнне арганізацыйна-ідэйнага механізма, якім карысталіся

бальшавікі, нарэшце, камуністы. Чым, у прыватнасці, не прыкладны матэрыял тэма арганізацыі падпольнага друку РСДРП(б)?

Так, на працы я быў адзіны, хто згадзіўся выканаць даручэнне камітэта камсамола выпускаць насценную газету. Удалося зрабіць некалькі выпускаў, насычаных ідэямі адраджэння, крытыкай, адпаведнай дэмагагічнай прапаганды афіцыйных структур... Дробязь? Як сказаць... Менавіта тады нараджалася ў мяне і паплечнікаў ідэя нелегальнага часопіса «Бурачок», адпрацоўвалася яго тэматыка. А калі пачалі распаўсюджваць гэта выданне, то шуму было зашмат: «Караул, суперантыкамунізм! Суцэльная антысаветчына, куды глядзіць КДБ!» Хоць гэта быў дзіцячы смех у параўнанні з матэрыяламі сучаснай ліберальнай прэсы.

— *Ну, а з чым выйшлі адкрыта?*

— З шырока распаўсюджаным «Адкрытым лістом «Талакі» XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі». Там упершыню была выказана наша сістэмная пазіцыя па эканамічных, палітычных пытаннях. Ставілася, у прыватнасці, праблема адмены забароны на прыватную ўласнасць, шматпартыйнасць. Непасрэдная рэакцыя на гэты дакумент з боку канферэнцыі мала хвалявала — галоўнае, была вынайдзена выдатная форма легалізацыі нашых поглядаў, іх масавай прапаганды.

— *Цябе неаднойчы ў прэсе і прылюдна абвінавачвалі ў антысаветызме. Што думаеш пра гэта вызначэнне і як ставішся да падобных ацэнак?*

— Для афіцыйных асоб слова «антысаветчык» было сінонімам больш рэзкага вызначэння — «антыкамуніст». Але раней я ніколі не выступаў супраць Саветаў як формы арганізацыі ўлады. Зараз і ўвогуле такая пастаноўка пытання не вытрымлівае крытыкі, бо шмат прадстаўнікоў Фронту абраны народнымі дэпутатамі ўсіх узроўняў. Разам з тым практыка паказвае, што Саветы з самага пачатку свайго ўзнікнення былі прыстасаваны пад інструмент дыктатуры Кампартыі, і ва ўмовах сённяшняй нейкай частковай дэмакратыі яны фактычна не могуць працаваць, усё развальваецца. Таму добрыя перспектывы прагледваюцца ў прапанаванай намі ідэі беларускага Кангрэсу — таго, што ёсць на Захадзе, заканадаўчага органа і муніцыпальнай улады на месцах. Без усялякай градацыі ад сельскага да Вярхоўнага Савета. Такім чынам, толькі зараз я фактычна станаўлюся на пазіцыі антысаветызму.

— *Твае адносіны да КПСС?*

— Многія фронтаўцы адкрыта насміхаюцца над камуністамі, але я гляджу на іх спакойна, нават паблажліва. У якім сэнсе? Пазіцыя КПБ у рэспубліцы яшчэ моцная, устойлівая. Аднак, нягледзячы на гэта, перспектывы ў партыі няма, яе час прайшоў, кожны дзень набліжае гэту састарэлую арганізацыю да палітычнай гібелі. Радавыя партыйцы, ды і функцыянеры ў масе сваёй напалоханы, яны безыніцыятыўныя. Таму нейкія сорак талакоўцаў на роўных змагаліся з шматтысячным ідэалагічным апаратам камуністаў і ў рэшце рэшт узялі верх. Бо наступалі. А тыя абараняліся.

— *Чаму, па-твойму, КПБ засела ў абароне?*

— Бо не мае новых прыцягальных ідэй.

— *А што, дарэчы, думаеш пра саму ідэю камунізму?*

— Яна заўсёды будзе знаходзіць сваіх прыхільнікаў. З ліку тых, хто не знойдзе свайго месца ў вольным рыначным грамадстве, ды яшчэ сірых, слабых, пакрыўджаных лёсам. Але аб'яднацца яны змогуць толькі ў секту.

— *Як складвалася твая рабочая біяграфія?*

— У адной з камуністычных агітак прачытаў пра сябе наступнае: «Івашкевіч — з маргінальных слаёў». Мелася на ўвазе тое, што па роду заняткаў я кадравы рабочы, але па зацікаўленасці цесна далучаюся да інтэлігенцкіх колаў.

— *Філосафы развітога сацыялізму вынайшлі такі тэрмін: рабочы-інтэлігент — здаецца, гэта той самы выпадак?*

— Рады, што садзейнічаю развіццю нашай беднай філасофскай думкі. Калі ж сур'ёзна, то заўважаю: многія мае равеснікі з ліку тых, хто са школы трапіў у студэнты, палохаюцца кантактаў, дыялогу, дыскусій у рабочым асяроддзі. Цікава, што гэта датычыць як пракамуністычнай інтэлігенцыі, так і дэмакратычнай. А вось у мяне такога комплексу няма. На выбарах давялося быць даверанай асобай у Жураўлёва. Дык вось на мітынгу ў Сельгаспасёлку выходзіць наперад рабацяга і пытае: «Ну, станеш ты, такі гладкі, вычышчаны, у акулярах, дэпутатам — што дасі тады мне канкрэтна?» Наш кандыдат, гляджу, разгубіўся, не ведае, чым парыраваць, як спыніць нахабную агрэсіўнасць? А мне ж выдатна вядома, што такое пагарджальна-ваяўнічае стаўленне часткі людзей ад станка не натуральнае, а, па-руску кажучы, *напускное*. Праўда якраз у тым, што большасць рабочых забітая, нерашучая, залежная ад волі адміністрацыі; сваю нелюбоў да начальства яна неасэнсавана пераносіць на ўсіх «белых каўнерыкаў». Варта, аднак, апошнім шчыра вызначыць сваю пазіцыю, і ўсё наладжваецца, штуч-

ны лёд насцярожлівай падазронасці ўмомант растае. Сацыяльна пасіўная большасць рабочых разумее: яны нядздольныя на самастойны рух, ім патрэбны лідэры, дарадцы, інакш жыццё яшчэ больш уцісне іх. Не выпадкова людзі з вышэйшай адукацыяй, якія выраслі з рабочага асяроддзя і нягледзячы на свае дыпломы засталіся па розных прычынах на ранейшых «нулявых» пасадах, пры жаданні лёгка становяцца цэментуючым, арганізуючым пачаткам вялікіх і малых працоўных калектываў.

— *Мне здаецца, ты вельмі спрошчана падышоў да сацыялагічнага партрэту сучаснага рабочага класа: большасць — меншасць...*

— Гэта ў мэтах эканоміі часу. Калі не шкада, дам сваю асабістую разгорнутую характарыстыку «авангарду» сацыялістычнага грамадства.

Дык вось, першая яго група — гэта, так сказаць, «рабочая арыстакратыя». Як правіла, яе складаюць пасланцы вёскі, галоўны дэвіз якіх — паслухмянасць, бесканфліктнасць з начальствам. Наменклатура падкупляе іх брыгадзірствам, званнем лепшага па прафесіі, чырвонцам па выніках сацспаборніцтва, іншымі падачкамі, уключаючы вышэйшую — ордэр на кватэру. Хоць «арыстакратаў» бясконца выбіраюць у прафкомы, парткомы, прэзідыумы, яны даўно развучыліся думаць самастойна, прычыны сённяшняга нашага гаротнага жыцця бачаць у тым, на што ківае «шэф»: «Зашмат свабоды далі, дужа разумнымі ўсе сталі, нефармалы штурхаюць да крыві!»

Калі карані першай групы вядуць да сталіншчыны, то другая — стопрацэнтны прадукт брэжнеўшчыны. Адзінае іх жаданне і мара — «паддаць». Жыццё ідзе па дакладнааднастайнай схеме: дзе дастаць грошы? дзе купіць? дзе выпіць? дзе пахмяліцца? дзе зноў купіць?.. Такіх у прэзідыумы не запрашаюць — іх проста заганяюць на сходы, дзе яны сядзяць быццам мышы, бо заўсёды адчуваюць за сабой грахі і таму знаходзяцца на кручку ў адміністрацыі.

Трэцяя група — самая вялікая, гэта так званыя «сярэднія рабочыя». Хіба не дамініруе ў іх сацыяльнай характарыстыцы пачуццё незадавальнення? Усімі і ўсім. Адсюль — азлобленасць. На ўсіх і ўсё. Сёння яны за тое, каб «перастраляць усіх бюракратаў», а заўтра лямантуюць, каб ім «далі Сталіна, бо толькі па тым часе быў парадак і цэны зніжалі»... Пасля — дэпрэсія: «Каб гэту перабудову пярун спаліў: пры Брэжневе хоць мільёны кралі, затое выпіць і закусіць было!» А заканчваецца той перапад пачуццяў банальным: «А ну

іх, усіх!... Не буду хадзіць на сходы! Не буду чытаць газеты! Не буду глядзець «Час» — усюды суцэльная ліпа і лухта!» Аднак на сходы ідуць. Газеты чытаюць. Цэлік глядзяць. Хоць па-ранейшаму мацюкаюцца і плююцца.

І, нарэшце, чацвёртая група — ужо ахарактарызаваная мной «рабочая інтэлігенцыя», якая асэнсавана глядзіць вакол сябе, шукае і знаходзіць выйсце з крызіснай сітуацыі, у якой аказаліся разам з усім грамадствам.

Хоць, зрэшты, такое дзяленне вельмі і вельмі ўмоўнае. У жыцці ўсё куды больш складана. Часцей за ўсё ў кожным рабочым прысутнічаюць рысы ўсіх чатырох тыпаў, розніца толькі ў іх працэнтных адносінах.

— *Па тваёй класіфікацыі рашаючае значэнне ў рашаючы момант будзе мець пазіцыя «сярэдняга рабочага», па сутнасці — абывацеля. Як вымалёўваецца яна зараз?*

— Азлобленасць перарастае ў азвярэласць. Ад нарастання паўсюдных нястач. Таму «сярэднія» лёгка ідуць на забастоўкі, яны сталі мускульнай сілай страйкавага руху. На жаль, трэцяя група неахвотна адмаўляецца ад прывычных патрабаванняў на ўзроўні жывата. У Салігорску мне прама сказалі: «Нам, рабацягам, усё роўна, што там будзе — камунізм, капіталізм, фашызм ці яшчэ якое ліха; абы мелася паесці, апрануцца, ды на піва ў кішэні... Таму: хто паабяцае гэта забяспечыць — за тым і пойдзем! Карацей: наша справа працаваць і атрымліваць грошы, ваша — думаць»...

— *Віктар, паразважай, калі ласка, на тэму «Беларускі рабочы рух і «Рабочы саюз» Беларусі».*

— Лепей зрабіць гэта Міхасю Собалю — ён узначальвае аргкамітэт «РС», яму належыць ідэя стварэння такога Саюза.

— *Собаль, дарэчы, з вышэйшай адукацыяй?*

— Так. Ён працаваў майстрам на заводзе, але за бескампрамісную барацьбу з мясцовай бюракратыяй «вылецеў» за прахадную. Некалькі год судзіўся, потым плюнуў на «справядлівасць па закону», зарыентаваную на начальства, і далучыўся да тых, хто змагаецца, каб памяняць усё ў прынцыпе, а не на ўзроўні асобных выпадкаў.

Дык вось, чым Міхась тлумачыў неабходнасць стварэння «Рабочага саюза»? Тады — а ішла якраз выбарчая кампанія — у друку шалёна цкаваўся БНФ, і вельмі часта ад імя класа-гегемона. Дарэчы, у Фронце яго прадстаўнікоў было мала, аснову складала інтэлігенцыя. Мы з Собалем уваходзілі ў склад каманды Мікалая Ігнатовіча, які вылучаўся пры паўторным галасаванні па Завадскому-Парты-

занскаму раёну. У парадку эксперымента вырашылі праверыць: як жа рэагуе рабочае асяроддзе на агітацыю БНФ? Справа ў тым, што ў адрозненне ад Жураўлёва Ігнатовіч не хаваў сваёй сувязі з Фронтам. Вынік быў наступным: наш кандыдат перамог ужо ў першым туры, выглядаў куды лепш за астатніх. Вывад з гэтага зрабілі наступны: рабочая маса падтрымлівае любую апазіцыю Кампартыі. Па прынцыпу: вораг майго ворага — мой сябар. Ва ўсякім разе, на той момант. З другога боку, людзі падтрымлівалі нас, але заклік далучацца да БНФ прапускалі міма вушэй.

— *Прычына ў пасіўнасці, пра якую ты ўжо казаў?*

— У ёй, у забітасці, абмежаванасці, у недахопе палітычнай культуры, дакладней, яе адсутнасці... Заставалася адно — нацэльвацца на доўгую і сур'ёзную работу ў гэтым асяроддзі. Тады і з'явіўся аргкамітэт па стварэнню «РС». На календары быў 89-ы год. У асноўным групы «Рабочага саюза», якія неўзабаве пачалі стварацца, далучаліся і да Фронту. Аднак яны не мелі нейкага сур'ёзнага ўплыву на палітычную сітуацыю ў рэспубліцы да таго часу, пакуль не зарадзіўся страйкавы рух. Пачынаецца недзе забастоўка — туды едуць лідэры «Рабочага саюза», размаўляюць, дапамагаюць, чым могуць. У асноўным парадамі, што таксама вельмі важна. Часткова выручаюць з раздрукоўкай агітматэрыялаў. Такім чынам наладжваліся добрыя трывалыя кантакты.

— *На якой глебе нараджаюцца звычайна забастоўкі?*

— Амаль выключна — на эканамічнай: знікла каўбаса, кепскія ўмовы працы, мала плацяць... Мы ж імкнемся давесці да лідэраў на месцах, што трэба змагацца з сістэмай.

— *Палітызацыя?*

— Так. «Рабочы саюз» займаецца палітызацыяй забастовачнага руху і яго каардынацыяй. На сёння ёсць кантакты больш чым з дваццаццю страйкавымі камітэтамі. Найбольш актыўныя сярод іх у Гомелі, Салігорску, Оршы...

— *А магіляўчане, якія зведваюць ціск і Чарнобыля, і «вялікай хіміі»?*

— Пакуль маўчаць, хоць на «Лаўсане» група «РС» ёсць. Практыка, дарэчы, паказала, што стварыць забастовачны камітэт штучна, планава нельга.

— *Атрымліваецца, вы зацікаўлены ў эканамічных правалах улады, адміністрацый?*

— «Рабочы саюз» лічыць эканамічныя забастоўкі шкоднымі. Іншая справа, калі радавыя працаўнікі праспяць прыватызацыю — тут іх трэба падштурхоўваць, паказваць, па-

між кім дзеліцца пірог і чым у рэшце рэшт гэта абернецца для токараў, слесараў, кранаўшчыкоў... Людзі павінны зразумець, што павышэнне расцэнак у параўнанні з пытаннем уласнасці — драбяза, капейкі.

— *Што значыць, па-вашаму, добра арганізаваны працэс прыватызацыі?*

— Характэрны, скажам, для Польшчы варыянт распродажу, з пункту гледжання «РС», непрымальны. Хто купіць? У радавых грошай няма. Застаюцца ценявыя структуры і партапарат, чыноўніцтва, якія прыбіраюць да рук народнае багацце па саміх для сябе ўстаноўленых цэнах і парадках. Ільготных, зразумела.

Або акцыянерныя таварыствы. Абвешчана: яны могуць існаваць, але парадак рэгістрацыі нікому не вядомы. Людзі кідаюцца за дазволам у канкрэтныя Саветы. І спрацоўвае элементарны механізм, калі масавай з'явай сталі паўзаконныя аброкі, хабар, розныя непрыгожыя здзелкі, махінацыі... А ўзбагачаюцца ў выніку зноў жа бюракраты ды апаратчыкі, якія абзавяліся дурнымі грашыма і першым чынам скупілі некалі казённыя дачы, дзе-нідзе ўжо і кватэры, а вось-вось пачнуць выкупляць заводзікі, лабараторыі, магазіны...

— *Ты не спрашчаеш сітуацыю?*

— Ды не, пераход да звычайнага капіталізму відавочны. Іншая справа — шлях: прускі або амерыканскі? Памятаеш Леніна? За першы стаіць гарой наша бюракратыя, яна хоча праз пакуты народа перарабіць свае феадальныя прывілеі ў капітал, каб ужо потым даць стаўшай раптам выгаднай ім дэмакратыю і астатнім, эканамічна абкрадзеным. Аднак на пераходны перыяд «таварышам» патрэбна іншае — дыктатура. Чаму ж яшчэ партапарат масава кінуўся ў Саветы?

— *А што ўяўляе ваш шлях, «амерыканскі»?*

— Дзяржаўную ўласнасць трэба максімальна роўна падзяліць сярод тых, хто ўклаў у яе стварэнне свае сілы. Значыць, працоўны калектыў не павінен плаціць грошы за свой завод — ён і так яго ўласнік. З вынікаючымі адсюль правамі, у тым ліку і правам продажу кожным сваёй часткі ад агульнага. У выглядзе акцый.

Асобна пра легалізацыю ценевікоў. У прынцыпе, гэта карысная справа: капіталы выносяцца ў сферу вытворчасці, ідзе абкладанне падаткамі і г. д. Але выкуп за саму легалізацыю павінны атрымаць менавіта рабочыя, правільна? Пры чым тут кішэня партапарату? Таму мы прапануем наступную ўмоўную схему. Ёсць даныя па суме асноўных

фондаў на тэрыторыі рэспублікі. І ёсць даныя па колькасці працуючага насельніцтва, пенсіянераў. Вось у залежнасці ад стажу працы — колькі кожны чалавек унёс у так званую агульнанародную ўласнасць, гэта дзеліцца і атрымліваецца сярэдняя фондаўзброенасць, фондазабяспечанасць на душу — напрыклад, восем тысяч у сярэднім. Яны і павінны быць раздадзены кожнаму без усялякага выкупа. Паколькі ж фондаўзброенасць прадпрыемстваў розная, то апроч сярэднерэспубліканскага мінімуму можна прадаставіць права на выкуп адпаведных «лішкаў», калі такія ёсць. Не хочаце — яны выкідваюцца на рынак, дзе і можа легалізавацца той жа непатапляльны ценявік. Пры сённяшняй нястачы, нішчымніцы, скачцы цэн відавочнае з'яўленне наваспечаных капіталістаў непазбежна можа выклікаць выбух. У выніку мажліва і вяртанне да сталінскай дыктатуры, што не патрэбна нікому з нармальных людзей. Значыць, у інтарэсах тых жа ценевікоў падзяліцца, згубіць частку сваіх грошай. Аднак складваецца ўражанне, што сквапнасць слепіць...

Падсумую сказанае: «Рабочы саюз» лічыць неабходным аддаць асноўныя фонды працоўным без усялякага выкупу. Важна зрабіць максімальна роўнымі стартавыя ўмовы, потым ужо як хто хоча: адны няхай прапіваюць сваё, другія — скупляюць.

— *Ці знаходзіць гэта ідэя падтрымку ў рабочым асяроддзі, пра якое вы так клапоцціцеся?*

— Поўную, што цалкам натуральна. Лепей жа атрымаць сваё, чым выкупляць яго. Ды і няма вялікіх грошай у масы народу. Гэта, дарэчы, не толькі наша асаблівасць. Менавіта з такой нагоды застопарылася прыватызацыя ў Польшчы, і людзі сталі задавацца пытаннем: дык за што мы змагаліся? Каб зноў застацца без справы?

— *А ці падтрымлівае «РС» сувязі з роднаснымі замежнымі арганізацыямі, скажам, з той жа «Салідарнасцю»?*

— Собаль уваходзіць у праўленне Міжсаюзнай канфедэрацыі працы, а тая звязана з людзьмі Валенсы.

— *Якая тут карысць?*

— Ёсць магчымасць вучыцца на чужых памылках і засвойваць ужо набыты вопыт, не марнуючы час на ўласныя пошукі. Так, у Расеі страйкавы рух пачаўся раней, там болей гузакоў набілі — чаму ж не глянуць на адпрацаваную ў Кузбасе або ў Варкуце практыку забастовачных камітэтаў? Напрыклад, яны з самага пачатку заявілі, што

не цікавяцца пытаннямі палітыкі, працуюць напрамую з урадам. Аднак патрабаванні да яго часта так і заставаліся на паперы, бо нярэдка выкананне іх было па-за межамі магчымасцей Масквы. І тады толькі дайшло да шахцёраў: трэба забіраць шахты ў сваю ўласнасць, а каб забяспечыць права на гандаль вуглем з найбольш выгаднымі партнёрамі, неабходна дабівацца палітычных рэформ. А мы, гледзячы на іх, адразу б'ём на спалучэнне першага з другім.

— *Вас не клапоцяць абвінавачванні, што ў такі цяжкі час «Рабочы саюз» падбухторвае да далейшага эканамічнага развалу?*

— Я ўжо казаў: мы супраць штучных забастовак. Яны ўзнікаюць стыхійна, непазбежна і незалежна ад суб'ектыўных намераў. Наша задача — вучыць, што акрамя патрабавання «дай!», трэба думаць над пытаннем: «дзе ўзяць?» Чыста спажывецкая пазіцыя — выключна заганная справа. Іншае — зноў вяртаюся да набалелага, калі людзі патрабуюць завод у сваю ўласнасць, калі ў гэтым яны бачаць магчымасць забяспечыць сабе дастойны ўзровень пражыцця. Такім чынам, мы зусім не напаляем абстаноўку, а, наадварот, астуджваем яе, змякчаем сацыяльную напружанасць. Зянон Пазьняк сфармуляваў гэту сітуацыю ў наступнай задачы: трэба накіраваць растучы ў народзе стыхійны антыкамунізм у канструктыўнае русла стварэння альтэрнатыўных структур. «Бі камуністаў!» — нягодны, прымітыўны лозунг, скіраваны на суцэльнае безадказнае руйнаванне. Страйкавы рух, адпаведна, можа быць пабудаваны па схеме: «Кепска жывецца — кінем працаваць, хай даюць!», а можна і так: «Пад пагрозай кінуць працу — даб'ёмся канструктыўных перамен!» Забастоўка — гэта вельмі сур'ёзна; у параўнанні з ёю роў нават стотысячнага мітынга ўяўляецца мастацкім свістам; бюракратыя палохалася яго толькі напачатку, а потым атрымала выдатную прышчэпку супраць такой формы выказвання рабочага «фу!»

— *Якія адносіны «Рабочага саюза» да Вярхоўнага Савета рэспублікі?*

— Пры дадзеным парламенце выйсці з крызісу немагчыма. Ён будзе займацца цыраваннем дзірак, жаданнем спалучыць неспалучальнае — адміністратыўную сістэму і рынак... Сённяшняя сітуацыя, калі аднаго трошку намешана і другога крыху, куды горшая, чым тая, якая была раней. Тады чалавек працаваў пад страхам. Цяпер боязь прапала, а эканамічнага інтарэсу няма. Такім чынам, справа ідзе да поўнага распаду, і мы будзем ставіць пытанне аб новых

выбарах, на аснове новага адпаведнага закона.

— *Уявім, што страйкавы рух на Беларусі набудзе моц, дастатковую для пастаноўкі пытання аб агульнай рэспубліканскай забастоўцы. Пойдзе «РС» на такі ультыматыўны крок?*

— Ультыматум: або такая акцыя, або роспуск Вярхоўнага Савета — магчымы. А чым яшчэ інакш прымусіш сённяшніх парламентарыяў падаць у адстаўку?

— *Калі ўжо мы выйшлі на парламенцкія пытанні, спытаюся: вас задавальняе абʼяўлены суверэнітэт Беларусі?*

— Сапраўдная незалежнасць тая, да якой імкнецца Літва. Дабіцца яе няпроста. У адзіночку наўрад ці што атрымаецца. Ідэя рэалізуецца, калі за яе адначасова прымуцца, скажам, Прыбалтыка, Беларусь, Украіна. Крэмль прызнае толькі сілу, бо на ёй трымаецца. Крый божа, каб мяне зразумелі ў тым сэнсе, што я заклікаю да зброі — не, размова пра эканамічны адпор. І наступленне. У рэшце рэшт «Рабочы саюз» не Савецкая Армія.

— *Ваяваць, сапраўды, можна не толькі зброяй. Напрыклад, дэпутацкімі паўнамоцтвамі. У сувязі з гэтым пытанне: колькі рабочых, на вашу думку, пройдзе ў новы парламент? І ці патрэбны яны там?*

— У самой рабочай масе меркаванне наступнае: электрыку, фрэзероўшчыку там няма чаго рабіць, кіраваць дзяржавай павінны адукаваныя людзі.

— *Тут свядомае дэлегіраванне сваіх традыцыйных паўнамоцтваў інтэлігенцыі?*

— Не, менавіта людзям з адукацыяй, у тым ліку і рабочым з дыпломам ВНУ. Прынцып такі: не больш рабочых ці вучоных, а больш адукаваных, разумных, актыўных людзей. Я нават па выбарчай практыцы заўважыў: чым вышэйшая адукацыйная графа ў кандыдата, тым лепшыя яго шанцы.

— *А ты сам не вылучаўся?*

— У Вярхоўны Савет не зарэгістравалі, а ў гарадскі прапусцілі. Аднак у мяне не было магчымасцей праводзіць актыўную агітацыю на сваю карысць, бо каардынаваў кампанію БНФ за мандаты рэспубліканскага парламента. Адзінае, на што хапіла,— раскідаць па паштовых скрынях уласныя агіткі. Атрымаў сорак працэнтаў ад прагаласаваўшых, канкурэнт значна меней і... Між іншым, адчуў, як адмоўна спрацаваў радок: «адукацыя — незаконченая высшэйшая». Вось яшчэ што ўдалося падлічыць: 30 працэнтаў людзей аддалі галасы за мяне, бо мая асоба асацыіравалася ў іх

менавіта з БНФ — яны выбіралі пэўную палітычную сілу, а не канкрэтнага чалавека. Што да членаў КПСС, то гэтак-сама прынцыпова галасавалі за іх працэнтаў дзесяць на-сельніцтва. Больш паловы не маюць дакладнай арыентацыі, гэтыя разглядаюць нават насы — крывы ён у цябе, доўгі, ці ладны, прыгожы.

*— Паколькі ў нас зноў зайшла рэтраразмова пра вы-бары, то вернемся да Жураўлёва, за якога ты агітаваў. Чаму?*

— Ён набраў сваю каманду вельмі прадумана, разліча-ную на розныя сацыяльныя катэгорыі. Не стаў выпадковым і выбар маёй кандыдатуры — бээнэфавец, ды яшчэ рабочы, і не просты, а з журналісцкай адукацыяй... На мітынгах з удзелам рабочых размову заўсёды пачынаў я.

*— Цябе ўспрымалі як свайго, а ў выніку выйграваў доктар эканамічных навук?*

— Гэта натуральна, тут няма нічога такога...

*— Пра што ты гаварыў?*

— У мяне вельмі вострая манера размовы. Пытанні, накшталт памянёных ужо: «А што вы мне дасцё?», літараль-на выводзяць з сябе: «Нічога вам Фронт не дасць: ні каўбасы, ні масла... Пададаецца жыць галоднымі і без штаноў — жы-віце! Мне трэба столькі ж, колькі вам. Аднак, у адрозненне ад вас, не люблю проста звягаць у бытоўках, а на сходзе сядзець з прыкушаным языком. Зразумейце: трэба дзейні-чаць!» І пачынаецца: а як? ды мы! ну, добра... Ламаецца, адным словам лёд, і цячэ размова.

*— Твая беларуская мова тут не перашкаджае?*

— Адмоўнай рэакцыі не заўважаў. Нейкі бар'ерчык узнікаў з самых першых слоў, аднак хутка ўсё прыходзіла ў норму. Бо людзі адчувалі: гэта не гульня на публіку, з імі гаворыць свой.

*— Скажы, калі ласка, Віктар, ці задаволены ты сёння сваім садзейнічаннем перамозе Жураўлёва? Маю на ўвазе неадназначную рэакцыю выбаршчыкаў на яго вельмі актыў-ную і своеасаблівую пазіцыю ў Вярхоўным Савеце СССР.*

— Зараз лічу тую нашу кампанію памылковай. У якім сэнсе? Ужо заднім чыслом зразумеў: калі праз акруговыя сходы не прайшлі кандыдаты Фронту — Пазьняк, Собаль, я,— нам трэба было не падтрымліваць ні Жураўлёва, ні Іванова, ні Сідарава — нікога; тактыка патрабавала агіта-ваць за выкрэсліванне з бюлетэняў усіх, змагацца за бай-кот выбараў да той пары, пакуль не зарэгіструюць кожна-га вылучанага кандыдата. Мы ж пайшлі па шляху пад-

трымкі лепшых сярод тых, каму пашанцавала больш нашага. Хоць ніхто з іх не быў фронтаўцам, а лепшыя стаялі на цвёрда ўсвядомленых дэмакратычных пазіцыях. Не выпадкова адразу пасля абрання сувязі з імі прыпыніліся. Даводзілася лавіць такіх дэпутатаў, падстаўляць для подпісу нейкія там паперкі на рэгістрацыю Фронту... Падпісвалі. Запрашалі на нейкія мерапрыемствы — прыходзілі... Але ўсё неяк так, не па шчырай ахвоце, не па любві. Далей болей: вы там, хлопцы з Фронту, ужо занадта хапілі,.. вы на пазіцыі экстрэмізму пераходзіце, а мы займаем адзіна разумную палітыку, цэнтрысцкую... Фактычна адбыўся адыход гэтых людзей ад БНФ. Аднак яны згубілі не толькі нас, але і сябе як палітычных дзеячаў. Разам з саюзным парламентам, што ўсё больш выразна ўспрымаецца нейкім атавізмам. Згубілі, аднак, і мы — на рэспубліканскіх выбарах, напрыклад, неаднойчы Фронту нагадалі агітацыю за таго ж не апраўдаўшага агульных надзей Жураўлёва... Маўляў, і вы такія ж — абы да ўлады, да размеркавальнікаў прарвацца! Крыўдна...

*— Сказанае тычыцца літаральна ўсіх саюзных дэпутатаў?*

— Напэўна, акрамя Шушкевіча. Ён не цалкам падтрымлівае БНФ, мы разыходзімся ў шэрагу пазіцый, але гэты чалавек заняў найбольш актыўную палітычную пазіцыю і куды часцей за іншых кантактаваў з намі.

*— А Жураўлёў для цябе закрэслены?*

— Можа ён яшчэ і ўсплыве, бо вельмі разумны. І калі ўбачыць змену кан'юнктуры, то з'явіцца. Ігнатовіч таксама. Па той жа самай прычыне. І мы зноў гатовы падтрымаць іх... Бо на Беларусі бракуе спецыялістаў і актыўных людзей. Мала вельмі сярод нас тых, хто адчувае сябе суб'ектам.

*— Рэзка мяняю напрамак гутаркі, каб зусім не перасварыць цябе з адметнымі асобамі. Часта бачу апошнім часам Віктара Івашкевіча на розных антыармейскіх мерапрыемствах. У чым справа? Сказваецца твой сумны вопыт будбатаўца?*

— Наадварот, мне пашанцавала, што трапіў не ў страявую часць. Па-першае, будаўнікі, ў цэлым, больш сталыя па ўзросту, таму не было зневажальнага падзелу хлопцаў на старых і маладых, здзекаў над асобай. Здараліся выпадкі, але як выключэнне, а не правіла. Адно праўда: першагодкам даводзілася працаваць удвая больш за старэйшых... Яшчэ — падзел па зямляцтвах...

*— Ну, гэтага ўжо зусім не мала!*

— Мажліва. Толькі ўсё пазнаецца ў параўнанні. У людзей было куды горш.

— *Ты сам працаваў добра?*

— Прывёз дамоў восемсот рублёў. Лепшыя з нашых — больш за тысячу.

Вось маё перакананне, вынесенае з асабістага вопыту: служба павінна быць альтэрнатыўнай — працоўнай, і — прафесійнай. У пераходны перыяд магчымы прызыў ва ўнутраныя войскі. На тэрыторыі рэспублікі. Гэта знішчыць напружанасць паміж насельніцтвам і органамі ўнутраных спраў, якая ўсталявалася зараз. Нездарма ж спецназаўцам далі мянушку — «апрычнікі». А каб былі ў гэтых увогуле неабходных падраздзяленнях прызыўнікі толькі з тэрыторыі Беларусі, ім бы даравалі нават і дробныя памылкі — землякі ёсць землякі.

— *Віктар, раскажы, калі ласка, пра сваю сённяшнюю пасаду ў Фронце?*

— Структура БНФ наступная: Сойм, у якім каля паўсотні чалавек займаюцца стратэгічнымі пытаннямі нашай арганізацыі. Старшыня — Зянон Пазьняк. У яго два намеснікі — Юрый Хадыка і Міхась Ткачоў, задача якіх — кантакты з афіцыйнымі органамі. І, нарэшце, управа — яна адказвае за функцыяніраванне ўсяго БНФ, за канкрэтныя тактычныя дзеянні. Каб мець стабільныя кантакты з растучымі групамі падтрымкі ў розных кутках рэспублікі, ўвялі маю вызваленую штатную адзінку — сакратара. Вызваленая пасада старшыні камісіі Фронту па сувязі з вытворчасцю і ў Міхаіла Собаля. Калі перакласці сэнс маіх абавязкаў на мову партапаратчыкаў, то гэта будзе гучаць так — адказны за работу па месцы жыхарства.

— *Ты ўвесь час у эпіцэнтры барацьбы, падзей, таму, відаць, больш грунтоўна можаш выказацца пра перспектывы Фронту. Многім здаецца, што БНФ губляе сваю палітычную вагу, ці праўда гэта?*

— У тым толькі сэнсе, што маса нашага насельніцтва не гатова да працы, доўгатэрміновай. Напачатку людзі жылі наіўнай верай у стварэнне Фронтам нейкага сацыяльна-палітычнага ды і эканамічнага цуда — маўляў, раз-два і разваліцца абрыдлая сістэма, а тады ўжо на ўсіх абрынецца шчасце... Але нам было наканавана доўгае, цяжкае змаганне, шмат у чым нават пазіцыйнае. І хто не цярпіць працяглага напружання, зразумела, расчараваўся: «Ах, не веру цяпер нікому і ні ў што!» Адышоў і абывацель, які не заўважыў прыбаўкі каўбасы ў крамах: «Што за карысць з таго БНФ!»

Такім чынам, сёння мы не з'яўляемся сапраўды масавай арганізацыяй. У нас недзе каля пяці тысяч практычных актывістаў зараз, не болей.

— *Вы прадбачылі такі паварот?*

— Доўгі час стаўка была на хвалю народнага ўздыму, якая, чакалася, падымецца сама, а нам заставалася толькі арганізаваць яе. Таму, у прыватнасці, Статут Фронту прадугледжваў самастойнасць груп падтрымкі, разлічаную на іх ініцыятыву. Гэта не спраўдзілася. Маса дэзарыентавана афіцыйнай прапагандай і не ведае, што ёй рабіць. Прызнаўшы такую рэальнасць, нам засталося наступнае выйсце — наладжваць новую структуру і ўласную інфармацыйна-прапагандысцкую сістэму. Зараз ўжо ўведзена індывідуальнае сяброўства, кожнаму франтаўцу даручаецца канкрэтны ўчастак працы. Паралельна вырашаецца задача прарыву інфармацыйнай блакады.

— *Які сёння наклад «Навін»?*

— Ятвяги — балтское племя. Эта точка зрения культивировалась, в частности, литовской наукой. Но выступления ученых на нашей конференции, о которой я уже говорил, убедительно показали: ятвяги — не племенное название; это прежде всего идеологически-культурно-религиозное наименование населения всего балтского региона. В старых документах, например, говорится, что в Турове находился православный епископ, бискуп католический, «а часть населения оставалась ятвяжской веры» — вот она, идеологическая подоплека термина! Ятвяжская вера существовала и у нас на Полесье, и в Пруссии, и в Литве, и во всей Белоруссии. Но у нас она более всего сохранилась и зафиксировалась. Почему? Полесье было зоной, первой контактировавшей с югом, откуда шло православие. И не случайно ятвяги зафиксировались прежде всего в летописях православных. Точно так, как католики шли на территорию Пруссии и, сталкиваясь с ятвягами, описывали местную языческую веру. Отличие лишь в том, что там их называли прусами или парсами... Ведь это же элементарно: не могло быть в IX—XIII веках национальностей, не существовало тогда национального деления... Те же киевские князья вон как метались, не зная, какую веру все-таки принять! И к христианству склонялись, и к иудейству, и к зороастризму... Так вот, ятвяги — языческое название. Но! На Полесье существовало и какое-то государственное образование, известное внешнему миру

именно ятвяжским. С 944 года, со времен ятвяжского князя Гунара, за нашим регионом закрепился термин Етвязь. Так что когда мы говорим «ятвяги», «ятвяжский язык» — это вполне соответствует историческим реалиям. Кстати, термин «полешуки» вовсе не от создания Богом земли... Впрочем, как и «белорусы»... Любой термин отчасти искусственен, механичен. Я убежден: придет время, и наш край будет называться либо западнополесским, либо ятвяжским. Но нельзя вот так сходу категорически утверждать: ятвяжское племя — балты...

*— Ну, почему же «категорически»: ваши оппоненты ссылаются, в частности, на отсутствие не только ятвяжской письменности, но и археологических памятников. А вот восточнославянские племена оставили на этой территории знаки своей материальной культуры...*

— Наша Академия наук, повторяю, считает ятвягов исключительно балтами, культура которых была распространена в Пруссии, Западной Литве и лишь частично в Западной Белоруссии с заходом на Полесье. На деле же все гораздо сложнее, тут трудно определить четкие границы. Углубляться в эти частности, подробности — значит копаться внизу, а надо глядеть вверх, вперед.

*— Знаешь, у меня сложилось впечатление, что нелюбимые тобой белорусские историки копаются во временных пластах как раз для того, чтобы заглянуть именно в перспективу. Отсюда, в частности, такой вывод группы известных ученых: «Намерения организаторов объединения «Полiсьсе» проводить культурно-просветительскую работу не с позиций национального единства существующих наций, а их разъединения нельзя оценить иначе, как отрицательно, ибо она связана с опасностью раскола белорусской нации на мелкие, территориально ограниченные группы по отдельным диалектам того или иного языка... За такими шагами часто идет требование выделения новых национально-государственных автономий, что ведет к разрушению национального единства народа». Выводы очень серьезные...*

— Вижу, ты их разделяешь... Попробую разубедить. Понимаешь, процесс формирования белорусской нации еще не завершен, как не сформирован окончательно и белорусский язык. Ведь окончательно сформированная нация и язык — мертвецы, латиняне... Белорусы как нация вообще находятся сейчас на раннем этапе своего рождения.

Что до Полесья, то процесс интеграции его в бело-

русскую нацию начался лишь только в 1939, 1945 годах. До того, как известно, край входил в состав Польши и у нас действовало не «Таварыства беларускай школы» и ему подобные, а западноукраинские национально-культурные движения, в том числе «Просвіта на Поліссі». Поэтому безапеляционно говорить о «национальном единстве существующих наций» не приходится.

И второе. Что важнее: белорусское благополучие, в котором есть место и полесскому кусочку, или мировое — с учетом того, что будет развиваться полесская самобытность, языковая культура, которые, несомненно, окажутся раздавленными в рамках так называемой «единой белорусской нации». С ее политических и националистических интересов выгодно именно такое «единение». Но с точки зрения интересов полесских и общеземных все обстоит иначе — неужели это не очевидно? Миру и Богу нет разницы, по какой дорожке мы придем к нему. Важна реальность. А она такова: Полесье — совершенно самобытный регион со своим языком и культурой, а значит, они должны развиваться по своим внутренним законам. Ты посмотри — и с точки зрения экономики нынешняя Белоруссия нуждается в серьезных дополнительных инъекциях; ясно, что, когда они будут изысканы, львиная доля перепадет коренной национальности, а полешуки окажутся обделенными...

— *Извини, но до сегодняшнего дня именно Полесье как раз и получало ту самую львиную долю капиталовложений. По сравнению с той же Брестчиной Могилевская и Витебская области по части материального обеспечения были явно обделенными.*

— Я имею в виду не экономику, а культуру.

— *Опять возражу тебе: да ни в одной области ее не жаловали!*

— Может быть именно поэтому мы и стоим сейчас перед фактом свободы, чистым листом. Отсюда Белоруссия пробует отказаться от русификации, развивать естественный национальный процесс. В то же время Полесью предлагается новый эксперимент — белорусизация. Для нас она сегодня, в перестройку, то же самое, чем была в застои русификация для всей республики! Нам предлагают какое-то новое неестественное развитие. Почему полешук не имеет права на такое же национальное самоопределение, как и белорус? А что до твоего замечания, будто нам перепало больше материальных благ, то это не так.

На Полесье каждый третий протестант. Они не пьют, а работают лучше. Отсюда и не сравнишь двор брестский с могилевским и витебским.

*— Это упрощенный взгляд, подгонка фактов под заданную теорию. Не хотелось бы углубляться в существо вопроса, но прикинь, сколько беды, жертв принесла сталинщина, а затем и война каждой из трех областей, и твои доводы уже несостоятельны... А начни, повторяю, подсчитывать вложенное всей республикой в каждую из них, и вообще ссылка на протестантизм, особый характер окажется несерьезной... Но давай не будем об этом — разговор, собственно, о другом. И все же: ты понимаешь, что экономические претензии будут лишь «небольшой» проблемой по сравнению с другими проблемами, если дело дойдет до государственного выделения Полесья? Видишь, чем чревата такая постановка? По-моему, надо искать иное, более цивилизованное и достойное решение вопроса, коль уж он возник.*

— С позиции общечеловеческих ценностей, повторяю, для мира важна как полесская культура, так и белорусская.

*— Ты все же категорически против определения полешуков белорусами?*

— Категорически. Допускаю на 33 процента, что мы — украинцы, но на 66 процентов вижу нас отдельным народом. В любом случае — граждане Белоруссии, но не белорусы, это принципиально иной культурно-психологический заряд. Разница между Полесьем и Белоруссией, как между Белоруссией и Польшей. Между прочим, придет время, когда будет снят не только ятвяжский вопрос — везде в республике обучение в школах можно будет вести на местных диалектах. Чтобы полноценно развить крону, должно соблюсти все ниточки, ведущие от корня — это касается не только республики, это общемировая перспектива. Для Бога нет большого и малого — есть лишь качественное и некачественное.

Что же получится при проецировании этого главенствующего принципа на административно-государственный план? Думаю, украинское Полесье обретет статус самоуправляемой земли, когда Украина станет Федеративной Республикой по образцу Германии. У Полесья белорусского две перспективы — или Полесский автономный край в составе Белоруссии, или Белорусско-Полесская республика типа Чехо-Словакии, на равных условиях.

Подобная самостоятельность необходима для решения культурно-духовных полесских проблем, что невозможно без политических механизмов и экономического обеспечения.

Проведу рискованную, но реальную параллель с Карабахом: он прежде всего — культура, ценная миру. И если будут гарантии ее сохранения в составе Азербайджана, значит, армянам надо согласиться с этим, а не стремиться к созданию большой Армении «от болота до болота». В свою очередь азербайджанцы должны смириться с тем, что там — армянский очаг, самообеспечивающийся, самоформирующийся.

— *Оставим Кавказ кавказцам. Скажи, пожалуйста, а смирится ли с идеями вашего политизирующегося общества белорусская общественность? Но прежде — как относятся к этим планам «Полісься» в Иванове, Дрогичине, Кобрине?..*

— Там реакция положительная, хотя, конечно, единомыслия в вопросе реализации ятвяжской государственности нет. Одни за автономию в составе Белоруссии, другие — Украины, а есть и такие, которые готовы были бы включить Етвязь в Россию или Польшу. Люди-«экономисты» с их ненасытным стремлением набить живот — пассивно-безразличны, им лишь бы кусок хлеба получать, иметь, неважно, где и от кого. Приверженцы политических игрищ преследуют лишь свои амбициозные цели и готовы в связи с конъюнктурой мгновенно менять хозяев, ориентиры... И только те, кто ценит духовно-культурное наследие своего народа, полностью разделяют нашу позицию.

Программа ж «Полісься», повторю, сформулирована четко: Объединение признает существующее законодательство, а значит, и статус-кво государственных (межреспубликанских) границ. И хоть мы выступаем за самое тесное этнокультурное единение и экономическое сотрудничество всех частей края, в то же время считаем, что каждая его часть вопросы административно-государственного устройства должна решать в контексте той республики, в которую она входит. Главное — народ Етвязи должен быть самим собой, а не бесправным дополнением какого-либо другого народа. Нет нужды в доказательствах: полешуки истосковались по возможности быть хозяевами своей земли. А ведь за пятьдесят лет Совет-

ской власти на Брестчине еще никогда первым лицом в области не был полешук...

— *Выходит, ты не случайно решил поменять Минск на Брест?*

— Конечно же, серьезно заниматься полесскими делами можно лишь только на месте. Но раньше это не получалось. Во-первых, объединение не имело юридических прав со всеми вытекающими отсюда сложностями материально-правового порядка. Во-вторых, прежде в условиях жесткой централизации, завязать наше дело можно было только в центре, на минской улице Карла Маркса, в доме номер 38... А брестские власти в идеологическом плане — типичные марионетки, абсолютно ничего не решающие. Сейчас на дворе иные времена, к тому же сделан основательный задел для настоящего разворота.

— *Хорошо: развернетесь вы уже завтра — ну, а когда рассчитываете увидеть свет в конце туннеля?*

— Точность временная — дело сложное. Но главное, я убежден в успехе. Подавляющее большинство наблюдающих за нами полешуков в самом начале пути не верило даже в то, что мы сумеем достичь сегодняшнего своего уровня. Но вопреки всему мы стали на ноги. Идем. И придем к тому, что Полесье получит статус самостоятельного формирования совместно с белорусами — речь идет о варианте Белорусско-Полесской республики. Если же белорусы окажутся не готовыми к разделу политической власти, то БССР сегодняшняя может быть расчленена на три части: Полесье отойдет к Украине, а Западная Белоруссия к Польше. А что тогда останется? И это вполне реально, поумерь, пожалуйста, свой скептицизм: об этом говорят знаки Неба, итоги медитации, мистические правила. Так что все сейчас зависит от мудрости пришедших лидеров. Шанс *«шчырых»* белорусов — только в конфедерации или федерации с полешуками, при учете интересов всех нацменьшинств БССР.

— *Сильно сказано!*

— Не ерничай: у них порой нет силы руководить даже самими собой, а не то что Полесьем... Политику должны делать люди, понимающие что-то не только в проявленном мире, но и в том, который спрятан. К сожалению, многие из тех, и кто ведет КПБ, и кто возглавляет БНФ, недостаточно это понимают. И пока они не позовут к руководству или соруководству людей типа Алеся Рязанова, то будут стоять в тупике, никуда не сдвинутся.

*— Наш разговор завершается на ноте некоей безысходности, неопределенности. Попробуй разогнать туман?*

— Ну, почему же так? Я говорю о вещах, где совмещаются все планы — и мистические, и астральные, и чисто ментальные... Мы должны придти к пониманию многомерности общества, нам пора стать на ноги, а не ходить вниз головой. Пока в обществе не установится вертикальная иерархичность, мы как раз и будем в том тупике безысходности, о котором ты говоришь.

Я вижу: полесская идея, полесский народ и его культура возникают не просто для каких-то обычных политико-экономических вопросов; это явление глубинного духовно-культурного плана. Пойми: в свое время ятвяги были людьми-мистиками, жрецами зороастризма...

*— Хочешь сказать, что речь идет о своего рода космическом знаке всем нам, а не только Берестейско-Пинско-Лельчицкому и Луцко-Ровенско-Коростенскому регионам?*

— Да, утверждаю. Но для осмысления этого нужна специальная подготовка. Пока у массы ее нет, пользуясь случаем, хочу сказать о земном.

Братья-белорусы! Духовно-культурному возрождению непосредственно Белоруссии Полесье не дает ровным счетом ни-че-го! Гляньте: мы подарили вам минимум писателей. И то — Алесь Каско с белорусской зоны, у Миколы Прокоповича отец белорус, переехавший, как и мать Алеся Рязанова, как и родители Раисы Боровиковой — они из Могилевщины, а Владимир Колесник сам родом с Гродненщины, ну, а Анатолий Козлович пишет на русском — все! Единственный — мой дядька, полешук Микола Федюкович... Не обогащается белорусская культура Полесьем, потому что силы не вливаются, а у себя они как в болоте чахнут — нет условий для развития. Неужели это доставляет удовольствие?

Вывод: пора на деле предоставить доминирующую функцию культуре и духовности, тем людям, которые несут в себе оба начала,— тогда только у нас появится шанс. Коли же случится, что во главе останутся проповедники прежде всего политических и экономических идей, то перспективы явно неоптимистические.

*Ноябрь, 1990*

# УЛАДЗІМІР АРЛОЎ

## Я нарадзіўся ў год смерці Сталіна



Я нарадзіўся ў год Змяі паводле ўсходняга календара і ў год смерці Сталіна — паводле савецкага. Мой дзень нараджэння ў жніўні, значыцца, у сакавіку, калі вялікі правадыр народаў нарэшце выправіўся на той свет, я ўжо існаваў, але мог не нарадзіцца, бо пасля радыёпаведамлення мама пачулася зусім блага і надоўга трапіла ў бальніцу. Але тым разам савецкая медыцына перамагла (нашы савецкія хворыя — самыя здаровыя ў свеце!), і, перачакаўшы, відаць, непамысныя для мяне дні задыякальнага знаку Льва, я шчасна нарадзіўся на трэці дзень Паненкі. Здарылася гэта ў Полацку. Радзільны дом быў тады на Верхнім замку, за нейкую сотню крокаў ад нашай Сафіі. Такім чынам, першае, што я, немаўлёнак, убачыў у вакне, былі званіцы Сафійскага сабора. Можа, якраз таму паступіў на гістфак БДУ.

Жонка — аднакурсніца, двое сыноў — Раман і Багдан. Старэйшаму летась прапанавалі ўжо ўступаць у камсамол, але ён не даў і, думаю, ніколі не дасць згоды.

Пасля універсітэта настаўнічаў, быў намеснікам рэдактара наваполацкай гарадской газеты «Химик», потым пару гадоў — на «вольным» пісьменніцкім хлебе. Цяпер працую рэдактарам у выдавецтве «Мастацкая літаратура», апякуюся новай серыяй «Літаратурныя помнікі Беларусі». Гэта — жыцці і хаджэнні, летапісы і хронікі, дыярыушы і сярэднявечныя мемуары. Выдаў дзве кнігі прозы на беларускай мове — «Добры дзень, мая шыпшына» і «Дзень, калі ўпала страла», навукова-папулярную кніжку «Асветніца з роду Ўсяслава» пра Ефрасінню Полацкую, у «Молодой гвардии» выйшаў зборнік «Пока не погасла свеча». На падыходзе кніжка вершаў у прозе. Пра іншае пакуль не варта гаварыць.

Ты спытаўся пра пашпартныя даныя, дык у маім «сярпастым, малаткастым» да самага нядаўняга часу не было штампа аб прапісцы. Паўтара года я меў, па сутнасці, статус бомжа. Пасля запрашэння на працу ў Менск выпісаўся з Наваполацка, а тут улады «усынавіць» не спяшаліся, былі на тое свае прычыны...

— *Пра іх пазней, добра? Давай вернемся на берагі Дзвіны, да вытокаў твайго знаёмства з музай Кліо.*

— Мне ўяўляецца, што ў такіх гарадах, як Полацк, штосьці адметнае прысутнічае ўжо ў самой атмасферы, своеасабліва ўплываючы на людзей. Я ўдзячны лёсу, што маё дзяцінства прайшло менавіта там. Хіба можна забыцца пра пошукі падземных хадоў — лёхаў, якія, паводле падання, некалі вялі на другі бок Дзвіны з Сафійкі і іншых полацкіх сабораў. Памятаю манашак. З зачыненага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра іх перасялілі ў Жыровіцы, але некалькі адмовіліся і яшчэ доўга заставаліся ў Полацку, уражваючы нас, малых, таямніцай свайго жыцця. Гэтаксама ўражвала святая крыніца ля Сафіі, высока над Дзвіною. А хіба можна забыцца пра зруйнаванне Мікалаеўскага сабора — тое здарылася на нашых дзіцячых вачах. Было такое пачуццё горычы, быццам мы ўжо ўсведамлялі, што адбываецца злачынства. Нават дзіця не магло ўзяць у розум: навошта руйнаваць даўніну? Гледзячы, як цэлы год завіхаліся там салдацікі з ламамі, мы дадумаліся да ісціны: памыляюцца, аказваецца, і дарослыя, не ва ўсім можна ім верыць!

У першы клас я пайшоў у 1960 годзе, калі да абя-

цанага Хрушчовым камунізму заставалася ўсяго дваццаць гадоў і ў сталоўках ужо можна было задарма пад'есці хлеба з гарчыцаю або з соллю. Здаецца, якраз тады ў горадзе зачынілі — вядома, па просьбах бацькоў і наогул усіх працоўных — апошнюю беларускую школу. Заканчваць дзесяцігодку давялося ўжо ў Наваполацку. Там у мяне з'явіліся сябры, з якімі не губляю сувязі і сёння: Вінцэсь Мудроў, Валерый Шлыкаў...

У семдзесят першым годзе яны, тады — студэнты Наваполацкага політэхнічнага інстытута, пачалі выпускаць рукапісны альманах «Блакітны ліхтар». У прынцыпе ён быў бяскрыўдны, але пераважна беларускамоўны. І ў гэтым ужо хавалася крамола. Пад уплывам гэтай спробы самвыдату (а выйшла нямала — 15 нумароў!) мы з сябрамі пачалі выпускаць у нас на гістарычным факультэце часопіс «Мілавіца». Мілавіцай у народзе называюць зорку Венеру.

*— «Зорка Венера»... Назва вельмі добрая для выдання паэтычнага, філфакаўскага, а да вашага, «герадотаўскага», неяк не клеіцца. Розум «правільны» выбраў бы нешта «ізмавае». А так — ерась ужо з вокладкі...*

— Да таго ж зноў «ерась» беларускамоўная. У той час роднае слова ў «Беларускім» дзяржаўным універсітэце ліпела толькі ў пакінутай яму рэзервацыі — на філфаку. Карацей, давялося пазнаёміцца з супрацоўнікамі Камітэта дзяржбяспекі — як жа, палітычныя злачынцы пад самым бокам беларускага ўрада! Было тое ў росквіт застою, студэнцтва маё пачалося ў стогадовы юбілей Ільіча Першага. Факультэцкі рэй вёў тады славуты Лаўрэнцій Абэцэдарскі.

*— На нашым журфаку дасціпна абыгрывалася яго імя — казалі, што гэты Лаўрэнцій — Цанава беларускай гісторыі. Афарызм як прыгавор. Справядлівы? Хлуслівы?*

— Асоба тагачаснага афіцыйнага герадота нумар адзін вартая аднаго абзаца. Неяк мы з Лаўрэнціем Сямёнавічам засталіся сам-насам на цэлыя паўтары гадзіны — зламаўся ліфт галоўнага корпуса. Інфантыльны дваццацігадовы бэйбус, я не ацаніў гістарычнасці тых хвілін і ўвесь той ліфтавы час дэманстратыўна чытаў Рэя Брэдберы. Франдзіраваў... Напярэдадні здаваў так званы ленінскі залік па XXIV з'езду КПСС і ледзь не да сівізны ўразіў шаноўную камісію сваімі неартадаксальнымі сімпатыямі да заходніх фантастаў, атрымаўшы ў выніку настойлівую параду *«непременно подписаться на журналы «Комсо-*

*мольская жизнь» и «Молодой коммунист»...* Карацей, франдзёрства падвяло. А якое інтэрв'ю для беларускай гісторыі мог бы ўзяць у аднаго з яе найбуйнейшых фальсіфікатараў!

— *Ну, нейкія заслугі ў Абэцэдарскага, напэўна, усё ж былі?*

— Гэта гледзячы перад кім. Пяру Абэцэдарскага належаць толькі тры працы, прысвечаныя дачыненням Беларусі і Расіі ў XVI—XVII стст., якія можна аднесці да навуковых. Тут можна знайсці даволі багатыя фактычныя звесткі. Добра паказана, скажам, як шмат зрабілі ў Масковіі беларускія перасяленцы — друкары, збройнікі, кафляры-цаніннікі, разьбяры, аднак аўтар зазвычай лічыць лішнім паказаць, што амаль заўсёды яны траплялі туды зусім не па сваёй волі, а прыкладна так, як 11 060 сялян, якіх пагналі зімовымі дарогамі на ўсход пасля крывавай разні ў захопленым Іванам Грозным Полацку.

— *А як вы ставіліся да лекцый Абэцэдарскага?*

— «Ставіліся»... Яго брашуру з непісьменнай назвай «У святле неабвержных фактаў» нас змушалі зубрыць літаральна нароўні з творамі класікаў. І што вынікала з той «працы»? Даводзілася, нібыта да ўтварэння БССР беларусы не мелі сваёй дзяржаўнасці. Што датычыць Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, дык прафесар БДУ і членкор Акадэміі педнавук краіны далучаўся да польскіх і літоўскіх нацыяналістычных гісторыкаў, якія прыніжалі годнасць нашага народа менавіта катэгарычным адмаўленнем беларусам у правах на сваю «долю» той дзяржаўнасці. Між тым добра вядома: Маркс і Энгельс глядзелі на Вялікае княства як на славянскую дзяржаву, беларусаў лічылі самастойным народам, падкрэсліваючы такую важную асаблівасць яго фармавання, як адсутнасць 250-гадовага татара-мангольскага прыгнёту. Энгельс у «Знешняй палітыцы рускага царызму» піша пра падступнасць расійскага ўраду, які зусім не збіраўся вызваляць беларускага селяніна, а Лаўрэнцій Сямёнавіч гне сваё — маўляў, «уз'яднанне» Беларусі з імперыяй-жандарам Еўропы мела выключна станоўчыя вынікі. Па-першае, не было ніякага ўз'яднання, бо раней Беларусь у склад Расійскай імперыі ніколі не ўваходзіла (вядома, калі не лічыць часовых захопаў у час войнаў з усходнім суседам, якія звычайна суправаджаліся зверствамі акупантаў і масавымі дэпартацыямі беларусаў углыб Маскоўскай дзяржавы). Было гвалтоўнае далучэнне з адпаведнай палітыкай на

захопленых землях. Узмацніўся феадальны ўціск сялян. Пачаліся рэкруцкія наборы, якіх Беларусь ніколі не ведала, бо войска ў Вялікім княстве Літоўскім было прафесійнае. Дзяржаўныя падаткі ў далучаных губернях збіралі выключна ў звонкай манеце, а курс срэбных грошай у параўнанні з асігнацыямі быў 22:100. Герцэнаўскі «Колокол» паведамляў, як абсалютную большасць беларусаў пад прымусам, з крывёю пераганялі з уніі ў праваслаўе. А Лаўрэнцій Сямёнавіч даводзіць сваё: быў знішчаны рэлігійны прыгнёт!

Вось яна, «гісторыя» паводле Абэцэдарскага, у якой факты падагнаныя пад заказаную канцэпцыю. Заказаную тымі, хто пры ўладзе. Дзеля ўмацавання імперскай палітыкі развівалася, заахвочвалася і імперскае мысленне з адпаведным падыходам да гістарычных з'яў — адсюль уся знешняя палітыка рускага царызму падаецца выключна прагрэсіўнай, бессаромныя захопы называюцца «ўз'яднаннямі» ці «добраахвотнымі ўваходжаннямі», праваслаўе ўзнімаецца на недасягальную вышыню і перад рымска-каталіцкай царквой, і перад уніяцтвам, ды любымі іншымі канфесіямі... Заказчыкі і афарміцелі такіх «канцэпцый» пры ўсім гэтым называюць сябе марксістамі, бессаромна маніпулюючы працамі саміх асноватворцаў «навуковага камунізму».

У падобным духу вытрыманы і народжаны пад кіраўніцтвам і з удзелам Абэцэдарскага школьны падручнік па гісторыі БССР, па якім да 1989 года вучыліся нашы дзеці.

— *Той самы, які быў ахрышчаны дапаможнікам па антыпатрыятызму?*

— Гэта словы шаноўнага Уладзіміра Максімавіча Дамашэвіча, сказаныя на адным з нашых пісьменніцкіх з'ездаў. А хіба не так? Аўтары падручніка не нагадваюць першых летапісных звестак пра гарады з тысячагадовай біяграфіяй, забываюцца пра даты Грунвальдскае бітвы, паўстання Тадэвуша Касцюшкі. На перыяд пасля 1917 года ў храналагічнай табліцы 33 даты, на папярэднія дзесяць стагоддзяў — 27... Ані слова пра Рагнеду і Рагвалода, Ефрасінню Полацкую і Давыда Гарадзенскага, пра Вітаўта Вялікага і Міколу Гусоўскага, пра Льва Сапегу, Антона Трусава, Івана Луцкевіча... Затое — замілаванне «бліскучым росквітам культуры беларускага народа» ў трыццатых, сталінскія жорны якіх вынішчылі каля двух мільёнаў беларусаў і ці не ўсю інтэлігенцыю. Дзеля

лагічнага канца аўтарскаму калектыву падручніка заставалася хіба што змясціць партрэт усмешлівага крамлёўскага горца.

— *Але ж, акрамя Лаўрэнція Сямёнавіча з яго школай, у гістарычнай навуцы была і другая плынь.*

— Так, была. Нягледзячы на ўсе перашкоды. У 1950-м, калі Абэцэдарскі ўжо загадваў кафедрай, наш выдатны гісторык Мікалай Мікалаевіч Улашчык па трэцяму разу сядзеў за лагерным дротам. Яшчэ праз чвэрць стагоддзя ў Інстытуце гісторыі АН БССР цкавалі Міколу Іванавіча Ермаловіча. Бліжэй да нашага часу рыцары застою ідэалагічнымі дзідамі спынялі братоў Анатоля і Валянціна Грыцкевічаў, Міхася Ткачова, Генадзя Каханоўскага, іншых, хто імкнуўся аднавіць гістарычную праўду.

— *Я тут нагадаў сваё студэнцтва: прафесар Жмуроўскі, які літаральна заходзіўся ад прозвішчаў Зіноўева, Рыкава, Пятакова, Бухарына, не кажучы пра Троцкага, мог даравадь амаль любы грэх няведання, акрамя аднаго — у чым адметнасць ленінскай скульптуры перад Домам ураду...*

— Гэта ж ад нашага Лаўрэнція Сямёнавіча пайшло! «Выдатнага вучонага, педагога і грамадскага дзеяча» — так было сказана ў некралогу, надрукаваным усімі галоўнымі газетамі рэспублікі і падпісаным на самым высокім узроўні. *«Какую руку Ленин поднял на памятнике у Дома правительства?»* — кароннае пытанне Абэцэдарскага, якое магло на заліку ці на экзамене вырашыць лёс студэнцкай стыпендыі.

— *Мо хопіць пра нашых настаўнікаў? Раней я перапыніў цябе на ўспаміне аб наваполацкіх сябрах. Раскажы, калі ласка, пра вашу суполку, пра яе столькі казалі і пісалі...*

— Можа так размясціліся сузор'і на небе, можа ёсць якая іншая прычына, але сапраўды ў літаратурным аб'яднанні «Крыніцы» пры нашай гарадской газеце сабраліся тады вельмі цікавыя людзі. У той задушлівай атмасферы гэта быў нейкі астравок волі і надзеі. Аднак і там наш шчыры абмен думкамі пачаў кантралявацца. Калі тры гады назад аднаго з сяброў аб'яднання выклікалі на чарговую размову ў КДБ, перад *«товарищем майором»* ляжала поўная стэнаграма аднаго з паседжанняў. Зазіраючы туды, чэкіст удакладняў, хто што гаварыў, якія песні спяваў Сяржук Сокалаў... Відаць, у рэдакцыйным кабінеце, дзе мы збіраліся, быў зусім не анекдатычны мікрафон.

(Памятаеце: *«Товарищ майор, организуйте чайку»)*.

Але ўвогуле ў той час — гэта канец 70-х — першая палова 80-х гадоў — нам удавалася надрукаваць такое, што, відаць, нідзе больш на Беларусі не выходзіла. Не апошнюю ролю адыгрываў тут рэдактар наваполацкага «Химика» Уладзімір Трафімавіч Сімураў. Ён хоць і быў прадстаўніком той, старой генерацыі, але мог зразумець нашы доказы і пайсці на ўступкі. У выніку нам, часам змяніўшы нейкую назву, радок або павесіўшы хітрае прысячэнне, удавалася друкаваць некаторыя вершы Сокалава, якія на той час лічыліся абсалютна недрукабельнымі. Сярод іх, скажам, цяпер шырока вядомая нізка гістарычных балад Сокалава-Воюша «Песні касінераў», прысвечаныя паўстанцам 1863 года. Мне ў гэтай нізцы найбольш да душы своеасаблівыя, вельмі актуалізаваныя маналогі Багушэвіча, Каліноўскага і нават... паўстанцкага каня. Пакладзеныя на музыку, многія з іх сталі цудоўнымі песнямі. Памятаеш прыпеў:

Цок-цок, цок-цок,
Вершнікі на конях,
Цок-цок, цок-цок,
Ты зважай, народ,
Цок-цок, цок-цок,
І штандар з Пагоняй.
Цок-цок-цок,
Кліча у паход.

— *Пагоня ж тады ўвогуле была крамолай...*

— А ў нас прайшла! Як прайшоў, напрыклад, і верш «Воля і Пятля» з такімі вось радкамі:

Што ж яны блукаюць, што на сэрцы маюць?
Недзе там у пушчах, аж займае дых,
Маладыя хлопцы Вольніцу шукаюць,
А Пятля шукае хлопцаў маладых...

Але гэта ўжо другая палова васьмідзесятых. А з канца сямідзесятых успамінаю адну абласную журналісцкую «лятучку», на якой адказны таварыш з Мінска учыніў нашай рэдакцыі разнос за безыдэйнасць літстаронак, у прыватнасці за апавяданне тагачаснага старшыні «Крыніц» Юрася Касцюка. Тое вясёлае апавяданне называлася «Секунцы», а правобразам галоўнага персанажа быў, між іншым, Абэцэдарскі. Найбольшае ж раздражненне ў сталічнага аглядальніка выклікала тое, што і «Секунцы» і іншая «безыдэйшчына» з'явілася ў газеце акурат у дзень прыняцця брэжнеўскай канстытуцыі.

Цікавы факт: час ад часу ў рэдакцыю прыходзілі з дзяржаўнай рэспубліканскай бібліятэкі паведамленні, што ў іхняй падшыўцы не хапае нейкіх нумароў «Химика», таму, маўляў, дашліце прапаўшыя экземпляры да камплекта. Я аднойчы праверыў, якія ж нумары зніклі, і высветлілася, што якраз тыя, з літаратурнымі старонкамі. Значыць, хтосьці з маладой адраджэнскай плыні наўмысна арганізоўваў у «ленінцы» дыверсіі дзеля таго, каб мець пад рукой тыя вольналюбівыя радкі.

— *Вы абмежаваліся выключна літаратурнымі атакамі?*

— Чаму ж, спрабавалі нешта зрабіць і публіцыстычным словам. Скажам, у час абмеркавання Закона пра школьную рэформу здолелі надрукаваць артыкул пад загалоўкам «Вызваленне. Ад чаго?» пра становішча беларускай мовы ў школе і ў грамадстве. У параўнанні з сённяшнімі артыкуламі на гэту тэму ён выглядае, вядома, абачліва-нясмелым, але праблема была акрэслена на той час вельмі востра. Да таго ж падрыхтавалі падборку водгукаў. Рэдактар адзначыў артыкул дваццаціпяцірублёвай прэміяй за лепшы матэрыял месяца, а літаральна назаўтра — званок з сектара друку ЦК КПБ. Цэкоўскі інструктар Крукоўскі паведаміў, што ў час абмеркавання публікацыі ў высокіх кабінетах адзначылі нацыяналістычную накіраванасць і г. д. Рэдактару, які, вядома, атрымаў раскрутку, нічога не заставалася, як прыняць адпаведныя захады. «Зляцеў», нават не трапіўшы на газетную паласу, артыкул Вінцука Вячоркі пра бардаўскую творчасць Сержука Сокалава. Цікава, што гэты артыкул быў дасланы асабіста мне, але рэдактару было пра яго аднекуль вядома. Зрэшты, неўзабаве дзякуючы Сяргею Навумчыку, гэты матэрыял выйшаў у «Віцебскім рабочым». Праўда, тэлефонныя размовы бясконца праслухоўваліся, пошта праглядалася, а таму рабіліся пэўныя захады на блакіроўку артыкула і там. Але час ужо пачынаў мяняцца...

Між іншым, мы друкавалі некаторыя «сумніцельныя» творы не толькі навапалачан. Сярод аўтараў літстаронак «Химика» былі скажам, мінчукі Адам Глобус, Уладзімір Сцяпан, Юры Кісялеўскі з Гародні.

— *Прозвішчы вядомыя. А хто стаў на крыло непасрэдна ў Наваполацку, у родных пенатах?*

— У Саюз пісьменнікаў за апошнія гады былі прыняты Ірына Жарнасек, Міхась Барэйша, Навум Гальпяровіч, Лявон Баршчэўскі, Сяржук Сокалаў-Воюш, Алег Мінкін,

які пачынаў у нас, а потым пераехаў у Бярэсце. На падыходзе — Якуб Лапатка, дарэчы адзіны ў рэспубліцы перакладчык з фінскай, Алесь Аркуш, Вінцэсь Мудроў... А за імі — вядомыя ўжо па публікацыях у калектыўных зборніках Павел Бурдыка, Лера Сом... Згадзіцеся, з'ява унікальная, каб у адным горадзе знайшлося столькі здольных літаратараў. Такое не ў кожнай вобласці сустрэнеш.

— *Гэта выдатна. Але ўяўляю, як пакутаваў ад такога сузор'я талентаў ваш бедны рэдактар...*

— Час ад часу ён заходзіў да мяне ў кабінет і казаў: *«Старик, дай-ка мне папку с твоими «Крыніцамі», посмотрю, что у вас там делается».* Ужо навучаны жыццём, я працягваў шэфу адну папку, так бы мовіць, узорна-паказальную, і падалей ад граха хаваў другую — «крамольную». Кабінеты нашы былі адзін насупраць другога, я прачыняў за шэфам дзверы і бачыў, як праз колькі хвілін ад яго выходзіў чалавек у цывільным з дыпламатам, у якім ехала на агледзіны ўзорна-паказальная папка.

Зрэшты, я разумеў становішча, у якім апынуўся Уладзімір Трафімавіч, бо няраз ён атрымліваў за нас добрых ідэалагічных кухталёў. Мне здаецца, яму нават падабалася быць крыху іншадумцам.

— *«Крыху іншадумцамі» лічаць сябе вельмі і вельмі многія. Такая гульня з самім жа сабой, блізка знаёмымі прыемна казыча нервы, хоць небяспека не пагражае не тое, каб галаве «вальнадумца», а нават ніводнай валасінцы на ёй... Куды менш проста іншадумцаў.*

— Слушна, але ў дадзенай сітуацыі такая пазіцыя рэдактара нам была вельмі дарэчы. Думаю, што яго імя можа застацца ў гісторыі нашай культуры якраз дзякуючы «Крыніцам». У кожнага з тых, чые імёны я называў вышэй, ёсць на Уладзіміра Трафімавіча свае крыўды, але ўдзячнасці, думаю, усё ж болей.

— *Сімурава, між іншым, шчыра паважалі ў журналісцкім асяроддзі за рэдактарскую смеласць. Ну, а табе, намесніку, зусім не даставалася за газетную і асабістую вольніцу?*

— Вось адзін толькі выпадак. У 84-м годзе ў Маскве была Усесаюзная нарада маладых пісьменнікаў. Запрасілі і мяне. Тэрмінова пераклаў для абмеркавання сотню старонак, а за дзень да выезду прыйшла тэлеграма з Мінска: «Ваша месца ў беларускай дэлегацыі скарочана». Званю ў СП Чыгрынаву, які тады кіраваў «літаратурнай моладдзю». Той на сваім заўсёдным «двухмоўі» кажа: «Будзеш у нас, дарагой, пагаворым, ты не валнуйся». Прыехаў

неўзабаве ў Мінск. Адзін старэйшы таварыш па пяру мяне, як кажуць, ва ўпор не пазнаў. Другі, маладзейшы, пацікавіўся, ці праўда, што на мяне завялі крымінальную справу. Заходжу да Івана Гаўрылавіча. «Пішы,— кажа,— спачатку заяву: Прашу аказаць мне матэрыяльную дапамогу ў суме 150 рублёў».— «Дзякуй, да такога яшчэ не дайшоў. Лепей давайце пра справу. Чаму ў Маскву не пусцілі?» — «А ў цябе, дарагой, барада крыху не такая — Маскве такі колер не падабаецца»...

Потым абазнаныя людзі мне растлумачылі, што прычына была ў маёй блізкасці да Ларысы Антонаўны Геніюш, на пахаванні якой давялося выступіць. За гэта і адпомсцілі такім вось чынам, каб ведаў, як сябраваць з «нацыяналісткай»... Да таго ж і сам мог у Маскве ляпнуць штонебудзь нацыяналістычнае пра наш небывалы росквіт...

— *Між іншым, якраз у гэтыя дні Ларысе Антонаўне споўнілася б восемдзесят гадоў. Якой яна была?*

— Нязломнай. Мы яе называлі — і з любасцю і трохі дзеля канспірацыі — Бабуляй. Стол для чаканых і нечаканых гасцей быў заўсёды шчодры — па-беларуску. Аднак не паспееш як след павітацца, а ў дзвярах — увішная медсястрычка. Маўляў, трэба ўколы рабіць. І марна тады чакалі яе дапамогі іншыя зэльвенскія хворыя — разумела жанчынка, які адказны ўчастак работы далі ёй «таварышы». (Дарэчы, дэфіцытная какарбаксілаза, якую я неяк паслаў Ларысе Антонаўне па пошце, ішла з Наваполацка ў Зэльву амаль два месяцы). А Бабуля падыме кілішак са сваім улюбёным цытрынавым лікёрам і, звяртаючыся да электраразеткі, скажа: *«Выпьем за нашего дорогого Леонида Ильича!»*

Як ні імкнуліся яе запалохаць, схіліць да прыняцця савецкага падданства, яна ўпарта стаяла на сваім — «хачу заставацца грамадзянкаю Беларускае Народнае Рэспублікі». Ва ўспамінах у яе ёсць горкае прызнанне: «Ні адзін народ так не прыніжаў сваіх паэтаў, сваіх жанчын»...

У любой, сапраўды дэмакратычнай, культурнай краіне развітанне з паэтам такога выдатнага таленту сталася б днямі народнага смутку. А ў нас, на Беларусі, абсалютная большасць насельніцтва анічога не ведала ні пра паэтку, ні тым больш пра яе смерць. Што датычыць інтэлігенцыі, дык у тыя выхадныя красавіцкія дні семдзесят трэцяга на адных раптам навалiліся хваробы, а іншых чамусьці менавіта тады накіравалі ў неадкладныя камандзіроўкі... На хаўтуры прыехала няшмат: Зянон Пазьняк, Данута

Бічэль, Адам Мальдзіс, мастак Яўген Кулік, гісторык Міхась Чарняўскі, інжынер Вінцэсь Мудроў, археолагі Ігар Чарняўскі і Валерый Шаблюк, некалькі былых лагернікаў... Няхай выбачаюць тыя, каго не ўспомніў. Мясцовыя «таварышы» ўсё намагаліся везці труну і вялікі драўляны крыж да могілкаў на машыне, але мы катэгарычна адмовіліся. Увесь няблізкі шлях да зэльвенскіх кладоў труну неслі на руках. Следам ішла ўся Зэльва. Бел-чырвона-белых сцягоў не было. Да іх мы тады яшчэ не дараслі.

— *Але вернемся ў Наваполацк, у пачатак 80-х. На каго вы рабілі стаўку, шукаючы аднадумцаў?*

— На моладзь, зразумела. У літаб'яднання было шмат сустрэч у наваполацкіх і полацкіх школах, тэхнікумах, музычным і педагагічным вучылішчах, у Наваполацкім політэхнічным інстытуце, на прадпрыемствах. Акрамя чыста літаратурных сустрэч, наладжвалі вечарыны, прысвечаныя, напрыклад Францішку Скарыне, Уладзіміру Караткевічу, Васілю Быкаву... З ініцыятывы «крынічанаў» узнік гарадскі клуб творчай моладзі «Маладзік». Праўда, у хуткім часе ўкаранёныя туды людзі пачалі імкнуцца звесці нашыя сустрэчы ледзьве не да нейкіх інструктажаў. Памятаю, аднойчы наваполацкі мастак Уладзімір Шапо чытаў нам лекцыю пра японскае мастацтва. Прысутны інструктар гаркама КПБ падвёў вынікі: *«Искусство должно принадлежать народу»*. Урэшце «Маладзік» разваліўся, але зрабіў сваю справу — пераznаёміў маладых інтэлігентаў, што прадстаўлялі даволі шырокі сацыяльны зрэз Наваполацка. Потым мастакі, архітэктары, музыкі з рок-гуртаў прыходзілі на пасяджэнні літаб'яднання, якія часам больш нагадвалі дыскусіі сучаснага палітклуба.

Між іншым, філолагі сярод наваполацкіх літаратараў заўсёды складалі меншасць. Па-беларуску пісалі не толькі гуманітарыі, але і «тэхнары». Мы бачылі ў гэтым прыкметы нацыянальнага адраджэння. А наогул наша тагачаснае асяроддзе, безумоўна, выйшла за межы чыста літаратурнага.

— *Відаць, менавіта на яго аснове ўжо ў гэтым, 90-м годзе, Сяржук Сокалаў-Воюш стварыў Партыю незалежнасці Беларусі?*

— Не зусім так. Поле ідэй і ідэалаў яе лідэра аказалася прыцягальным для розных людзей. Калі не памыляюся, ці не большасць у гэтай, праўда, пакуль што нешматлікай партыі — рабочыя. На рахунку ПНБ ёсць першыя акцыі. Яе кіраўніка і некалькі ягоных паплечнікаў ужо дастаўлялі ў полацкую міліцыю... Пасля пікетавання з пратэстамі

супраць забароны нацыянальнай сімволікі. На леташнюю кастрычніцкую дэманстрацыю ў Наваполацку чалавек дваццаць выйшлі з бел-чырвона-белымі сцягамі, і ўлады паспрабавалі прыцягнуць «злачынцаў» да адказнасці. Больш пільных клопатаў, вядома, не было, усё астатняе для народа ўжо зроблена.

*— Зноўку вярнуся да Сокалава: у яго ёсць дзве вельмі добрыя дасціпныя песні пра тое, як у Наваполацку ствараліся першыя беларускамоўныя класы...*

— Першая і няўдалая спроба датуецца 86-м годам. Тады якраз павінен быў ісці ў першы клас Сержукоў сын Стась. Бацька першага верасня нікуды яго не пусціў — у Наваполацку, як і ва ўсіх іншых гарадах Беларусі (апрача Мінска, дзе некалькі дзесяткаў дзяцей ужо вучыліся на роднай мове), не было ніводнай школы з навучаннем па-беларуску. І Стась мусіў вярнуцца ў дзіцячы сад. Выхавальніца пытаецца: «Што ж ты зноў да нас, Стасік?» — «Бацька сказаў: пакуль не будзе беларускага класа, буду хадзіць у садок».— «Ну, Стась, будзеш ты хадзіць у садок да сівой барады...» Але ў наступным годзе адчыніць першы такі клас нам усё ж удалося. Туды і пайшоў Стась. А праз год, у другі,— мой малодшы сын, Багдан.

Нас, тых, хто збіраў заявы на гэтыя класы, найбольш прыхільна сустракалі звычайна не ў беларускіх сем'ях. Адгукнуліся рускія, украінцы, нават казахі, фіны. А самымі зацятымі праціўнікамі беларушчыны былі ўчарашнія тутэйшыя вяскоўцы, якія ледзьве паспелі прапісацца ў горадзе. Такі вось своеасаблівы ўзровень мыслення, што грунтуецца на комплексе нацыянальнай непаўнацэннасці. Гэтыя людзі інстынктыўна імкнуліся абараніць сваіх дзяцей ад сваёй жа ўласнай бяды — няведання ні беларускай, ні рускай моваў, ад чаго яны пакутавалі. Не было і веры, што нашыя спробы знойдуць падтрымку на дзяржаўным узроўні, што гэта дасць дзецям у будучым нейкія выгоды, перавагі. Так што першыя тыя класы ўзніклі пераважна на голым энтузіязме і рыцарскім бацькоў. А хацелася — каб на свядомасці...

*— Ну, а пазіцыя самой школы, педагогаў: падтрымлівалі, дапамагалі, або тармазілі, заміналі?*

— Усяго было намяшана. Напачатку заявы бацькоў усё губляліся. Скажам, назбіралі дваццаць заяў, прынеслі ў школу, а праз месяц — ніводнай няма. Але лёд кранууся. Летась 9-я наваполацкая школа набрала ўжо другую беларускую паралель. Праўда, і сябрам літаб'яднання, і людзям з БНФ давялося зноў хадзіць у гэтым мікрараёне па кватэ-

рах. Ну, а ў тую, дзе калісьці пачыналі вучыцца нашыя з Сержуком сыны, бацькі ўжо неслі заявы самахоць. Машынка, як бачыш, запрацавала. Летась, залетась яшчэ наладжвалі Каляды для вучняў, што вучыліся на роднай мове. Да кожнага прыходзіў дахаты з падарункамі Калядны Дзед, Каза... Цяпер абысці ўсіх проста немагчыма.

— *Мы столькі гаворым пра школьныя справы, што мне грэх не спытацца: а як паўплывала школа на цябе самога? Ну, напрыклад, такія кананізаваныя Міністэрствам асветы і агітпропам ЦК героі, як Паўлік Марозаў, Алег Кашавы... або Цімур з класічнага гайдараўскага твора?*

— Мяне заўсёды больш прывабліваў не Цімур, а Мішка Квакін. Імпанаваў мне і Нестар Іванавіч Махно, як мы нядаўна даведаліся, асоба сапраўды гераічная. Думаю, такія мае сімпатыі былі неасэнсаваным пратэстам супраць фальшу, які панаваў наўкола.

— *Памятаю, дарэчы, уласнае ўспрыманне «Маладой гвардыі» — сімпатыі выклікаў якраз небездакорны Сяргей Цюленін.*

— А мяне гэты твор — ну што тут крывіць душой? — пакінуў амаль абыякавым. І ад гэтага я мучыўся: усім як быццам падабаецца, дзяўчаткі ледзьве не ў слёзы: ах, Уля, ах, Алег, а мне... Здавалася, што тут зноў няпраўда. А потым з'явіліся новыя літаратурныя шэдэўры — «Малая зямля», «Цаліна»... Нядаўна пераглядаў старую падшыўку «ЛіМа». Жахнуўся. Таленавітыя, разумныя людзі хвалілі гэтую нікчэмную пісаніну. Ну, можна зразумець, чаму такія захопленыя водгукі з'яўляліся ў 30-я гады. А дзесяць гадоў таму? Можна ж было, урэшце, проста прамаўчаць. Не, спявалі алілуйю! І якія імёны!..

Але я крыху адхіліўся ад тэмы. У старэйшых класах я сур'ёзна захапіўся фантастыкай — Брэдберы, Шэклі, Лем, Азімаў, і ў выніку з цяжкасцю здаў ленінскі залік «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё!»

— *Прапаную ўраўнаважыць фантастычную феерыю справамі больш зямнымі. Хто быў для цябе аўтарытэтам, так сказаць, тутэйшым?*

— У студэнцтве маліўся на Караткевіча. Філасофская думка ў краіне была замарожана, а таму пісьменнікі вымушаны былі браць на сябе і функцыі філосафаў. Нам вельмі імпанавала гуманістычная канцэпцыя твораў Караткевіча. Ён сцвярджаў адвечныя каштоўнасці, а не «ізмы». Ужо потым адкрылі разам з сябрамі Быкава...

— *Ты сказаў: «разам з сябрамі». Назаві каго-небудзь.*

— Генадзь Кулажанка...

— *Вы знаёмыя?! У адным з матэрыялаў пра афганцаў я прыводзіў водгукі баявых афіцэраў пра яго, свайго паплечніка, былога камсамольскага работніка, які прапаў без вестак на той бясслаўнай вайне...*

— Такі вось лёс...

Генадзь не проста падзяляў мой светапогляд. Я ўдзячны яму за тое, што ў нейкім сэнсе ён зрабіў мяне такім, які я ёсць. Менавіта ён даў мне пачытаць «Каласы пад сярпом тваім», першую ў маім жыцці кнігу Караткевіча.

З вуснаў Генадзя я ўпершыню ў жыцці пачуў гарадскую беларускую мову. Гэта ў яго ад бацькі. Калі Салжаніцына прымусова зрабілі «іншаземцам», Уладзімір Андрэевіч сказаў нам: «Ну вось, апошняга сумленнага чалавека выкінулі з краіны».

З Генікам мы стварылі на трэцім курсе нашага гістфака Клуб аматараў піва, што, як пазней стала вядома, стукачы з ліку аднакурснікаў абвясцілі ў сваіх сакрэтных рэляцыях нацыяналістычнаю арганізацыяй. А сакратар партбюро ў часе разбору «справы» глыбакадумна зазначыў: *«В Германии тоже всё начиналось с пива»*. Асаблівае шаленства выклікала ў выкладчыкаў марксізму-ленінізму створанае намі «вучэнне» — піваізм. Генадзю належыць і ідэя стварэння «Мілавіцы».

Аднойчы я думаў пра лёс выдаўцоў «Мілавіцы», пра хлопцаў, што запалілі «Блакітны ліхтар». Жыццё іх, ведаеш, склалася даволі тыпова для нашага грамадства. Нават калі хочаш, і ў тым сэнсе тыпова, што адзін не вярнуўся з Афганістана... Другі з «Блакітнага ліхтара» стаў партыйным работнікам і на падпітку выказаў не так даўно горкае шкадаванне: маўляў, калісьці запэцкаўся, дурань, з тым часопісам, а цяпер — няма ходу. Возьмем трэці лёс. Юнак — нядаўна перачытваў ягоныя студэнцкія вершы — быў, відаць, самы з нас таленавіты. Жыў у студэнцкія гады надгаладзь, паходзіў з вельмі беднай сям'і. І вось, атрымаўшы дыплом, хутка стаў дырэктарам школы і наеўся. Наеўся, разумееш, за ўсё тое нішчымнае студэнцтва. Гадоў колькі ўжо з ім не бачыліся, а днямі завітаў да мяне са сваімі двума дзеткамі. Жонка згатавала полудзень, кліча малых да стала, а яны глядзяць і быццам не чуюць. Я не адразу і даўмеўся, што проста не разумеюць беларускай мовы. А ён жа — дырэктар беларускай школы... І гэта цяпер, калі да роднага слова штурхаюць нават дзяржаўныя структуры. Думаю, што ён ужо даўно нічога не піша...

А некаторым з нас уяўлялася, што, каб нешта зрабіць дзеля свайго народа, трэба заняць пасаду адпаведнага ўзроўню і ўжо там разгарнуцца. Аднак на шляху да гэтай прыступкі...

— *...нешта губляецца.*

— Каб жа «нешта». Сама душа. А часам і жыццё.

— *Сумная, цяжкая тэма. Давай пра што-небудзь лягчэйшае. Самае банальнае: чым ты ганарышся?*

— Знаёмствам, сяброўствам з людзьмі, імёны якіх, на маю думку, назаўсёды застануцца ў гісторыі Беларусі. Не буду канкрэтызаваць.

— *А чаго саромеешся?*

— Болей за ўсё саромеюся, прынамсі на сённяшні дзень, што ў 79-м у маім Наваполацку сядзеў за кратамі беларускі праваабаронца Міхал Ігнатавіч Кукабака, а я нічога не зрабіў і не рабіў, каб хоць неяк яго падтрымаць. Днямі ён быў у мяне дома, доўга размаўлялі. 17 гадоў лагераў, турмаў і псіхушак. Жыве цяпер у Маскве, у гаражы ў знаёмага. Хоча вярнуцца на Бацькаўшчыну, разлічвае на дапамогу народных дэпутатаў ад БНФ. Пакуль што яму крыху паспрыяў «Мартыралог Беларусі». Купілі, напрыклад, друкавальную машынку.

— *Хіба ж ты ведаў тады, у 80-м, пра яго лёс?*

— Хоць цераз глушылкі, але «Свабоду» слухаў і з перадач меў сякое-такое ўяўленне. Між іншым, пад час нашай размовы Міхал Ігнатавіч гаварыў, што наваполацкі перыяд ягонага блукання па пакутах быў самы цяжкі... І нават калі я тады і не ведаў, што Кукабака сядзіць якраз у Наваполацку, мне сорамна зараз за тое сваё няведанне...

— *Ты не горш за мяне разумееш, што гэтыя твае пачуцці для вялізнай колькасці людзей не больш чым фраза. Грамадства літаральна праедзена іржой «дафенізму» — абыякавасцю, дамініруе згубны для сацыяльнага арганізма татальны клопат кожнага выключна пра свой спакой. Адсюль прывычка «не рыпацца», імкненне не высоўвацца, трымацца ў цяню...*

— Многа значыць тут трагічны лёс народа. Маці мая, настаўніца гісторыі, невыпадкова паўтарала: «Трымай, сын, язык за зубамі». А калі я, ужо студэнт, пачынаў разважаць, напрыклад, пра становішча беларускай мовы, мама раіла: «Навяжы язык!» Па вайне яна, закрэсліваючы ў падручніках імёны «ворагаў народа», успамінала і рэпрэсаванага бацьку, але вымушана была маўчаць, бо інакш не закончыла б педінстытут... Іхні калгас быў да вайны нябедны —

на «палачкі» выдавалі нават мёд і алей. А ім, тым, у каго ў родзе былі «ворагі»,— толькі збожжа. Але дзякуй роднай уладзе і за гэта.

Тое пакаленне расло ў дзікіх, нечалавечых умовах. Людское жыццё нічога не каштавала. Відаць, незваротныя страты імі ўспрымаліся зусім не так, як цяпер намі. Панавала антымараль, антыідэалы. Сістэма давяла да таго, што смерць Сталіна аплаквалі нават тыя, хто паводле любой нармальнай логікі павінен быў яго ненавідзець усёй душой... Зрэшты, пра гэта ўжо шмат сказана. Толькі вось ці асэнсавана на ўсю поўніцу? Хіба не жыве і сёння выхаваная тады масавая свядомасць? Хлопчык з нашага двара па-дзіцячы наіўна падзяліўся з маім сынам: *«А мой папа сказал, что всех этих БНФ пора передушить по квартирам. Вот в Китае пару тысяч танками в блин раскатали, зато сейчас порядок и японские телевизоры в магазинах».*

— *Колькі крокаў ад «навязанага языка» да «завязаных вачэй», калі людзі «не бачаць» відавочнага і зноў жа нішчаць сваю духоўную тонкасць?*

— Жыццё ў гэтым тэатры абсурду, прычым жорсткага, бязлітаснага, вымушала насіць пры сабе тыя павязкі і нас, маладзейшых. Асабіста я дастаў яе, калі ўступаў у КПСС. Праўда, я згадваю і разважлівыя словы Казімеры Прунскене: калі б яна не ўступіла калісьці ў гэтую партыю, дык пазбавілася б магчымасці атрымаць тыя веды, дзякуючы якім кіравала ўрадам Літоўскай Рэспублікі, ну, а мне не давялося б стаць намеснікам рэдактара гарадской газеты, выпускаць нашы вальнадумныя літстаронкі з вершамі Сержука Сокалава... І хоць членства ў «авангардзе грамадства» давала магчымасці зрабіць нешта вартае, усё адно гэта быў нялёгкі кампраміс. Здаўшы партквіток, я адчуў вялікую палёгку. У адказ на маю лапідарную заяву: «Паведамляю, што добраахвотна выходжу з КПСС», я быў выключаны, як мне потым паведамілі, з фармулёўкаю накшталт *«за отход от позиции марксизма-ленинизма»*. Дарэчы, за той самы грэх аднаму са стваральнікаў «Мартыралога Беларусі» і Народнага фронту нябожчыку Міхалу Фёдаравічу Дубянецкаму райком уклеіў «ідэйнае перараджэнне».

— *Калі ты адчуў цану самога сябе?*

— Відаць, пасля першых выклікаў у КДБ. Значыць, думаю, нечага варты!

Паступова я дакладна зразумеў, чаго менавіта мне ў жыцці не хапае — свабоды. Ну, глядзі: у юнацтве захапляўся, як і шмат хто, музыкай «Бітлз». На школьным

камсамольскім сходзе гэтую нашу любоў ахрысцілі *«низкопоклонством перед Западом»*. Мудроў і кампанія прыляпілі да насценгазеты расклад музычных праграм «Голаса Амерыкі». Дырэктар школы Абрам Залманавіч Герцыковіч (наогул чалавек неблагі, але сын свайго часу) убачыў тут амаль што здраду Радзіме.

Пазней асэнсаванне неабходнасці свабоды станавілася ўсё больш выразным. А пачуў сябе вольным — уяві сабе калі? — 30 кастрычніка 1988 года. У той самы дзень, што ўжо назаўсёды ўвайшоў у нашую гісторыю. Побач з газам, дубінкамі, у акружэнні некалькіх ланцугоў міліцыі і войска, пад гучную каманду *«Батальон, к бою!»* раптам адчуў — свабодны!

— *У такім разе, як я зразумеў: ты — несвабодны...*

— А ты?

Хоць мы і былі тады малыя, аднак XXII з'езд даў прышчэпку праўды і нам. Памятаю, як Хрушчоў гаварыў па радыё пра забойства таварыша Кірава і іншыя крывавыя справы Сталіна, які з лагоднаю ўсмешкаю зазіраў з п'едэстала ў вокны нашай першай полацкай сталінскай школы. І разам з сябрам Колькам мы адпомсцілі: выдралі з «Букваря» партрэт Іосіфа Вісарыёнавіча, выкалалі яму ржавым цвіком вочы, потым партрэт спалілі і вырашылі, што назаўсёды расквіталіся з найлепшым сябрам савецкіх дзяцей...

Пазней тая прышчэпка праўды дапамагала глядзець на нашу рэальнасць са здаровым скепсісам і іроніяй. Лічу, што іронія савецкаму чалавеку неабходна, як паветра... Іначай суіснаваць з нашай сістэмай на больш-менш парытэтнай аснове проста немагчыма. Як пісаў Махатма Гандзі: калі б у меня не было пачуцця гумару, я б даўно ўжо скончыў жыццё самагубствам.

Можа, з гэтай прычыны афіцэр дзяржбяспекі аднойчы зусім паважна даводзіў мне, што хоць з Брэжнева і смяюцца ў палітычных анекдотах, але ж акрамя яго краіну ўзначаліць больш няма каму. Можа, ўсё-ткі іронія кіравала той жанчынай — суседкай маёй жонкі ў радзільным доме, якая таксама сур'ёзна запэўнівала нас, што калі народзіць дачку, дык назаве яе Брэжневіянай (Генсеку тады якраз пачапілі чарговую Зорку героя ). Шкада, што ёй не пашанцавала — нарадзіўся хлопчык.

— *У такім разе, як ты спалучаеш іранічны скепсіс і патрыятычнае «трэба»?*

— Пра гэта ў свой час добра сказаў акадэмік Вярнадскі. Ёсць перыяды ў жыцці грамадства, калі вучонаму

нельга заставацца ўбаку ад падзей, займацца толькі навукай — у такім разе ён пацерпіць не толькі як грамадзянін, а найперш як вучоны, адстане і ў навуцы. Думаю, для літаратара гэта яшчэ больш важна. Гэта пацвярджае само наша літаратурнае жыццё. Ты можаш, напрыклад, назваць мне ў нашай прозе, паэзіі, публіцыстыцы за апошнія тры гады што-небудзь сапраўды вартае, створанае літаратарамі, якія не занялі акрэсленай грамадска-палітычнай пазіцыі, а вырашылі «служыць мастацтву»? У той самы час, скажам, Васіль Быкаў выдаў «Аблаву».

Асабіста для мяне імператыў часу — гэта пасільны ўдзел у працы Сойма БНФ, «Мартыралога Беларусі». Хоць не адчуваю за сабой здольнасцей ні палітыка, ні прамоўцы. Я, дарэчы, лічу сябе чалавекам, якога нават з вялізнымі агаворкамі нельга назваць грамадскім ці палітычным дзеячам. Таму ўсе мае палітычныя фармулёўкі і выказванні ніякім чынам не могуць прэтэндаваць на вычарпальнасць, гэта думкі дылетанта ад палітыкі. Разам з тым нейкую маленькую ролю ў палітыцы, напэўна, даводзіцца адыгрываць і мне. Прынамсі, калі я быў яшчэ ў КПСС, кіраўнікі Цэнтральнага райкома КПБ г. Мінска няраз на павышаных танах тлумачылі мне няправільнасць маіх палітычных пазіцый.

Магу дадаць, што быў сярод давераных асобаў Зянона Пазьняка на выбарах у Вярхоўны Савет.

— *Цікава, як успрымалі вашу агітацыю гараджане, апарат?*

— Асноўны цяжар выпаў на мастака Уладзіміра Крукоўскага і матэматыка Юрыя Дракахруста. За дзень — пяць-шэсць вострых дыялогаў з залай або з удзельнікамі перадвыбарчага мітынгу. Дызайнер Лявон Бартлаў, які вазіў Зянона на сваіх «Жыгулях» і быў, па сутнасці, яго целаахоўнікам, аднойчы доўга пятляў па гораду, збаўляючыся ад «хваста» ў выглядзе белай «Волгі». Так што псіхалагічны ціск быў і пасля сустрэч з выбаршчыкамі.

Што да саміх сустрэч, дык вось як, напрыклад, праходзіла адна з іх у інтэрнаце аўтазавода. Спачатку было зроблена ўсё, каб замаўчаць наш прыезд — ніякіх абвестак, ну аніводнай! Што павесілі — усё сарвалі. Аднак у прызначаны час у маладзёжны інтэрнат дружна прыйшло недзе чалавек сто пяцьдзесят з ордэнскімі калодкамі... Пакуль Зянон выступаў, набраўся цэлы стос пытанняў. Прычым большая частка — надрукаваныя на машынцы. Першая цыдулька была такая: *«Уважаемый Зенон Станиславович!*

*Расскажите, пожалуйста, поподробнее о ваших связях с ЦРУ. Сколько вам ежемесячно платят? В каких отношениях вы с резидентом американской разведки в Минске Матулевичем? В каком фашистском гарнизоне служил ваш отец?»* і гэтак далей. У зале запанавала мёртвая цішыня, усе літаральна настроіліся на Зянона. Заўважу, што на самым пачатку перадвыбарчай кампаніі ў такіх вось сітуацыях Зянон часам трымаўся на мяжы зрыву, але з кожнай сустрэчай на вачах набіраў спакою, разважлівасці, калі хочаш, палітычнае мудрасці. А тады Пазьняк далікатна адказаў і на гэтыя, і на наступныя пытанні. Урэшце, сустрэча скончылася тым, што адпаведна падабраная, амаль цалкам варожая да яго аўдыторыя, якой дырыжыраваў прадстаўнік парткома аўтазавода, раскалолася, часткова перайшла на наш бок. А адзін з прысутных сказаў парткомаўцу проста ў вочы, нібы ўрэзаў пад дых: «Ты ж нам гаварыў, што Пазьняк гатовы страляць камуністаў з кулямёта!» Пад канец сустрэчы ў залу зайшлі двое міліцыянераў з дубінкамі і піскучымі рацыямі: «Далажыце абстаноўку!» Мы на ўсякі выпадак пасунуліся бліжэй да Зянона, аднак высветлілася, што хлопцы прыйшлі запрасіць яго на выступленне ў свой райаддзел. А калі Бартлаў ад'язджаў, адзін з іх узяў пад казырок.

Або такі эпізод. Ля крамы ў тым мікрараёне, дзе Пазьняк жыве і дзе ён балатаваўся, адзін нібыта ветэран вайны сабраў вакол сябе людзей і давай ім вочы адкрываць. Маўляў, бацька Зянонаў служыў паліцаем, расстрэльваў людзей, катаваў. Карацей, не ўздумайце галасаваць «за». Якраз на той час падышла туды старэнькая маці Пазьняка, удава франтавіка, уступіла ў палеміку, прылюдна вывела на чыстую ваду таго «партызана». А да выбараў заставалася тады дні два — ці варта казаць, колькі галасоў заваявала яна сыну? Народныя сімпатыі і антыпатыі нараджае Праўда. Таму і не дапамаглі апаратчыкам самыя гнюсныя падмётныя лісты (была, дарэчы, выпушчана і «агітка» супраць даверaных асобаў), больш таго, яны адыгралі ў размеркаванні галасоў адваротную ролю. Нават такая досыць прафесійна зробленая нейкім беспрынцыпным подлым мастаком лістоўка-плакат: Зянон з гітлераўскімі вусікамі прымае парад, а на конях едуць Марачкін, Вячорка, яшчэ хтосьці. І тэкст: калі вы прагаласуеце за Пазьняка, дык бээнэфаўцы ўладкуюць вам шчаслівае жыццё — валютай стане адзін бульбаш, за тысячу бульбашоў можна будзе купіць драждэжэй на брагу і далей розная такая самая нізкая і подлая дурата...

— *А контрпрапагандай вы займаліся?*

— Я ўжо казаў, што, па сутнасці, гэтыя «творы» самі па сабе часта агітавалі якраз за Пазьняка і БНФ. Вядома, і мы сёе-тое рабілі. Я з Юрам Дракахрустам напісалі пра свайго кандыдата ў дэпутаты міні-нарыс пад загалоўкам «Чалавек, які не баіцца сістэмы». Званю рэдактару «Вячэрняга Мінска»: «Таварыш Грышан? Вас турбуе член Саюза пісьменнікаў Арлоў, давераная асоба Пазьняка». Тут тав. Грышан пачынае раптам дзьмуць у трубку: *«Что? А? Алло! Я вас не слышу, перезвоните»*. Потым можна было набіраць нумар цэлы дзень — трубку ніхто не здымаў... Назаўтра сітуацыя паўтарылася, а ўрэшце нам адмовілі. Аднак мы дамовіліся ўсё-такі даць гэты матэрыял у шматтыражцы «Автозаводец». Праўда, першая спроба была няўдалая, яго знялі ўжо з паласы, але рэдактар Філончык перачакаў буру і сваё слова журналіста стрымаў.

— *Ці не за ўдзел у камандзе Пазьняка ты, працуючы па запрашэнні ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», паўтара года не мог атрымаць нават часовай мінскай прапіскі?*

— А-а, успомніў пачатак нашай размовы? Не, не за выбары. Але за ўдзел у «камандзе Зянона» ў шырокім сэнсе. За 30 кастрычніка 1988 года, калі мне давялося апынуцца ў эпіцэнтры вядомых падзей.

На Устаноўчай канферэнцыі ў Чырвоным касцёле я быў абраны ў кіраўніцтва «Мартыралога» і адразу ж заўважыў за сабой «пільнае вока». Напярэдадні Дзядоў пабыў дома ў Наваполацку, дзе жыла сям'я. Жонка вырашыла паехаць са мной — каб быць побач на той выпадак, калі будуць браць. Да «ўзяцця», дарэчы, я таксама рыхтаваўся, нават узяў з сабою пару часопісаў і кніг — калі што, будзе чым бавіць час... І ў сваіх прадчуваннях не вельмі памыліўся. Як потым стала вядома, напярэдадні ў «Мастацкую літаратуру» наведаўся чалавек з міліцыі, якому растлумачылі: «Арлоў паехаў у Наваполацк». Думаю, гэта і ўратавала ад «перахопу» на шляху да Маскоўскіх могілак.

Першага, каго я там убачыў, быў Зянон Пазьняк. Каюся: адразу нават падумаў, што той нападпітку (хоць, здаецца, ён ніякага зелля ніколі і ў рот не бярэ) — вельмі ўжо быў чырвоны з твару і неўразумела круціў галавой. Як высветлілася, яго толькі што апрацавалі «Чаромхай» — пырснулі газам проста ў твар. Акрыяўшы, Зянон пачаў заклікаць людзей не паддавацца на правакацыі. І тут — першая атака: падрыхтаваныя малойцы ў форме і ў цывільным пачалі, пусціўшы ў ход кулакі і гумовыя дручкі, адціскаць натоўп

ад уваходу на могілкі. Адзін міліцыянер паспрабаваў ададбраць у мяне сумку з «турэмнымі» часопісамі. Пакуль мы з ім змагаліся, натоўп пацягнуў жонку далей. Мой сябра пісьменнік Алесь Асташонак, захінуў яе, прыняўшы прызначаны ёй удар на сябе. Удар, дарэчы, быў прафесійны. Каля двух тыдняў Алесь быў на бальнічным з дыягназам *«ушиб позвоночника»*.

Сілавой атакай *«блюстители порядка»* дабіліся свайго: нас рассеклі на дзве часткі. Адна, дзе апынуўся я, падалася ў напрамку Курапат. Сярод поля, на ўзгорку, правялі мітынг, на якім паспелі выступіць Зянон і я. Яшчэ Таня Зіненка верш свой прачытала, а потым адзін хлопчык дастаў бел-чырвона-белы сцяг, якім ён быў абкручаны пад курткаю. Добра экіпіраванаму ачапленню гэта паслужыла сігналам да таго, што потым у афіцыйных дакументах далікатна назвалі «спыненнем мітынгу».

Зрэшты, гэта ўсё рэчы агульнавядомыя. Што датычыць мяне, дык некалькі дзён пасля таго мне давялося пабыць у шкуры дысідэнта, хоць да поўнага падабенства з дысідэнтамі 70-х, зразумела, далёка. Назаўтра пасля Дзядоў роўна а палове дзесятай гадзіны да мяне ў кабінет заявіўся старшы лейтэнант таварыш Сальнік Аляксандр Мікалаевіч. Праз колькі дзён ён нават паспрабаваў загаварыць пабеларуску, а я падараваў яму сваю кніжку: што рабіць — чалавек выконваў загад. Але ў нашу першую сустрэчу таварыш Сальнік склаў на мяне пратакол за пражыванне ў Мінску без прапіскі. Назаўтра — яшчэ адзін і папярэдзіў: пасля трэцяга пратакола пачынаецца крымінальная адказнасць, што прадугледжвае пазбаўленне волі да аднаго года... Аднячасова націснулі на дырэктара выдавецтва Валерыя Грышановіча: маўляў, ведай, каго бярэш. Партбюро атрымала зверху загад выключыць мяне з партыі. Адзін з членаў бюро на пасяджэнні сказаў: «Ты выступіў супраць савецкай улады!» Тут, праўда, заступіўся Грышановіч: «Не трэба блытаць — мітынг забараніла не савецкая ўлада, а ўсяго толькі гарвыканком». Між іншым, дырэктару — за тое, што ўзяў мяне, непрапісанага, на працу — давялося заплаціць штраф.

Тым часам працягваліся штодзённыя візіты Сальніка. На трэці дзень ён адкрыта сказаў: «Мы вас пасадзім у машыну і завязём у Наваполацк, дзе вы прапісаны і павінны жыць». Аднак менавіта тады ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі адбыўся сход з удзелам тагачаснага Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Г. Таразевіча, які прыйшоў адга-

ворваць нас ад ідэі накіраваць пра падзеі 30-га кастрычніка тэлеграму Гарбачову. Я на сходзе ўзяў слова і звярнуўся непасрэдна да Прэзідэнта рэспублікі з просьбай абараніць ад шантажу і штодзённых візітаў міліцыі за маё антысталінісцкае выступленне на мітынгу. Таразевіч, склаўшы па сваёй звычцы рукі на жываце, сказаў: «Я думаю, таварыш Арлоў, што з заўтрашняга дня гэта закончыцца». Тое здарылася, нагадаю, у час гандлю — пасылаць альбо не тэлеграму ў Крэмль... Таму Прэзідэнт раздаваў абяцанні направа і налева, у прыватнасці, амаль па-бацькоўску цікавіўся здароўем Алеся Асташонка.

Нашыя кіраўнікі даўно ўжо заслужылі недавер да любых іхніх слоў — ад абяцанняў *«светлого будущего»* да чаго-небудзь самага элементарнага, накшталт забеспячэння цыгарэтамі. Але тады, ва ўсякім разе, што датычыць мяне, Таразевіч слова стрымаў: таварыш Сальнік назаўтра ў выдавецтва не з'явіўся. Адзіным чалавекам, у якога ад такой навіны сапсаваўся настрой, быў кінааператар Юрый Хашчавацкі, бо ён вельмі хацеў выкарыстаць эпізод з міліцэйскімі візітамі да мяне ў сваім фільме пра нашы вандэйскія парадкі. Аднак і пасля таго мяне больш года не прапісвалі.

— *Што ты стаў думаць пра наш лад, яго перспектывы пасля ўсіх гэтых падзей?*

— Не толькі я — здаецца, пераважная большасць здаровых людзей тады ўжо канчаткова ўсвядоміла, у якім грамадстве мы жывём. Усвядоміла, што за «сацыялізм» ці «камунізм» чапляюцца зараз толькі тыя, хто даўно пабудаваў іх для сябе за кошт астатніх.

Нядаўна я прачытаў чарговае інтэрв'ю ў «АиФе» з Нінай Андрэевай. Яно заканчваецца ў духу апошніх заклікаў Фідэля Кастра — «Сацыялізм або смерць!» Мне здаецца, што замест злучніка «або» тут, як паказвае гісторыя, больш лагічным быў бы працяжнік. Здань камунізму, якая яшчэ сям-там блукае па Еўропе, усё больш і больш палохае людзей, хоць Усходняя Еўропа з гэтаю зданню ўжо амаль развіталася. Спадзяюся, яна пакіне і нас. Мой выбар — нацыянальнае адраджэнне і дэмакратыя, прычым для Беларусі адно без другога немагчыма.

— *Адсюль вынікае: асаблівай лаяльнасці да сваіх палітычных праціўнікаў ты не маеш?*

— Павінна адбывацца барацьба ідэй, а не людзей. Увогуле, узровень дэмакратычнасці грамадства найлепей было б

вызначаць па здольнасці яго афіцыйных структур выслухаць іншадумцаў.

— *Ты столькі часу ў самым віры перабудовы, што, магчыма, больш выразна, чым іншыя, бачыш, куды, у якім напрамку рухаецца наша рэспубліка. Якія набыткі перабудовы мы маем? Якія страты?*

— Наконт віру ты яўна перабольшваеш. Я ўжо казаў, што палітыкам сябе не лічу і ўпэўнены: маім месцам працы павінна быць не мітынговая і не парламенцкая трыбуна, а — пісьмовы стол. Калі казаць пра гады так званай перабудовы, дык галоўны набытак для нас, які кампенсуе ўсе магчымыя страты,— гэта абуджэнне беларускага народа ад летаргічнага сну, у якім мы знаходзіліся значна даўжэй за нашых суседзяў.

Тут варта ўзгадаць пачатак сямідзесятых, калі ў Савецкім Саюзе было паляванне на так званых нацыяналістаў. На Украіне, у Прыбалтыцы, Закаўказзі сотні людзей трапілі за краты, у нас не ўзялі нікога, хоць, як мне вядома, былі і такія патрабаванні. Аднак перамагла думка, што ў беларусаў, маўляў, нацыяналізм ужо не мае пад сабой ніякай базы і пазбаўлены ўсякіх перспектыў. Інакш кажучы, гаворка ішла пра тое, што нацыянальнае абуджэнне і адраджэнне на Беларусі адбыцца ўжо не могуць, што мы ўжо цалкам ператварыліся ў дэнацыяналізаваны савецкі народ, ці больш дакладна — у насельніцтва. Бязмоўнае і бяспамятнае. Цяпер людзі, што некалі вырашалі лёс вольнадумцаў, у тым ліку Пазьняка і іншых вядомых сёння людзей, кусаюць сябе за локці: эх, трэба было садзіць! А так усіх западозраных у «нацыяналізме» толькі звальнілі з працы ды, калі хто з іх быў членам КПСС, павыключалі з партыі.

— *«Бяскроўны» разгром беларускага «нацыяналізму» ў сямідзесятых гадах стаў падставай для сцвярджэння, быццам тады ў рэспубліцы ніхто не выступаў супраць татальнага абалваньвання і падману, супраць знішчэння мовы і гістарычных каранёў нацыі... Маўляў, інтэлігенцыя асмялела толькі сёння, калі сістэма адрахлела, страціла колішнюю агрэсіўнасць, і ніхто ўжо не пакутуе болей за свае «антыпераканнанні», не губляе за тое магчымасць пракарміць сям'ю і сябе. Ці так гэта на самой справе, Уладзімір?*

— Лухта. Успомні: гадамі не друкаваліся творы нашага незабыўнага Уладзіміра Караткевіча, у Гародні подла білі вокны ў кватэры Васіля Быкава... А падазроная гібель мастака Лявона Баразны ў 72-м годзе? Нагадаю, што ме-

навіта тады звольнілі з Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Зянона Пазьняка, і таленавіты вучоны мусіў працаваць фатографам. Кандыдат філалогіі Мікола Прашковіч «перакваліфікаваўся» ў грузчыка. Тады ж *«ушли»* археолага Міхася Чарняўскага. Пазбаўлены ступені кандыдата гістарычных навук, ён паўтара года грузіў у мастацка-вытворчым камбінаце цэмент, збіваў і грунтаваў шчыты пад наглядную агітацыю, з якіх абвешаны зоркамі і ордэнамі «верны ленінец» на кожным гарадскім скрыжаванні далдоніў нам: *«Верной дорогой идете, товарищи!»* Толькі праз пяць гадоў Міхась Міхайлавіч упершыню ў жыцці выпадкова пабачыў чалавека, поплеч з якім каваў крамолу ў «нацыяналістычным падполлі»... Нядаўна былы работнік выдавецтва «Універсітэцкае», цяпер пенсіянер Сцяпан Міско расказаў мне, што якраз у той час — не ў 37-м, а ў 74-м — выбіваючы прызнанне, яго дапытвалі пяць сутак без перапынку.

— *У цябе, дарэчы, таксама хапала ў жыцці горкіх хвілін. Як тады супакойваў сябе, у чым знаходзіў падтрымку?*

— Я — гісторык, таму заўсёды ў цяжкія моманты прыгадваў, колькі выпрабаванняў выпала на долю нашага народа і людзей, што былі носьбітамі нацыянальнай ідэі, увогуле прагрэсу. Безліч разоў ім даводзілася адступаць перад поўнай, здавалася, безнадзейнасцю. Памятаеш, адзін з герояў Караткевіча кажа: «Кожны раз народ бліжэй да свабоды на вышыню нашых магіл». Але ўсё ж бліжэй. Таму і засталіся ў гісторыі і ў памяці народа імёны крычаўскіх паўстанцаў Васіля Вашчылы, Івана Карпача, закатаванага царскімі жандарамі вальнадумца Аляксандра Незабытоўскага, правадыроў паўстання 1863 года, пра якіх мне давялося пісаць у сваіх апавяданнях. Эпіграфам да аднаго з іх я зрабіў лацінскае выслоўе Gloria victis! — «Слава пераможаным!»... Не пераможцам, а пераможаным. Бо пераможаныя сёння вельмі часта робяцца пераможцамі заўтра. Такі закон гісторыі.

— *Тут не трэба нават заглыбляцца ў справы даўно мінулых дзён,— нагадаць хаця б тых жа «разгромленых» у сямідзесятыя гады «нацыяналістаў»: многія іх растаптаныя тады ідэі склалі аснову толькі што прынятай Дэкларацыі аб суверэнітэце Беларусі.*

— Так, гэта адбылося дзякуючы ў першую чаргу нешматлікай, але нязломленай апазіцыі ўладзе. У цывілізаваным, дэмакратычным грамадстве апазіцыя не дае палітычным структурам закасцянець, схіліцца ў бок таталіта-

рызму. Ну а ва ўмовах нашай краіны апазіцыя з усімі яе выдаткамі — гэта тое, што вяртае на шлях дэмакратыі.

— *Слухаючы цябе на адным з мітынгаў, я зразумеў так, што таталітарная сістэма ў СССР закладзена Леніным, ён нясе за гэта роўную адказнасць разам са Сталіным... Перадаю думку правільна?*

— Баюся, што ты зараз пачуеш не адказ, а цэлы маналог, вельмі прынцыповы для мяне.

Пачну з уступлення ў КПСС. На бюро Наваполацкага гаркома партыі, дзе адбывалася таемства майго далучэння да авангарду грамадства, я прыйшоў у тэнісцы, размаляванай картачнай масцю — віні, хрэсці... Адзін з членаў бюро ажно задыхнуўся: *«Как вы посмели явиться в таком наряде! Вы можете себе представить Владимира Ильича с картами в руках?»* Шчыра кажучы, мне было вельмі проста ўявіць правадыра не толькі з картамі, але, скажам, і з кілішкам каньяку ці добрага віна ў кавярні на беразе Жэнеўскага возера або пасля палявання ў Шушанскім... Значна цяжэй было ў той час уявіць, што 19.сакавіка 1922 года Уладзімір Ільіч у сакрэтным лісце да Палітбюро ЦК РКП(б), які цяпер стаў вядомым, патрабуючы ўзмацніць рэпрэсіі супраць духавенства і вернікаў, пісаў: *«чем большее число... удастся нам расстрелять, тем лучше».* (Газета «Собеседник», М., 1990. № 16. С. 7). Па няпоўных звестках у тым самым годзе было расстраляна 8100 *«представителей реакционного духовенства и буржуазии»* (ленінскае вызначэнне), у тым ліку 3447 манашак і паслушніц. Гэтыя факты з кнігі «Новые мученики России» пратапрэсвітэра М. Польскага. (Джорданвіль. 1949—1957. Т. 1. С. 214).

Між іншым, бацькі ніколі не вучылі мяне быць падобным на Валодзю Ульянава. Не памятаю, каб я даваў камусьці клятву з «чэсным ленінскім». Затое аднойчы тата задуменна працытаваў, гледзячы на так-сяк зроблены і таму хутка раскіданы пантонны мост цераз Дзвіну: *«Течет вода Кубань-реки, куда велят большевики»...* У мяне як у літаратара ніколі, нават у хвіліны замарачэння, не хапала натхнення напісаць апавяданне, напрыклад, пра тое, як Ленін любіў дзяцей, ці вершы, як Ленін чытае «Правду» ці думае пра Беларусь.

Але ўсе мы дыхалі атрутнымі парамі нашай акцябрацкай, піянерскай, камсамольскай, партыйнай ідэалагічна-выхаваўчай машыны, і таму Ленін яшчэ нядаўна ўяўляўся мне і маім сябрам, вядома, не геніем усіх часоў і народаў (бо мы чыталі, у прыватнасці, М. Бярдзяева з ягонай характа-

рыстыкай інтэлектуальнага ўзроўню Ільіча), але дзеячам, якога варта было чытаць і на якога ў нашай сітуацыі можна было спасылацца пры адстойванні сваіх поглядаў. Пару гадоў назад кіраўнік пісьменніцкай арганізацыі Латвіі Яніс Петэрс на адным літаратурным пленуме замест уласнай прамовы прачытаў ленінскую працу «Да пытання аб нацыянальнасцях ці аб «аўтанамізацыі» і сарваў апладысменты. Тады гэта прагучала, бо Ленін вёў гаворку пра русіфікацыю, шавіністычна настроенае чыноўніцтва... А цяпер, калі забранзавелы, кананізаваны Ільіч дзень пры дні набывае ўсё больш і больш чалавечых рысаў, мне здаецца, Петэрс згадвае той выпадак не без пачуцця ніякаватасці.

Трохі няёмка падмацоўваць сваю думку цытатамі чалавека, які ў адрозненне ад Сталіна, не тоячыся, пакідаў шматлікія пісьмовыя сведчанні сваёй жорсткасці, заклікаючы, як цяпер мы ведаем, расстрэльваць заложнікаў, «буржуяў», спекулянтаў, прастытутак і іншых «ворагаў». Я зрабіў назіранне, што ў нас на Беларусі людзі, якія любілі яшчэ нядаўна цытаваць Леніна — гісторыкі, навукоўцы, літаратары,— ужо з год, як пакінулі гэтае сваё захапленне. А калі і цытуюць, дык як бы наадварот, развітваючыся са сваёй аблудаю, са сваім старым уяўленнем,— як бы засцерагаюць ад яго іншых.

Самы раз і мне прывесці адну з малавядомых пакуль цытатак. Таварыш Троцкі ў напісанай ім ленінскай біяграфіі падае словы Ільіча, якія той часта паўтараў: *«Эта диктатура? Это манная кашка! Русский человек слишком добр. Он не в состоянии принять решительные меры революционного террора. Тем не менее необходимо попробовать»*. Што ж, *«напробовались»* у смак. Выканалі вялікі запавет.

Выкажу некалькі крамольных думак.

Мне здаецца, Леніну пашанцавала памерці своечасова. У тым сэнсе, што праз некалькі гадоў яго маглі б выкінуць з краіны як таварыша Троцкага альбо зрабіць удзельнікам гучных адкрытых працэсаў, а потым, праз 50 гадоў, рэабілітаваць... А перажыўшы прыемнае хваляванне ад рэабілітацыі, як было ўжо ў выпадку з Бухарыным, Рыкавым, мы праз некалькі месяцаў задумаліся б: а за што яго абялілі? Ці рэабілітуе ленінскае акружэнне сама гісторыя? За што іх можна рэабілітаваць? За крывавую расправу аднаго з тысячамі афіцэраў белай арміі ў Крыме, якія засталіся там пад чырвонае слова гонару: «Жыццё захаваем!»? За 5 тысяч адразу расстраляных салдат арміі Махно, якая разам з чырвонымі гераічна брала Перакоп? За не менш жудасныя

злачынствы другога, трэцяга, пятага... Таварыш Бухарын, як вядома, называў людзей не інакш, як чалавечым матэрыялам або масаю.

Ленін памёр учас, і замест таго, каб выдзіраць яго партрэты з падручнікаў, па ўсёй краіне яму паставілі помнікі. У гэтым быў зацікаўлены Сталін — значна выгадней абвясціць сябе прадаўжальнікам вялікай справы, чым быць яе заснавальнікам.

Верагодным уяўляецца мне і іншае развіццё падзей. Скажам, Іосіф Вісарыёнавіч мог проста ціха, без шуму і пылу адправіць свайго настаўніка на той свет, без усіх гэтых знішчаных кніжак і іншых бальшавіцкіх штучак, а потым, схаваўшыся за помнікі правадыру, абсалютна шчыра абвясціць сябе яго спадкаемцам.

— *Дарэчы пра помнікі. Памятаеш, за абедам у кафэ да нас падсеў камандзіраваны штурхач з Днепрапятроўшчыны: «Як у вас з манументам нумар адзін — яшчэ моліцеся?» Голас — сумесь дзікунскай злосці з варварскай гордасцю...*

— Я не прыхільнік сляпога знішчэння любой манументалістыкі. Можна прыдумаць нешта больш цывілізаванае і дасціпнае. Напрыклад, звезці ўсе мінскія помнікі рэвалюцыйным дзеячам да будынка ЦК. Хай бы яны там стваралі бачнасць пастаяннага мітынгу ў падтрымку генеральнай лініі.

Што цікава: у нашым Наваполацку ніколі не было (а цяпер, я ўпэўнены, ужо ніколі і не будзе) ні помніка, ні нават вуліцы Леніна.

— *Затое Полацк не абдзелены ідэалагічнай увагай...*

— Безумоўна. Там жа пачыналася беларуская гісторыя, якую неабходна было сцерці, вытруціць з нашай памяці. На якой вуліцы, па-твойму, стаіць Сафійскі сабор? Можа, на вуліцы Усяслава ці Ефрасінні Полацкай? Не — на Бальнічным завулку. А які адрас Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра? Можа, гэта вуліца ювеліра Лазара Богшы ці дойліда Іаана? Завулак Фрунзе! Ну, а помнікаў Ільічу, калі не памыляюся, ажно пяць! І ніводны з іх я не адважуся назваць творам мастацтва. Аднойчы да нас у Наваполацк прыехаў Міхась Стральцоў. «Устаю,— апавядаў мне Міхась Лявонавіч,— раніцой у гатэлі, зырк у вакно — чагосьці не хапае... Пахадзіў па гораду і зразумеў: няма Ільіча!» Такім чынам спрацоўвала нават наяўнасць адсутнасці сімвалаў. Між іншым, на ўсе нашы неаднаразовыя просьбы перайменаваць вуліцы з недарэчнымі, проста дэбільнымі назвамі накшталт

Алімпійскай, Юбілейнай гарвыканкамаўцы нязменна адказвалі адно і тое ж: «Не лезце са сваімі Скарынамі ды Каліноўскімі!» Потым угару шматзначна падымаўся палец, і, як бы палохаючы саміх сябе, савецкія служкі азіраліся па баках і сцішана дадавалі: «У нас няма яшчэ вуліцы Леніна!»

Пачастую цябе яшчэ адной цытатаю пра Ільіча-першага,— горкаўскай, з лістапада 17-га: *«Он обладает отсутствием морали и чисто барским, безжалостным отношением к жизни народных масс».* (М. Горький. «Несвоевременные мысли». Париж, 1971. С. 113). А ў школе мы вучылі зусім іншы, пасмяротны нарыс Горкага.

Я думаю, Анры Барбюс зусім не памыляўся, калі сказаў у разгар сталінскага генацыду, што Сталін — гэта Ленін сёння. У ленінскай спадчыне застаўся ліст да Дзяржынскага, датаваны 19.V.1922 года, дзе Ленін патрабуе падрыхтаваць да высылкі за мяжу, па сутнасці, красу расійскай інтэлігенцыі. І дзеля гэтага правадыр раіць «рыцару рэвалюцыі»: *«Собрать систематические сведения о политическом стаже, работе и литературной деятельности профессоров и писателей».* Тут і гатовыя ворагі, якіх Ленін прапануе: *«Питерский журнал «Экономист»... по-моему, явный центр белогвардейцев. В № 3... напечатан на обложке список сотрудников... Все это явные контрреволюционеры, пособники Антанты, организация ее слуг и шпионов...»* Як гэтыя ленінскія парады табе падабаюцца? А тэрміналогія? Ці не нагадвае яна вядомыя тэрміны класавай барацьбы 30-х гадоў?

*— Апанент можа заўважыць табе: столькі гадоў пакланяліся Леніну, вырываючы з яго бясцэннай спадчыны адны выгадныя цытаты, а цяпер пачынаюць выкрываць Леніна па той жа самай ушчэнт раскрытыкаванай методзе, падбіраючы другія выгадныя цытаты.*

— На гэта я магу адказаць так. Ленінскія ідэі, якія мы доўгія гады паўтаралі як малітвы-заклёны, так і не ўвасобіліся ў светлую будучыню. А ўказанні і запаветы, ад якіх робіцца проста вусцішна, вельмі хутка станавіліся змрочнай рэальнасцю: расстрэламі, высылкамі, турмамі...

Цяпер ідзе працэс развенчвання Леніна не толькі ў сферы псіхалагічнай, у грамадскай свядомасці, але і ў дэмантажы помнікаў, сціранні яго імя з назваў вуліц, установаў. На Беларусі на гэты конт пакуль што пачуліся толькі першыя прапановы. Напрыклад, у час абмеркавання праектаў помніка Францішку Скарыну прагучала ідэя знайсці

помніку месца на цэнтральным праспекце горада, перайменаваным з Ленінскага ў Скарынаўскі. Апарат задушыў тую спробу, але праблема, думаю, з парадку дня не знікла.

Хто ж быў стваральнікам тайнай паліцыі — ВЧК, хто быў пачынальнікам агульнадзяржаўнага тэрору — Ленін або Сталін? У святле вядомых цяпер фактаў гэтае пытанне з'яўляецца рытарычным. Між іншым, складальнікі зборніка дакументаў *«Ленин и ВЧК»* (М., 1975) лічаць бацькам дзяржаўнай тэрарыстычнай арганізацыі менавіта Ільіча...

Праходзячы па вуліцах імя Леніна, я міжволі думаю пра тое, што правадыр і кіраўніцтва яго партыі заўсёды разглядалі Беларусь як своеасаблівую разменную манету ў сваёй палітыцы. Спачатку нашу зямлю аддалі немцам на перагаворах у Брэсце. Потым, не спытаўшы наш народ і не пусціўшы яго прадстаўнікоў на перамовы ў Рызе, Беларусь распалавінілі па жывым, пасля чаго яе ўкрыжоўвалі па два бакі мяжы сталіністы і пілсудчыкі.

Аднойчы запытаўся ў самога сябе, якая ў нас самая ганебная чарга? Колішняя на расстрэл у Курапаты? Па лагерную баланду? Па віно? Па мыла і трусы? Мне здаецца, самая ганебная наша чарга — да чалавека, які разам з паплечнікамі падштурхнуў краіну на шлях, які давёў нас да стаяння ва ўсіх гэтых жудасных і ганебных чэргах. Я маю на ўвазе чаргу ў Маўзалей.

Нельга казаць, што злачынцы толькі Ленін са Сталіным, і ўскладаць віну выключна на іх. Відаць, свядомасць большасці насельніцтва краіны была падрыхтаваная якраз да такога павароту падзей. Бязлітасна-жорсткі сацыяльны эксперымент праводзіўся на спрыяльнай глебе і найлепшы доказ сказанага — тое, што вельмі хутка ўдалося стварыць так званы савецкі народ. Той народ, які ў 30-х патрабаваў крыві, крыві і крыві «сваіх» ворагаў. Гэта, на жаль, не міф, а рэальнасць. «Хома савецікус» павінен прайсці доўгі пакутлівы шлях да «хома дэмакратыкус», чалавека сапраўднага, цывілізаванага.

Нават цяпер, калі парламенты некаторых нашых рэспублік больш-менш дэмакратычныя, сярод народных дэпутатаў проста на пасяджэнні, як мы ведаем, можа часам усчацца самая звычайная бойка. Гэта — адна з праяў цяжкой спадчыны. А колькі недэмакратычных актаў прымаюць Саветы, абраныя менавіта на хвалі дэмакратычнага, нацыянальнага адраджэння?

Ну, Алесь, прабач, я ўжо злоўжываю тваёй цярплівасцю. Заканчваю. Хто сёння хаваецца за Леніна, за яго ідэ-

алагічную постаць, прапанаваную народу для пакланення? Тыя, хто зацікаўлены ў захаванні заснаванай ім таталітарнай дзяржаўнай сістэмы. Чаму за Леніна? Таму што помнікаў Сталіну больш няма; Хрушчоў — валюнтарыст; не схаваешся і за абчаплянага ўзнагародамі Ільіча № 2; і за падобнага на пустое месца таварыша Чарненку; і за чэкіста Андропава... Таму Ленін адзін «аддуваецца» за ўсіх. З-за яго выглядаюць тыя, хто не збіраецца развітвацца з марксісцка-ленінскім вучэннем, бо яно і прывяло іх да свайго асабістага сацыялізму ці нават камунізму. Не толькі з персанальнымі машынамі, але і з персанальнымі каровамі ў спецыяльнай гаспадарцы. Прывяло за кошт беднасці, абяздоленасці, духоўнага і фізічнага вынішчэння цэлых нацый.

І ў гэтым сэнсе, у рэчышчы вяртання нашай краіны да дэмакратыі, Ленін — гэта Сталін сёння. Не развянчаўшы Леніна, мы не здолеем адмовіцца ад яго вучэння і не прыйдзем да сапраўды новага мыслення.

Ленін — гэта Сталін сёння.

— *Табе не здаецца, што ўчора жыццё патрабавала іншадумцаў, а сёння — асоб, якія думаюць цывілізавана?*

— У кантэксце ўчарашняга дня так званыя іншадумцы мыслілі якраз цывілізавана, што і адрознівала іх ад астатніх.

— *Я меў на ўвазе крыху іншае. Тое, напрыклад, што зараз вядзецца зусім не дыпламатычная барацьба з камуністамі, якіх, амаль усіх да аднаго, абвінавачваюць літаральна ў кожнай накладцы, кожным граху перабудовы ды і застою.*

— У тым, што адбываецца, вінавата сама партыя. Бо яна не жадае адмовіцца ад сваёй манаполіі на ўладу, а толькі ўсяляк маскіруе яе — тут і пераход партакратаў на новыя пасады ў Саветы, і спроба партапарату дыктаваць свае ўмовы на рэгістрацыі перыядычных выданняў. Не спрыяе аўтарытэту КПСС і яе нежаданне адмовіцца ад сваіх прывілеяў, раскошных будынкаў на карысць той жа культуры, адукацыі ці медыцыны. У выніку стаяць адзін насупраць аднаго будынкі — паўпусты, выдатна дагледжаны ЦК КПБ і дабітае, цеснае памяшканне Ленінскай бібліятэкі, якая вымушана захоўваць частку фондаў амаль за сто кіламетраў, у Валожыне... Адкуль жа ўзяцца любові да маўклівых апаратчыкаў і да камуністаў шэрагоўцаў, якія трываюць усё гэта?

— *Ці можа наша грамадства павярнуць на 180 градусаў — да прывычнага таталітарызму?*

— На гэтым этапе — вельмі нават можа. Аднак хочацца спадзявацца на лепшае.

— *У такім разе — куды мы прыйдзем?*

— Гады два таму назад у праграме «Час» адна літоўка, адказваючы на пытанне, якой яна бачыць будучыню Літвы, заявіла: «Я за той Саюз, з якога не хочацца выходзіць». Практыка даказала — такога Саюза ў нас не атрымліваецца. І ўсё, што мы чуем пра новы Саюзны дагавор, пераконвае: Цэнтр імкнецца падпарадкаваць сабе ўсё, у чым выяўляецца суверэнітэт рэспублік. Таму я прыхільнік паступовага выхаду Беларусі са складу СССР і стварэння незалежнай Беларускай Рэспублікі.

*Лістапад, 1990*

# СЕРГЕЙ НАУМЧИК

## Свобода читать, свобода говорить, свобода думать — и мужество не врать



Я родился 15 декабря 1961 года в небольшом городке Поставы, на западе Витебской области. Отец в ту пору был секретарем райкома комсомола, мать — учительницей. Вообще-то судьба запрограммировала мне лояльность к существующим политическим структурам: оба деда (как по материнской, так и по отцовской линии), хотя и были крестьянами, но состояли в Компартии... По семейной традиции вступил в нее и я. Но не надолго. Журналист. Жена — также выпускница журфака.

Родители мои с утра и до вечера были заняты на работе — тем самым предоставив мне возможность «воспитываться» самому... Тут, конечно, немалую роль сыграла улица — а точнее, двор. Дворы «хрущевок» в шестидесятые годы — это соседство совершенно разных семей, и — единый кодекс о мальчишеской чести; это при-

чески «под битлов» у старших по возрасту, и — безногие инвалиды на досках с колесами у пивного ларька... В ту пору люди были как-то добрее друг к другу, мягче — а может быть, это просто кажется так, из детства.

Теперь часто слышу от сверстников уверения, что «хрестоматийные» персонажи из пионерско-комсомольской обоймы уже в те времена воспринимались ими не иначе как с иронией. Не хочу подвергать сомнению искренность таких утверждений — но о себе не могу сказать подобного. Даже сочинение по «Малой земле» на выпускных экзаменах писал — что, впрочем, не мешало совершенствоваться в подражании тембру «верного ленинца», рассказывая о нем анекдоты. Но в чистоту (и честность!) коммунистической идеи — верил. Драма моего поколения — нравственная раздвоенность. Хорошо, если, помимо идейно-казенных, появлялись и альтернативные, нравственные примеры — тогда был шанс не превратиться в законченного циника или обывателя.

В этом смысле первым нравственным примером для меня были родители, как ни странно. Отец занимал крупные, по местным масштабам, партийные посты, последний — секретарь обкома партии по идеологии, он безусловно несет на себе долю исторической вины КПСС — но я никогда не видел, чтобы он поступал подло или корыстно, чего, увы, не могу сказать о некоторых его коллегах, понастроивших себе особняки и расселивших своих чад в шикарные апартаменты. В коммунистические идеалы он верил и верит искренне — подобная убежденность, помимо сочувствия, все же не может не вызывать чисто человеческого уважения.

— *Сергей, извини за обывательскую банальность: чем объяснить, что дети начальников порой активно исповедуют совершенно противоположные политические убеждения?*

— Ты, конечно, не оригинален — меня уже десятки раз спрашивали об этом. Социальный факт, как говорится, действительно имеет место. Речь не обо мне одном. Члены Сойма БНФ Винцук Вечерко и Алесь Суша — классические тому примеры. Чем же объяснить их «отступничество»?.. Карьеризмом? Но политический талант Винцука и журналистский дар Алеся, подкрепленные к тому же связями, при условии «послушания» гарантировали обоим великолепную карьеру в официальных, коммунистических структурах. Желанием самоутвердиться? Но никакие личные амбиции не компенсируют тех семейных драм, кото-

рые сопутствуют инакомыслию. Возможно, каким-то объяснением может служить то обстоятельство, что дети высокопоставленных родителей изначально имели более широкий доступ к различного рода информации. А значит, имелась возможность сравнивать. Не завидую я предкам. У них, в партаппарате, как? Можешь иметь сына-алкоголика или дочь-проститутку — и тебе простится, но коли твой отпрыск посягнул на незыблемые устои...

Возвращаюсь к теме нравственных ориентиров. Однажды — я тогда учился в классе третьем или четвертом — отец принес домой учебник «Родная літаратура» с очень теплой дарственной надписью писателя, о котором я в ту пору, понятно, ничего не знал. Теперь это одна из самых дорогих мне книг в личной библиотеке. Ведь у очень и очень многих именно с творчества Владимира Короткевича начался процесс осознания — и собственной личности, и своей нации, и принадлежности — маленькой частицей — к нации, и принадлежности нации — к человечеству. Вообще же в так называемую пору застоя литература была именно тем источником, который сохранял нравственные критерии едва ли не в большей степени, чем содержала их реальная жизнь. Возможно, что в нормальном обществе литература должна быть самоценна и нести скорее эстетическую, нежели непосредственно воспитательную функцию — но где оказались бы мы, не будь в этом мире Михаила Булгакова, Бориса Пастернака, Василя Быкова, того же Владимира Короткевича?

— *Это твои любимые писатели?*

— Литературные пристрастия у меня разнообразны. Причем политические позиции авторов особого значения не имеют. Перечитываю Габриеля Маркеса и Германа Гессе, Андрея Битова, Валентина Распутина, тех же Быкова (особенно — «Знак беды») и Булгакова. Из поэзии — Вознесенского, Бородулина, раннего Мандельштама.

— *Ну, а музыка?*

— Здесь мои вкусы консервативны: слушаю, хотя не вполне «прочувствовал», Шостаковича и Шнитке, а вот Первый концерт и «Щелкунчика» Чайковского, кое-что из Рахманинова знаю почти наизусть.

— *Ей богу — завидую!!*

— Чему? Я, увы, ни на одном из инструментов играть не умею.

— *Чтобы не разочароваться, перейдем-ка лучше к следующей музе — живописи...*

— Близки Тулуз-Лотрек, Ренуар, как любому уважающему себя витеблянину — Шагал. Нравятся и работы художников-земляков Феликса Гумена и Александра Соловьева.

*— Отлично. Осталось выяснить твои отношения с драмой и комедией...*

— Одно время, работая в областной газете, подвизался писать театральные рецензии и даже был приглашен в аспирантуру, но вовремя отказался, так как понял, что не могу отличить плохой игры от хорошей: я слишком доверчивый человек, и меня легко обмануть.

*— Доволен ли ты своей корреспондентской судьбой? Чем гордишься в ней?*

— Поскольку о каких-то особенных успехах в журналистике говорить не приходится, остается радоваться «прорывам» в иные сферы. Будучи в армии, лучше всех в дивизионе стрелял из пистолета и автомата, даже грамоты есть. Это задевало себялюбие коллег-офицеров: надо же — журналист, но не только пером по бумаге водить умеет. Так что когда на сессиях Верховного Совета депутаты в лампасах, упрекая меня в очернении доблестной Советской Армии, переступают границы такта, я жалею, что из кодекса чести советского офицера исчезли дуэли... Но если серьезно — в жизни не убил даже курицу, а изобретение пороха считаю самым гнусным порождением человеческой мысли. Я — убежденный пацифист.

*— Рядом с гордостью вечно сопутствует стыд...*

— Есть, конечно, стыд за какие-то политические действия, совершенные в юности по недомыслию — ну, то же сочинение по «Малой земле». Но больнее переживаешь не за уже совершенное — а из-за того, что не успел что-то сделать вовремя. Это — чувство вины перед родными и близкими, уже ушедшими из жизни, и я не думаю, чтобы со временем оно ослабевало. Речь о глубоко интимных переживаниях, и мне не хотелось бы распространяться о них публично. Давай лучше пройдемся по другим этическим категориям.

*— Совсем другим? Идет: когда ты скрежещешь зубами?*

— Презираю трусость и неискренность. Эти два качества в нашем антигуманном, бесчеловечном обществе порождают насилие — главную «движущую силу» тоталитаризма. И тем не менее — людей нужно прощать. Не каждому дано господом Богом выстоять под напором системы.

*— Насчет Неба спорить бесполезно... Но все же мы живем на Земле — надобно и самому думать о себе, о своем нравственном взрослении...*

— Тут такое дело: с одной стороны, постоянно ощущая собственную невежественность, несовершенство, осознаешь необходимость самообразования — а с другой, изначально советская школа, а затем последующие звенья идеологического механизма с его дебильной методой весьма прочно вбивают в тебя страх этого самого образования, развития. Особенно же печально, что в нашем самосознании отсутствует философская подкладка — и при этом изучать Шопенгауэра или Бердяева возьмется не каждый, ибо свежи в памяти нехитрые постулаты философии марксистско-ленинской. А вообще система коммунистического тоталитаризма заложила в человека не просто страх как психологическое явление, а страх исторический. Мне до сих пор не ясно, почему руководители Компартии, в 70-х годах в частности, так упорно заставляли скрывать правду о репрессиях — ведь, казалось, наоборот, было бы выгоднее: запугали как следует народ, и дело с концом. Ведь и вера в скорую победу коммунизма к тому времени окончательно иссякла даже у самых убежденных марксистов-ленинцев. В 1981 году в студенческом стройотряде на несколько дней поехали с товарищами на Соловецкие острова. Облазили весь монастырь, ночевали на каких-то полуистлевших тюфяках в келье XVII столетия — этакая приключенческая романтика. А в первый день спросили у экскурсовода — стояли тут где-нибудь тюрьмы, может и следы остались от них? «Да что вы, ребята, какие тюрьмы, Соловки — чудо природы, вот только реставрацию бы провести в монастыре!» — был ответ...

О том, что все обстоятельства жизни советского человека, включая самое необходимое (жилье, например), зависели от политической лояльности — нечего и говорить.

*— Выходит, весь жизненный уклад подталкивал к смирению либо компромиссу?*

— С первым все ясно. Что до второго варианта, то, по-видимому, он неизбежен — во всяком случае, в политике, где действуют разнонаправленные векторы интересов. Однако я лично стараюсь прибегать к нему как можно реже, поскольку это именно тот случай, когда количество рискует неизбежно перерасти в качество — в бесхребетный, угодливо согнутый конформизм.

*— Можно ли вырастить свободную личность, скажем*

*так, путем насилия, пусть даже и самого малого?*

— Нет, даже если оно мотивировано благородными побуждениями. Иное дело — обучение неким профессиональным навыкам, когда тебя обязывают доводить начатую вещь до кондиции. Но это — шлифовка мастерства. Кстати, осуществление права на свободу предполагает хорошее владение хотя бы одной профессией — тем более в обществе, где социальные гарантии сведены до минимума.

— *А когда ты понял: «Я — самоценная личность, а вовсе не один из десятков, сотен, тысяч?»*

— Наверное, это случилось в студенческие годы. У меня были очень сильные конфликты со старостой — попался на курсе такой паренек после морфлота, считал своим долгом нас, сосунков, уму-разуму учить. Затем конфликт перерос бытовые рамки. Однажды на журфаке выпустили стенгазету, в которой имели неосторожность воспроизвести известную статью Ленина по национальному вопросу,— уж не помню теперь, в каком томе Полного собрания сочинений она была напечатана. Но главный факультетский цензор профессор Пыжков усмотрел-таки в праве наций на самоопределение, пусть даже и высказанном вождем мирового пролетариата, крамолу. Газета была содрана со стенда. Какие-то серьезные неприятности грозили Сергею Дубовцу, ну, а меня и Алеся Сушу наказали банально и бездарно. После первомайской демонстрации декан факультета, автор целой серии книг о детских, юношеских и зрелых годах Ильича, Павел Иванович Ткачев вдруг заявил, что во время первомайской демонстрации мы бросили в лужу государственные флаги СССР и БССР, да еще потоптались по ним. А я, помимо всего прочего, достал из сумки бутылку водки и якобы щедро угощал товарищей, оскверняя тем самым праздник солидарности трудящихся всех стран. Разумеется, это была несусветная чушь, на счастье, однокурсники и наш куратор Ирина Фроловна Ухванова опровергли этот бред, но нервы потрепали здорово.

И вообще, меня постоянно втягивало в совсем небезопасные истории. Как-то так получалось, например, что многие мои публикации потом перерастали в акции, во всяком случае, требовали от автора не столько журналистских, сколько политических или каких-то иных качеств. Иногда после нервотрепки, хождения по инстанциям казалось, что дело безнадежно проиграно, что иссякли последние надежды — но летело время, и справедливость торжествовала. Так было с идеей создания музея Шагала в Витебске, с

реставрацией некоторых архитектурных памятников. Конечно, способствовали тому вовсе не мои публикации, а заинтересованность людей.

— *Давай не будем скромничать по части журналистского профессионализма. Скажу, как есть: по-доброму завидовал мужеству и умению, какими были пронизаны твои статьи об истории строительства АЭС под Витебском. Как вышел на эту тему?*

— О том, что начинаются проектные работы, узнал совершенно случайно, в июне 88-го года. Чем глубже изучал проблему атомной энергетики, чем больше беседовал с экологами — тем яснее становилось, бомба какой разрушительной силы закладывается под потомков ничего не подозревающих витеблян. Решение о возведении станции на чудом уцелевшем от радиогрязи кусочке белорусской земли было одобрено партийным руководством республики спустя год после чернобыльской катастрофы — это ли не верх безразличия к судьбе собственного народа? Особенно отвратительно то, что делалось все под покровом строжайшей секретности. И хотя витебское руководство в принципе возражало против строительства, но, с другой стороны, делалось все, чтобы народ оставался в неведении. Было ясно: областное начальство не сможет долго удержать напора Минска и Москвы, если свое слово не скажет народ. А люди еще ни о чем не знали. За одну ночь написал статью — но редактор от публикации отказался. Пришлось ксерокопировать текст, пускать по рукам. Наконец, когда удалось уломать шефа и набранный материал уже стоял в газетной полосе — звонок первого секретаря обкома партии, и материал слетает. Вместо него выходит печально знаменитая «Пена на волне перестройки», где на чем свет клеймят минских неформалов. Ну, а на первой полосе нашлось словцо и для местных, витебских: мол, группка авантюристов распространяет непроверенные сведения о строительстве АЭС, нагнетает напряженность в трудовых коллективах... На следующее утро вышли к универмагу с пикетами. Под требованием «Мы — против строительства Белорусской АЭС и планов размещения ее на территории Витебской области» на заводах, в учреждениях собирали подписи. До сих пор считаю, что эти две строки — самые результативные из всех, которые довелось мне когда-либо написать.

Зноў жа па сабе мяркую. Вось быў гэтым я дзіцём, як кажуць, ніякім, савецкім хлопчыкам. Пабачыў, як на Украіне, у Літве, жывуць нейкія людзі, не зусім правільныя — у іх там нейкія мовы ёсьць, архітэктура трохі не такая... Усё гэта ўспрымалася адступленьнем ад нашага добрага стандарту. Праблемы тых людзей былі абсалютна далёкія і незразумелыя. Затое пасьля таго, як я ўсьведаміўся беларусам, нешта, хай мінімальнае, спасьціг — што гісторыя маёй зямлі шматпакутная, але і слаўная, што ёй ня семдзесят, а тысяча гадоў; калі самастойна вывучыў мову, бо не было такога настаўніка,— вось тады я зусім інакш пачаў ставіцца да пакутаў латыша, які баіцца, што яго народ стане меншасьцю на сваёй зямлі; да бедаў расейцаў, якія баяцца, што зьнікнуць паўночныя рэкі, а зь імі й непаўторная архангелагародская культура; бедаў і пакутаў тых жа валійцаў, тых жа брэтонцаў — народаў ня першага гатунку ў сваёй жа дзяржаве, зусім як мы... Зьявілася, адным словам,

стэрэабачаньне, нарадзіліся эстэтычныя імпульсы ад спробы пранікнуць у душу іншага народа. Узяць хоць чытаньне грузінскай прозы. Агульначалавечую яе каштоўнасьць я ўсьведаміў, зайшоўшы ў гэты поўны пахмяцяў непаўторны, унікальны грузінскі нацыянальны сьвет, гэтак непадобны да нашага. І ад таго, што я, беларус, займеў у сваёй душы і гэты куток, створаны Аміраджыбі ды іншымі, ад гэтага ж толькі ўзбагаціўся мой нацыянальны сьвет. Вось які патрыятызм я маю на ўвазе.

*— Вас, аднак, называлі не патрыётамі, а не менш чым нацыяналістамі. Такое зневажала? Вы спрабавалі растлумачыць уласную пазіцыю?*

— Чаго-чаго, а ярлыкоў хапала... Колькі патрачаных нэрваў яны каштавалі, колькі стандартных адказаў мы напрацавалі, пакуль дзейнічала «Майстроўня», потым — «Талака». У нас ужо тады зьявілася сыстэма: сьпеўкі — лекцыя, сьпеўкі — экскурсія, сьпеўкі — дыскусія, сьпеўкі — вандроўка... Ня тое, каб гэта ішло па нейкім стратэгічным пляне, проста мы імкнуліся, нам было цікава і важна разьвівацца інтэлектуальна. Разумееш, зьбіраліся людзі, якія разважалі прыкладна ў аднолькавым рэчышчы: ну калі мы ня станем беларусамі ў поўным сэньсе гэтага слова, то хто? Гэта адно. Было і другое: пачуцьцё справядлівасьці, адчуваньне, што нешта ў нашым родным краі ненармальна. І за гэта чуць сябе нацыяналістамі?

Цярпліва, даходліва, нібы дзецям неразумным, тлумачылі элемэнтарнае: нацыяналіст — гэта, таварышы, той, хто зьневажае іншых, ставіць свой народ вышэй за суседні... З другога боку, сусьветная ж традыцыя ўжываньня гэтага тэрміну зусім інакшая, гэта ў нас за семдзесят гадоў ён неяк вывернуўся ў бок шавінізму, што зусім, як кажуць, зь іншай опэры. У сусьветнай паліталёгіі нацыяналістычнымі называюцца ўсе так званыя нацыянальна-вызваленчыя рухі трэцяга сьвету. Таму калі мы хочам далучыцца да сучаснай замежнай філязофскай думкі, нам трэба разабрацца са сваёй «саматканай» тэрміналёгіяй. Можа мы і сапраўды нацыяналісты, толькі ў агульнаэўрапейскім сэньсе. А такога саромецца ня трэба.

*— Дарасламу заўсёды лягчэй абараніцца ад з'едлівых кпінаў, навешвання тых жа самых ярлыкоў, лягчэй прывыкнуць да касавурых позіркаў... Ну, а дзецям як? Як рэагуюць твае дзеці на прэсінг ранняй сацыялізацыі?*

— Адразу скажу: я кепскі выхавальнік — бракуе часу...

Выратаваньне ў жонцы. Што да паднятай праблемы, яна была б невырашальная, каб мы былі па адным. Вялікае шчасьце, што мы ішлі ўжо гэнэрацыяй, што нас шмат. Не забудуся, як недзе ў годзе 79-м мы хадзілі да Караткевіча і пачулі наступнае: «Хлопцы, гляджу на вас і цешуся: мы ж былі ў шасьцідзесятыя, як купіны на балоце; стаіш на ёй і бачыш недзе далёка-далёка яшчэ адну постаць на гэткай самай купіне... А вы ўжо цэлую выспу, цэлы востраў занялі». Мы прыблізна адначасова жаніліся, заводзілі дзяцей у адзін час і таму стварылі нейкае сваё дзіцячае асяродзьдзе, нашы дзеткі сябруюць паміж сабой. Ёсьць і праблемы. Дачка, напэўна, і камплексуе, калі трапляе ў новае рускамоўнае асяродзьдзе аднагодкаў — тыя і «дзярэвняй» калі-нікалі абзавуць, і пазьдзекуюцца часам... Таму і камплексуе, за лепшае лічыць тады маўчаньне. Затое сярод аднамоўцаў — энэргічнае, талковае дзіцё, усё нармальна. Цікава, што яна навучыла беларускай мове суседзкіх дзяўчатак з рускай сям'і, вельмі талерантнай. Яна бярэ прыклад з нас — на Беларусі мы гаворым па-беларуску з усімі, ну хіба чалавек прыежджы, зусім здалёк і разумее толькі па-руску. Мая пазыцыя: калі я буду пасьлядоўна карыстацца мовай, тады ў іншых ня стане «жалезнага» аргумэнта — ах, у мяне няма адпаведнага асяродзьдзя, а таму кажу, як усе!.. Між тым ёсьць ужо добрая купа сапраўды беларускіх сем'яў, дзеці якіх таксама карыстаюцца роднай мовай. Мовай бацькоў.

Нашы дзеці разам з намі ходзяць на мітынгі, для іх усьведамленьне сваіх бацькоў непадобнымі да іншых мае, безумоўна, нейкае сваё вельмі пэўнае значэньне. У што яно выльецца, мне цяжка пакуль прагназаваць. Ня ведаю, можа гэта і нядобра. Можа, сям'я павінна быць толькі цёплым такім агмянём, дзе ёсьць народная традыцыя, дзе ёсьць літаратурнае слова, дзе ёсьць добры бацькоўскі прыклад — гэта ў ідэале. Але ў нас цяпер такі час, што інакш няма як.

І зрэшты, хто ведае, як павернецца жыцьцё, што давядзецца рабіць нашым дзецям, ці не спатрэбіцца ім нейкі гарт, набываны ўжо сёньня. Індыра Гандзі, да слова, выхоўвалася з маленства ў атмасфэры палітычных гутарак ейнага бацькі, ейнай слаўнай сям'і.

— *І гэта пайшло Індыі на карысць...*

— Індыі — так. Але барані Бог, я ня думаю праводзіць тут аніякіх паралеляў!

— *Разам з тым у нейкім сэнсе на вашых сем'ях ідзе*

*апрабацыя пэўнай грамадскай мадэлі заўтрашняга дня, ці так?*

— Нашы сем'і далёка не ідэальныя, хоць апрабацыя сапраўды йдзе. Між нашай волі.

— *А як да гэтага ставяцца старэйшыя пакаленні вашых радаводаў?*

— Я ўспамінаю цяпер сябе, сяброў ранейшымі: якія мы былі самаўпэўненыя, бачылі сябе ўсё адкрывальнікамі, піянэрамі... А потым пачалі даведвацца, што, мякка кажучы, гэта зусім ня так, што, можа быць, гісторыя сама так пакруцілася... Хаця сапраўды на вуліцы мы выйшлі задоўга да перабудовы, гэта я заўсёды не прамінаю падкрэсьліць, калі чую: «Ах, перабудова стварыла магчымасьці!» Не, магчымасьці стваралі і мы. Вялікае ўражаньне пакінула размова зь Зянонам Пазьняком, калі рашуча прыйшлі да яго, патрабуючы тэрмінова сабраць усіх сьвядомых людзей, выпрацаваць нейкую стратэгію, праграму... Толькі ён быў цёрты жыцьцём чалавек: «Хлопцы, ні ў якім разе! Калі вы хочаце, каб усіх нас накрылі і рух быў спынены на бліжэйшыя дваццаць гадоў, тады абавязкова трэба зрабіць па-вашаму». Ён мала нас ведаў, і на мяне вялікае ўражаньне зрабіла, як ён паверыў нам, сказаў: «Галоўная задача — гэта змагацца за незалежнасьць, супраць камунізму». Сказаў гэта вельмі даўно. Я зразумеў, што мы ня першыя на гэтай зямлі, ёсьць людзі, якія рабілі, робяць і будуць рабіць гую справу, што фактычна раскрылася, распрастала крылы толькі цяпер.

— *Дзякуй, але я меў на ўвазе і крыху іншае, калі задаваў папярэдняе пытанне. Сфармулюю больш жорстка: чытачы не зразумеюць, калі я не спытаю, а ты не адкажаш пра свае ўзаемаадносіны з бацькам. Даўся яму ў знакі? Паўплываў твой выбар жыццёвага шляху на яго грамадскае становішча?*

— Гэта была агульная бяда. Пэўны час мае ідэалы ўспрымаліся сям'ёй як прыкметы падлеткавага максымалізму. Аднак пступова высьветлілася: ёсьць іншае — натуральны канфлікт пакаленьняў у чыстым яго выглядзе. Сытуацыя складвалася надзвычай складаная, непрыемная, цяжкая для бацькі, ён меў масу непрыемнасьцяў, і пагоршанае здароўе выразна адлюстравала тое... У сваю чаргу, натуральна, двухсэнсоўным было ўвесь час і маё становішча: як жа, нашчадак намэнклятурнай сям'і! Праўда, тут ёсьць момант — мы не карэнныя менчукі. Да сталічнай намэнкля-

туры той жа бацька далучыўся, калі мне было гадоў трынаццаць. Так што я не выхоўваўся ў асяродзьдзі залатой багэмы, і дзякуй Богу. Хадзіў, як кажуць, сваімі дарогамі.

Карацей, канфлікты даліся ў знакі ўсім. Калі я балятаваўся на выбарах у Вярхоўны Савет БССР, галоўным контраргумэнтам апарату было якраз намэнклятурнае паходжаньне. Вось, маўляў, старэйшы пры ўладзе, цяпер і малодшы туды цэліць... Абвяржэньне было адным — свая пазыцыя. Але, паўтараю, на бацькавым становішчы гэта адлюстравалася болей. Цяпер паміж намі існуе паразуменьне, ёсьць у кожнага свае погляды, свае пазыцыі.

— *Прыклад сямейна-палітычнай талерантнасці?*

— Так. І бацька мяне зразумеў цяпер куды болей. Гэта натуральна: мы ўсе зьмяняемся, сталеем. Вось... Сацыяльнае паходжаньне моцна стрымлівае мяне. Я б не балятаваўся ў народныя дэпутаты, але так было неабходна — мяне, можна сказаць, прывялі: «А хто яшчэ? Трэба ратаваць сытуацыю...»

— *Колькі ты галасоў набраў?*

— Сорак шэсць працэнтаў выбаршчыкаў былі «за».

— *А з кім змагаўся?*

— У першым туры ажно з шасьцю, у другім — з генэралам. Пасьля старту я значна апярэджваў яго. А на фінішы, з улікам складанасьці раёна — прыватны сэктар Грушаўкі, «хрушчоўкі», што побач зь ёй,— генэрал мяне апярэдзіў на працэнт, для перамогі і яму крыху не хапіла. Аддам належнае гаркаму партыі — папрацаваў супраць мяне вельмі шчыра: штоночы зьяўляліся паскудныя ўлёткі, дзе абыгрывалася ўсё тое ж сацыяльнае становішча, прыдумляліся незьлічоныя сацыяльныя даброты, якія я нібыта маю дзякуючы бацьку... Давялося гэтага агіднага варыва каўтнуць удосталь.

Шчыра кажучы, было б лепей, каб «Майстроўню», «Талаку», Фронт стваралі людзі не майго паходжаньня...

— *Разлік на інерцыю класавага выхавання?*

— Сем дзесядзігодзьдзяў зрабілі сваё... Аднак зазначу: непрыняцьце рэжыму ў мяне не асацыявалася з бацькам. Я бачыў, што ён сапраўды працуе начамі й выхаднымі, шырокія ўяўленьні пра намэнклятуру зусім іншыя. Хоць меркаваць, зразумела, тым, з кім ён працаваў, але для мяне бацька быў, ёсьць і будзе бацькам. Пра намэнклятуру я меркаваў якраз па стылі вышэйшых кіраўнікоў: Паўлава, Антановіча, Пячэньнікава, Сакалова... Узгадваю іхнія выступы, іхнія адносіны да таго, што мы рабілі — а ішло ад пачатковай

міралюбнасьці да сьведамага непрыняцьця... А дрымучае невуцтва вярхоў і памагатых? Яно было для многіх з нас такой цудоўнай школай сацыяльнай арыентацыі! Адно вярзеньне пра нейкую «поповщину» ў сьвяце Купальля чаго вартае... Яно пераконвала, да якой жа ступені люмпэнская, прымітыўная гэтая партыйна-савецкая эліта, што, натуральна, не магло не паглыбляць канфрантацыю, перакананасьць: вось гэтыя ну нікуды і ніяк нас ня выведуць!

Вядома, увесь адрэзак савецкай гісторыі народу прышчаплялася, выхоўвалася падазронасьць да інтэлігенцыі творчай, навуковай, рэлігійнай, нарэшце. Яна плянамерна вынішчалася, а пра Беларусь дык наогул няма чаго казаць, тут адстрэл вёўся фактычна франтальна. Прапорцыя сяброў Саюзу пісьменьнікаў года 37-га ад года 29-га складае працэнтаў дзесяць... Таму пажынаем тое, што мелі. Безумоўна,ніводная нацыя ня можа абысьціся без... Я тут рызыкую, калі гэта кажу — узьняты папулісцкі грэбень хвалі ставіць мяне ў двухсэнсавае становішча, але нацыя ня можа абысьціся бяз той эліты духоўнай, якая нясе каштоўнасьці, якая вяртае іх народу ў крытычны момант — і ў народу зьяўляецца апірышча. Літоўцы гэта здолелі зрабіць. Яны здолелі захаваць эліту нацыянальную, культурную й палітычную, якая прайшла лягер, захавала ў касьцёлах вернасьць нейкім спрадвечным ідэалам, у эміграцыі. І ў крытычны паварот літоўскай гісторыі высьветлілася: народ гатовы да выпрабаваньняў, да гэтай блякады, яшчэ нейкага ліха. У іх ёсць інтэлігенцыя, якая аппладняе людзей думкай.

— *Вывад: у нацыі павінны быць прафесійныя думанні кі?*

— Прычым шмат. У нас жа многае засланіла анкета. Дарэчы, той факт, што пераважная большасьць вышэйшага кіраўніцтва паходзіць пераважна зь сялян і рабочых, гэта з аднаго боку цудоўна — напрыклад, для многіх зь іх ня склала б праблемы вярнуцца да роднай мовы, тут абы жаданьне; аднак, з другога боку, поўныя гонару за сваё сацыяльнае паходжаньне, але не задаўшы сабе працы зраўняцца з дасягненьнямі, вяршынямі сусьветнай і ўласнай цывілізацыі, яны засталіся на прымітыўным узроўні. Да гэтага дадалося і праклятае паўмоўе: ад роднага слова адбіўшыся, расейскім не авалодалі. У выніку — няздольнасьць выказаць глыбокую філязофскую думку ці абагульненьне, сфармуляваць ідэю, якая падштурхне да прарыву ў фундамэнтальных навуках, ні тым больш выказаць далікатнае эстэтычнае, маральнае пачуцьцё... Адсюль маем ганебную адсутнасьць ляўрэатаў Нобэля, адсюль у нас ці не найменшая колькасьць пісьмень-

нікаў на тысячу чалавек сярод народаў, якія ўтвараюць саюзныя рэспублікі... Маем тое, што маем — агульную інтэлектуальную, палітычную, а цяпер яшчэ й фізычную дэградацыю.

*— У сваіх развагах ты нагадаў некалькі прозвішчаў былых першых асоб рэспублікі, апусціўшы пры гэтым Машэрава. Чаму? І яшчэ: пасля вядомых падзей 30-га кастрычніка ў друку абыгрывалася такая думка — мы ішлі да адналькава святых беларусам магіл Караткевіча і Машэрава, а нас сустрэлі вадамётамі. Два гэтыя прозвішчы ставіліся побач свядома, або тут была нейкая палітычная гульня-аднадзёнка? Дзеля згладжвання сітуацыі?*

— Думаю, тыя, хто гэта казаў, казалі шчыра. Я — гэтага не казаў. Таму што разумеў — гэты чалавек вельмі многае рабіў шчыра. Разам з тым я перакананы: Машэраў умацоўваў сыстэму, няхай і міжволі, але ствараў у людзей нейкія ілюзіі. Хоць выгодна суб'ектыўна адрозьніваўся ад большасьці сабе падобных, свайго акружэньня. Ён здолеў захаваць у некаторых выпадках элемэнтарную чалавечнасьць, будучы на такой пасадзе і трымаючы ў руках такую ўладу. Напэўна, ён рабіў гэта не дзеля іміджу, як прынята цяпер, калі «першыя» пачалі задумвацца, раіцца зь нейкімі кансультантамі, наколькі эфэктоўна атрымліваецца — іншая справа. Але ня трэба заплюшчваць вочы і на тое, што для Машэрава не існавала як самакаштоўнасьць беларуская нацыянальная культура, ён заставаўся ў поўным і абсалютным палоне ідэалягічных догмаў і не рабіў спробы вырвацца зь іх. Нарэшце, ён ня здолеў зрабіць для Беларусі таго, чаго дамогся для Літвы Снечкус — абмежаваць насаджэньне хімічных і іншых экалягічна шкодных прадпрыемстваў, а ў выніку рэспубліка літаральна нафаршыравана імі. Гэта вынік «шчырасьці і адкрытасьці» Машэрава. Мы павінны ўсьведамляць усё вельмі выразна і не ствараць сабе куміра.

*— Ты лічыш, што ў тых, сваіх абставінах, сваёй уладай ён мог дабіцца прынцыпова іншага?*

— Мог жа Снечкус...

*— У такім разе, якія якасці прафесійных думаннікаў, па твайму ж выразу, вылучаюцца на першы план зараз? Што ты думаеш пра работу нашага, сённяшняга парламента?*

— Я ішоў на выбары пад лёзунгам «Беларусь, вяртайся ў Эўропу!» Што ўкладаў у яго? Безумоўна, такую думку: калісьці мы ў гэтай Эўропе былі не чужыя, калісьці наша

мова была мовай міжнацыянальных зносінаў цэлага вялікага рэгіёну ад Балтыйскага да Чорнага мораў... Ідэі, народжаныя на беларускай зямлі, сягалі ўсёй Эўропай да Францыі і Гішпаніі. Ідэі, народжаныя там — Томаса Гобса і Лютэра, і Вальтэра — пранікалі да нас. Гэта была суцэльная культурная прастора.

— *А што мы далі Томасу Гобсу?*

— Хіба недастаткова Сымона Буднага? Ён быў папярэднікам Гобса і Вальтэра... Альбо цяпер Скарыну мы адназначна падаем як піянэра, але ж і да вялікага першадрукара сьцежка была пратаптаная. Хто такі Джон Літоў? Ян Ліцьвін — адзін з ангельскіх першадрукароў, у лёнданскім Сіці стаяў ягоны станок. Я ж перакананы, што ён зь якога-небудзь Наваградка. Наша сыстэма адукацыі была тады стандартна-эўрапейскай: набыўшы адукацыю ў Полацку й Вільні, Скарына пайшоў потым у Кракаў і далей, быў падрыхтаваны на належным узроўні. І вось нас гвалтам адрэзалі ад гэтага, мы аказаліся зусім у іншай культурнай прасторы. Бяда і трагедыя Расеі ў тым, што яе напаткала татарскае ярмо. Вечавыя традыцыі былі забытыя, зьявілася пірамідальная структура, сыстэма «царь и холопья». А ідэалёгія камунізму знайшла ў гэтай клятай азіяцкай традыцыі ідэальную глебу і спарадзіла пачвару, імя якой Савецкі Саюз. Яна адрэзала народы, прыналежныя да Эўропы, ад гэтай самай Эўропы. І калі прыбалты аказаліся адлучанымі ад яе значна пазьней, то нас такое не спаткала, і мы аказаліся сьцертыя з памяці эўрапейцаў наогул як народ. Нас прымаюць за нейкіх «белых рускіх», маўляў, тут нейкім дзіўным чынам жывуць рускія белагвардзейцы.

— *Што такое еўрапеізм Беларусі?*

— Лепшыя нашы думаньнікі сёньняшняга дня — Васіль Быкаў, Уладзімір Конан — грунтаваліся і грунтуюцца на эўрапейскіх каштоўнасьцях, на каштоўнасьцях хрысьціянства і дэмакратыі, на каштоўнасьцях нацыянальна-гістарычных. Нядаўна ў аддзеле рэдкай кнігі Акадэміі навук я пабачыў народнага дэпутата СССР Алеся Дабравольскага, якога Фронт падтрымліваў на выбарах. Ён там штудзіраваў Джона Сцюарта Міля, аднаго з клясыкаў тэорыі парлямэнтарызму. Усіх бы нашых народных дэпутатаў туды, у аддзел рэдкай кнігі! Паглядзець Міля, пагледзець працы, напісаныя 200—300 гадоў таму назад. Ня буду доўга казаць, што мы павінны жыць у кантэксьце сусьветнай культуры і нарэшце страсаць зь сябе гэтыя шоры, што сталі за семдзе-

сят гадоў жалезнай заслонай. Мы павінны быць адкрытыя сусьветным вятрам культуры і ў ніякім разе не замыкацца ў сваёй шкарлупіне. Таму так важна спасьцігнуць урокі сусьветнага парлямэнтарызму. Дарэчы, калі ў Вярхоўным Савеце заклікаюць да цярплівасьці, узаемапашаны, то, як мне падаецца, фракцыі БНФ гэтыя заклікі наўрад ці трэба адрасаваць. Яна дастаткова талерантная, улічваючы абсалютную меншасьць прыхільнікаў Народнага фронту з дэпутацкімі мандатамі.

— *Малавата ў цябе парламенцкага аптымізму...*

— Шчыра кажучы, я вялікі пэсыміст, што да працы гэтага Вярхоўнага Савету (ён — далёка не парлямант!). У мяне ёсьць глыбокае перакананьне: ён не працягне ўсе законныя пяць гадоў. Радыкальныя эканамічныя рэформы магчымыя толькі пры даверы народа да ўраду і вярхоўнай заканадаўчай улады. Такога даверу няма — мяркую па мітынгах, кантактуючы з сацыяльна актыўнымі людзьмі, ды і з сацыяльна пасыўнымі, у рэшце рэшт. Няма даверу. Значыць, гэты ўрад радыкальных захадаў зрабіць ня зможа. А палавіністыя выніку не дадуць. Вось чаму развал так і так сьвеціць. І калі мы ня будзем гатовыя зараз да таго, каб новыя выбары... Стоп, па інэрцыі так і падмывае сказаць далей — «у Саветы». Не, Саветы — мёртванароджаная форма, форма рэалізацыі дыктатуры. Намінальна клясы, а фактычна партыі. Я пазаўчора чытаў Кнорына — быў такі рэвалюцыйны дзяяч на Беларусі, дык ён ганарыўся, як яны задушылі дэмакратычныя органы, ён выхваляўся, як ім удалося набраць фактычна падстаўных людзей: *«Эти люди никого не представляли, но они отражали интересы рабочей и солдатской массы, и мы из них создали Совет рабочих и солдатских депутатов».* Яны ганарыліся гэтым! Трэба скончаць з гэтай дзікай традыцыяй.

— *А што ўзамен?*

— Трэба выбіраць Устаноўчы сойм, ідэя якога прагучала ў васямнаццатым годзе, у часы тварэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Мне здаецца, калі мы цяпер ня будзем інтэлектуальна, маральна гатовыя да таго, то нас будзе чакаць страшная параза. Нас будзе чакаць гістарычны віток вяртаньня да таталітарызму. Хто прыйдзе да ўлады? Бог яго ведае, які там генэрал Радзівонаў знойдзецца на нашую галаву...

— *«Нас» — гэта народ у цэлым, як вынік. А пачатак, «мы» — гэта хто?*

— І Беларускі народны фронт, і ўсе дэмакратычныя

сілы, аб'яднаныя барацьбой супраць таталітарызму, за адраджэньне незалежнай Беларусі. Таму такая вострая патрэба ў гуртаваньні наяўных сілаў — эканамістаў, філёзафаў, спэцыялістаў па экалёгіі, талковых палітыкаў, здольных прадказваць падзеі. На вялікі жаль, мала такіх людзей. Ня тое каб мала інтэлектуалаў — мала людзей, гатовых згуртавацца і энэргічна працаваць. Вось цяпер, на патрэбу сёньняшняга моманту думаць глябальна і глыбінна. Можа быць, зараз гэта самая вялікая наша праблема. Хаця можна гаварыць і пра неабходнасьць стварэньня масавага руху і страйкавых камітэтаў, але ўпусьцім менавіта гэта — будзе агульнагістарычны крах.

— *Твае разважанні аб новым парламенце рэспублікі адкруцілі назад некалькі месяцаў маёй памяці — нагадаў папярэдні Вярхоўны Савет, які папярэдзіў «бунтарскую» Літву аб магчымых тэрытарыяльных прэтэнзіях да яе з боку Беларусі. Што ты думаеш пра тую заяву?*

— Кранаешь вельмі далікатную тэму... З аднаго боку, я сакратар управы БНФ і мае словы, будучы апублікаванымі, будуць трактавацца як погляд чалавека, які зьяўляецца ў нечым рупарам арганізацыі. З другога боку, ёсьць і мае нейкія асабістыя думкі. Але паспрабую неяк прайсьці на гэтым лязе...

— *Паміж Сцылай і Харыбдай...*

— Імі самымі. Ратаваць нацыю мы павінны, не зважаючы на тое, якімі адміністрацыйнымі межамі яна аказалася парэзанай. Гэта ня наша віна, а наша трагедыя, што беларускі народ у сваіх этнічных межах у XX ст. так і ня быў аб'яднаны ў адной дзяржаве. Беласточчына, Смаленшчына, Дзьвіншчына сярэдняя, Віленскі край, Севершчына — гэта землі, на якіх беларусы жылі спрадвеку, якія далі нашай культуры выдатных дзеячоў. Што датычыць Віленшчыны, то зь яе быў родам ня хто іншы, як Бранілаў Тарашкевіч, першы ўпарадчык нашай літаратурнай мовы. Такім чынам, віленскі дыялект, безумоўна, быў падставай нашай літаратурнай мовы, прынамсі да 33-га года ва Ўсходняй Беларусі і да 39-га ў Заходняй.

Тая складаная сытуацыя, якая паўстала цяпер у Віленшчыне,— гэта вынік гульні імпэрскіх сілаў, што, ня дбаючы пра інтарэсы беларускага народу, над нашымі галовамі заключалі пагадненьні, перадавалі кавалкі нашай тэрыторыі камусьці, ад некага забіралі, калі гэта было ім выгодна. Я не пускаюся зараз у гістарычныя нюансы, пра гэта пісалася, у тым ліку «Звяздой». Дык вось, цяпер маем дзіўную

сытуацыю: у Вільні жыве больш за палову літоўцаў, але ўсе прыежджыя, пераважна зь Літвы глыбіннай; а ў Віленскім краі большасьць насельнікаў беларускамоўная, а па сьвядомасьці палякі, палякамі яны сябе лічаць, бо так ім казаў касьцёл, ва ўсякім разе апошнія 150 гадоў.

Мы асудзілі заяву Вярхоўнага Савета БССР, бо яна выглядала вельмі непрыгожа на той час, калі Літва паказвала ўсяму Савецкаму Саюзу шлях, як трэба ісьці да дэмакратыі,— трэба рашуча рваць з «цэнтрам», які навязвае ідэі кансэрвацыі, прыхарошанага таталітарнага ладу. І ў гэтым сэньсе прывязка тэрытарыяльных інтарэсаў Беларусі да таго, які шлях абярэ Літва, выглядала звычайным нажом у сьпіну: прабачце, панове, але дзе вы былі пяцьдзесят гадоў таму — і паўстагодзьдзя таму назад там жылі беларусы, і ў іх былі свае моўна-культурныя інтарэсы. Якія, дарэчы, ня браліся ў рахубу ні літоўскім камуністычным урадам, ні Масквой, ні Менскам. Спачатку беларуская інтэлігенцыя Віленшчыны была вынішчана, быў зачынены Беларускі музэй — ну і ў выніку там не засталося наогул нічога. Адраджэньне беларускага культурнага руху там пайшло толькі за зьяўленьнем Саюдзіса на палітычнай арэне.

У сумеснай заяве, прынятай БНФ з Саюдзісам пры ўдзеле Ландсбергіса, мы пагадзіліся, я лічу, на вельмі слушнай фармулёўцы: тэрытарыяльна-культурныя праблемы Беларусь і Літва будуць вырашаць як незалежныя дзяржавы паміж сабой. Нам трэба зараз, калі ўжо абвешчаны хай куртаты, але сувэрэнітэт, зараз трэба прыступаць да высьвятленьня нашых праблем. Зь літоўцамі час распачынаць перамовы. У чым была падступнасьць той, першай, аднабаковай заявы? У заведамым разьліку на савецкія танкі. І гэта гнюсна. Трэба дзейнічаць інакш. Неабходна, каб частка нашага насельніцтва, якая жыве там, усьлед за мовай вярнула сабе самасьвядомасьць і захавала сваю самабытнасьць, свой фальклёр.

— *Паводле ўсёй гэтай сітуацыі тады ж хуценька нарадзіўся анекдот-дыялог: «Хто пераможа — Саюдзіс або Кампартыя?» «Ніхто — Беларуская ваенная акруга!»*

— Тое і яно, што ніхто. Пры такім раскладзе сіл, зразумела. Наогул не хацеў бы здацца рэваншыстам, але паўтару: нашыя межы рэзалі бяз нас. Я нядаўна быў у Смаленшчыне. Там пустыя вёскі. Яны ахвочыя прымаць нашых чарнобыльцаў туды хоць сотнямі тысяч. Яны туркаўмесхецінцаў сялілі, але ўзьніклі страшэнныя праблемы:

абсалютна іншая мэнтальнасьць, рэлігія, нораву — не было ў іх паразуменьня й кантакту. Але зноў жа перасяляць нашых людзей, ня маючы пры гэтым магчымасьці іх абараніць — сацыяльна, эканамічна, палітычна... Не, тут трэба думаць!

Паўтару: на мой погляд, Фронт павёў сябе слушна, калі ў вачох усяго люду засьведчыў, што сярод беларусаў ёсьць сілы, якія ставяцца да тэрытарыяльна-культурных праблемаў цывілізавана і не разьлічваюць іх вырашаць коштам нейкіх імпэрскіх шахматаў. Так, як гэта рабілася ў часы Молатава-Рыбэнтропа і раней, у часы Леніна і таго першага Літоўскага ўраду.

— *Ты даўно ўжо пазіраеш на гадзіннік...*

— Выбачай, справы.

— *Тады давай у экспрэс-стылі. Не баішся абвінавачванняў у снабэрыі, самалюбівай катэгарычнасці, «залішняй» разумнасці?*

— Што да мяне, то прычына майго камплексаваньня — маё паходжаньне сацыяльнае. Каб ты не спытаўся, я б ніколі не пачаў этую тэму. Справа ў тым, што я вельмі сьціпла ацэньваю свае магчымасьці. Я болей практык — скажам так. Мне даспадобы канкрэтная практыка. Хоць лічуся навукоўцам. Жыцьцё, аднак, павярнулася так, што дысэртацыю я не абараніў. Цяпер магу шчыра сказаць: раней на гэты папрок нешта мямліў такое, а ўсё куды як проста — грамадзкая праца зьела ўвесь час. Ну вось будзе незалежная Беларусь і будзе з маім навукоўствам усё нармальна!

Я ня так схільны да закопваньня ў глыбіні, колькі да папулярызатарства. Можа гэта больш простая праца, але яна вельмі патрэбная, трэба несьці людзям веды, ідэі. Так што тут не да «залішняй» разумнасьці...

— *Як адносішся да клішыраванага ў краіне ўяўлення: Беларусь — рэспубліка без праблем, ціхая, спагадлівая...*

— Ня кажучы пра Літву, мы мелі добрую інфармацыю пра становішча на Украіне. Яшчэ да перабудовы езьдзілі туды самі, нелегальна прымалі адтуль сваіх аднадумцаў. Там быў вельмі моцны нацыянальны рух і ў міжваенны пэрыяд, і пасьля вайны. Таму КДБ, наогул рэжым запалохваў нашых суседзяў з поўначы і з поўдня ня проста франтальна, мелася, я б сказаў, цэлая канцэпцыя запалохваньня. А Беларусь трымалі ў гэтым сэньсе за «благополучную», так сказаць, дзеля кантрасту, «в назидание неразумным». І больш, чым мелася падставаў, разьдзімаўся прапагандысцкі міф пра спакойную, добрую, мірную рэспубліку,

якая спраўна што трэба і куды трэба пастаўляе, любіць армію савецкую... Прынамсі тут нам «пашанцавала»: чынавенства не хацела руйнаваць ідылічны вобраз, хоць пры жаданьні на палітычны працэс магло нарасьці. Парадокс: таму карысьліваму, а ня «добраму» чынавенству дапамагаў і малады адраджэнскі рух, які не сьпяшаўся паказаць сябе, бо з-за маладосьці сваёй, недасьведчанасьці мог аказацца растаптаным дзяржаўнай карнай машынай.

— *Твае адносіны да святыняў? Да Леніна, напрыклад?*

— Падлеткавы зьдзек зь іх непазьбежны: на юнацкім узроўні кпілі літаральна з усяго. Потым — спроба вычытаць тое «сапраўднае», што потым было скажона. А ўжо ў студэнцкія гады я ўважліва пасядзеў над «Дзяржавай і рэвалюцыяй», над Ленінавымі працамі па нацыянальным пытаньні і адчуў, што гэта ўсё ж такі чалавек, які быў па другі бок ад эўрапейскай палітычнай культуры. Даю папраўку: прагучала сёньняшняя мая фармулёўка. А ў студэнцтве Ленін успрымаўся агрублена прасьцей. Пра тую ж «дзяржаву і рэвалюцыю» я казаў, што яна напісана цынікам, які не цураўся ніякіх сродкаў дзеля дасягненьня мэты. Прычым пісаў пра тое адкрыта. Што асабліва весяліць,— гэта кантраст паміж добрым «дедушкой Лениным», дзетсадаўскім, і тым Уладзімірам Ільічом, які рэкамендуе абліваць паліцыянтаў расплаўленай смалой...

— *А як упісваецца ў плынь еўрапейскай палітычнай культуры знос ленінскіх помнікаў?*

— Я супраць гэтага. Лічу помнікі яму аднымі са знакаў эпохі. Мелі ж права егіпцяне паставіць свайму Хеопсу піраміду? Стаіць яна — і добра. Ня трэба антыкамунізм зводзіць да жывёльных інстынктаў. Хаця тое, што людзі, пакаштаваўшы 70-гадовага рэжыму, адпаведна ставяцца да яго — непазьбежная стыхія. Мы ў Фроньце лічым, што ачышчэньне ад таталітарызму павінна быць вельмі канструктыўным. Барані Бог, калі мы ў сябе дапусьцім паляваньне на вядзьмарак, паляваньне на ўсіх, хто быў сябрамі гэтай камуністычнай партыі. А помнікі надалей павінны быць вечнымі, не хвіліннымі. Часовае трэба дэмантаваць. Але бяз гвалту. Помнікі эпох трэба ня зносіць, а сабраць усе ў адно месца, зрабіць парк таталітарных скульптураў: Сталін (ляжыць бронзавы пад Менскам), Ленін, Калінін... Хай стаяць, тыкаюць рукамі ў сьветлую будучыню, і хай будзе ўрок нашчадкам.

— *Якія перамены найбольш заўважныя ў нашым грамадстве?*

— Іх хапае. Цешаць, напрыклад, высокія трыбуны. Цяпер Дземяньцей гаворыць тое, за што нас пяць гадоў назад цкавалі няшчадна, нават год — ссоўваецца палітычны спэктар. Ёсьць задавальненьне: на Беларусі гэты няпросты працэс абышоўся без тэрарыстычнага радыкалізму, якім так «праславіліся» пэўныя рэспублікі, асабліва паўднёвыя.

— *А ці не таму ў нас іншая карціна, што няма па-сапраўднаму рэзкіх, ультрарадыкальных рухаў?*

— Правільна: БНФ, напрыклад, займае па сутнасьці цэнтрысцкую пазыцыю. А калі спраектаваць наш палітычны спэктар на эстонскі, скажам, то БНФ займае прыблізна такую пазыцыю, як радыкальнае крыло КПЭ і кансэрватыўнае — Народнага фронту Эстоніі. Наш Фронт часам схільны да размеркавальных, папулісцкіх ідэяў, а трэба, вядома, глядзець болей у Эўропу, болей на рынак. Заўсёды пакутую, калі кажуць: левы, правы — тут ня ведаеш, зь якога боку глядзець. Усё ж такі сусьветная традыцыя называць правай — кансэрватыўную лінію, увасобленую ў Тэтчар; а левая, крайне левая — гэта Лігачоў, калі так разважаць... Ну, гэта ўсё абстрактныя развважаньні. Па-сапраўднаму ж у нас няма нейкай Лігі свабоды Беларусі, Беларускай нацыяналістычнай партыі, Беларускай нацыянальнай арміі — такога няма, значыць, няма й сапраўднага радыкалізму.

— *Ты прывык да мітынговых страсцей?*

— Яны самі й зьвязанае зь імі ў рэшце рэшт ураўнаважваюцца са зьяўленьнем дэмакратычных органаў улады. Мудрасьць і адказнасьць за лёс свайго народу пераважаць і возьмуць верх.

— *Што цябе непакоіць?*

— Спроба згуляць на папулізме. Так, мы зараз шмат гаворым пра разьмеркаваньне, і трэба ў КПСС рэквізаваць маёмасьць. Але раз гэта зробім, другі — куды далей? Найперш трэба думаць пра выраб, стварэньне. Будзе — тады й падзеліцца неяк. А крычаць, ня маючы таго, што дзяліць... Ну можна, паўтараю, можна, але ж давайце думаць і на крок наперад! Палітыкі сапраўдныя павінны рабіць менавіта так, ісьці крокам наперад цяперашняга хвіліннага настрою масы, вылучаць новую задачу, прывучаць да яе. Калі верыць «7 дням», зараз у нас 10 працэнтаў за рынкавую эканоміку... Нас чакае гіганцкая інтэлектуальная прапаганадысцкая праца, інакш ніякі ўрад не правядзе сучасных рэформаў.

— *Як у такім разе ты ставішся да канцэпцыі каманды Кебіча?*

— Я ня бачу яе лягічнай аформленасьці, закончанасьці. Таму й казаў раней пра неабходнасьць кансалідацыі талковых інтэлектаў. Мы тэрмінова павінны выйсьці з пакетам прапановаў, нават канкрэтнай раскладкай іх па месяцах, як зрабіў гэта Ельцын са сваёй камандай. Што датычыць агульнай, скразной ідэі, яна ў наступным: аздараўленьне эканомікі Беларусі — у варунках эканамічнай незалежнасьці. Сёньня гэтага ў рэальнасьці няма. Заўваг да ўрадавага бээсэсэраўскага пляну куча, тым больш што ён, можа, нават міжволі для яго ж складальнікаў, стыкуецца з саўмінаўскім эсэсэсэраўскім плянам — па-ранейшаму зыходзіць зь ідэі адзінай эканамічнай таталітарнай прасторы СССР. Ня будучы эканамістам, я не хацеў бы тут, як кажуць, займацца дылетанцкімі развагамі, пакінем гэта спэцыялістам — а я імкнуўся б прывесьці іх у Фронт і тым самым рабіў усё, каб ня быць дзяжурна папракнутым у дэмагогіі.

*— Фронт сёння і заўтра: якія здабыткі і перспектывы, планы і рэаліі?*

— Задача дня — інтэлектуалізацыя грамадзтва, асьвета — можа і нечакана, тым ня менш спашлюся на хрэстаматыйна-ленінскае: вучыцца, вучыцца, вучыцца. Гэта найперш.

Па-другое — аб'яднаньне ўсіх актыўных сілаў, цывілізаваны дэмантаж таталітарызму, нацыянальна-культурнае адраджэньне й незалежнасьць Беларусі. Самамэта — чалавек, сродак — незалежнасьць.

Я нявызвалены сакратар БНФ, таму вельмі думаю пра наша арганізацыйнае ўдасканаленьне: як найлепей зьяднаць сілы. Зьяўленьне шматлікіх партыяў — і выдатнае, і праблематычнае. Афіцыйныя органы Кампартыі рэклямуюць гэтыя партыі, публікуюць пра іх інфармацыю вельмі ахвотна, а пра Фронт значна меней. Такое ўражаньне, што шматпартыйнасць на драбнюткім узроўні ім вельмі даспадобы.

*— Па-твойму, іх стварэнне — сплanаваная недзе ў апараце акцыя?*

— Так, між іншым, многія і лічаць, ківаючы ў бок КДБ, маўляў, гэта яго крэатуры, але гэта лухта! Ідзе непазьбежны аб'ектыўны працэс. Але я гляджу на гэтую справу збоку — ні ў якую партыю не зьбіраюся ўступаць, ва ўсякім разе пакуль што — і бачу: пакуль нам рост колькасьці партыяў на карысьць ня йдзе. Важна, каб новыя партыі падымалі людзей, не кранутых Фронтам. Хаця, па сутнасьці, зараз па-за Фронтам па-ранейшаму няма сапраўдных палітычных арганізацыяў, акрамя КПСС-КПБ. За выключэньнем Дэ-

макратычнай плятформы — яна на практыцы шматзьвёнаная й структурызаваная сіла. Але сам Фронт ні ў якім разе не павінен вырастаць у партыю. Калі мы выйдзем да першых прыступак пабудовы ідэалу, тады можна будзе распадацца, рассыпацца, тады ў нас увесь спэктар будзе: і хадэкі, і сацыял-дэмакраты, і іншыя — нармальны эўрапейскі палітычны спэктар.

І ўсё ж.

Лёзунгі справядлівага разьмеркаваньня — яны добрыя, але што разьмяркоўваць? Давайце разам зробім нармальную рынкавую эканоміку, а тады...

І яшчэ. Як толькі пачаўся Фронт, балела душа: барані Бог, мы расколемся на агульна-дэмакратычную і нацыянальна-незалежніцкую плыні. Для дэнацыяналізаванай Беларусі наяўнасьць дзвьюх плыняў непазьбежная, натуральная. Многія людзі не прыйшлі да ўсьведамленьня, самакаштоўнасьці нацыянальнай культуры, беларускіх традыцыяў, самакаштоўнасьці Беларусі як адметнай і непаўторнай краіны на карце сьвету, на карце цывілізацыі. З другога боку, для некаторых нашых культурных дзеячоў так і ня сталі самакаштоўнасьцю дэмакратычныя вартасьці. Іншыя, і нават вядомыя людзі, лічылі за лепшае ісьці ў ЦК Кампартыі з надзеяй знайсьці нешта лепшае для беларушчыны, ісьці на адкрытае пагадненьне з апаратам — я гэтай пазыцыі таксама не прымаю, бо людзі пачынаюць лічыць адраджэньне беларушчыны чарговай апаратнай акцыяй і ня вераць яму. І вось яшчэ чаму. Сам сутыкаўся: «Ну, як вы, беларусы, дамагліся перамогі — назвалі вуліцу імем Петруся Броўкі, во дасягненьне!» Яно й праўда. Гэта ж далёка не вяршыня нацыянальнай культуры, але чаму тады Броўка ў школьнай праграме ёсць, а Караткевіча ня знойдзеш? Бо беларушчына была дарэшты ідэалягізаваная, афіцыйная. А з гэтага якраз мы і пачалі нашу гутарку — я ж асабіста прыйшоў да яе ня дзякуючы школе, не пад ціскам урокаў беларускай мовы і літаратуры, а насуперак ім, самахоць. Я адкрыў для сябе беларушчыну ў бібліятэцы, якая носіць пакуль што імя Леніна.

— *Пакуль што? А на чыё заменіце?*

— Вядома на чыё — імя Францішка Скарыны. Баюся, яно дэвальвуецца, але для бібліятэкі і Бог казаў, і ў 20-я гады прапаноўвалі. «Скарынаўка» — гучыць.

— *Але вернемся да плыняў БНФ.*

— Іх пашанцавала злучыць у самым пачатку — і пайшло ўзаемнае выхаваньне, бо талковыя людзі і там, і там.

Узаемаўзбагачэньне зрабіла вельмі важную справу — людзі пабачылі, што БНФ, які відавочна паставіў за мэту разбурыць таталітарную сыстэму ў рэспубліцы, яшчэ паказвае і прыклад выхаваньня сьведамых беларусаў. Стала ясным адно: беларуская мова — гэта ня школьныя падручнікі, а мова людзей, што дбаюць за народ. Беларушчына пачала атаесамляцца з чымсьці добрым, чалавечным і неафіцыйным, некамуністычным.

Гэта тое, чаго ніколі не прымаў Ніл Гілевіч. На глебе гэтага ў мяне пастаянна адбываліся зь ім спрэчкі і сутычкі.

— *Ты ўжыў тут форму мінулага часу?*

— Ня ведаю, можа яшчэ ня ўсё страчана. Важна захаваць гэта на бліжэйшыя два-пяць гадоў, захаваць адзінства дзьвюх плыняў. Калі расколемся, Інтэрфронт нейкі паўстане, будзе поўная дэзарыентацыя людзей, і мы загразьнем тады. У тым, у чым загразьлі на пэўны пэрыяд у той жа Эстоніі.

І яшчэ: дзякаваць Богу, пакуль жа ў Беларусі не было нацыянальных канфліктаў. Ой, каб іх не пабачыць і надалей! Аднак некаторыя праблемы, на жаль, паўстаюць. Ня з рускімі, дарэчы. З палякамі могуць паўстаць пытаньні. Гэтага я баюся. І магчыма, што тут будзе і Варшава нейкім асяродкам выпрамяненьня. Зрэшты, пра гэта ня будзем, ня трэба.

— *За абмежаваннем часу прыярытэт на апошняе пытанне пакідаю за табой...*

— Тады так: чаго я больш за ўсё баюся для сябе? Баюся, каб не перастаў быць шчырым, каб не заела абыдзёншчына, цякучка, каб ня страцілася найвышэйшая мэта. Каб не згубілася тое, дзеля чаго ўсё гэта і рабілася. Напэўна так.

Так.

*Лістапад, 1990*

# МИХАИЛ КУКОБАКА

## Принудительно меня упрятали за решетку на 17 лет, принудительно и помиловали



Родился я в Бобруйске в декабре 1936 года. Отец погиб в финскую, защищая неправое дело, мать ушла в партизаны, была ранена, болела и после войны умерла. Воспитывала бабушка. Когда уж очень невмоготу стало — сдала в детдом. После него — ремесленное, а затем увезли в Сибирь, не спрашивая согласия. «Надо!» — и весь сказ. Так я в 17 лет попал на одну из «строек коммунизма» в Ангарске. Потом служба в армии, Казахстан, Украина...

В трагическом августе 1968 — вызов в Дарницкий военкомат Киева. «Если пошлете в Чехословакию, поверну автомат против вас: соучастником преступления Советского правительства не буду, выступлю на стороне чехословацкого народа»,— сказал я.

Тогда еле-еле удалось спастись от психушки. Но пришлось уехать из Киева в Александров

Владимирской области. Устроился электриком на радиозавод. Когда КГБ установил, что я настойчиво ищу встречи с западными корреспондентами, последовал арест. При обыске нашли написанное мною «Открытое письмо английскому писателю Айвору Монтегю» в защиту Анатолия Кузнецова, автора «Бабьего Яра». Статья была ответом на злобную, клеветническую публикацию зарубежного литератора в «Комсомольской правде».

14 апреля 1970 года началась моя длинная тюремно-лагерная одиссея. За отказ помочь КГБ в стряпанье «компромата» на западногерманского дипломата Мюллера начальник следственного отдела УКГБ майор Павел Евсеев рекомендовал Институту имени Сербского объявить меня сумасшедшим (шизофреником). Некие Д. Р. Лунц и А. А. Фокин «просьбу» охотно выполнили. Так начались мои скитания по психушкам, лагерям и тюрьмам...

Любая борьба требует жертв — это аксиома. Я был одним из многих, кто сполна поплатился за свои антитоталитаристские убеждения, приверженность к подлинной, а не декларируемой демократии. Но сегодня ни о чем не сожалею, ни о чем. Потому что всегда был убежден в своей правоте, понимал: свобода личности, свобода народа сама не приходит — ее надо завоевать. И приходится платить. И надо быть к этому внутренне готовым. Такова жизнь.

Мне еще повезло, остался жив, иные же из моих товарищей так и погибли за колючей проволокой неволи. Анатолий Марченко, например, за шаг до победы — в восемьдесят седьмом году. В. Некипелов вышел смертельно больным. А сколько потеряли здоровья? Я отсидел около семнадцати лет, а Левка Лукьяненко двадцать пять, Станислав Караваньский около того же...

— *Что Вы, посмевший некогда вслух сказать правду о Чехословакии, думаете о нынешней внешней политике СССР?*

— Посмотрите, какая громадная армия у страны! Для чего? Чем большая мощь сосредоточена в руках правителей, тем больше у них соблазна вершить дела в мире по своему разумению. Никто не будет отрицать, что режим в Албании ничуть не демократичнее нашего, он даже жестче; то же самое в Северной Корее, Кампучии... Но КНДР не посягает на соседний Китай; Албания не притязает на завоевание Греции... А вот Советское правительство захотело прибрать к рукам Афганистан... Или не понравился ход событий в Эфиопии — получите, чернокожие братья по

Интернационалу, оружие... А военная помощь Анголе? Зачем же, спрашивается, нам кормить и вооружать зарубежную партийную номенклатуру и созданные ею режимы? Нас ведь родная бюрократия заедает! Отсюда — я за независимую демократическую Белорусскую республику со статусом демилитаризованной зоны, постоянного нейтралитета. У нас, как и у народов Балтии, нет иных врагов кроме империи. Получив независимость, освободившись от армии и ВЧК, мы стали бы на треть богаче — есть такие подсчеты, цифра не взята с потолка.

— *Извините, Ваши рассуждения в условиях Белоруссии, так пострадавшей в минувшую войну, иным покажутся неоправданно пацифистскими...*

— Не забывайте: сорок первый год явился как результат событий конца двадцатых — начала тридцатых годов, когда Сталин, расколов международное рабочее движение, привел к власти Гитлера; тогда наш белорусский, русский — советский хлеб, советские руда, нефть, оружие сплошным потоком лились в Германию; немецкие летчики, танкисты учились военному искусству на советских полигонах, в советских академиях... Наши правители создали этого монстра, а нам — народу, пришлось расплачиваться за свою рабскую покорность сталинскому режиму. Или пример нынешних дней, когда грозный милитаризованный Ирак оккупировал маленький беззащитный Кувейт. Что обнаружилось? 80 процентов иракского военного снаряжения помечено клеймом «Сделано в СССР». А 8000 советских военных советников на службе у Хусейна? Опять имперские амбиции наших правителей оборачиваются страданиями миллионов людей, в том числе и советских. Но мы, слепцы, упрямо не желаем видеть это и все печемся об укреплении «западных рубежей Отчизны», бесконечно пичкая и без того загрязненные радиацией леса, пущи ядерным оружием. Что мы оставляем потомкам своим? Неужели недостаточно одного Чернобыля? Откуда тогда эти обвинения в «неоправданном пацифизме»?

— *Что, по-Вашему, откинуло страну от устремленной вперед Европы, мира?*

— Тормоз известный — коммунистическая система. Не будь ее, мы, выражаясь общедоступным и понятным языком, жили бы богаче, достойнее — как все!

— *Михаил Игнатьевич, давайте вернемся к истории Вашего политического заточения. Каков был приговор «родного» суда, в Бобруйске?*

— Три года.

— *И Вы попали?..*

— В новополоцкий лагерь...

— *А как же продлили это «удовольствие»?*

— Существовала замаскированная форма сведения счетов с «неперевоспитуемыми»: не нравится человек — белыми нитками «шили» ему новое «дело», жернова судебной машины беззвучно проворачивались для выдачи лагернику очередного документа о продлении срока... Человека можно было держать в заточении до бесконечности.

— *Проиллюстрируйте, пожалуйста, на собственной судьбе.*

— «Ручные» судьи по указаниям КГБ определили мне аж три срока подряд. Согласно последнему, освобождаться я должен был в октябре 1990 года. Но еще в 86-м блюстители политического единомыслия откровенно предупредили: «Не выбросишь дурь из головы — опять засядешь, так и знай: добавим десять лет по второй части семидесятой статьи».

— *В чем конкретно Вы обвинялись?*

— Я не признал себя виновным по материалам сфабрикованного дела, что ставило под сомнение «работу» следователей КГБ, поэтому их коллеги из оперативного отдела задались целью выдавить из меня покаянное письмо. Они хотели, чтобы я оболгал сам себя! Оклеветал друзей, знакомых, зато выгородил их: «смотрите, Кукобака признается — осужден он правильно, по закону!»

— *Какова механика подобного принуждения?*

— Нажим был достаточно грубым. Конечно, иголки под ногти не забивали и ледяной водой на морозе не обливали. Поступали проще: в одной паре белья бросят в холодную камеру, где с потолка капает, вечно мокрый пол. Плюс пониженное питание. Через день по 150 граммов хлеба и кружка кипятку. Разве это не замаскированная пытка? А впереди безысходность, никакого просвета. И не каждый это выдерживал.

Ну, а первый срок внутрилагерной тюрьмы я получил формально за то, что во время сеанса кино, для заключенных обязательного и потому являющегося повинностью, отвернулся от экрана и заткнул ватой уши. За это на полгода я угодил в ПКТ.

*Что за аббревиатура?*

— «Помещение камерного типа» — вот так стыдливо замаскировали место, где невольникам ломали волю. Кста-

ти, когда садили в ШИЗО — штрафной изолятор — этот срок в общий зачет дней вообще не шел...

*— Чем памятен Вам новополоцкий лагерь?*

— Это был самый трудный период заключения, не считая спецпсихушки. Я был там единственным, кто проходил по статье 190-й «прим.» — антисоветская агитация. Видите, в нашем кодексе для политзаключенных существует именно такая тенденциозная, закамуфлированная формулировка. Так вот, администрация решила во что бы то ни стало «перевоспитать» меня. Отсюда и откровенные придирки за «кино». Проигнорируй его уголовник — сошло бы с рук; ну, а мне дали по рукам. Хотя по соответствующей международной конвенции принудительное навязывание убеждений является пыткой.

*— Кстати, международная общественность поддерживала Вас?*

— Да, но об этом я узнал, уже будучи на свободе. В лагерях и тюрьмах тщательно скрывались выступления общественности в нашу защиту, письма из-за рубежа не пропускались (да и сейчас не пропускаются). Письма от родственников и друзей подвергались самой жесткой цензуре. Между тем были публикации в «Нью-Йорк таймс», передачи радиостанции «Свобода», массу мероприятий проводил созданный в США «Комитет узников совести в Белоруссии», американский конгрессмен Билл Грин включил мою историю в специальную записку, адресованную конгрессу... Защищали также профсоюзы Англии, писали о своей поддержке различные миссии, организации из десятков стран мира. Последняя интересная статья появилась в Штатах шестого декабря 88-го года под заголовком «Подарок Горбачева Нью-Йорку» — так было оценено освобождение последнего «семидесятника» из печально знаменитого пермского лагеря. Публикация приурочивалась к визиту Генсека в Америку...

*— Таким образом, снова воздадим хвалу сильным мира сего, перестройке?*

— Здесь следует затронуть тему эйфории части общества по поводу новой политической погоды в стране. Да, перемены налицо, но они вызваны не субъективными, а именно объективными причинами. Мое, в частности, освобождение было вынужденной мерой, а вовсе не следствием вдруг явившегося раскаяния власть предержащих. О нажиме на них международной общественности я тогда, конечно, не знал. Это позже показали массу соответствующих до-

кументов, с некоторыми из своих зарубежных защитников теперь переписываюсь. Среди них англичанин Каролин Браун, искусствовед из Австрии доктор Герхильд Кучера, земляки-белорусы Александр Зданкович (Лондон), Павел Янковский (Нью-Йорк), Светик Корженевский (Австралия)... Очень многое в информировании общественности, оценке моего положения сделал академик Андрей Дмитриевич Сахаров, которого удалось лично поблагодарить при счастливой встрече, московские диссиденты, сами угодившие затем в тюрьму. Например, Виктор Некипелов, Григорий Подъяпольский, Мария Петренко...

*— Прозвучал ли за эти семнадцать лет хотя бы один голос в Вашу поддержку из родной Белоруссии?*

— Нет. Сказалась известная специфика республики, особое усердие «глушильщиков» западных радиоголосов, плохо проникал сюда, как вы знаете, и самиздат. «Железный занавес», конечно, аллегория, однако нас действительно умело отгораживали от правды не только «внешней», но и от правдивого освещения событий и положения внутри страны.

*— Ваше мнение о «параде суверенитетов» союзных и автономных республик?*

— *А што робіце дома, так бы мовіць, для чалавечай раўнавагі?*

— Самае цікавае, што і раней, і цяпер дома амаль не бываю. А ў святочныя дні — майструю, будую. Некалькі апошніх гадоў — «фазэнду» ва універсітэцкім садовым таварыстве «Купалінка».

— *Гора з ёй!*

— Не, наадварот — найцікавейшая справа.

— *Вы з тых, хто сам і муляр, і столяр, і пячнік?*

— У мяне ніводзін рабочы не ўбіў ніводнага цвіка.

— *Будзем лічыць, што мы перакурылі на Вашай будоўлі і — зноў за працу. Імя Шушкевіча як грамадзяніна стала вядомым многім якраз у сувязі з барацьбой за праўду аб Чарнобылі.*

— Спачатку я не адчуваў патрэбы ў «агучванні» сваёй пазіцыі. Думаў, калі мы, вучоныя, удакладнім параметры аварыі, то дзяржаўныя інстанцыі хутка прымуць адпавед-

ныя меры. Чаму лічыў менавіта так? На нашай кафедры заўсёды выкладаўся курс «Бяспека ядзерных установак». Разглядаўся там і парадак дзеянняў пры розных ЧП на атамных станцыях. Аварыя, якая адбылася ў Чарнобылі, была тэарэтычна прааналізавана і распісана па пунктах яшчэ ў шасцідзесятыя гады. На ўсялякі выпадак, хоць ніхто не думаў, што такое здарыцца. Карацей кажучы, тады, у красавіку — маі я быў унутрана падрыхтаваны да ўзгодненых, прадуманых дзеянняў па даўно існуючай і вывучанай схеме. Работнікамі станцыі, службамі грамадзянскай абароны, іншых урадавых звёнаў...

Хоць і не быў наіўным, усё ж не ўсведамляў: калі ў нас здараецца нават самае страшнае, без начальніцкай думкі ніякія меры не прымаюцца. А чарнобыльскі ланцужок узгадненняў цягнуўся да самых высокіх кабінетаў, «губерня» пісала ой як многа, доўга... Проста жах! Мне і ў галаву не магло прыйсці, што катастрофу стагоддзя напаткае банальны «наменклатурны» лёс.

— *Калі вучоныя падрыхтавалі першы грунтоўны матэрыял для дзяржаўнага кіраўніцтва?*

— Шэраг захадаў на ўзроўні стварэння розных камісій, груп дарадцаў быў ажыццёўлены па гарачых слядах папер. А на свята 9 Мая прэзідэнт Акадэміі навук акадэмік М. А. Барысевіч сабраў прадстаўнічае кола навукоўцаў з аператыўным аналізам стану спраў, перспектыўнымі напрацоўкамі. Тады і з'явіўся абагульняючы рэкамендацыйны дакумент. Папера, даю гарантыю, была ўручана першым асобам.

Ёсць яшчэ адзін момант, які нельга выпускаць з-пад увагі: шэраг прынцыповых момантаў у ядзернай энергетыцы традыцыйна пазначаўся грыфам «сакрэтна». Гэтая абставіна вымушала вучоных нешта даказваць, спрачацца ў даволі вузкім коле дзяржаўных функцыянераў. У выніку безгалоснасці навука і палітыка пайшлі рознымі курсамі.

— *Як Вы заўважылі несупадзенне пазіцый?*

— Перш за ўсё быў здзіўлены інтэрв'ю афіцыйных асоб, арыентаваўшых народ на спакой. Ледзьве не трапіў у шок, калі даведаўся, як праводзілася ёдавая прафілактыка насельніцтва, асабліва пацярпелых раёнаў... Так з'яўлялася ўсвядомленае разуменне: робіцца не тое і не так. Разам з калегамі пачаў штурмаваць вярхушку: трэба зняць сакрэтнасць! Але насустрач ішлі вельмі марудна... На кафедры мы аператыўна арганізавалі вучобу розных спецыялістаў методыцы прафілактычных дзеянняў. Паралельна

запусцілі ў справу ў шэрагу арганізацый і ўстаноў апаратуру, якая гадамі бяздзейна пылілася, хаця і набывалася за вялікія грошы, а часам за валюту.

— *Дзеля справядлівасці, Станіслаў Станіслававіч, трэба адзначыць, што прыхарошвалі сітуацыю не толькі безадказна-дысцыплінаваныя чыноўнікі, але і вельмі дасведчаныя вучоныя. Зусім не адзінкі з іх узялі тады грэх падману на сваю душу. Ці не так?*

— На жаль, праўда. Вось павінен прыехаць з Масквы тагачасны віцэ-прэзідэнт Акадэміі медыцынскіх навук СССР, старшыня Нацыянальнага камітэта па радыяцыйнай ахове Ільін. Я ні за што на свеце не прыму яго, бо лічу паводзіны гэтага чалавека злачыннымі. Чаго вартае адно толькі запэўніванне Ільіным сусветнай грамадскасці ў тым, што своечасова і пагалоўна зроблена тая ж ёдавая прафілактыка, хоць яе доблесна правалілі... Дарэчы, зладжаныя дзеянні ільінскай каманды супраць гуманістычнай пазіцыі беларускіх навукоўцаў актыўна падштурхнулі мяне да барацьбы за дэпутацкі мандат.

— *Яна была нялёгкай?*

— На акруговым сходзе з семнаццаці кандыдатаў у бюлетэні вырашылі ўнесці чатыры прозвішчы. І пачалося... Навічок у палітычных гульнях, я пасля іншых акцый супраць сябе толькі рукамі разводзіў: тыя, хто цэбрамі выліваў бруд на мяне, да здзіўлення, таксама мелі прафессарскую ступень. Адно суцяшала: не з універсітэта! Я змагаўся пад лозунгам зацвярджэння чалавечай годнасці і быў абраны.

— *Што змянілася ў Вашых адносінах да праблем Чарнобыля на пасадзе першага намесніка Старшыні Вярхоўнага Савета рэспублікі?*

— Раней ведаў радыяцыйныя, эканамічныя аспекты праблемы, медыцынскія ў нейкай ступені. Але быў незнаёмы з сацыяльным і псіхалагічным бокам справы. Таму недарэчнасцю ўспрыняў накіраванне ў пацярпелыя раёны групы адпаведных замежных спецыялістаў па лініі МАГАТЭ. Думаў — запыльваюць нам вочы. Аднак пасля доўгай паездкі па зоне з вельмі паважаным мною чалавекам, першым сакратаром Гомельскага абкома партыі Аляксандрам Адамавічам Грахоўскім, кардынальна змяніў пункт гледжання. Уразілі размовы з вяскоўцамі, што вярнуліся ў родныя мясціны праз нейкі час пасля эвакуацыі. Сітуацыю яны ўсведамляюць: узрастае верагоднасць захворвання звычайным цвёрдым ракам і белакроўем, можа змяніцца імунная сістэма і гэтак далей. Дзякуй Богу, што хоць няма

і не будзе прамянёвага захворвання. Дык вось, калі раней я быў катэгарычна супраць, то цяпер часам здаецца: людзі не ў дзетародным узросце маюць рацыю, вяртаючыся нават у мясціны з высокай забруджанасцю радыенуклідамі. Трэба ўлічваць псіхалагічны фактар: не могуць яны кінуць магілкі бацькоў, адбудаваныя ўласнымі рукамі хаціны...

Я за тое, каб у чарнобыльскай камісіі Вярхоўнага Савета працавалі дэпутаты з зоны. Напрыклад, Абухаў Аляксандр Іванавіч ці Пракопаў Аляксандр Міхайлавіч — яны, шмат аддаўшыя Брагінскаму і Хойніцкаму раёнам, больш тонка адчуваюць настрой на месцах, могуць засцерагчы ад рызыкоўнага «хірургічнага» ўмяшання там, дзе можна абмежавацца бяспечнымі сродкамі «народнай медыцыны». Мой жа клопат — забеспячэнне поўнай інфармацыяй аб радыяцыйным баку справы.

— *Што Вы думаеце пра палітыканства на чарнобыльскай бядзе?*

— Натуральна, хваля пратэсту не магла не вынесці новых, раней невядомых палітычных лідэраў. Яны вельмі многае зрабілі, каб зрушыць, як кажуць, воз з месца. Аднак жа трэба ісці далей! На жаль, многія так і засталіся на пазіцыях некалі «заводзячых» лозунгаў: далоў бюракратыю, такіх і такіх партыйцаў, ЦК да адказнасці!.. Гэта ўжо не канструктыўна. Вунь колькі ўжо новых памылак, глупстваў нароблена!

— *Напрыклад?*

— Возьмем хоць бы дробязную грашовую падтрымку людзей, якія фактычна не падвяргаюцца радыяцыйнаму ўздзеянню — размова пра зону забруджвання ў адзін кюры. Уся Баварыя «фоніць» не меней, аднак там поўны спакой. А мы сваімі злашчаснымі «грабавымі» настойліва пераконваем людзей: ваша жыццё ў штодзённай небяспецы! У выніку сама дзяржава правакуе сацыяльную напружанасць, грамадскую істэрыю, якая таго і чакай скандэнсіруецца ў выбух пратэсту.

Ідуць суцэльныя скаргі: чаму правялі несправядлівую мяжу выплат, чаму тую вуліцу заасфальтавалі, а нашу не, чаму, чаму, чаму... Суседзі ваўкамі глядзяць адзін на другога. О, колькі выдаткаў закладзена тым рашэннем Вярхоўнага Савета! Неабходна як мага хутчэй ўлічыць ранейшыя памылкі. Некаторыя дэпутаты цяпер саромеюцца таго даўняга ўчынку, калі ў знак пратэсту супраць закліку падумаць, не спяшацца з прыняццем вельмі сур'ёзных рашэнняў яны падняліся і пакінулі залу...

— *Ці не змянілася Ваша думка наконт таго, што нельга жыць там, дзе вырабляецца забруджаная прадукцыя?*

— Я з самага пачатку падтрымліваў гэту канцэпцыю, аднак не трэба абсалютызаваць. Працуюць жа людзі ў небяспечнай Антарктыдзе, на далёкай Поўначы! Ёсць пытанні, якія трэба вырашаць і ў зоне. А хіба ж нельга забяспечыць нармальнымі прадуктамі тых людзей, якія прадукуюць пазарэз неабходны ўсёй рэспубліцы цэмент? Чысты цэмент!

— *Маеце на ўвазе скандал з Касцюковіцкім заводам?*

— Такую праблему з ім накруцілі, столькі жахаў панавыдумлялі! Маўляў, пойдзе «брудная» прадукцыя і новаўзведзеныя дамы стануць... «свяціцца»! Цемрашальства, сярэднявечча нейкае... Радовішча, паўтараю, чыстае.

— *Аднак вернемся да іншых аспектаў «неабсалютызаванай канцэпцыі».*

— Часамі перасяленне вялізных мас людзей абарочваецца яшчэ горшым злом. Любое правіла, у рэшце рэшт, дапускае выключэнні. Так і тут: нельга калькіраваць сітуацыю адной вёскі на ўвесь раён, аднаго раёна — на ўвесь рэгіён. У нашым становішчы літаральна кожны выпадак патрабуе ўсебаковага асэнсавання. Прафесіяналамі вышэйшай пробы, а не адміністратарамі, новаспечанымі палітыкамі. Трэба ствараць у рэспубліцы свой Нацыянальны камітэт радыяцыйнай аховы (НКРА). Невялікі — з пяці, сямі чалавек, не болей. Але з шырокімі паўнамоцтвамі прыцягваць да справы неабходных кваліфікаваных экспертаў. Сумесна яны павінны выпрацоўваць афіцыйныя рэкамендацыі ўраду па ўсяму спектру складаных праблем зоны.

— *А хіба не так было?*

— Пагаджаюся: схема не новая. Аднак ажыццяўлялі яе людзі тыпу Ільіна — чаго тады чакаць? Адбор кандыдатаў у беларускі НКРА павінен весціся літаральна праз павелічальнае шкло, тут нельга прапускаць брак. І прафесіянальны, і маральны.

— *Што Вы думаеце пра бойку паміж абласцямі і ведамствамі ў нас пры дзеляжы чарнобыльскіх сродкаў?*

— Спрадвечнае наша зло — месніцтва, набыло цяпер новую афарбоўку ва ўмовах бясконцых «абвяшчэнняў» чарговых «дваровых суверэнітэтаў», якія толькі ганьбяць святы суверэнітэт рэспублікі. Прэтэнзіі на самастойныя эканамічныя зоны і гэтак далей здаюцца мне, мякка кажучы, не вельмі абгрунтаванымі. На Беларусі і сёння лагічна ажыццяўляць агульнарэспубліканскую палітыку. Нашы вобласці зусім не розняцца так, напрыклад, як БССР і Узбе-

кістан ці Чукотка. Таму не ўспрымаю як сапраўдны патрыятызм мясцовых лідэраў, атаесамляючых сябе з удзельнымі князькамі, якія лічаць за найлепшае цягнуць і цягнуць на сябе, грэбуючы інтарэсамі суседзяў, рэспублікі ў цэлым. Такі падыход раз'ядноўвае народ, аслабляе нацыю.

*— Тое ж можна сказаць і пра дэпутатаў, што бачаць інтарэсы толькі сваіх выбаршчыкаў?*

— Нагадаю: народных дэпутатаў, а не медыцынскіх, настаўніцкіх, культасветаўскіх, ці яшчэ якіх — пінскіх, лідскіх, мінскіх... Цэхавы прынцып парламенту не падыходзіць, у ім ёсць нешта найгоршае ад прымітыўнага папулізму. У Вярхоўным Савеце трэба набрацца мужнасці забыцца пра сваю прафесіянальную прыналежнасць. Я асабіста ведаю, колькі і якія цяжкасці ў навукоўцаў — дык што, касцьмі класціся за фізікаў, матэматыкаў, хімікаў? За вышэйшую школу? Не, гэта не выйсце для ўсяго народа, маёй рэспублікі.

*— У чым бачыцца клопат агульны?*

— Гэта, безумоўна, эканоміка. Тут перш за ўсё патрэбен пошук, неабходна, каб зварухнулася прамысловасць. Гляньце ў вакно — на плошчы Леніна стаяць фуры з замежнай дапамогай. І гэта тады, калі мы ўзаконьваем новыя святы. Не аўстрыйцы, не немцы, не італьянцы і не заклікі выратуюць краіну ад галечы — спадзявацца варта толькі на свае мазалі, спрыт і розум. Якое вяселле, які адпачынак у момант вастрэйшага крызісу? Памятаеце пра пір у час чумы? Быццам пра нас: клічам не на суботнікі, як калісьці, а на пагулянку! Не, людцы, трэба ўпірацца, працаваць і працаваць, бо справы дрэнь! На жаль, «суботнікавае» слова не агукаецца... Дэпутаты не выключэнне: кідаемся ў размеркаванне. Толькі што дзяліць? Дзе той біблейскі хлеб, якім можна накарміць усіх? «Цэхавікам» з парламенцкімі паўнамоцтвамі пара зразумець: хопіць быць «любімцамі» народа, патрэбна мужнасць, каб ажыццявіць комплекс мер непапулярных. Перыяд утробнага развіцця Вярхоўнага Савета прайшоў, час станавіцца не тэлезоркамі — дзяржаўнымі мужамі.

*— Да слова, Станіслаў Станіслававіч: ці патрэбны доўгія трансляцыі аб парламенцкіх дэбатах, смакаванне «розгага»? Можа выцерпіць як-небудзь галоснасць? Няўжо так патрэбны народу тры сотні новых «публіцыстаў»?*

— Якасць работы дэпутатаў павінна ацэньвацца па рэальнаму росту ўзроўню жыцця народа, а не колькасцю рэкламных падыходаў да мікрафонаў залы паседжанняў.

*— Пабойваюся, нашкодзіце сабе шчырасцю. Таму крыху ламаю логіку размовы: многія звязваюць імклівы ўзлёт Вашай палітычнай кар'еры з падтрымкай Фронту — ці так гэта?*

— Я пазнаёміўся з БНФ сёмага красавіка 89-га года на перадвыбарчым сходзе ва універсітэце. Тады было вылучана некалькі кандыдатур, у тым ліку і Зянона Пазьняка, з якім мы датуль не сустракаліся. Хоць лідэр Фронту адсутнічаў, аднак галасоў набраў шмат. Да мяне сярод іншых вострых пытанняў было і пра адносіны да «Адраджэння». «Ніякія, незнаёмы з яго пазіцыяй». Праз дзень атрымліваю праграму, іншыя дакументы. Прачытаў, асэнсаваў і ў наступным, калі пыталіся, адказваў: у цэлым да новай арганізацыі стаўлюся добра; ёсць некалькі пунктаў для мяне непрымальных, аднак большасць з гнеўна асуджаных партыйнымі камітэтамі ідэй Фронту падтрымліваю. Яшчэ праз паўгода, год КПБ, дарэчы, узяла на ўзбраенне якраз тое, многае з чаго раней аб'яўляла *«оголтелым антикоммунизмом»*. Прычым асобныя функцыянеры не пасаромеліся ўслых заявіць, быццам менавіта гэтыя пазіцыі Кампартыя заўсёды займала і адстойвала... Спадабаецца каму ці не, аднак крывадушша тут замнога.

З улікам прынцыповасці пытання хачу раздзяліць два моманты. Першы: пачатковы варыянт афіцыйнай праграмы БНФ я падзяляў практычна цалкам, а з чым не згаджаўся, аспрэчваў у дыскусіях з прадстаўнікамі Фронту і сёе-тое даказаў гэтым сумленным, адукаваным, сапраўды патрыятычна зарыентаваным людзям. Зараз другі момант: БНФ часам падтрымлівае не народ, а тлум. Чакаць ад яго дабра, ну ніяк, выбачайце, не атрымліваецца; можа здарыцца, што сёння ён дапаможа «Адраджэнню» літаральна ва ўсім, нават у цяжкай чарнавой рабоце, але заўтра з зусім не меншым, д'ябальскім стараннем пачне таптаць нядаўняга куміра. Фронту не варта карыстацца неўсвядомленай, імпульсіўнай, выпадковай падтрымкай.

*— Няхай не ідэнтычны, але вельмі падобны прыём ёсць і ў арсенале ідэолагаў Кампартыі, не заўважалі?*

— Толькі сляпы не ўбачыць, а глухі не пачуе... Спрацаваным штампам, зацёртым клішэ стала, напрыклад, «аднадушная» падтрымка ветэранамі «генеральнай лініі» цэнтральнага і нізавых партыйных камітэтаў. Функцыянеры яшчэ не паспеюць толкам асэнсаваць узнікшую ідэю, а слаўная наша гвардыя асуджае нязгодных з ёй...

Уласнага глыбокага асэнсавання сітуацыі імпульсіўныя

групы «падтрымкі» не робяць, што вельмі небяспечна для грамадства: успомніце гэтую страшную разню ў розных кутках краіны. Ратуй, зразумела, нас Божа ад практычных паралеляў.

Карацей: не робіць гонару ні Камуністычнай партыі, ні Фронту падтрымка тых, калі яна не цалкам асэнсавана, не дакладна ўсвядомлена. Трэба знайсці мужнасць адважыцца на разумныя хады для змякчэння сітуацыі ў імя здароўя грамадства.

Аднак вы пыталіся менавіта пра КПБ, дык лічу, што ганарлівая пыха ў адносінах да новых палітычных сіл ёй не да твару. Я вельмі паважаю, напрыклад, новага сакратара ЦК Валерыя Гур'евіча Ціхіню, аднак часам здаецца, што ён выступае па адшліфаванай ветэрана-маладзёжнай методзе: «Мы не дужа разабраліся, што тут, але асудзіць трэба!»

— *Маецца на ўвазе яго ацэнка дзеянняў Фронту на плошчы Леніна — кастрычніцкае свята? Ну, а Вы што думаеце?*

— Раніцой я ўскладаў да помніка Ільічу тыя кветкі, якія ў поўдзень былі растаптаны. Тэлеперадача ўзрушыла: што ж нарабіў БНФ! Аднак ўражанне змянілася пасля прагляду ўсёй плёнкі без купюраў. Мне здаецца, што і Зянон Станіслававіч Пазьняк, і Валянцін Фёдаравіч Голубеў добра разумеюць: іх гучнамоўныя меркаванні і прамовы хоць і не пярэчылі закону — антыкамунізм не класіфіцыруецца цяпер антыдзяржаўнай пазіцыяй, аднак асаблівая палітычная завостранасць прагучаўшых тэзісаў ва ўмовах яшчэ не прывычнага ідэйнага плюралізму становіцца свайго роду наркотыкам, калі арганізаваны мітынг ператвараецца ў агрэсіўны, незацугляны натоўп. Ён здольны растаптаць і зняважыць грамадзянскую годнасць. Палітык — цвярозы, свядомы, павінен зразумець: так нельга, гэта гульня з агнём... Хоць лідэры апазіцыі, паўтару, зрабілі памылку, не болей.

І апошняе. Сёння самы прымітыўны заклік — бязлітасна руйнаваць тыя структуры, якія прывялі да сённяшняга жыцця. Згодны — дрэннага жыцця. Аднак заўважце: у многіх адносінах і бесклапотнага... Я ўпэўнены: новы сойм БНФ прызнае — аднаго простага асуджэння сёння ўжо мала, цяпер у чырвонай цане канструктыўны, стваральны пачатак. Пара ўсвядоміць: настаў момант, калі побач з палітычнай барацьбой павінна суседнічаць звычайная чалавечая разважнасць, пачуццё памяркоўнасці.



17. Зак. 5493

Іначай не пазбегнуць паўтора горшага вопыту папярэдняй сваёй Вялікай рэвалюцыі.

— *Вы заклікаеце да вырашэння прынцыповых праблем парламенцкім шляхам?*

— Базіс грамадства, безумоўна, трэба мяняць. Але не раптоўна, змена састарэлых дзяржаўных дэкарацый павінна адбыцца без ломкі «праз калена». Гэта магчыма пры ўмове апераджальнага ўтварэння новага кіраўніцкага механізму, які павінен запрацаваць да таго, калі жыць па-старому стане неўмагату. Тут як з засмечаным калодзежам: пакуль будуюць новы, неяк падчышчаюць стары. Але ж ніколі яго не засыпаюць, не маючы анічога ўзамен!

— *Як Вам працуецца з парламенцкай апазіцыяй БНФ?*

— Без праблем. Яна генерыруе новыя ідэі і падыходы куды больш актыўна, чым іншыя дэпутацкія групы.

— *У Вас не бывае сутыкненняў з Фронтам?*

— «Адраджэнне» не толькі падтрымлівала мяне, але і асуджала. Разумееце, я не хадок супраць свайго сумлення, не падладжваюся з кан'юнктурных меркаванняў ні пад «правых», ні пад «левых», ні пад «цэнтрыстаў».

— *За што канкрэтна Вас білі?*

— Не прыйшлася да спадобы абарона некаторых партыйных работнікаў. Але ж я быў упэўнены ў гэтых людзях, бо працаваў побач з імі, бачыў іх у справе, у паўсядзённым жыцці, напрыклад, першага сакратара Фрунзенскага райкома Леаніда Іванавіча Радкевіча. Час пацвердзіў: правільна рабіў! А тады Сойм Фронту паслаў у Маскву, на з'езд народных дэпутатаў, крыўдную асуджальную тэлеграму.

— *Ну, а прынцыповыя разыходжанні з апазіцыяй?*

— Не бачу сур'ёзнай абгрунтаванасці сепаратысцкіх захадаў. Дарэчы, катэгарычнага «не» Саюзу ў першай праграме «Адраджэння» не было. Я бачу больш складанасцяў у разарванні Саюзнага дагавора, у выхадзе з Саюза, чым маем пры сённяшнім дзяржаўным статус-кво. Аднак перад вамі зусім не прыхільнік праекта таго дагавора, якія разаслаў рэспублікам Гарбачоў. Неабходна вельмі выверанае, дакладнае раздзяленне функцый, вызначэнне таго, што мы перадаём Цэнтру. Ніяк не магу пагадзіцца, напрыклад, з прэрагатывай Цэнтра захоўваць на месцах правы чалавека. Дык калі ўжо будзе такі недавер нашаму ўраду і Вярхоўнаму Савету, то, прабачце, дарагія таварышы, тут прамая знявага нашай нацыянальнай годнасці...

— *На Беларусь праецыруецца сітуацыя ў Прыбалтыцы, Малдове, Закаўказзі?*

— У нас ёсць свае адвечныя традыцыі талерантнасці, паважлівых адносін да іншых народаў. Не трэба забіраць у рэспублікі тыя функцыі, якія мы здольныя забяспечыць лепей, бо тонка адчуваем мясцовыя асаблівасці.

*— Нагадваю пачатак работы новага Вярхоўнага Савета — літаральна шквал атак на камуністаў, абвінавачванне іх хіба ці не ў тым, што сонца ўсходзіць і заходзіць, непрыхаваныя пагрозы... Вы адзіны з партыйнай дэпутацкай большасці, хто ўстаў і дастойна адказаў дужа азлобленым прамоўцам. Непрымірымыя праціўнікі Фронту, цвёрдакаменныя абаронцы «ідэйнай чысціні, маналіты згуртаванай» КПБ змаўчалі...*

— Хочаце сказаць, што ў гэтым ёсць нейкая нематываванасць маіх паводзін? Так, адным часам я не бачыў для сябе магчымасці быць сярод прыхільнікаў лініі ЦК. Аднак адбылося нечаканае: мяне вылучылі дэлегатам XXXI з'езда Кампартыі Беларусі.

*— Дзе?*

— Спачатку ва універсітэце, а пасля ў працоўным калектыве. Балатаваўся ў рабочых, на сур'ёзнай конкурснай падставе. Пазіцыю сваю не хаваў: «Калі не будзе катэгарычных змен, з партыі выйду...»

*— І што з'езд?*

— Сярод сямісот дэлегатаў убачыў там сотню чалавек, пераважна маладых сакратароў пярвічных арганізацый, гатовых і здольных па-іншаму весці партыйны карабель, як заўсёды ўяўлялася гэта і мне. А значыць, з майго боку будзе здрадай пакінуць іх, не падставіць плячо.

Што вельмі важна, зусім іншы і новы першы сакратар. Наша знаёмства з Анатолем Аляксандравічам Малафеевым пачалося на першым з'ездзе народных дэпутатаў СССР. Мы неаднойчы дыскуціравалі, у нас няма згоды па многіх пытаннях. Аднак для мяне важна наступнае: ён не здольны аднадумцам гаварыць адно, і зусім іншае — палітычным праціўнікам, нейтральнай аўдыторыі. Сам быў сведкам, як, не віхляючы, Малафееў растлумачыў сваю пазіцыю зусім не міралюбіва настроенай да яго студэнцкай аўдыторыі. І развіталіся з ім ужо вельмі цёпла. А вось больш «гібкія» партыйныя таварышы правальваліся.

Так што зрухі на верхнім узроўні ёсць. І яшчэ: шэсцьсот тысяч свядомых, добра арганізаваных людзей могуць прынесці Беларусі ого якую карысць у цяжкі час, калі будуць зарыентаваны ў правільным, новым для ўсяго дзесяцімільённага народа кірунку. Аб'яўляць жа ім вайну, ды яшчэ

ў цяперашніх крызісных умовах, проста злачынна.

— *Ці адносіце Вы ўсіх камуністаў — работнікаў апарату Прэзідыума Вярхоўнага Савета да тых самых «шасцісот тысяч свядомых»?*

— Нават у маёй любімай фізіцы наверх часам падымаюцца шэрыя, выпадковыя людзі. А што ўжо казаць аб спарахнелай дзяржаўна-партыйнай машыне кіравання? Усякія людзі, зразумела, працуюць і ў нас. Калі сустракаю, мякка кажучы, «не таго» спецыяліста, якому бракуе прафесіяналізму, дык шукаю якога-небудзь імянітага яго сваяка — хто прыладзіў да цёплага месца? — і, звычайна, знаходжу...

— *Карупцыяй, карыслівасцю хворая толькі Кампартыя?*

— Вопыт сведчыць: у другіх таксама няма асаблівага імунітэту супраць гэтай брыдоты. І Фронт не стане шчаслівым выключэннем, калі зачэпіцца за ўладу. Разумееце, мы маем справу з вельмі агрэсіўнай сацыяльнай хваробай. Аднак грамадскі арганізм у стане змагацца з ёю, не трэба толькі рукі апускаць — іх мыць трэба.

— *Раней Вы пахвальна ацэньвалі лідэра нашай партыі і дзяржавы. Час не змяніў гэту ацэнку Гарбачова?*

— Ён самае вялікае маё захапленне і самае моцнае расчараванне. Я нават уявіць не магу, як можна так упарта трымацца за дзве такія пасады! Гэта сумяшчэнне яшчэ неяк апраўдвалася да з'езда. Мне думалася, на ім Гарбачоў далікатна растлумачыць камуністам становішча і адмовіцца ад кіравання КПСС. Але не! Дык што, няма другога чалавека? Мы зноў збяднелі на разумных людзей, асоб яркіх, непаўторных? Гэта ж старыя, запыленыя нашы крокі! Адным словам, у партыйным доме хапае ўсялякага. Але ўсё роўна ён не настолькі засмечаны, каб пускаць пад знос. Рана здымаць партыю з гістарычнага ўліку. Заканчваю думку ўжо пачатым: лепей усім разам, адкінуўшы амбіцыі, думкі пра звядзенне рахункаў, пастарацца навесці парадак у тым самым доме, чым шукаць матэрыял для новага — каб не займець замест пажаданых хароманў крывабокі арачнік...

— *Ці здольная выжыць ідэя камуністычнасці ў высокім яе сэнсе цяпер, калі мы загналі сябе ў становішча жабракоў?*

— Не зусім разумею пытанне... Калі вы пра камунізм, ці пра нейкую бескарыслівасць на мяжы самаахвярнасці, ці пра маральную крыштальнасць партыйца — накшталт чысціні дзіцячай слязінкі, то... Давайце будзем зямлянамі.

У маім разуменні захаваць камуністычнасць сёння — гэта, напрыклад, дабіцца, каб пераважная большасць зямлі паранейшаму засталася дзяржаўнай уласнасцю.

— *Як — Шушкевіча ведаюць менавіта прыхільнікам ідэі прыватызацыі!*

— Так, я — за прыватную уласнасць, заўважце, і на зямлю, але ў разумных межах. Навошта яе распраўсюджваць на Белавежскую ці Налібоцкую пушчы, Свіслач ці Нарач, на літаральна кожную лапінку нашых палёў? Калі ў мяне стажыраваўся сябар — амерыканец беларускага паходжання, і ў часе адной з нядзельных вандровак я прыпыніў машыну, каб крыху размяцца, ён аслупянеў: «У вас можна так проста гуляць па лесе, закінуць вуды вунь у тую рачулку?!» Для яго гэта цуд, дзіва, бо там усё вакол чыёсьці, а значыць — не ступі! не крані! не глядзі! Мы ж прызвычаіліся да свайго камуністычнага цуда настолькі, што, не думаючы аб гэтым, гатовы прадаць яго і застацца ну поўнымі жабракамі!

— *Крыху неўпарад, і ўсё ж па тэме: ваш бацька, дарэчы, камуніст?*

— Ён быў беспартыйным, калі трапіў у Сібір і вяртаўся з яе. Аднак у 64-м годзе ўступіў у КПСС. Бо адрозніваў сталіншчыну і палітыку партыі. Гэта розныя зусім рэчы! Уступіў якраз па перакананнях — з кар'ерай ужо спазніўся... Так, структура нашай фактычна ваенізаванай партыі дазваляла ўсталявацца прынцыпу: «Я начальнік — ты дурань!», гэтага не абвергнуць. Аднак з гэтым можна пакончыць, што і пачынаюць рабіць.

— *Якая думка першага намесніка Старшыні Вярхоўнага Савета БССР пра паступовае падзенне парламенцкага рэйтынга?*

— Усё лагічна: зніжаюцца эканамічныя паказчыкі — нізкі КПД работы парламента. І ўрада. Апошні павінен смялей выходзіць з заканадаўчымі ініцыятывамі, а першаму наканавана стаць іх добрым фільтрам, наступальным апанентам. Аднак гэта пакуль у ідэале. А на справе пераважная большасць дэпутатаў, да майго вялікага засмучэння, працуе, як і раней, не дзяржаўна — местачкова-цэхава.

— *Ці не таму многія прадракаюць сённяшняму дэпутацкаму складу датэрміновую адстаўку? Такое можа здарыцца?*

— Я не варажбітка. Структура парламента, як і яго працаздольнасць, далёкая ад аптымальнай. Наш Закон аб выбарах найменш дэмакратычны ў краіне, затое Вярхоўны



18. Зак. 5493.

Савет БССР па колькасці дэпутатаў на душу насельніцтва ідзе другім у Саюзе — лідэрства сумніцельнае. Так што пытанне хоць і крыўднае, але не без падстаў. Справа такая — наперадзе прынядце новай Канстытуцыі, яна многае якраз і вызначыць.

Але я катэгарычна супраць таго, быццам гэты парламент толькі і варты, каб яго «папрасілі». Нягледзячы на ўсе агрэхі, ім створаны добры задзел на будучыню. Узяць, напрыклад, тую ж Дэкларацыю аб суверэнітэце, або першымі ў краіне прынятыя Законы аб індэксацыі даходаў, аб культуры...

— *З усіх бакоў чутны заклікі да паразумення, здаровага сэнсу. Слоў хапае. А спраў?*

— Корань праблемы ў тым, дзеля чаго кансалідуюцца і на якой падставе? Заўважце: у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый вельмі доўга не было згоды, а калі мы занялі іншую пазіцыю, дык вырашаюцца вастрэйшыя праблемы. Ад Еўропы да Персідскага заліва. Што да краіны, тут таксама змяніліся некаторыя пазіцыі — але не настолькі, каб прыйшоў канец тупіковым спрэчкам. Пошук пунктаў сутыкнення вядзецца. Замінае яму, на мой погляд, аднабаковасць памкненняў да агульнага кансенсуса — дамініруе ініцыятыва кіруючага цэнтра. Да таго ж ім не асабліва маскіруецца жаданне захаваць свае былыя пануючыя пазіцыі, што ў сваю чаргу не ўпісваецца ў планы рэспублік...

— *Гэта на саюзным узроўні...*

— Што б ні казалі, у рэспубліцы відавочнае імкненне Кампартыі застацца на даўно заваяваным палітычным плацдарме. Але апроч прывычнага жадання шырока кіраваць, лідэры апошнім часам захварэлі прагай абзавядзення мадэрновай маёмасцю, супраць чаго, у прынцыпе, камуністы ўвесь ранейшы час змагаліся. Можа варта перагледзець гэтыя памкненні? Чаму б, скажам, не палепшыць стан вышэйшай адукацыі за кошт вызваленых плошчаў у абкоме, гаркоме ці ЦК партыі? Чаму там утвараюцца нейкія кааператывы, асацыяцыі, малыя прадпрыемствы і адначасова ўзнімаецца лямант супраць надзялення зямлёй сялян? Як гэта камуністы зрабіліся разам лепшымі прадпрымальнікамі? Відаць, тут нешта не тое, зноў крывадушнічаем, не паспеўшы замаліць ранейшыя грахі... Пра якую кансалідацыю тады гаворка? Яна немагчымая, калі кожны з высокіх бакоў цішком нясе да стала перагавораў камень у кішэні. Многа падазронасцей, пытанняў і малавата шчырасці. У наяўнасці тыповае палітыканства: даеш кансенсус пад

нашым мудрым шматгадовым кіраўніцтвам! Гэты нумар не пройдзе, ва ўсякім разе асабіста я апладзіраваць яму не стану. Хоць пагадненне паміж КПБ і БНФ магчымае. Пачаць хоць бы з рэгістрацыі Фронту, спыніць нарэшце прымітыўны бюракратычны спектакль на тэму даўно спісанага «ніз-зя!»

— *Праблему перамен прадоўжым пытаннем пра тое, як перабудоўваецца вышэйшая ўлада?*

— Пакуль у асноўным спрачаемся, а пара рашуча дзейнічаць.

— *Маленечкая дэталізацыя: што Вы думаеце пра інстытут прэзідэнцтва на Беларусі?*

— Не ў яго ўпіраюцца цяпер нашы справы, а ў канкрэтыку выканаўчай улады. Вярхоўны Савет здольны сам надзяліць адпаведнымі паўнамоцтвамі Савет Міністраў. Скажыце, калі ласка, якіх яшчэ паўнамоцтваў яму не хапае для дынамічнага вырашэння пытанняў? Ды хапае іх! Тугавата з рашучасцю. Каб запатрабаваў сёння Вячаслаў Францавіч Кебіч нейкія асобныя паўнамоцтвы прэм'ера, каб даказаў, што ў тым гарантыя паляпшэння, то атрымаў бы іх.

— *На заканчэнне, Станіслаў Станіслававіч, традыцыйнае: Ваш прагноз стану «здароўя» рэспублікі?*

— Пры актыўным нежаданні вялізнай колькасці людзей працаваць не пакладаючы рук, хуткае выздараўленне немагчымае. Любы, хто больш-менш добра жыве, працуе лепш. На жаль, наша самае вялікае дасягненне — уменне не перанапружвацца... І ў першую чаргу не перанапружвацца ў справах арганізацыі і кіравання.

— *А крышку мёду?*

— Усё ж у генннай памяці беларусаў не вынішчана нацэленасць на работу сапраўдную. Мы — людзі дысцыплінаваныя, таму зрухі будуць значна больш хуткімі, чым у іншых рэспубліках. Ды і сёння ўжо нашы прылаўкі здаюцца многім памазанымі тым самым мёдам — усё пазнаецца ў параўнанні. З уключэннем цэнавага механізма, хоць людзі яго і баяцца, змены могуць быць даволі хуткімі. Прыкладна, як у Польшчы. Важна толькі пазбегнуць пры гэтым адмоўных сацыяльных з'яў, што нажылі заходнія суседзі. На стабілізацыю я спадзяюся ўжо ў гэтым годзе. А сур'ёзнага паляпшэння давядзецца пачакаць Такая праўда.

*Студзень, 1991*

# МІХАСЬ ТКАЧОЎ

## Не зрабіць зла свайму народу



Я нарадзіўся ў незвычайна прыгожых мясцінах на ўсходзе Магілёўшчыны — у Мсціславе, калысцы многіх добрых людзей, якія праслаўлі і Беларусь, і Расію дарэвалюцыйную, і Савецкі Саюз... Сям'я наша — настаўніцкая. Бацька загінуў пад Ленінградам у тым жа годзе, калі з'явіўся на свеце я — у сорак другім. Пасля вайны гадаваў мяне айчым, добры чалавек. Дай Бог яму здароўя.

Я доктар гістарычных навук, зараз загадваю адной з рэдакцый Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Намеснік старшыні Сойма БНФ, старшыня Цэнтральнай Рады Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады.

Пачну са школы. Трэцюю мсціслаўскую дзесяцігодку закончыў з трыма чацвёркамі і падаў дакументы на гістфак БДУ. Трапіў пад вельмі цікавы загад міністэрства: школьнікі, якія не

мелі двух гадоў працоўнага стажу, першы курс вучыліся завочна — маўляў, у дзяржаве сярпа і молата рабочая загартоўка для будучай інтэлігенцыі зусім не будзе лішняй. Хоць датуль я і зарабіў чатырнаццаць заліковых месяцаў у час летніх вакацый — з шостага класа працаваў рыдлёўкай у кар'еры мясцовай цагельні, яшчэ дзесяці не хапала... Таму пасля ўступных экзаменаў вярнуўся дадому і да вясны 1960 года рабіў у прыгарадным калгасе імя Варашылава.

— *Палята́дам?*

— Усяго было. Восенню бульбу адганяў, вазіў салому, а потым — у цялятніку — вывозіў гной на поле... Тады здарылася проста жахлівая зіма: стаяў страшэнны голад. Прабачце за грубы натуралізм: з нішчымніцы нашы паўдохлыя коні паядалі нават свае ўласныя навозныя «шышкі»... Становішча людзей было адпаведнае. Усё гэта моцна паўплывала на маё духоўнае сталенне. Тым больш, даводзілася працаваць не толькі з жывёлінай — быў тады ж абраны сакратаром камітэта камсамола калгаса, не вызваленым. Вось, дарэчы, цікавы факт: маладзёжным лідэрам раёна па тым часе быў сённяшні другі сакратар ЦК КПБ Аляксей Камай. Зразумела, зрэдку нам даводзілася сустракацца...

— *Міхась Аляксандравіч, а няўжо Вы не бачылі датуль сялянскае жыццё?*

— Чаму ж? Ведаў і люблю яго з маленства. Недзе ў годзе 52-м я самастойна прыехаў з Мсціслава да сваёй вясковай бабулі. Як самы дарагі гасцінец вёз з сабой дзве буханкі хлеба. Ніколі не забудзецца першае яркае ўражанне: не маючы чым прывеціць унука ў сваёй хаце з глінабітнай падлогай, бабуля падалася на агарод, дзе толькі што пасеялі бульбу, і доўга-доўга навобмацак выбірала з зямлі больш-менш вялікія бульбіны... Дык вось, тое першакурсніцкае калгаснае жыццё стала як бы падагульняючым перыядам маіх народных «універсітэтаў».

— *І якім здаўся пасля вялікі горад?*

— Я жыў тады нейкімі дзіўнымі ўяўленнямі. Калі паслаў дакументы на гістфак, то да ўступных экзаменаў рыхтаваўся выключна па беларускіх падручніках, хоць школа наша была рускамоўнай. Але мне падавалася, што ў беларускай сталіцы ўсе карыстаюцца родным словам. Якім жа моцным, нават крыўдным было здзіўленне правінцыяльнага падлетка пасля сутыкнення з рэальнасцю: у прыёмнай камісіі з-за той самай мовы адчуў такую пагарду да сябе... Маўляў, прыехаў тут лапаць нейкі і тлуміць галаву, лепей накручваў бы хвасты сваім быкам...

— *Жыццё выветрыла дзіцячыя ілюзіі?*

— На шчасце, вельмі і вельмі хутка!

— *На шчасце?*

— Бо з маладога сораму кінуўся ў другую крайнасць: калі прыехаў праз год на свае першыя студэнцкія канікулы, то так гаварыў на нейкім супер-рускім жаргоне, што маці схапілася за галаву: «Сыночак, родненькі, размаўляй пагарадскому там, у Мінску, а дома, калі ласка, прашу цябе — будзь чалавекам!» Халодны, як разумееце, душ, і ўсё стала на сваё месца.

— *Усе мы жывём недзе студэнцкімі гадамі — любіце ўспаміны той пары?*

— А як жа! Курс сабраўся вельмі цікавы. Асаблівасць: кожны трэці з пяцідзесяці чалавек — былы матрос. Тады служылі чатыры гады і з войска прыходзілі сталымі людзьмі. Што цікава, усе яны з ліку вяскоўцаў. Жылі небагата, гэтыя хлопцы хадзілі ў сваіх форменках аж да пятага курса... І, можа, дзякуючы іх флоцкай згуртаванасці, мы былі надзвычай дружнымі. Нагадаю: якраз пачыналася эпоха «вялікай кукурузы», вёска канала ў нэндзе...

— *У чым, прабачце?*

— Нэндза — старое беларускае слова. Па-руску — *«нищета»*. Жабрацтва. А нас «кармілі» ідэямі навуковага камунізму. Тыя байкі і міфы аб заможным жыцці чыталі людзі, якія, магчыма, не ведалі страшнай праўды калгаснай рэчаіснасці. Затое многім студэнтам было добра вядома, як штурхалі ў камунізм калгаснікаў, прымусова адбіраючы жывёліну, абкладаючы цяжкімі падаткамі...

І вось у тыя гады адбылося некалькі вызначальных для мяне спатканняў — з людзьмі, якія толькі-толькі выйшлі з канцлагераў ГУЛАГа. Сярод іх, напрыклад, нядаўна памёршы Шушкевіч. У невялічкім Дамку літаратараў каля ЦК Станіслаў Пятровіч расказваў пра жахі, зведаныя на Поўначы і ў Сібіры. Або ўзяць вельмі цікавага чалавека, таленавітага апавядальніка Сушынскага Язэпа Францавіча — разам з Купалам у Пецярбургу ён пачынаў калісьці суполку «Загляне сонца і ў наша ваконца», стаяў ля вытокаў нацыянальнага адраджэння.

Тады я і зразумеў: ідзеш, браток, абочынай жыцця. Такая думка выспявала не толькі пасля шматлікіх сустрэч з былымі гулагаўцамі — нагадаю, стаяў час знакамітых з'ездаў па культу асобы, здымаліся шматлікія помнікі Сталіну і яго прыхвасням... У душы маёй адбываўся карэнны пералом: я ўсвядоміў, што жыву на гэтай зямлі не нейкім

там бязродным чалавекам, а беларусам, што ў мяне ёсць культура, ёсць гісторыя, якую, на жаль, мы вельмі дрэнна ведаем. Памятаю, пры паступленні дужа здзівіўся словам аднаго адукаванага знаёмца: «Выдатна, Міхась, што ты выбраў гісторыю — яна ў нас зусім не вывучаная». Як не вывучаная? А акадэмічны двухтомнік?! Гэткія дзве цагліны, праштудзіраваныя перад экзаменам? «От пабачыш — няма яшчэ нашай гісторыі, яе пісаць трэба...»

*— Мушу перабіць: расшыфруйце больш падрабязна — што значыў для Вас той самы пералом у душы?*

— Ён быў не толькі чыста эмацыянальны, псіхалагічны... Куды больш важна іншае. Я, у прыватнасці, зноў загаварыў па-беларуску. Гэта фактычна азначала вяртанне на сваю дарогу. З той пары як нацыянальна свядомы чалавек стаў пільна цікавіцца ўсім, што звязана з беларускай культурай. Памятаю, вельмі востра перажываў разбурэнне спрадвечных помнікаў...

*— А што асабліва ўразіла?*

— Скажам, як здымалі крыжы з мсціслаўскай Аляксандра-Неўскай царквы. Было тое ў 61-м годзе. Некалі ж іх рамантаваў мой дзед... Па вяровачнай лесвіцы я дастаўляў яму туды, на самы купал снеданне. Дзед яшчэ хваліў: «Малайчына, не спужаўся вышыні...» Тутэйшыя актывісты нагадалі той выпадак і ў ідэалагічных мэтах прапанавалі ўзяць удзел у «акцыі» знішчэння: маўляў, затурканы дзед тыя крыжы ставіў, а ўнук — адукаваны, пазбаўлены забабонаў, выбірае новую, камуністычную, сапраўды светлую веру... Ды і грошы абяцалі. Я адмовіўся, што выклікала адпаведную рэакцыю камсамольскага кіраўніцтва раёна: «Чаму!» Таму...

*— Як, дарэчы, ставіліся да царквы ў Вашай сям'і?*

— Усіх дзяцей, у тым ліку і мяне, па традыцыі хрысцілі. Але маліцца хадзілі вельмі рэдка, па вялікіх святах. Так што зацятых вернікаў сярод нас не было. Праўда, на Вялікдзень, Каляды, Радаўніцу ўсе дзедавы дзеці збіраліся са сваімі сем'ямі пад адным дахам, бацькоўскім. Гаварылі пра рознае, напрыклад, чаму так бяздумна нішчацца цэрквы, касцёл, што стаяў побач. Між іншым, у ім меліся цудоўныя фрэскі, унікальны батальны роспіс XVII стагоддзя. Разам з дарослымі па-дзіцячы, па-свойму разважалі і мы, каму перашкаджае гэтае харасцво, навошта разбураюцца храмы?

Калі вярталіся пасля канікулаў ці выпадковых вандровак назад у студэнцкі інтэрнат, то нечакана высвятлялася, што разбураюць не толькі ў маім Мсціславе — па ўсёй

рэспубліцы... Гэта выклікала гаркоту, але на нейкі рашучы ўсвядомлены пратэст нас не хапала. Мы былі добрымі, сумленнымі ўвогуле хлопцамі, аднак з палітычнага пункту гледжання занадта спакойнымі. Так працягвалася да той пары, пакуль не сталі «распранаць» правадыра ўсіх народаў... Во тады курс і раскалоўся. Аднекуль раптам з'явіліся заўзятыя прыхільнікі Сталіна, якія казыралі вернасцю «вялікаму кормчаму», крычалі, быццам антысталіністы толькі і думаюць, каб асесці ў гарадах, а вось яны пададуцца ў вёскі, панясуць абдуранаму народу «разумнае, добрае, вечнае»... Аднак на чацвёртым курсе ўсе гэтыя «патрыёты» збеглі на завочнае аддзяленне, бо вельмі праглі застацца ў Мінску. Тут, дарэчы, яны жывуць і цяпер. А на вёску паехалі мы, якія нічога не крычалі.

— *Куды трапілі пасля універсітэта Вы асабіста?*

— Дыпломную абараніў у 64-м годзе і адразу атрымаў накіраванне ў Смалявіцкі раён, у Жодзіна, на краю якога якраз тады паставілі новую школу для саўгаса «Зарэчча». Амаль пяцігодку настаўнічаў, потым быў завучам. Па студэнцкай звычцы актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці, мастацкай самадзейнасці, гуляў за мясцовыя зборныя па валейболу і баскетболу. Між іншым, меў першыя разрады!

— *А ў самадзейнасці што рабілі?*

— І спяваў, і танцаваў, і на гармоніку граў. Сам нават складаў розныя надзённыя прыпеўкі

— *Пры такой актыўнасці Вас не маглі не прыняць у партыю...*

— О-о, тут цікавая атрымалася гісторыя. На апошнім курсе аб'явілі набор у першы Усесаюзны студэнцкі будаўнічы атрад. Вакол новай справы распачалі такі шум, што конкурс ва універсітэцкую цалінную «зборную» дасягнуў фантастычнай адметкі. Мне пашчасціла трапіць у лік пераможцаў. Назад вярнуўся з граматай ЦК камсамола Казахстана,і нечакана аднакурснікі рэкамендавалі мяне ў рады КПСС. Так што ў Смалявічы я прыехаў ужо з рэкамендацыямі. Аднак у райкоме партыі выйшла асечка: *«Мы вас не знаем, надо присмотреться, оценить»*. Мне стала крыўдна: «Ведаеце, як хочаце, так і рабіце... Я не набіваюся ў партыю, хоць і падзяляю прынятую Праграму камунізму». *«Нет-нет, не можем!»* Крыўдна, аднак што зробіш? Стаў працаваць і пакрысе забыўся на тую несправядлівасць, абразлівую падазронасць. І вось праз нейкі час прапануюць чытаць курс грамадазнаўства. Але, як высветлілася, усіх грамадазнаўцаў прапускалі праз райком, дзе з імі праводзілі спе-

цыяльную гутарку. Да таго ж я павінен быў стаць завучам па выхаванню... Тут ужо канчаткова патрабавалася «зрабіць» мяне камуністам. Школьнае начальства звярнулася ў РК КПБ і там умомант далі «дабро», бо на гэты раз я ўжо быў патрэбны ім, трапіў у наменклатурную «калоду»...

— *Ну, а справы асабістыя?*

— Ажаніўся, нарадзіў сына, месціліся ў прышкольнай старожцы, на адзінаццаці квадратных метрах. Уласна, выхаваннем дзіцяці займалася жонка, а я да начы прападаў у школе і лічыў, што па-іншаму жыць нельга. Праўда, з цягам часу ўсё больш і больш рупіла заняцца навукай.

— *Вы не думалі пра аспірантуру ў студэнцтве?*

— Быў грэх. Асабліва, калі пачаў пісаць дыпломную — пра гісторыю роднага Мсціслава. Між іншым, я лічыўся адным з любімчыкаў славутага карыфея беларускай гісторыі Лаўрэнція Сямёнавіча Абэцэдарскага. Нябожчык быў чалавекам неардынарным. Некаторыя ацэньваюць яго цяпер даволі адназначна: маўляў, Абэцэдарскі — тыповы рэтраград і ўсё тут! Але такі падыход мне здаецца спрошчаным. Чалавекам ён быў далёка неардынарным. Мне думаецца, што ён проста вымушаны быў выконваць сацыяльны заказ той пары, ЦК КПБ. Потым, відаць, яму гэта ўжо і самому падабалася. Але мысленне Лаўрэнція Сямёнавіча не было пазбаўлена яскравай арыгінальнасці, ён ведаў шмат першакрыніц, быў даступны для студэнтаў, аднак мог быць і страшным хамам. І ўсё ж менавіта ён падахвоціў мяне да навукі. Гэта здарылася, калі я літаральна замучыў яго роспытамі пра Мсціслаў. Загадчык кафедры гісторыі Беларусі нарэшце не вытрымаў і сказаў: «А, нічога не ведаю! Ідзі ў бібліятэку, не універсітэцкую — там наўрад ці што добрае знойдзеш; звяртайся ў фонд, перададзены БДУ акадэмікам Перцавым»... «Ды хто мяне пусціць туды?» «А гэта ўжо мая справа». Ён дамовіўся з бібліятэкаркай, і вось пасля дзесяці вечара мне («ненармальнаму») штодзень уручаўся ключ ад кніжных скарбаў — працуй, не лянуйся! Я замыкаўся і сядзеў на багацейшых стэлажах да двух, трох ночы. Як дабраўся да найцікавейшых дарэвалюцыйных выданняў, дык цвёрда вырашыў: усё, адсюль і надалей буду займацца толькі гісторыяй сярэднявечча! Абэцэдарскі ўбачыў, што Ткачоў натхніўся, і давай ганяць мяне па архівах, «прабіў» для мяне камандзіроўкі ў Смаленск, Ленінград, Маскву... Так што навукі я нюхнуў! Хоць галава і не закружылася канчаткова, але беларускім сярэднявеччам з той пары захварэў назаўсёды.

*— Не цяжка здагадацца, што дыпломную Вы абаранілі на «выдатна»...*

— Так, яе рэкамендавалі нават да друку, і я па маладой наіўнасці аднёс рукапіс у выдавецтва «Беларусь», чым вельмі пацешыў рэдакцыю: «Такога яшчэ не было, каб мы друкавалі студэнтаў!» Удосталь парагатаўшы, нехта Дрозд даў параду апублікаваць сабраны матэрыял у Мсціслаўскай раёнцы. Так і зрабіў. А неўзабаве знайшліся жвавыя хлопцы, якія сабралі шматлікія газетныя нумары і ў тым жа самым выдавецтве «Беларусь» выдалі кніжку...

*— Крыўдна, калі цябе абкрадваюць?*

— А як жа! Ды яшчэ ўлічыце, што зрабіў гэта мясцовы настаўнік, які ўсё выцягваў з мяне матэрыялы пад тым соусам, быццам яны патрэбны для мсціслаўскага музея. А на самой справе мною сабранае клалася ў кнігу, падпісаную неўзабаве двума спрытнюгамі ад краязнаўства... Прозвішча Ткачова там не было згадана аніводным словам.

*— Вы перадалі ім матэрыялы толькі сівой даўніны?*

— Я сур'ёзна займаўся і мясцовым антыфашысцкім падполлем, якім на той час ніхто не цікавіўся: *«Не было руководящей роли партии, это невыгодный для воспитания истинного патриотизма материал»*. Сапраўды, падпольны райком у нашых мясцінах утварыўся незадоўга да іх вызвалення, у канцы лета 1943 г. Аднак жа людзі ваявалі, змагаліся, гестапаўцы расстралялі многіх патрыётаў, хоць і не было ў Мсціславе кіруючага партыйнага ядра. Вось гэты матэрыял мае «сааўтары» пабаяліся змясціць. Ён увойдзе ў кнігу, якую я разлічваю выдаць сёлета.

*— Зразумела. Аднак вернемся да пачатку Вашай навуковай кар'еры...*

— Першым, хто заўпарціўся, была... жонка! Як жанчыну зразумець яе лёгка: завуч школы тады зарабляў даволі добра, да таго ж я чытаў палітэканомію на бухгалтарскіх курсах, ды яшчэ філасофію для вячэрнікаў філіяла БПІ. І вось усё гэта прапанавалася адным махам памяняць на сто рублёў аспіранта і вельмі-вельмі няпэўную перспектыву... Тым не менш, мы з маёй Валяй урэшце дамовіліся, я здаў экстэрнам два кандыдацкія экзамены і прыехаў у Акадэмію паступаць на гісторыю. Чаму не ў БДУ? Дэкан гістфака Савачкін Пётр Захаравіч адразу папярэдзіў: «Міша, Абэцэдарскі ніколі не возьме цябе ў аспірантуру». Я не паверыў, не мог паверыць, бо Лаўрэнцій Сямёнавіч некалі прылюдна абяцаў узяць у свае аспіранты. Тым не менш наш дэкан меў рацыю — чатыры разы падманваў мяне Абэцэ-

дарскі, маўляў, няма месца, хаця для іншых яно знаходзілася. У чым тут справа, так і не зразумеў.

— *Вось табе і «любімчык»...*

— Не, крыху не тое вызначэнне: ён называў мяне сваёй «надзеяй»...

У Акадэміі навук адразу папярэдзілі: «Падаваць дакументы на сярэднявечча ваша, зразумела, права, аднак, шанцаў паступіць практычна няма». Я не адступіў, экзамен здаў на «выдатна» і стаў чакаць. Але мяне зноў, у пяты раз, падманулі: залічылі тых, хто набраў менш балаў, затое ўзялі «вагой» сваіх «заступнікаў». Сябры параілі: «Ідзі да Глебкі!» — ён тады быў акадэмікам-сакратаром аддзялення грамадскіх навук. Выслухаў, стаў званіць, высвятляць, у чым справа... Потым: «Дык што ж ты, дарагі чалавеча, хочаш: туды ўзялі дачку аднаго нашага акадэміка, во! — і хітра смяецца.— Дужа хочаш вучыцца?» «Хачу!» «Ладна, зараз буду шукаць табе стыпендыю — яна галоўнае, а не месца...» У рэшце рэшт вырашылі, што возьмуць мяне па крыху іншай спецыялізацыі — на стыку гісторыі і археалогіі, затое позняга сярэднявечча. Так што народнага пісьменніка Беларусі я заўсёды ўспамінаю з удзячнасцю.

Дырэктарам нашага Інстытута была нехта Каменская — адчувала яна сябе хіба ці не царэўнай, бо была жонкай намесніка Старшыні Савета Міністраў. Адносіны паміж намі не склаліся: у аспірантуру я прабіўся насуперак яе волі. Тым не менш вучоба ладзілася. З вялікім задавальненнем займаўся замкамі Беларусі. Найцікавейшая спадчына! Колькі было раскопак, падарожжаў, знаёмстваў з мясцінамі і людзьмі...

— *Плёнам гэтага стала Ваша «замкавая» кніга?*

— Дзве, у вас, мабыць, другая, першая выйшла даўнавата. У аснову яе лягла дысертацыя, якая напісалася вельмі хутка. Да мяне ў нашым сектары менш чым за сем гадоў ніхто не абараняўся. Але я быў проста вымушаны працаваць многа і хутка, нават сам дапамагаў у раскопках з рыдлёўкай.

— *Падганяў абавязак перад сям'ёй?*

— Так. Я на рукі атрымліваў 91 рубель 80 капеек. Таму абараніўся ўсяго за тры гады, нават меней. Разам з археолагам Валодзем Ісаенкам першымі выязджалі ў поле, недзе у маі, і вярталіся апошнімі, у кастрычніку — лістападзе, амаль паўгода ў экспедыцыях.

— *Шанцавала са знаходкамі, адкрыццямі?*

— Дзякуй Богу, зрабілі шмат. Гэта неяк дапамагала

забывацца на жыццёвыя складанасці. Хоць нарэшце не вытрымаў шматгадовай — 10 год! — штодзённай язды ў Жодзіна і назад, пайшоў у партком Акадэміі: «Ну неяк дапамажыце з кватэрай».— «Не можам: метрабуд забірае жыллё». Якраз адкрываўся універсітэт у Гродне, і восенню 78-га года я даў згоду перайсці туды.

Спачатку быў выкладчыкам, праз дзевяць гадоў, працуючы, абараніў там доктарскую дысертацыю. Напісаў яе таксама хутка, але чатыры гады не мог знайсці месца для абароны. Нарэшце, ВАК дазволіў разавую абарону адразу і па археалогіі, і па гісторыі. У Мінск, у Акадэмію навук запрасілі трох дактароў навук па археалогіі з Ленінграда, Масквы, Кіева, і я абараніўся. А роўна праз тры месяцы мяне зацвердзілі доктарам навук.

— *Людзі гадамі чакаюць...*

— Вось і кажу: моцна пашанцавала. Што цікава, першымі пра гэта даведаліся мае нядобразычліўцы, таму спачатку я вырашыў: ліпа, лухта, здзекуюцца...

— *Вашаму навуковаму росту ў Гародні, мабыць, добра паспрыяла спецыфіка абласнога цэнтра па-над Нёманам?*

— Безумоўна, гэта ж сапраўдны музей пад адкрытым небам! Я прыняў актыўны ўдзел у яго археалагічным вывучэнні. Тое-сёе нам удалося. Напрыклад, разам з Ігарам Мяфодзьевічам Чарняўскім мы адкрылі храм XII стагоддзя. А разам з Алегам Анатольевічам Трусавым, сённяшнім народным дэпутатам БССР, капалі на Замку і, у прыватнасці, устанавілі, што дзяцінец старажытнай Гародні быў абведзены мурам яшчэ ў XII стагоддзі! Гэта абсалютна унікальная рэч. Калі пра тое дазнаўся акадэмік Ліхачоў, ён неадкладна запатрабаваў артыкул у свой папулярны і прэстыжны ў навуковым асяроддзі штогоднік «Памятники культуры. Новые открытия».

Між іншым, дзякуючы той знаходцы, мы зрабілі горад яшчэ больш старажытным. Датуль лічылася, што ён нарадзіўся на цэлых два стагоддзі пазней. Зараз я выношваю ідэю адзначыць у 2000-м годзе 1000-годдзе Гродна.

— *Такія прынцыповыя адкрыцці вымушалі, мабыць, да сустрэч з бацькамі горада і вобласці. Як Вам працавалася з прадстаўнікамі ўлады?*

— Па-рознаму. Вельмі рэдкім чалавекам сярод партыйных работнікаў падаўся першы сакратар абкома Леанід Герасімавіч Кляцкоў. Гэта быў проста мудры дзед, яго так і звалі паміж сабой — Дзед. Ён мог прыняць цябе хоць днём, хоць ноччу, толькі папрасіся. Выслухоўваў, задаваў

пытанні, згаджаўся з тваімі довадамі або нешта сваё падказваў... Да мяне, калі я прыйшоў з ідэяй раскопак на двары абкома, спачатку паставіўся з недаверам. А там быў якраз гарадскі гандлёва-рамесны пасад. Доўгі час мяне вадзілі за нос, усё шукалі нейкую крамолу ў той прапанове, а потым па даручэнню Кляцкова выдзелілі пляцовачку для работы. Як капанулі там археолагі, дык адразу і селі на старажытны помнік з плінфы, а гэта ж XII стагоддзе!

*— Чым яшчэ адметны для Вас гродзенскі перыяд?*

— Памятаю першую рэакцыю: як так — мясцовыя жыхары мала ведаюць сваю гісторыю, а што яшчэ горш — не хочуць ведаць яе! Не ўсведамляюць неяк сябе пад гэтым сонцам: хто яны, адкуль, дзеля чаго? Ні ідэй, ні ідэалаў, ні высокіх памкненняў... Гэта балюча кранала мяне. Але ж чалавек не жыве ў грамадстве адзін. Пастунова высветлілася, што гэтаксама думаюць многія гродзенцы, яны пакутавалі ад адзіноты, імкнуліся да знаёмства, нейкай гісторыка-асветніцкай дзейнасці. І неўзабаве стварыўся аматарскі гурток, куды я прыйшоў на чытанне разавай лекцыі, а застаўся з тымі людзьмі назаўсёдным аднадумцам. Разам мы вырашылі стварыць клуб аматараў гісторыі і культуры Беларусі. Доўга думалі над назвай: прапаноўвалася «Спадчына», іншыя варыянты, але спыніліся на слове «Паходня».

*— Чаму?*

— З даўніх часоў беларусы ўжывалі яго ў значэнні «факел». Мне вядомы дакументы XIV стагоддзя, у якіх ужываўся гэты выраз. «Паходня» пачала збіраць нас кожны чацвер. Вельмі хутка народ, як кажуць, паваліў валам. Гэта ўстрывожыла гарком. Людзі там, у гаркоме, падабраліся «цікавыя», не ведалі нават сэнсу нашай назвы — вырашылі, што ў перакладзе на рускую гэта... *«странники»*! Памятаю, запрашаюць мяне разам з біёлагам Міколам Тарандам *«на беседу»: «Так куда это вы странствуете? С кем? Зачем?»* «Ведаеце,— адказваю,— я не прывык карыстацца эзопавай мовай, нідзе мы не *«странствуем»* — сядзім перад вамі». *«Ну, как же: а кто создал подпольную организацию?»* «Не падполле мы стварылі, а клуб». *«Тогда почему у него такое название — «Странники»? «Согласитесь: странно все это!»* Моўчкі дастаю кнігу, зборнік вершаў заходнебеларускай рэвалюцыйнай паэзіі, дзе на тытульным лісту пазначана: «Сцягі і паходні». Пытаюся: «Вы хоць чытаеце вершы славутых сваіх папярэднікаў?» *«Да, читаем!»* «Дык гляньце рускі пераклад назвы гэтага зборніка на апошняй старонцы». *«Знамена и факелы»... Ах, так это факелы!»* «Так, мы

запалілі сваю паходню, каб высока трымаць яе і асвятляць усе вуглы...»

— *Каго Вы запрашалі на сустрэчы клуба?*

— Многія нашы субяседнікі — людзі добра вядомыя: гэта гісторыкі браты Грыцкевічы, Анатоль Пятровіч ды Валянцін Пятровіч, Адам Мальдзіс, Генадзь Каханоўскі, Генадзь Кісялёў, Мікола Ермаловіч — словам, эліта беларускай культуры. Гэта не магло не выклікаць самы станоўчы і шырокі рэзананс у горадзе. Неўзабаве нам стала цесна ў памяшканні старога Дома культуры. Народу набівалася столькі, што стулы ставілі нават у калідоры. «Назіральнікі» ад горада і вобласці вельмі нерваваліся: людзей шмат, «крамола» распаўзаецца, пытанні задаюцца самыя вострыя, усё больш «небяспечныя»... Культура паступова стала адыходзіць трошкі ўбок, на першы план вылучалася ўжо палітыка...

— *Вы казалі пра свае адносіны з Кляцковым, а як складвалася з начальствам меншым?*

— Гарадское неўзлюбіла з самага пачатку. Не атрымалася і са старшынёй албвыканкома Кабяком — ужо на першым годзе мы вельмі крута схапіліся з ім. На вуліцы Ажэшкі стаялі некалькі дамоў, архітэктурных помнікаў, у тым ліку адзіны на ўсю рэспубліку будынак так званага афіцэрскага сходу. Гэты ансамбль надаваў гораду непаўторны каларыт. А тут вырашылі расшырыць, калі ж без хітрыкаў — то паставіць новы аблвыканком, бо на «прыбудову» грошы давалі. Фінт у бюракратычнай гульні добра вядомы. Пад мяркуемы гмах разбурылі цэлы архітэктурны квартал, потым сталі крышыць помнікі XVII—XVIII стагоддзяў на суседніх вулічках, хоць патрэбы ў тым зносе не было. Але ж не — вырубалі даўніну пад корань... Напрыклад, знішчылі пабудову да тэатра XVIII ст., дзе жыў знакаміты Рыгор Раманавіч Шырма, славутыя рэжысёры і акцёры. З мясцовым таварыствам аховы помнікаў мы спрабавалі неяк супрацьстаяць такому наступу. Так, адзін палкоўнік-адстаўнік напісаў пра гэты тлум у «Советскую Белоруссию». Матэрыял апублікавалі, а адстаўніка... звольнілі. Тады мы ліст у Маскву, Касыгіну. На шчасце, скарга дайшла да высокага адрасата, прэм'ер сваёй рукой наклаў рэзалюцыю: *«Разобраться и доложить»*.

У Мінску хутка стварылі спецыяльную ўрадавую камісію. А ў той дзень, калі яна прымчалася ў Гародню, на мяне раптам чамусьці напаў лірычны настрой: пайшоў любавацца зімовай Каложай... Хаджу зачараваны і не ве-

даю: чорныя «Волгі» ўвесь горад аб'ехалі, адшукваючы мяне, бо нараду назначылі на тры гадзіны, а «бунтара» няма! Жонку, бедную, напалохалі, універсітэцкаму начальству ні за што перапала... Нарэшце падлятае машына, у ёй невядомыя: *«Вы Ткачев? Немедленно садитесь с нами — ждут ведь!»* Хто, што? *«Там узнаете!»*

— *Міхась Аляксандравіч, я крыху чуў пра тую гісторыю, толькі, памятаю, яе звязвалі з барацьбой за даліну Гараднічанкі...*

— Гэта ўсё ішло паралельна. За кошт даліны тады ж нашы кіруючыя разумнікі надумалі зрабіць велічную плошчу Леніна, дзе планавалася ўзвесці новы гарком — карацей, канчаткова знішчыць гістарычную частку горада. І так званую швейцарскую даліну пачалі ўжо буціць самазваламі. Людзі, зразумела, абураліся, але хто іх слухаў?

У кабінет мяне запрасілі не адразу. За даўжэзным сталом ці не трынаццаць чалавек сядзяць, у галаве — старшыня аблвыканкома. *«Вы писали товарищу Косыгину?»* «Пісаў». *«Сейчас мы посмотрим!»* — здымае пінжак, закасвае рукавы, маўляў, трымайся, зараз пабачыш, дзе ракі зімуюць! І давай мяне палохаць: гэта ж такое наплесці, не падумаць пра будучыя выгоды гарадскога добраўпарадкавання; пакуль не позна, таварыш Ткачоў, звярніцеся да таварыша Касыгіна з прызнаннем уласнай памылкі... «А вось гэтаму не быць. Між іншым, пісьмо, акрамя мяне, падпісана таксама архітэктарам Жаровінай. Не ведаю, як яна, а я за свае словы адказваю да канца».

Чатыры гадзіны выкручвалі мне рукі, спрабуючы абяліць чорнае — не атрымалася. Адзін толькі чалавек, Калацэй, работнік аблвыканкома, дарэчы, імкнуўся выслухаць мяне, зразумець логіку апанента, астатнія ж праглі расправы, не зважаючы на здаровы сэнс... Ваўкі, і ўсё тут.

— *А мо — халуі?*

— Гэта, напэўна, больш дакладна, калі прыгадаць: *«Люди холопского званья — сущие псы иногда»*... Адно і тое ж.

Далей падзеі разгортваліся так: скарга на мяне пайшла універсітэцкаму начальству, а ў суд трапіла заява з патрабаваннем прыцягнуць Ткачова М. А. да крымінальнай адказнасці *«за клевету на органы Советской власти», «за ввод в заблуждение Председателя Совета Министров СССР»* і г. д. Мяне ўжо хуценька цягнуць на партком. Лінчаваць, зразумела. Што магло атрымацца — не ведаю. Але дапамог выпадак. Акрамя той, чыноўніцкай камісіі, з якой давялося

сустрэцца, пабыла ў вобласці яшчэ адна, Камісія па культуры Вярхоўнага Савета БССР на чале са знакамітым нашым мастаком Міхасём Савіцкім. Прайшлі менчукі па адрасах разбурэнняў, названых намі ў касыгінскім пісьме, і Савіцкі звяртаецца да Кляцкова: «А ці ёсць у вас Савецкая ўлада? Гэта ж такое робіцца!» І — за шасцю подпісамі адправілі пісьмо ў Маскву: *«В основном факты подтвердились»*.

Пра гэта ведалі адзінкі, добрыя людзі расказалі навіну і мне. Хуценька, за дзень да пасяджэння парткома, званю Друшчыцу, дырэктару рэстаўрацыйных майстэрань: «Сяргей, памры, але копію адказа камісіі Касыгіну здымі і начным цягнікам перадай мне!» Раніцай разрываю вялізны такі канверт прама на пероне — ну, з гэтай паперай ніякая «інквізіцыя» не страшная... Прыходжу ў партком. Там ужо многія са мной не вітаюцца: глядзяць у вакно, некаторыя ледзьве рэагуюць, а адзін прама кажа: *«Ну что, доигрался?»*. Іду да сакратара — спыняюць: *«Вас вызовут!»* «А можа той выклік не спатрэбіцца»,— і штурхаю дзверы. Віктар Пятровіч Таранцей муліцца: *«Рановато, отдельно пригласим»*. «Каб не ставіць вас у няёмкае становішча, пачытайце лепей зараз вось гэты дакумент»,— працягваю раздабытую копію. Чытае: *«Хм, ты смотри, ты смотри, вот как интересно... Михаил Александрович, пожалуйста посидите здесь, а я к ректору сбегаю»...*

Праз дзесятак мінут вяртаецца, чую, кажа парткомаўцам: *«Товарищи, извините, есть предложение собраться после»*. І мне: *«Михаил Александрович, пройдемте к самому»*... У кабінеце Бадакова не менш цікавая размова. Калі галоўны архітэктар падаў на мяне ў суд, рэктар вітаўся са мной вельмі холадна, а тут выходзіць насустрач з-за стала: *«Я всегда знал, что вы настоящий коммунист! Действительно, рушат, не глядя, не думая, а вы человек смелый, принципиальный. И ясно почему: не за свою же дачу боретесь — за достояние города! В общем, поздравляю с победой. Знаете, бумагу эту я на всякий случай оставляю у себя, вы не против?»* «Супраць. Яна для мяне — ахоўная грамата. Калі ласка, няхай машыністка здыме копію...»

Гэта было зімой, а вясной — я ўжо казаў — быў адкрыты архітэктурны помнік XII стагоддзя, а пад ім слой жыцця старажытнай Гародні XI ст. Як мне потым расказвалі сведкі, Машэраў падтрунькваў над Кляцковым: *«Вот видишь, поторопились вы с юбилеем города»*... (Маецца на ўвазе 850-годдзе горада, адзначанае ў 1987 г.) Пасля гэтага

мне як бы амністыя наступіла канчаткова. Але прозвішча запомнілі. Усё часцей і часцей стаў атрымліваць запрашэнні выступіць з лекцыяй перад калектывамі, а пасля ўтварэння «Паходні» канчаткова стаў чалавекам, добра знаёмым усяму гораду.

— *На якой мове Вы чыталі лекцыі?*

— Палітычныя — па-руску, гісторыка-культурны цыкл — на роднай мове. І гэта не ўсім спадабалася, тым больш пытанні я падымаў вострыя. Мая шчырасць многімі калегамі ўспрымалася хваравіта-падазрона, але ніхто ўжо не мог прымусіць мяне «змяніць пласцінку». З гарбачоўскай вясной нібы прарвала плаціну грамадзянскага спакою. «Паходня» палітызавалася цяпер так імкліва, што ідэалагічнае начальства страшэнна напалохалася. Пакуль яно не перайшло ў наступ, мы афіцыйна памянялі назву клуба, пачалі называцца так: гісторыка-культурны і палітычны клуб «Паходня». Цяпер ужо інструктараў змянілі загадчыкі аддзелаў з партыйных і камсамольскіх камітэтаў — яны не прапускалі ніводнага паседжання.

— *Якія мерапрыемствы Вам запомніліся асабліва?*

— Сярод вялікіх масавых вечароў — юбілей КПЗБ з запрашэннем адзінага ўцалеўшага сакратара падпольнага ЦК Мікалая Сямёнавіча Арэхвы, які хоць і не прыехаў, бо захварэў, але прыслаў нам вельмі цёплую тэлеграму. Атрымалі таксама прывітальны ліст ад жонкі Браніслава Тарашкевіча... Здавалася, якая тут крамола? Не, знайшлі «двайное дно»: маўляў, свята падавалася не проста з нагоды круглай даты, а ў кантэксце нацыянальнага адраджэння, культуры. Апафеозам, аднак, сталі Дзяды 88-га года.

Я дамовіўся з гарадскім кіраўніцтвам правесці ўшанаванне продкаў на вайсковых могілках, мы разам распісалі ўсю працэдуру, з ёю пагадзілася сакратар гаркома па ідэалогіі... Усё выдатна, рыхтуемся, як раптам увечары мяне выклікаюць: *«Нет и еще раз нет, категорически запрещаем!»* «Што здарылася?» *«Нет и точка. Попробуете ослушаться — у нас четыреста милиционеров, за последствия будете отвечать персонально»*. «Пачакайце, вы ж у адзінаццаць дня далі «дабро», і я абвясціў праз клуб увесь горад, людзей ужо немагчыма стрымаць, падумайце, што робіце!» *«Все, товарищ Ткачев, решение принято, вот постановление горисполкома»*.

Мне і няўцям было, што ўжо аб'явілі мабілізацыю партактыву, што назаўтра адна група засела ў гаркоме, а другая на трох аўтобусах разам з міліцыяй падалася да вайсковых

могілкаў. Запахла буйной правакацыяй, я тэрмінова сабраў сваіх: «Ведаеце, на ражон лезці не варта. Бог ім суддзя, такая палітыка не для майго розуму. Каб не абразіць людзей, свята абавязкова правядзём, але не на могілках, а ў Доме культуры. Накіроўвайце ўсіх туды». Праўда, пачатак перанеслі з дванаццаці дня на шаснаццаць гадзін. З-за гэтага пацярпелі тыя актывісты, якія з раніцы падаліся на могілкі, каб даць «паходненцам» «дастойны» адпор. А мы, атрымалася, надурылі іх — столькі людзей сабралася ў ДК, так добра ўсё прайшло...

І толькі пасля ўсяго даведаліся аб падзеях у Мінску, аб тых вядомых «Дзядах-88». Тады толькі зразумелі, адкуль занерваваліся нашы мудрацы, чаму так нечакана яны памянялі сваё рашэнне...

— *А Вы былі ў сталічным Доме кіно на ўтварэнні «Мартыралога Беларусі»?*

— Не мог не адгукнуцца на тое запрашэнне, прыязджаў, увайшоў у склад аргкамітэта БНФ.

— *Рэакцыя начальства, зразумела, аказалася негатыўнай?*

— Іншай я і не чакаў: суцэльныя касыя позіркі, рэпутацыя нацыяналіста... Але для мяне куды большае значэнне меў той факт, што ў час, калі бурліць уся краіна, так пацярпеўшая ад сталінізму Беларусь не падавала нават сімвалічны голас пратэсту... Некаму трэба было стаць парушальнікам грамадскага спакою. Майго дзеда, які прайшоў грамадзянскую вайну, меў восем дзяцей, у 33-м пасадзілі. Ні за што! Рабацягу... Таму я не вагаўся ні на хвіліну. Перабудову ўспрыняў усёй душой і розумам, лічыў: наступіў пераломны момант, і сапраўдны камуніст павінен знаходзіцца наперадзе, рабіць справу, карысную для народа. У сваёй пазіцыі я не бачыў ніякой антысаветчыны, ніякага антыкамунізму. Аднак так меркавалі не ўсе...

— *Газеты па Вас прайшліся?*

— І даволі пагана. Так, з чужога голасу, па «сацзаказу» напісаў пагромны артыкул дэкан нашага факультэта.

— *Супраціўляліся альбо махнулі рукой?*

— Дабіўся права выступіць з публікацыяй у адказ. Называлася яна «Хто мы такія». Гэта была вострая водпаведзь магільшчыкам «Паходні». Дарэчы, яе філіялы пачалі ўтварацца ў самых розных калектывах, але зусім не ўсюды нашых прыхільнікаў сустрэлі з разуменнем. Рэктар мядінстытута пра сваіх новаспечаных «паходзенцаў» сказаў вельмі выразна, нібы прысуд агучыў: *«Это все агенты ЦРУ!»*

Не менш энергічна выказаўся рэктар сельгасінстытута: *«Все вы будете в Сибири!»* Хлопцам-пяцікурснікам прама заявілі: «Выбірайце: дыплом або «Паходня». Зразумела, перавага была аддадзена першаму... Прыйшлі, не падымаюць вачэй, пунцовыя: «Прабачце нас...»

У выніку гэтага на гарадской партканферэнцыі мяне абазвалі і такім, і сякім, нават агентам міжнароднага імперыялізму! Калі перадалі тыя словы, хутка напісаў пратэст і дабіўся, каб назаўтра адкрыты ліст да ўдзельнікаў канферэнцыі быў зачытаны. У прыватнасці, я запатрабаваў доказаў у пацвярджэнне прагучаўшых абразлівых слоў. Рэктар медінстытута вымушаны быў у другі раз падымацца на трыбуну: *«Меня не так поняли, я не то имел в виду...»* Сітуацыя атрымлівалася пікантная, і канферэнцыя прызнала, што асобныя аратары перагнулі палку, Ткачоў нармальны чалавек...

— *Рэдка каго ў тыя дні абмінуў удзел у выбарчай кампаніі. Вас вылучалі кандыдатам у народныя дэпутаты краіны?*

— Так, у аб'яднанні «Азот», але з-за хваробы я трапіў у бальніцу і не змог прыняць удзел у выбарах. Дзякуючы заарганізаванасці ніхто ў першым туры не перамог, а «Азот», Інстытут біяхіміі, яшчэ пяць калектываў паўторна вылучылі маю кандыдатуру. Адначасова нехта назваў імя сённяшняга першага сакратара абкома партыі Сямёнава. Гісторыя нашай барацьбы цікавая ў тым сэнсе, што яна прадвызначыла наступныя мае палітычныя паводзіны. Таму і спыняюся на ёй больш падрабязна.

На працягу месяца мы разам ездзілі да выбаршчыкаў. І заўсёды Сямёнаў гаварыў, што ён не хацеў дэпутацтва, бо Кляцкова ўжо абралі, а два сакратары-дэпутаты — гэта занадта. Аднак, казаў далей мой сапернік, 62 калектывы настаялі на такой барацьбе. Напачатку ў ёй удзельнічалі ажно сем чалавек, але пасля першага паўторнага тура засталіся толькі ён і я.

— *Якое ўражанне зрабіў на Вас тагачасны сакратар абкома па прамысловасці?*

— Чалавека неардынарнага, са сваім складам мыслення, добрым веданнем вытворчасці, абласных сацыяльна-эканамічных праблем — тут ні ўбавіць, ні дабавіць. Гэта можа здацца дзіўным, але я так выхаваны з дзяцінства, што маю традыцыйную павагу да людзей са становішчам. Не ад таго, што па-руску называецца *«подобострастием»,*— ад жыццёвай логікі: адказныя пасады павінны займаць адказныя людзі...

Але ж якім было маё здзіўленне, калі пасля выйгрышу Сямёнаў стаў заяўляць у сваіх пераможных інтэрв'ю прыблізна наступнае: даведаўшыся, што адзін з лідэраў БНФ выставіў сваю кандыдатуру ў народныя дэпутаты краіны, ён са свайго боку вырашыў зрабіць усё, каб Ткачоў «не прайшоў», і мэты сваёй дамогся. Тое прызнанне — нібы абухом па галаве. Разумееце, ездзіш месяц з чалавекам у адной машыне, абедаеш за адным сталом, спрачаешся, а потым ён робіць разварот на сто восемдзесят градусаў і гаворыць зусім другое...

— *У такіх выпадках кажуць: гэта палітыка, яна вымушае да вельмі своеасаблівай тактыкі...*

— Добра, разумею. Магу зразумець. Але ж ёсць у гэтай справе і маральны бок. У фільме, прысвечаным яму, Сямёнаў публічна заявіў, нібыта ў часе адной з сустрэч на чыюсьці абражальную для БНФ рэпліку я заявіў: выйдуць супраць нас танкі, як у Тбілісі, дык накіруем іх на абком! Гэта ўжо не проста хлусня, а гнюсная... Правакацыйная. Здарыўся той па-мастацку дадуманы Сямёнавым эпізод на цукровым заводзе ў Скідалі. Сапраўды, адна з жанчын сказала: «А навошта нам гэты Народны фронт — хоча, каб танкі на вуліцах былі?» Я ў адказ: «Што ж танкі — паглядзім, куды яны паедуць...» Усё! Сам камуніст, я проста не мог заявіць: мы «пашлём танкі на абком»...

Цікава, што ў трэці раз тую перадачу далі на Саюз, але згаданы эпізод ужо ўбралі. А ў рэкламе мясцовага значэння не пагрэбавалі і хлуснёй. Ліпай.

— *Вы многа, дарэчы, прайгралі?*

— Вось лісты выбаршчыкаў, якім я пакуль не даю ходу. Тут апавядаецца пра шматлікія махінацыі на выбарчых участках. Усялякімі няпраўдамі прабіваліся ў дэпутаты асобныя сённяшнія кіраўнікі. Для мяне тыя выбары сталі сапраўднай школай жыцця. Я ўпершыню ўбачыў, што палітыка і бруд, амаральнасць ідуць побач. Датуль шчыра верыў у ідэалы партыі, стараўся ўзняць яе аўтарытэт, думаючы, што найлепшы для гэтага шлях — нармальная старанная праца, асабісты прыклад у грамадскім жыцці. І вось прыйшло крушэнне маральных устояў, пэўных палітычных прынцыпаў. Зразумеў нарэшце, што ў партапарату святога няма, дзеля захавання ўлады ён гатовы на ўсё.

— *Нават такія прывабныя для многіх людзі, як...*

— ...як мой сапернік. Між іншым, яго «каманда» працавала пад той вывескай, быццам Сямёнаў — гэта гродзенскі Ельцын! Вось так! Каб такое было на самой справе... Дзя-

куючы нашаму «Ельцыну», я страціў веру, ён падламаў устоі маіх поглядаў як камуніста.

— *Аднак Вы не спяшаліся пакінуць партыю?*

— Апошнюю кропку паставіў XXXI з'езд КПБ. Паўтару: я лічыў сябе добрым камуністам, не ведаю, хто зможа кінуць у мяне камень за якіясьці грахі... Але спектакль, учынены ў Доме афіцэраў з Бровікавым, рэзалюцыі антыперабудовачнага плана, прынятыя дэлегатамі, патыхаючы 30-мі гадамі даклад Сакалова, яго бальшавіцкая лютасць да сваіх жа землякоў, якія глядзяць на свет іншымі палітычнымі вачамі,— усё гэта вымусіла мяне ў рэшце рэшт развітацца з партыяй. Асабліва ўразіла, паўтару, нежаданне КПБ хоць бы на крок наблізіцца да сваіх палітычных апанентаў, адмовіцца ад прымітыўнай дзяльбы ўсіх на «сваіх» і «чужых», чаго я ніколі ў жыцці не прымаў і не прыму. Ёсць «МЫ», людзі розных поглядаў, якія тым не менш належаць да адной сям'і, аднаго народа. Невядома яшчэ — зло ці дабро наша «рознакаляровасць»...

На вялікі жаль, партапарат робіць усё, каб захаваць статус-кво Беларусі, не даць ходу дэмакратызацыі і прадоўжыць шлях у «рамках сацыялістычнага выбару»... Калісьці Маякоўскі сказаў пра яго вельмі трапна: *«С Лениным в башке и с наганом в руке...»* Гэтай дарогай мы ішлі семдзесят з гакам гадоў. І што маем? Такую сітуацыю, калі нельга гаварыць пра нармальнае чалавечае жыццё; гэта ўбогае існаванне, здзек над тымі задумамі, вялікімі ідэямі, якім мы пакланяліся і якія нарэшце пачалі развейвацца, нібы міраж, знікаць, падобна нейкім надуманым міфам. Жыццё падмянілі міфатворчасцю. Краіна, рэспубліка сталі палігонам эксперыментаў, дзяржава пайшла крывавым шляхам, густа высланым трупамі сваіх жа людзей, адданых у большасці ўсё тым жа «вялікім ідэям», ні ў чым не вінаватых... Свае білі сваіх — жахлівая, непаўторная трагедыя ўсіх часоў і народаў...

Я не вельмі спадзяваўся, што XXXI з'езд цвяроза ацэніць народны лёс, хоць недзе ў глыбіні душы жыла надзея: а раптам? Цуд, аднак, не адбыўся. І тады канчаткова вырашыў: я павінен застацца чэсным чалавекам, а значыць, не магу больш заставацца ў такой партыі, якая здрадзіла народу ў чарговы раз, увяла яго ў зман, нібыта ўсе рэпрэсіі — гэта ініцыятывы выключна Сталіна; не, партыя вінавата, што яна стала прыладай працы ў руках гэтага ката. Маё глыбокае перакананне: на партыі і ўсіх камуністах, былых і цяперашніх, ляжыць цяжкі смяротны грэх, мы



19. Зак. 5493.

абавязаны павініцца перад народам за тое, што ўтрамбавалі яго ў яму, з якой ніяк цяпер не можам выбрацца. Я асабіста таксама не ўсё зрабіў, каб неяк выправіць ці паправіць становішча. На мільёнах членаў КПСС ляжыць цяжар маральнай віны і адказнасці як за мінулае, так і за будучае. Аднак нельга жыць у становішчы грэшніка, які толькі і робіць, што каецца. Трэба мяняць сітуацыю да лепшага, замольваючы грахі канкрэтнымі справамі. Глыбока перакананы: наша сённяшняе пакаянне можа існаваць толькі ў канкрэтных дзеяннях.

— *Якімі бачацца яны асабіста для Вас?*

— У актыўнай палітычнай дзейнасці па фармаванню такіх структур у рэспубліцы, што сапраўды могуць гарантаваць дэмакратыю, заможнае жыццё кожнага чалавека — іншымі словамі, размова пра свабоду, роўнасць, салідарнасць, прыярытэт права. Гэтага можна дабіцца толькі ва ўмовах шматпартыйнасці, палітычнага плюралізму.

Таму я вырашыў стаць на пазіцыі, даўно і надзейна выверанныя гісторыяй,— еўрапейскай сацыял-дэмакратыі. Я думаю, гэта ісцінная партыйная лінія, якая непарыўна звязана з народам.

— *Вы — член аргкамітэта Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады...*

— Яе знішчылі ў 1918 годзе. За ёй стаяць вельмі слаўныя імёны... Тыя, каму дарагія ідэалы сапраўднага сацыялізму, сапраўднай роўнасці, для каго сваё жыццё непарыўнае ад лёсу народа, аб'ядноўваюцца ў БСДГ.

— *Ваша будучае стаўленне да камуністаў?*

— Адэкватнае іх пазіцыі. Мы не збіраемся, ва ўсякім разе, развязваць ніякай грамадзянскай вайны. Не збіраемся таксама ўчыняць нейкі там суд, хай сабе і маральны — гэта справа гісторыі... І народа. Наперадзе нармальная палітычная сітуацыя, калі будуць суіснаваць розныя палітычныя канкурэнты. Пры ўсіх варыянтах развіцця падзей неабходна памятаць: мы — беларусы. І камуністы, і сацыял-дэмакраты. Розныя партыі аднаго народа. Зразумеем гэта — усё астатняе вырашыцца лёгка і проста. Не зрабіць зла свайму народу — найпершая запаведзь палітыка, яе трэба памятаць штодня. Кожнаму. Трэба старацца рабіць так, каб над нашай дарагой зямлёю было спакойна, свяціла сонца, і мы ўсё рабілі для таго, каб выжыць пасля атамнага Чарнобыля. Гэты тэзіс павінен сёння аб'ядноўваць людзей самых розных палітычных поглядаў. Галоўнае, паўтару, жыць спакойна, дэмакратычна, адчуваць сябе беларусамі.

*— Акрамя ўсяго, Вы — адзін з кіраўнікоў Фронту. Чым жыве зараз БНФ, якія новыя праблемы вылучыла жыццё перад «Адраджэннем»?*

— Я вельмі перажываю за справы БНФ. Большасць з нас прыйшлі туды па закліку сэрца і розуму, хацелі, каб гэта сіла ацэньвалася адназначна станоўча, а не як дэструктыўная грамадская сістэма. На жаль, хутка ўжо два гады бачна непрыхаванае глумленне над ісцінай: Фронт існуе, а яго ўсё ніяк не зарэгіструюць. Мы ўжо тройчы атрымлівалі нейкія недарэчныя адпіскі ў адказ на заявы аб рэгістрацыі. Сваімі паводзінамі каманда Сакалова, якая насмерць стаяла супраць новай палітычнай сілы, магчыма, аб тым не падазраваючы, спіхнула значную частку нашых прыхільнікаў на адкрыта антыкамуністычныя пазіцыі. Такое становішча, падкрэслю, штучна створана менавіта ЦК КПБ.

Непрыхаваны антыкамунізм, як кажуць, папёр пасля таго, як з нас пачалі здзекавацца. Публічна абражаць, паліваць брудам. Чаго вартая адна толькі атака на Пазьняка: пісалі, нібыта дзед яго быў звязаны з фашыстамі, ды і радня, маўляў, такая ж... У выніку такі недастойны псіхалагічны ўціск зрабіў з Зянона Станіслававіча катэгарычнага чалавека, які абсалютна не ўспрымае камуністычныя шыльды. Хоць з Пазьняком можна было дамовіцца. У 88-м, 89-м гадах. Аднак сёння ніхто з партапарату не заключыць саюз з лідэрам БНФ.

Заслуга за штучна створаную канфрантацыю кладзецца, зноў падкрэслю, на ЦК КПБ. Яго сакратароў. Увогуле, бяда ўсёй Кампартыі ў тым, што вельмі доўга яна не можа падабраць неабходнага чалавека на першую ролю ў ідэалогіі. У КПБ не было і няма сучаснай ідэалогіі. Тое, што гэтым называецца, на самай справе нейкая калька з маскоўскіх канцэпцый, сілком, гвалтам прывязваемая да нашай зямлі, дзе ёсць свае праблемы і балячкі... Успомніце вайну супраць адраджэння сваёй нацыянальнай культуры. А як глушылі праўду аб Чарнобылі? А праблемы вёскі? Катэгарычная адмова ЦК ад прыватнай уласнасці на зямлю прывядзе да таго, што мы закансервуем сітуацыю настолькі, што вымруць яшчэ паўтара-два пакаленні людзей, якія маглі яшчэ направіць справы і далей — усё, кропка! Правадыры пойдуць на забяспечаную пенсію, а вёска застанецца голенькай, будзе гібець... Тая ж самая сітуацыя і ў прамысловасці. Пабачыце, неўзабаве не БНФ, а жыццё пасраміць нашых кіруючых артадоксаў, што заблудзіліся паміж трох соснаў з ідэяй камуністычнай перспектывы. Часам трэба

мець гонар прызнацца ў памылцы — мы ж усе людзі, зразумеем... Не, адны фанфары: вярхі не памыляюцца, падводзяць нізы! Толькі нізы! Абсурд... Жыццё над гэтым яшчэ не раз жорстка пасмяецца.

— *Зноў мы выйшлі на праблемы КПБ, хоць спрабавалі гаварыць пра клопаты БНФ...*

— Яго сённяшні лёс ва многім тлумачыцца паўлегальным палітычным становішчам. Ну, ці магчыма нармальная работа, калі ўправа Фронту не мае хоць які пакойчык, адсутнічае тэлефонная сувязь, у нас няма свайго рахунка і г. д. Ці губляе ад гэтага рэспубліка? Яна мае ад такога становішча штучна пагоршаны маральны клімат, грамадзянскую напружанасць, уся сітуацыя складваецца такім чынам, што ў рэшце рэшт балем пачне правіць натоўп. Ім не ўкіруе ні КПБ, ні БНФ — ніхто!

— *Найгоршы варыянт...*

— Так-так, гэта ахлакратыя! Яна разнясе ў трэскі і левых, і правых, і цэнтр...

— *Дарэчы, якую пазіцыю, на Ваш погляд, займае ў палітычнай прасторы БНФ?*

— Цэнтрысцкую. Ну, можа, левацэнтрысцкую. Аднак вяртаюся да сваёй думкі: антыфронтаўская дзейнасць ЦК КПБ нанесла вялікую шкоду ўсім нам, беларусам. А магла б атрымацца вельмі добрая школа дэмакратыі, была магчымасць прытармазіць нейкія непазбежна ўзнікаючыя адмоўныя грамадскія плыні, знайсці разумны кансенсус паміж БНФ і КПБ, іншымі структурамі. Але пасля перажытага ў час выбараў, пасля тых падтасовак, штучных абмежаванняў непажаданых кандыдатаў даўні крыўдны след ужо не зарасце і не забудзецца. Мы, здаецца, атрымаем яшчэ горшую сітуацыю, чаго мне асабіста страшна не хочацца.

Раней я на сто працэнтаў быў упэўнены: Беларусь назаўсёды застанецца тэрыторыяй, дзе пры ўсіх умовах будзе правіць баль розум. А сёння той упэўненасці няма — справы зайшлі вельмі далёка, дужа моцнае напружанне канфрантацыі.

— *Зараз рыхтуецца другі з'езд БНФ — што можна чакаць ад яго?*

— Уся наша паслярэвалюцыйная гісторыя — гэта палітыка людзей з перакошанымі ад крыку тварамі. То: «Даеш Варшаву!», то: «Даеш Берлін!»; то: «Даеш калектывізацыю! Індустрыялізацыю!! Ворагаў народа!!!» Цяпер: «Далоў БНФ!» «Далоў КПБ!» — вось і ўся гісторыя. Не, сапраўдная

гісторыя так не робіцца — пры крыку няма дэмакратыі. Нам трэба думаць над тым, каб памяняць гэты самы твар, надаць яму нармальны чалавечы выраз. Еўрапейскі. Пара ўсім палітыкам — і з таго, і з другога боку — зразумець: нельга выходзіць на людзі са сцятымі зубамі.

— *Вельмі хацелася б, каб з'езд франтаўцаў быў крокам ад грамадзянскай злосці...*

— Паглядзім. Ва ўсякім разе магу прысягнуць вам: Пазьняк вельмі прыстойны чалавек, вельмі, але затраўлены. Так азлобілі, што стаць другім яму надзвычай цяжка. Азлобілі няпраўдай, хлуснёй, паклёпамі. На самай жа справе, калі разабрацца, то Зянон Станіслававіч чалавек трагічнага лёсу. І сям'я яго перажыла столькі, што не дай Бог... Ад прыроды лідэр БНФ чалавек чысты, сумленны, разумны, цікавы, шматгранны, таленавіты — ніводнае з гэтых вызначэнняў не лішняе, не надуманае. Пазьняк не заслугоўвае адназначных рубленых ацэнак, дарэчы, як і любы іншы чалавек. Нельга ацэньваць лёс адным словам-прысудам. Пры пэўнай палітычнай мудрасці кіраўніцтва маёй былой партыі ў нас на Беларусі магло атрымацца вельмі цікава, так, на зайздрасць іншых...

— *Вы маеце на ўвазе варыянт, калі б на чале КПБ стаяў чалавек тыпу Бразаўскаса?*

— Нешта ў гэтым плане, але я хачу сказаць трошкі другое. Ідэя садружнасці, якую прапаведуюць, напрыклад, у Расіі Ельцын, а ў нас Кебіч, ідэя садружнасці самастойных суверэнных дзяржаў — вельмі перспектыўная. Увесь цывілізаваны свет пайшоў такім шляхам, і толькі мы выбралі калгас, сталі будаваць новы Вавілон... Мы абавязкова пойдзем па дарозе сусветнай цывілізацыі. Толькі адправіцца ў яе можна ўжо сёння, а можна і праз дваццаць год... Калі цягнуць, то, не прывядзі Бог, дачакаемся грамадзянскай вайны. Навошта яна нам? Ці не лепей паставіць на першы план эканамічную, палітычную самастойнасць? Пытанне, як і з кім жыць, на якіх адносінах, непазбежна паўстане, і давядзецца адказваць... Мы, аднак, прадаўжаем хаду *«в едином строю»*. Хоць светам ва ўсе вякі правіла і правіць адна ідэя — нацыянальная. На гэты стрыжань усё накалваецца. Толькі не варта нацыянальную ідэю атаясамліваць з нацыяналізмам. Не, тут нешта больш мяккае, пластычнае, светлае, прыцягальнае... На жаль, у нас на Беларусі гэта ідэя пакуль і не начавала.

— *А мне здаецца, што яна жыве ва многіх людзях неяк неўсвядомлена ці, скажам так, эмбрыянальна: ганарацца*

*сваёй нацыянальнай прыналежнасцю, хоць не ведаюць мовы, культуры, шмат чаго іншага, ганарацца высокай унутрысаюзнай рэпутацыяй рэспублікі...*

— Я згодзен з вамі. Каб нам далі гадоў на дзесяць сферу адукацыі, культуры, інфармацыі, мы б па-добраму перакавалі большасць насельніцтва. А далей — кансалідацыя нацыі. Як у Прыбалтыцы. І да гэтага ўсё ідзе. Пакуль працэс стрымліваецца камандай падкоркі — страх! Мая мама дасюль баіцца за мяне: «Дзетачка, ты ж ведаеш: дзеда нашага пасадзілі, столькі ў вёсцы раскулачылі, баюся, што і вас туды ж...» А яна пранастаўнічала больш як трыццаць гадоў... І такі — увесь наш народ, ён вельмі шмат гора перажыў. Наўрад ці хто ва ўсёй Еўропе вынес столькі, як беларусы — здаецца, я не памыляюся.

Гэта вам кажа спецыяліст па ваеннай гісторыі. Калі пачынаю лічыць ахвяры, то не хапае ні рук, ні ног: то крыжакі, то крымскія татары, то маскоўскія паходы... Нават Пётр, якога мы так славім, жывога месца не пакінуў на Беларусі, уцякаючы ад Карла XII пад Палтаву. Выпаліў усё Падняпроўе, пусціў на галавешкі тагачасны Магілёў, які быў тады нібы Нью-Йорк. У канцы XVII стагоддзя стольнік Аляксей Талстой дакладваў цару: *«В Могилеве, государь, 40 000 дворов. А дома все необнаковенные, все расписаны картинами»*. Падлічыце: калі кожны дом гэта хоць пяць чалавек, там жылі 200 000! А пятроўскія грэнадзёры-калмыкі на чале з капітанам Салаўёвым выпалілі ўвесь горад. Гэтаксама ляглі і Шклоў, і Дуброўна, і Орша, і Копысь, і Віцебск... А колькі тут садралі *«людских и конских кормов»?* Патрашылі да апошняй ніткі.

І колькі ўсяго перажыла Беларусь у астатніх войнах? Нейкае праклятае месца. У генах народа ўжо выпрацавалася такая структура поглядаў, што галоўнае — каб шкоды не было! А грузіны з кінжаламі ў зубах танцуюць... Беларуская псіхалогія вельмі каштоўная. Наша пластыка мыслення, імкненне духоўнай раўнавагі трымае за сабой каласальную патэнцыю, якая ў адзін час можа ўзяць і выбухнуць з нябачанай яшчэ энергіяй. Карыснай. Калі на свабоду выходзяць і душа, і плоць, і думкі. У нас вельмі здаровы запас. Але ён не можа быць пастаянным. Зараз пік пройдзены,назіраецца спад... Цяпер усё задушыць, мне здаецца, каўбасная ідэя... Яе падсунулі замест камуністычнай. А куды гэты крок? У жывёльны свет... Паслухайце, з усіх трыбун нясецца: «Што, ваша мова каўбасы дасць болей?!» Гэта ўсё тая ж адсутнасць сапраўднай рэальнай, жыццяздольнай

ідэалогіі. Перманентная адсутнасць... Новы галоўны прапагандыст у апошнім інтэрв'ю заяўляе: не разумею камуністаў, якія кінуліся ствараць новыя партыі! Але ж тут, паважаны, твая трагедыя: не разумееш...

— *Міхась Аляксандравіч, бачу, пара заканчваць гутарку. Аднак развітацца хацелася б на больш мажорнай ноце...*

— Нягледзячы на ніякія адкаты, працягваю верыць у наш народ. Што б з ім не вытваралі, ён застанецца самім сабой: добрым, працавітым, незлабівым і вельмі адважным, рашучым у крытычныя моманты гісторыі, калі на карту ставіцца лёс яго жыцця. Жыву надзеяй, што лепшыя рысы нацыянальнага характару яшчэ праявяцца. Наша задача — не шкодзіць, а ўсяляк спрыяць гэтаму. Не выпадаць з агульнай абоймы, мы павінны быць у народзе як баявыя патроны. І ўсё зрабіць дзеля адстрэлу зла і захавання дабра.

*Люты, 1991*

# ЗЯНОН ПАЗЬНЯК

## Аснова дабра, працы, заможнасьці — свабода, свабодны, вольны, творчы чалавек



Вашу прапанову расказаць пра сябе зусім не ўспрымаю. Дзе нарадзіўся, кім хрысьціўся, люблю салодкае або горкае — ну, каму гэта цікава?! Навошта патрэбна?! Так, ведаю: бруд на мяне выліваюць цэбрамі, імкнуцца намаляваць нейкім нечалавекам... Гэта лагічна для сістэмы, з якой я змагаюся,— сапраўды сатанінскай арганізацыі, што жыве па законах зла, цемры. Самае страшнае зь яе злачынстваў — запалоханае грамадства. Забіты жывёльным страхам чалавек. Ён не прывык думаць самастойна, аналізаваць рэчаіснасьць, даваць дакладныя ацэнкі.

Вось я паслухаюся і раскажу пра сябе, вы напішаце, даверлівыя ўладзе прачытаюць гэта, а потым іншае, афіцыйна-прапагандысцкае, і зларадна ўсклікнуць: ага, вунь жа як было на самай справе! Разумееце, тут нявольніцкая псіхалогія. Таму, лічу, ня трэба марнаваць час на сваё

абяленьне. Жыцьцё само неяк расставіць усё па сваіх месцах. Я жыву па прынцыпу: не перашкаджай сістэме ганьбавацца. Самой! Брахаць з кожным — ніжэй маёй чалавечай годнасьці. Гэта ўвогуле бессэнсоўна, да таго ж патрабуе часу, энергіі. А ў мяне ёсьць іншыя заняткі. Уся гэтая камуністычная прапаганда, яе гразішча, ілжышча не дасягаюць галоўнага—не выбіваюць мяне з раўнавагі; я працую, Фронт рухаецца, разьвіваецца, зьезд паказаў гэта... Я спакойна сплю, праўда, калі хапае для гэтага часу... Ва ўсялякім разе паганых сноў ня бачу, мяне нічога не палохае. А сабакі хай брэшуць — абы караван рухаўся.

— *Усё ж такі, Вы недааацэньваеце таго, якім Вас падаюць людзям.*

— Магчыма. Мяне асабіста ў першую чаргу цікавіць духоўны стан чалавека, яго інтэлектуальныя здольнасьці. Далей ацэньваю палітычныя погляды... Мне цікава: галадае чалавек ці мае што есьці? Ёсьць яму дзе жыць, ці пакутуе гадамі ў інтэрнаце? А розныя там перыпетыі прыватнага жыцьця, ды яшчэ інтымнага,— гэта ўсё бульваршчына, разьлічаная на нізкія грамадзкія інстынкты. Ім патураюць журналісты, дрэнная літаратура — на гэтым робіцца папулісцкая камерцыя. Праўда, у нас яна яшчэ ня вельмі разьвілася. Мяне асабіста, паўтару, гэтыя пытаньні не цікавяць. Не цікавяць, напрыклад, скандалы, зьвязаныя зь Ельцыным. Я толькі хачу ведаць, што ён за чалавек па сваёй прыродзе, якія яго погляды, мараль...

— *Дык мне рупіць даведацца пра тое самае! Чуў, напрыклад, што ў Вас каля тысячы вершаў, што Вы добра фатаграфуеце, шмат займаецеся тэатрам — гэта праўда?*

— Хоць маю фотаальбомы і меў аўтарскія выставы, гаварыць пра сябе ня буду. Хочаце — пачытайце энцыклапедыю, дзе ёсьць пра тое колькі словаў, спытайце ў фатографаў — яны прафесійна ацэняць мае работы.

— *Як усё ж здарылася, што Вы ўшчыльную заняліся фатаграфіяй?*

— Каб не было бальшавікоў і каб Беларусь была вольнай, незалежнай дзяржавай з нармальным цывілізаваным гаспадараньнем, то я б ніколі не займаўся палітыкай. Не люблю гэты занятак. Але ў жыцьці мне прыходзілася рабіць і тое, што зусім не да спадобы. Так і тут: ёсьць такія пласты жыцьцёвыя, разуменьне якіх прыводзіць да абавязку выкананьня таго, ад чаго залежыць будучыня. Вось і займаюся палітыкай. Прыходзіцца. Але каб не было той неабходнасьці, то хутчэй за ўсё — толькі фатаграфія. Бо з усіх



20. Зак. 5493

відаў мастацтва, творчасьці гэта мяне найбольш цікавіць. Там, як кажуць, я аддаю сваю душу і там я проста магу рэалізаваць з прыемнасьцю для сябе свае ўяўленьні аб сьвеце, адчуваньні... Ну, тое ж самае ў паэзіі і гэтак далей, аднак літаратура больш складанае пытаньне: можна любіць пісаць вершы і нават неблагія, але паэтам ня быць — ім трэба нарадзіцца. Таму я ніякіх ілюзіяў ня маю і колькі б ні пісаў — вельмі рэдка даваў для друку, і то пад прымусам сяброў, рэдакцыяў.

— *Якая Ваша тэма?*

— Паэт заўсёды апавядае сам пра сябе. Вершы — самавыказваньне асобы. А яна — цэлы сьвет, сусьвет. І як адлюстраваны ў творчасьці гэты сьвет, як ён суадносіцца з сусьветам і ўсімі іншымі людзьмі, у гэтым і каштоўнасьць вобразнага слова, радка, верша.

Адным словам, я займаўся фатаграфіяй, але зараз тое немагчыма. Палітыка — від дзейнасьці, які забірае чалавека ўсяго, цалкам, і чым далей ты ўцягваешся ў яе, тым большая для цябе небясьпека дэградаваць духоўна і творча. Я ў гэтым пераконваюся: палітыка прыводзіць да дэградацыі. Асобе нельга аддавацца поўнасьцю толькі ёй.

— *Як паэт сёння Вы таксама закрэслены?*

— За два гады не напісаў ніводнага верша. Ну, некалькі ўсё ж зьявілася... Дакончыў пачатае. А так ніводнага.

— *Няма часу?*

— Няма, хоць крычы: не хапае сну... Але важней тое, што іншым забіта галава, зусім іншыя пачуцьці, нервы; каб узьнік асаблівы, паэтычны настрой душы, трэба расслабіцца. Палітыку ж гэта небяспечна.

Усё, што расказваю — бессістэмна, мабыць, мяне цяжка зразумець. Каб ня жорсткі ліміт часу, я б мог выкласьці сваю эстэтычную сістэму, філасофію адносінаў да жыцьця. Але ж... Выйсьце хіба ў вобразнасьці апавяданьня. Раскажу вам прыпавесьць.

Некалі жыло каля Балтыйскага мора балтыйскае племя прусаў. Гэта там, дзе цяпер Кёнігсбэргская вобласьць. Зямля тая зазнала нямецкую каланізацыю. Прыхадні будавалі свае замкі, выціснулі прусаў у лясы... Яны жылі на сваёй зямлі і асіміляваліся з прычыны таго, што нямецкая культура была вышэйшай — захопнікі валодалі пісьмовасьцю, а гаспадары былі паганцамі. Хоць мелі свой фальклёр, сваё адзінства племянное, сваю мову, сваіх багоў, сваю зямлю — усё было ў іх. Але яны не змаглі супрацьстаяць. Таму што пачалі гаварыць па-нямецку, пачалі забываць свае песьні

і пачалі зьнікаць. І дайшоў такі час, калі аднойчы, недзе з глыбіні, з лесу прыйшоў апошні прускі бард на рынак у горад. І перад народам прускім сьпяваў народныя прускія песьні на прускай мове. Але яго ўжо ніхто тут не разумеў. Натуральна, ніхто й ня слухаў. Спыніліся толькі два падгулялыя рыцары нямецкія. Ім здавалася пацешным, што сьпявае так самотна прускі бард. Яны яго паслухалі, а ён сьпяваў пра зямлю Прусіі, пра свой народ, рэкі, лясы, птаства, жанчын, багоў — сьпяваў пра любоў да роднай зямлі... І калі ён скончыў, немцы голасна зарагаталі яму ў твар. А як узнагароду сыпанулі жменю пустых арэхаў — шалупіньне.

Дык вось, я не хачу атрымаць жменю пустых арэхаў. Разумееце сутнасьць прыпавесьці? Я б таксама мог з задавальненьнем займацца любімай справай. У той час, калі ўсім нам дрэнна і Бацькаўшчына наша зьнікае, я, магчыма, здолеў бы нават дасягнуць нечага. Магчыма. Хоць мне перашкодзілі стаць тым, кім хацелася,— тут гэта нерэальна, але нейкае задавальненьне для душы сваёй я атрымаў бы. А пасьля — арэхавае шалупіньне ў твар. Як расплата за тое задавальненьне. Разумеючы гэта, у час, калі вырашаецца лёс Бацькаўшчыны, калі зьнішчаюць народ, яго культуру, калі яго ганьбяць, плююць у твар, калі дом гарыць — на скрыпачцы іграць нельга. Трэба іншае — займацца палітыкай, ратаваць народ. Гэта як вайной трэба браць зброю ды ісьці змагацца. Такі час у гісторыі Беларусі настаў. Таму я і не напісаў ніводнага верша, закінуў фатаграфію, закінуў навуку, доктарскую дысертацыю — усё. Бо вызначальнае ня гэта, трэба вырашыць агульныя пытаньні. Каб жыў народ. А калі вырашыцца агульнае, калі будзе жыць культура, Беларусь, зьявяцца людзі, якія складуць тое, што я ня склаў, прасьпяваюць тое, што я не прасьпяваў, сфатаграфуюць тое, што я не сфатаграфаваў і напішуць сто доктарскіх дысертацыяў лепшых, чым я хацеў напісаць.

— *Кола Вашых навуковых інтарэсаў шырокае?*

— У мяне некалькі пачатых кніг ляжаць — і па тэатры, і па Курапатах... Аднаго не хапае — я ўжо казаў: часу. Ды і не актуальна гэта цяпер.

— *Ці можна даведацца, як Вы ўзялі на сябе цяжар лідэрства? У палітыку пайшло шмат інтэлігенцыі, многія закінулі свае рукапісы, пэндзлі, лабараторыі, кінакамеры, падмосткі тэатра... Але самае цяжкае выпала Вам. І калі праз нейкі час многія калегі, сябры, аднадумцы займелі хоць нейкую магчымасць заняцца любімай справай, то Юпітэру тое не дазволена...*

— Лідэрам мяне зрабілі, як гэта ні падасца дзіўным, хутчэй не сябры, а камуністычная прапаганда. Я асабіста да свайго першынства адношуся вельмі скептычна. Каб быць першым, трэба любіць палітыку, а гэта не маё. Тут проста зьбег абставінаў. Відаць, антаганісты заўважылі больш актыўных людзей сярод сваіх апанентаў і пачалі ганіць, паліваць брудам — самі паказалі на тых, каго найбольш баяцца. Іншыя людзі ўбачылі гэта і кінуліся на абарону — справядлівасьць адвеку шанавалася ў нашым народзе. Да таго ж, абараняючы блізкага па духу, заўсёды выдатна ўсьведамляеш: тым самым бароніш і сябе, свае ідэі. Канкрэтнае лідэрства — вынік складанага перапляценьня розных абставінаў, нюансаў, а зусім не выключна вынік звышякасьцяў нейкага пэўнага чалавека. Калі нехта наўмысна імкнецца прадэманстраваць грамадзе сябе, свае, як ён лічыць, несумненна важкія плюсы, такога звычайна насуперак яго жаданьню зусім не ўспрымаюць, ня любяць, амбіцыйныя прэтэнзіі на кіраваньне ўмомант раскусваюцца...

— *Вам да спадобы кіраўнічыя функцыі?*

— Не люблю іх. Хоць, зазначу, не жадаю, каб і мной кіравалі. Такое я не дазваляю, калі без патрэбы, ды яшчэ й на карак лезуць.

— *Што з двух горшае?*

— Навязваць сваю волю іншым. Тут вельмі многае значаць чалавечыя ўзаемаадносіны, ступень аўтарытэтнасьці кіраўніка... Заўважце, між іншым: аўтарытэт чалавеку ствараюць, а сам суб'ект можа толькі разбурыць яго.

— *А што гэта ўвогуле — аўтарытэт?*

— Давер паплечнікаў. Ім трэба ўмець даражыць больш за астатняе. Дык вось, разумеючы ўсё гэта, я тым ня менш лічу сваё лідэрства часовым.

— *Ну, іншыя так не думаюць...*

— Бо ня ведаюць маіх недахопаў. Павярхоўныя, зразумела, навідавоку; але ж ёсьць і глыбока ўнутраныя, схаваныя, зь якімі пастаянна змагаюся. Вельмі многія людзі вядомыя большасьці толькі, гм... зьнешне, павярхоўна, грамадзкае ўяўленне пра іх далекаватае ад ісьціны.

— *Наўрад ці адносіцца сказанае да Вас асабіста. Бо прайсьці Вашым шляхам і застацца «містэрам Ікс» немагчыма. Ад многіх чуў: калі б Фронт узначальваў не Пазьняк, то БНФ даўно б капітуляваў...*

— Я ў гэтым сумняваюся. Давайце паразважаем. Чым больш культурны народ, чым больш культурнае грамадзтва, тым больш яны шануюць аўтарытэты й ствараюць умовы

для іх. У цывілізаваных краінах, скажам, у Японіі, ахове дзяржавы падлягае талент, чалавек, які валодае народнымі традыцыямі. І калі ў нас берагуць гаршкі, дык там — чалавека-майстра, што лепіць іх. У сьвеце скрозь і побач спецыяльна ствараюць аўтарытэты, сьцьвярджаюць іх, робяць аўтарытэтнымі нават пасрэдных людзей, калі часова няма сапраўды дастойных. Бо як толькі аўтарытэт створаны, зьяўляецца магчымасьць гуртавацца й рухаць адпаведныя ідэі.

— *А прыклады?*

— У значнай ступені дзьмуты аўтарытэт Эйнштэйна — я цікавіўся фізікай і чытаў шмат сьпецыяльнай літаратуры.

— *Вы — фізікай?!*

— І ня толькі ёй — таксама матэматыкай. Па маладосьці аддаў даніну і астралогіі... Але ня буду паглыбляцца, каб якраз не абвяргаць тыя самыя аўтарытэты. Бо якімі б яны ні былі — у цэлым усё роўна адыгрываюць станоўчую ролю. Маю на ўвазе разьвіцьцё культуры.

Тое ж самае ў палітыцы. Вельмі важна, каб быў лідэр. І калі яго няма — трэба стварыць. Што й робіць кожны сьпелы рух. А маем справу з прымітыўнай грамадзкай сілай — на першы план выходзяць амбіцыі, пачынаецца тапленьне адных другімі, другіх трэцімі і г. д. У выніку — гібель руху ў цэлым.

— *Самы раз звярнуцца да практыкі БНФ.*

— У нас шмат інтэлектуальных людзей. Сьветлыя галовы, напрыклад, Юрась Хадыка, Валянцін Голубеў, Уладзімір Заблоцкі, Міхась Ткачоў, Вінцук Вячорка — усіх не пералічыць. Чаму, спытаеце вы, зьезд вылучыў мяне? Бо маю пэўныя перавагі: напрыклад, стаў дэпутатам. І людзі, што сабраліся вакол, здолелі зразумець: гэтыя плюсы трэба захоўваць, яны важныя для руху. Тут тлумачэньне таго, чаму на зьезьдзе БНФ мне не выстаўлялі альтэрнатывы — у дадзенай сітуацыі яна не працавала на Фронт.

Ён, паўтару, зусім бы не разваліўся без Пазьняка. Ёсьць, як бачыце, людзі-аднадумцы, інтэлектуальныя, лепшыя за мяне, але яны лічаць прымальным для сябе дапамагаць некаму трэцяму. У нас няма спрэчак за прыярытэты — дыскуціруем і нават востра, па сутнасьці справы. Але не дапускаем пры гэтым бестактоўнасьці, нейкай азлобленай эмацыянальнасьці. Ва ўсякім разе я гэта разумею і прынцыпова стараюся не дапусьціць нейкай шкоднай для агульнай справы сваркі, нікому непатрэбнага ўнутранага канфлікту. Хоць характар у мяне «ня цукар». Але ламаю сябе: тут

лепш пацярпець, нешта не заўважыць, прапусьціць міма вушэй, галоўнае — захаваць адзінства. Мае калегі прытрымліваюцца аналагічнай тактыкі. Такім чынам, уяўленьне пра Пазьняка як пра адзіную апору БНФ таксама чыста зьнешняе і створанае, дарэчы, таксама камуністамі.

Яно, магчыма, выгаднае рэакцыі, якая дужа пастаралася стварыць мне адпаведны імідж. Разьлік — арыентацыя грамадзкай увагі выключна на аднаго чалавека, што, натуральна, прыніжае ролю галоўнай дзейнай асобы — Фронту, руху тысячаў. Масаў. Якой бы бязглуздай, грубай і амаральнай ні была афіцыйная прапаганда, у яе ўсё ж вельмі хітры псіхалагічны разьлік. Стаўка робіцца на ахлакратыю. Адначасова штучна паніжаецца, люмпенізуецца грамадзтва. Прымітыўна — затое дзейсна. Па Гебельсу. Я вельмі сур'ёзна вывучаю гэтую тактыку камуністычнага кіраўніцтва і лічу — яно нідзе не перамагло. «Таварышы» з КДБ і КПСС ведаюць пра мяне куды менш, чым я пра іх. Таму й не атрымліваецца задуманае. І не атрымаецца. Бо мне вядомыя сутнасныя матывы іхніх паводзінаў. Адсюль мой аптымізм, сьмех замест страху.

— *І ў чым, калі не сакрэт, гэтая сутнаснасць?*

— Дзеяньні бальшавікоў такія, што нармальны чалавечы розум ня ў стане іх асэнсаваць, не дадумаецца да таго, што прыдумалі яны. Генацыд, уціск, зьнявага сталі нормай жыцьця, нормай! Гэта ж трэба ўмець... Уся наша прастора сёньня перапоўнена хлусьнёй, яна проста вісіць у паветры, тую мярзотнасьць адчуваеш проста фізічна. Людзям стварыць такую атмасферу немагчыма — тут сатанінская праца, бо нармальная псіхіка падобнае ніколі не спародзіць. Ці не таму многія проста вар'яцеюць, робяцца шызафрэнікамі ад бясьсільля перад відавочнай несправядлівасьцю: яны ходзяць па ўсемагчымых інстанцыях, закідваюць скаргамі найвысокія кабінеты, але дабіцца праўды не могуць. Гадамі. Нават дзесяцігодзьдзямі... У рэшце рэшт, як кажуць, звіхваюцца.

А чаму ня могуць вызначыць са сваёй пятай ці пяцідзесятай няўдалай спробы — хто замінае відавочнаму, што за сіла перашкаджае ім дабіцца свайго законнага?.. Бяда: бачаць толькі перад сабою, ня могуць глянуць у сутнасьць, не падымаюцца крыху вышэй — няма веры... Веры!

Я цудоўна разумею, што такое сатанізм. Што стаіць за падаграванай цікаўнасьцю да «лятучых талерак», экстрасэнсаў, ёгаў, будзістаў, калдуноў, да ўсіх гэтых Глобаў, Кашпіроўскіх, да ўсёй гэтай цемры, якая вылезла на паверх-

ню... У маладосьці мне давялося вельмі глыбока вывучаць тыя штучкі. На ёгах здароўе патраціў, але, дзякуй Богу, неяк выйшаў. Займацца гэтым еўрапейскаму чалавеку нельга ні ў якім разе.

— *Зянон Станіслававіч, а масонамі Вы не цікавіліся?*

— Рыхтаваў нават кніжку. Але пасьля таго, як на гэтай тэме пачалі сьпекуляваць розныя *«патриоты»*, вырасла і ўзмацнела бягуншчына зь яе д'ябальскай прафанацыяй ісьціны,— закінуў пачатае, спыніў работу. Тады я займаўся гэтымі пытаньнямі як вучоны, а цяпер яны сталі неактуальнымі. Пра тое, што адбываецца ў сьферы сацыяльнай псіхалогіі, я ніколі не разважаўляю, але ацэнку прагрэсуючага працэсу маю: ён страшней за камунізм. Адкрыта вядзецца праграмаванне цэлай нацыі, на вачах зьнішчаюцца душы чалавечыя... Жахліва: замест суда Кашпіроўскага з камандай носяць на руках! У нармальных краінах дайшлі да разуменьня прыхаванай тут небясьпекі, адпаведныя пытаньні адлюстраваны ў заканадаўстве... Нягледзячы на свае мінусы, там усё ж разьбіраюцца, што такое гіпноз, экстрасэнсорыка. Гэта адлюстравана таксама ў традыцыях, у маральна-этычных правілах... Тут як з парнаграфіяй, якой мы так доўга папракалі Захад: так, ёсьць і «Плэйбой», і дамы з чырвонымі ліхтарамі, і сэкс-шопы — але ўсё гэта не разломвае іхняе грамадзтва! А ў нашай адсталай, бязбожнай краіне, дзе пачуцьці ня выхаваныя, дзе розум як прасавальная дошка — хіба зь некалькімі немудрагелістымі зьвілінамі, вось тут раздольле ўсяму цёмнаму, яно адразу ўспрымаецца, толькі пусьці яго! Так і сказана: калі ты выганіш з сябе беса, але Бог не паселіцца, то ўселяцца бесаў сямёх. Ня можа быць чалавек пусты, ня можа! Альбо будзе ў душы Бог, альбо Сатана. Гэта ж эксперымент — бязбожнае грамадзтва, якое праіснавала семдзесят гадоў. У гісторыі чалавецтва ніколі не было такога. Колькі за тыя дзесяцігодзьдзі забівалі, зьнішчалі, атручвалі... І сёньняшні культурна-маральны, псіхалагічны працэс страшнейшы за горкія сацыяльныя зрухі. Трэба раз і назаўсёды зразумець: без культурнага, маральнага, свабоднага чалавека немагчымыя ніякая эканоміка, ніякія рэформы, ніякая цывілізацыя — нічога не адродзіцца. Грамадзтвы гінулі не ад крызісу, не ад голаду, а ад разбурэньня маралі.

Бачу: важна выкрываць, разьвенчваць сілы цемры, сатанізму, але каб тут перамагчы, патрэбна вярнуць людзям веру, хрысьціянства, патрэбна веруючае грамадзтва. На ўзроўні чыста навуковых экзерсісаў гэта бясплённы занятак.

Нават шарлатанаў цяжка выкрыць на гэтым узроўні. Бо чалавек успрымае такія рэчы верай, а бязбожнік кіруецца папулістыкай: чым больш неверагоднае, тым больш ён хапаецца за гарачае вугольле...

— *Ваш прагноз адносна перспектыў рэлігіі на Беларусі?*

— Вельмі сьмешна выглядае чырвоная прапаганда: «Пазьняк — фашыст, забойца, прагне крыві мільёнаў камуністаў!» Гэта заўсёды выклікае ў мяне вясёлы настрой. Паколькі я чалавек хрысьціянскіх поглядаў. Але гэта да слова.

Камуністы, зразумела, выкарыстаюць рэлігійную карту, каб разьяднаць народ. Што да нас, то мы заўсёды лічылі: вяртаньне веры — адна з галоўных задачаў адраджэньня. Без рэлігіі няма ніякай культуры. Ёсць сурагат. Бяда ў тым, што палітычныя працаўнікі разарвалі рэлігію па канфесіях. У межах аднаго народу! І стараюцца супрацьпаставіць іх. Праўда, беларускі народ вельмі сьветлы ў сваёй аснове, незвычайна сьветлы. Па маіх ведах і ўяўленьнях іншага такога народу няма ў сьвеце... Адкуль ідзе гэтая вялікая цярпімасьць, талеранцыйнасьць? Чаму наша вандэйская рэспубліка ўсё ж самая стабільная ў імперыі? Як ні стараюцца тут палохаць вайной грамадзянскай, нацыяналістамі, крывёй, БНФ — нічога не атрымліваецца, ніякіх сутыкненьняў! Стрымлівае народ яго глыбокая аснова, што недзе яшчэ засталася... Безумоўна, ён хворы. І ўсё ж, і ўсё ж — сьветлы!

— *Якія «лекі» патрэбны Беларусі?*

— Першая задача — незалежнасьць ад СССР. Калі яна будзе дасягнутая, тады адразу аслабляецца камунізм. Бо камуністычная сістэма зарыентаваная на імперыю, імперыяй яна пабудаваная па сваёй структуры. І як толькі імперыя руйнуецца на дзяржаўным узроўні, у Беларусі, як і ў іншых, адразу зьявіцца персьпектыва. Пачнуцца радыкальныя перамены і ў гуманістычнай арганізацыі, што забясьпечыць рэальны шанц для рэформаў, выратаваньня.

Вось чаму ў палітычным дакладзе я падкрэсьліў: першасным зьяўляецца дзяржаўны суверэнітэт, антыкамунізм — другасны.

— *Гэтак задача БНФ вызначана цяпер. А два, тры гады таму?*

— Пачатак увогуле быў у рэчышчы перабудовы. Бо ня мелася дастаткова людзей, здольных да глыбіннага асэнсаваньня рэчаіснасьці, грамадзтва ў цэлым тым больш не магло яшчэ даць сапраўдную ацэнку камунізму й свайму

стану. Адсюль і лозунг пра саюз зь «лепшымі сіламі КПСС». Асэнсаваньне праўды масамі, рухам прыйшло гады праз два. Такім чынам, паўнакроўная антытаталітарная ідэалогія Фронту сфармавалася толькі цяпер. Дакладней, у другой палове 1990 года.

Другі зьезд выявіў сапраўды франтаўскую сутнасьць і ў структуры, зрабіўшы адкрытым Сойм, увёўшы адкрытую квоту. Цяпер ён стаў бліжэй да класічнага фронту, больш дэмакратычным. Хаця ў мінулым не было, скажам, абавязковых складак, членскіх картак, затое меўся закрыты Сойм, канфедэрацыя толькі грамадзян, а не партыяў. Зараз мы прадастаўляем магчымасьць уваходзіць да нас арганізацыямі, справа за іх рашэньнем і жаданьнем.

Вось такі рост за два гады. І адначасна адбылося асэнсаваньне неабходнасьці дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі.

Трэці важнейшы аспект, які стаяў ад самага пачатку,— адраджэньне нацыянальнай культуры і сьвядомасьці — сёньня набывае сапраўды сутнаснае значэнне. Раней жа, без асэнсаваньня ідэй антыкамунізму і незалежнасьці, ён не меў персьпектывы. Адраджаць? А нашто? *«А зачем тот белорусский язык?»* Цяпер усё зьлілося ў адзінае цэлае: без адраджэньня нацыянальнай культуры нельга быць незалежнымі, свабоднымі; без свабоды нельга палепшыць жыцьцё, дабрабыт, эканоміку — нічога! Дык я і тлумачыў на зьезьдзе, што калі ў балтаў такой праблемы не стаяла — яны скансалідаваныя нацыі і таму адразу пачалі вырашаць юрыдычныя пытаньні — пакт Молатава — Рыбэнтропа, то нам патрабавалася перш за ўсё хуткааднавіць разьбітую культуру, скансалідаваць нацыянальную сьвядомасьць, нацэліць яе на незалежнасьць. Працэс складаны, цяжкі. Але ён ідзе, пашыраецца.

Яшчэ раз падкрэсьлю: эканоміка і палітыка — гэта зразумела само сабой; аднак не падымем нацыянальна-культурную праблему — можам прыйсьці ў рэшце рэшт спачатку да раздрабненьня грамадзтва, а затым ўвогуле да звыражэньня.

Вось кажам: людзі палітызуюцца. Але ж суцэльная палітызацыя — рэч небяспечная! Нельга, каб яна ахапіла ўвесь народ. Людзі павінны жыць нармальным жыцьцём: займацца сям'ёй, дзецьмі, слухаць музыку, кахаць. Бяз гэтага застаецца адно — бясконцае напружаньне, што зараз і назіраем.

Заўважце ў сувязі са сказаным цікавую рэч: бальшавікі — прынцыповыя ворагі культуры. Чаму яны пачалі з

прамога зьнішчэньня носьбітаў духу? Інтэлігенцыі, людзей веры... Далей — уціск ідэалагічнага кантролю, стварэньне вульгарных сацыялагічных канцэпцыяў, прымітыўна-антыкультурных, і ў выніку сёньняшняя дэградацыя, абніжэньне культуры.

— *Прабачце, а культурная рэвалюцыя?*

— Яе проста зьвялі да ўсеагульнай пісьменнасьці. Але ж сутнасьць гэтай акцыі зусім іншая! Калі чалавек ня ўмее чытаць і пісаць, ён глухі да палітыкі, во дзе сабака закапаны. А навучы раба азам адукацыі — і ўся ідэалогія паплыве ў яго бедныя мазгі. Так што буквары прыйшлі ў кожную хаціну не зь вялікай любові бальшавікоў да таннай рабсілы. Патрабаваўся раб, які разумеў бы, акрамя іншага, таксама ідэалагічныя каманды.

Вяртаюся да палітызацыі. Яна — справа небясьпечная. І асабліва для нацыянальна нескансалідаванага грамадзтва, калі няма грамадзянскай супольнасьці. Адсюль — павышаная неабходнасьць культурнага адраджэньня. Мы ў адрозьненьне ад бальшавікоў ставім задачу менавіта культурнага адраджэньня, а для іх найважнейшым было выхаваньне, селекцыя аб'ектаў інфармацыі — выключна цынічны падыход.

— *Палітызацыя грамадства адбываецца па нейкіх унутраных сваіх законах, або гэта прымусовая, прадуманая некім акцыя з разлікам на запланаваны вынік?*

— У бальшавікоў быў менавіта другі варыянт, і яны дасягнулі сваёй мэты — фармаваньня ў галовах людзей палітычных стэрэатыпаў. Нeяк: без Саюза мы загінем, без КПСС ну зусім нельга, прыватная ўласнасьць — гэта толькі эксплуатацыя і да т. п.

Аднак на сёньняшнім этапе палітызацыя стала спантанным працэсам. Бо ніхто ня стане абвяргаць факт: афіцыйна сьцьверджаныя стэрэатыпы руйнуюцца; а каб гэта адбывалася, неабходна мець палітычную сілу іншай якасьці.

І зноў вяртаюся да вельмі дарагой мне думкі: без адраджэньня культуры палітызацыя — небясьпечны працэс. У кожным выпадку.

— *У Вашым дакладзе прагучала, дарэчы, думка, што ў асьпекце культурнага адраджэння лёд крануўся...*

— У пэўнай ступені — безумоўна. Гэта, скажам, адкрыта і актыўна праяўляецца, калі людзі зацікаўлена гавораць пра мову ці пра гісторыю, у чым ужо відаць пэўная сьвядомасьць. Аднак працэс праяўляецца і ў пасіўнай форме — маю на ўвазе зьнікненьне тых агрэсіўных адносінаў да

беларушчыны, да кожнага, хто на вуліцы, у краме, аўтобусе карыстаўся родным словам... Колькі гадоў таму назад гэта зьдзіўляла, насьцярожвала больш, чым зьяўленне ў глухой вёсачцы негра. А цяпер назіраецца ня проста пазбаўленая эмоцый абыякавасьць — беларускамоўнае насельніцтва пачало адчуваць прыязнасьць, павагу да сябе. На старых пазіцыях засталіся толькі адкрытыя ворагі — тыя, хто ўсё жыцьцё сваё зьнішчалі нацыянальную культуру, народныя звычаі, традыцыі. Пакуль гэта зацята касмапалітычнае пакаленьне не аджыве, канфрантацыя на тым полі не вырадзіцца.

— *Якое зьвяно грамадскай структуры вызначальнае ў такой сітуацыі?*

— Дзвюх думак быць ня можа — школа. Выхаваньне і адукацыя.

— *Перад Вамі я размаўляў з Ткачовым і пачуў ад яго: калі скіраваць у адпаведным напрамку выхаваўчыя інстытуты, сістэму інфармаванасці насельніцтва, то хапіла б і дзесяці год, каб сьвядомасць беларусаў набыла выразны нацыянальны характар. Ваша пазіцыя?*

— Гэта ў ідэальным сэньсе. Аднак з ходу школу не перабудаваць — няма кадраў... Слабасьць базы будзе адчувацца да той пары, пакуль не задзейнічаем усе рэзервы. І галоўнае — пакуль ня зьвернемся па дапамогу царквы. Яе неабходна як мага хутчэй падключаць да адукацыі. Тады сітуацыя якасна пераўтворыцца — хопіць нават меней гадоў, чым вызначыў Ткачоў.

Кажу пра гэта з такой упэўненасьцю, бо ўжо ёсьць прэцэдэнты, адпаведны вопыт. Грузінскі, напрыклад. Яшчэ ў сямідзесятых гадох там меліся магчымасьці для выхаваньня падлеткаў царквой. У выніку моладзь Грузіі прыкметна адрозьніваецца — няма хіпі, панкаў-шманкаў, яны гэтым не цікавяцца, больш думаюць пра Бацькаўшчыну... У значнай ступені тут сказваецца выхаваньне празь мясцовую праваслаўную царкву. Падзеі пасьля дзевятага красавіка засьведчылі якасны стан грузінскай моладзі, паказалі: яе ўплыў на ход палітычных падзеяў у рэспубліцы несумненна прыкметны. А моладзь народаў, якія ў нацыянальна-культурным сэнсе выраджаюцца, у палітыцы практычна ня ўдзельнічае. Не спалітызаваная яна і ў Беларусі. Бо — нацыянальна ніякая. Скажам, рэферэндум ёю ў асноўным праігнараваны — студэнты разьехаліся па хатах і ўсё... Тое ж самае заўважаеш на мітынгах, у часе выбарчай кампаніі — і гэта самае страшнае. Сьведчаньне таго, што ў народу няма будучыні.

І тлумачыцца такое становішча якраз адсутнасьцю нацыянальнай сьвядомасці. А моладзь Прыбалтыкі, той жа Грузіі зусім іншая — яна будуе Бацькаўшчыну, сваё заўтра. Што да Беларусі, то гэтым якраз заклапочана старэйшае пакаленьне: яно было выхавана ў абставінах, калі больш успаміналі мараль, народную глыбінную этыку, калі не паўсюдна яшчэ задушылі беларускія школы.

— *Падсумоўваем: на Ваш погляд, без рэлігіі, без хрысціянства не абысціся?*

— Так. Мы — краіна, сфармаваная менавіта хрысьціянствам. І безь яго ўдзелу адраджэньня культуры нам не дабіцца. Аб гэтым я ўжо казаў, але, мабыць, ёсьць неабходнасць крыху дапоўніць сказанае. Сутнасьць у тым, што хрысьціянства ў нас разадралі палітычныя сілы, каб мець магчымасьць маніпуляваць ім у сваіх інтарэсах. Таму гэтае пытаньне, відаць, будзе мець сэнс у агульнакультурным адраджэньні. Каб у нас існавала унія, каб яе ня зьнішчылі ў 1839 годзе і мы былі краінай адзінай рэлігійнай канфесіі, тады пытаньне стаяла б значна прасьцей. А так размова пра агульнакультурнае адраджэньне, у тым ліку пра рэлігійнае. Патрэбна беларуская мова ў касьцёлах, у цэрквах і гэтак далей. Тут, як бачыце, працягвае сказвацца стан нашай агульнай разьбітасьці. Але калі прыйдзем да незалежнай дзяржавы, усе праблемы будуць вырашацца значна прасьцей. Ужо сёньняшні вопыт паказвае: зьнікне ўзьдзеяньне зьнешніх сілаў, то і наш народ, і клер рэлігійны знойдуць паразуменьне. Усё ж мы ня бачым нейкіх непрымірымых рэлігійных спрэчак. Хоць і стараюцца некаторыя падкінуць сухога гальля ў тое тлеючае вогнішча.

— *Але ж учора, у гісторыі, касцёр палаў?*

— Гэта няпраўда, фальсіфікацыя. Такога ніколі не было і раней. Меўся адзіны выпадак з Язафатам Кунцэвічам, але ён сыходзіў не з унутраных прычынаў — тут справа рук Масквы.

— *Многія ў размове аб справах рэлігійных даказваюць, што сёння ствараюцца нейкія падстаўныя арганізацыі, каб прытармазіць ушчаты працэс...*

— Ёсьць, напрыклад, нейкі Беларускі хрысьціянскі саюз. Па нашых зьвестках — дзіця КДБ. Пасьля Дэмакратычнага кангрэсу ў Харкаве ў камуністычнай прэсе зьявіўся артыкул прадстаўніка БХС у найтыповейшай аранжыроўцы «Политсобеседника» — з прымітыўнай аргументацыяй, убогім мысьленьнем, непрыхаванай злабой, нянавісьцю... Паліцэйская сутнасьць так званага хрысьціянскага саюза пад-

крэслена і тым, што напярэдадні рэферэндуму, ноччу, у офісе Таварыства беларускай мовы разьбілі шыльду, а дзьверы, вокны пазаклейвалі гнюснымі лістоўкамі за подпісам БХС. Як бачыце, нічога агульнага з хрысьціянствам там няма.

— *Зянон Станіслававіч, калі Вы казалі, што ў школу павінна прыйсці царква...*

— Не, я адзначаў, што царква павінна дапамагчы школе.

— *Прабачце, але ўсё роўна пытанне стаіць так: дэпалітызацыя — аднак рэлігія?*

— Не. Дэпалітызацыя азначае, што дзяржаўныя ўстановы не павінны быць арэнай партыйнай дзейнасьці, адчуваць уціск партарганізацыяў і гэтак далей. А царква ж ня мае сваіх прадстаўнікоў і арганізацыяў, скажам, у пракуратуры, іншых установах. Яна жыве сваім жыцьцём, але разам з тым павінна мець магчымасьць ажыцьцяўляць сьвецкую дзейнасьць. І школкі свае арганізоўваць, і літаратуру сваю выдаваць, і радыётэлевізійныя праграмы мець, і свае клубы, і хрысьціянскія арганізацыі — усё гэта састаўная частка нармальнай грамадзянскай супольнасьці.

— *У сувязі з праблемамі рэлігіі я нагадаў выраз, ужыты ў адным з Вашых артыкулаў: гуманістычная філасофія Беларускага народнага фронту...*

— Вас падводзіць памяць — было напісана: гуманістычная канцэпцыя палітыкі...

— *Прабачце. Калі ласка, развіце гэтую думку.*

— Размова аб прыярытэце чалавека перад прыярытэтамі ідэалогіі, партыі, нацыі і г. д. Размова, фактычна, пра канцэпцыю дэмакратыі. Так, змагаючыся супроць камунізму, мы аддзяляем ідэалогію ад яе носьбітаў. Бо асоба, калі яна не вінаватая, ня можа адказваць па суду за калектыўныя дзеяньні. Трэба аддзяляць калектыўную і індывідуальную адказнасьць, маральную й палітычную. А бальшавікі, фашысты — усе сацыялісты — таго не рабілі. Як, напрыклад, змагаліся ленінцы з эсэрамі? Проста пазабівалі іх. Таксама адбывалася і з рэлігіяй: расстрэл ды турмы. А зь сялянствам? Сібір ды Салаўкі. Вось у чым справа...

Мы ж лічым па-іншаму: чалавек ня можа, напрыклад, прасьледавацца толькі за членства ў партыі, гэта антыгуманна. І супроць нашай канцэпцыі камуністы бясьсільныя. Таму яны хлусяць, каб у першую чаргу ашукаць сваю радавую партыйную большасьць, а потым ужо і ўсё грамадзтва. Хлусяць, што БНФ — гэта суцэльныя фашысты ці ў лепшым выпадку апантаныя экстрэмісты зь неўтайма-

ванай прагай крыві. Псіхалогія гэтай фантастычнай прапаганды вельмі своеасаблівая. Яна крымінальная ў сваёй аснове, прыдуманая яшчэ Леніным, «творча» распрацаваная і прадоўжаная Гебельсам. У аснове яе няма нават намёку на праўдападобнасьць. Гэта маё глыбокае перакананьне.

Вазьміце маіх намесьнікаў у Фронце: Хадыка, Голубеў, Заблоцкі — усе былыя камуністы. А каб была праўдай афіцыйная інфармацыя пра БНФ — хіба яны далучыліся б да нас? Здолелі стаць кіраўнікамі? У КПСС траплялі рознымі шляхамі. Іншым выхаду не было, бо па службе не пасунешся, дысертацыю не абароніш... А цяпер людзі ўсё асэнсоўваюць, вяртаюцца ў нармальны стан, да нармальнага жыцьця, у жывое чалавечае асяроддзе. Вось у чым сутнасьць гуманістычнай канцэпцыі. І мы тут выйграем поўнасьцю. Мы захавалі адзінства нацыі за два цяжкія мінулыя гады, заўважце, змагаючыся супроць камунізму. Прынцыпова і паслядоўна. Мы змагаемся за выхад нармальных людзей з КПСС. Зрабіць гэта могуць толькі яны самі. Але трэба даць для таго час, дапамагчы ўбачыць раней схаванае — вось што мы выдатна разумеем.

— *Контрпрапагандысты Фронту часта прыводзяць Ваш тэзіс аб тым, што ў прынцыпе Кампартыя не мае права на жыццё...*

— Калі мець на ўвазе людзей, то такога я проста не мог сказаць. Тлумачу.

Сусьвет пабудаваны па прынцыпу свабоды. Кожны ў ім мае права на жыцьцё. Гэта закон Сусьвету. Самы апошні гад на Зямлі, калі, як кажуць, ён дапушчаны Богам, мае права на жыцьцё. І калі Бог дапусьціў існаваньне Сатаны, то хай жыве і зло. Чалавеку дадзены толькі запаведзі й свабода волі. Бо ў Сусьвеце ўсё свабоднае, чалавек заўсёды можа выбіраць. Наша канцэпцыя, пра якую вы пыталіся, якраз і заснавана на сусьветным законе й на запаведзях. Таму я ня мог гаварыць так, як нехта перадаў мае словы. У прынцыпе ня мог! Іншая справа, што мне належыць думка аб неабходнасьці роспуску гэтай партыі і што вінаватыя павінны быць пакараны. Пакаяньне магчымае толькі пасьля пакараньня зла. Тады толькі грамадзтва пераканаецца, што пачала лячыцца яго хвароба. У іншым выпадку хвароба працягваецца, грамадзтва не вылечваецца й ня можа пакаяцца: ні тыя, хто былі супрыналежныя да гэтага злачынства, і ні тыя, хто пасіўна за ім назіралі.

З другога боку, у нас ёсьць прапановы і наконт роспуску

Кампартыі. Гэта агітацыя за выхад з КПСС радавых членаў, вывад парткомаў з прадпрыемстваў — дэмакратычны, як бачыце, шлях. Без усялякага прымусу.

Камуністы зацыклены на старым бальшавіцкім стэрэатыпе: распусьціць — значыць прыгнаць танкі і паставіць пару кулямётаў. І расстраляць.

Хм: *«БНФ рвется к захвату власти!»* Ды Фронт як рух проста ня можа гэта рабіць! У яго для гэтага няма ні структураў, ні людзей, ні ідэалогіі, ні канцэпцыі — нічога! Сітуацыя на самой справе прынцыпова іншая. Фактычна «Адраджэньне» выступае як правобраз грамадзянскай супольнасьці, ён фармуе яе. Камуністы так скажона трактуюць нас, бо маюць карпаратыўнае адчуваньне. І адпаведную ідэалогію. Яна праграмуе адпаведны ход думак. Узяць, напрыклад, двух аднолькавых з пункту гледжаньня інтэлекту людзей, але — матэрыяліста і хрысьціяніна. Вы пачуеце дыяметральна розныя ацэнкі аднаго і таго ж факта, з'явы... Так і бальшавікі запраграмаваныя на зло. Часам яны нават зусім не плануюць нейкія каварныя хады, але атрымліваецца вельмі і вельмі непрыгожа... Вось чаму мы так пільна ставімся да разьвянчаньня і адмаўленьня гэтай ідэалогіі, гэтай страшэннай атруты, якая губіць нясьпелую сьвядомасьць — я ўсё пра марксізм-ленінізм.

— *У сувязі са сказаным: ці не здаецца Вам, што зацвярджэнню лідэрскіх функцый такіх людзей, як, напрыклад, Гавел, Гамсахурдзіа, Ландсбергіс, Пазьняк, садзейнічала і тое, што ўсе пералічаныя ў свой час пацярпелі, хай і ў рознай ступені, ад афіцыйна пануючай ідэалогіі?*

— Мяне ні ў якім разе нельга параўноўваць, ставіць у адзін шэраг побач з тымі трыма. Гэта людзі дзяржаўныя, яны выбраныя народам.

— *Але ж і Вы ў нашым парламеньце фігура навідавоку!*

— Адна справа — чалавек, які змагаецца ў апазіцыі, іншая — калі нехта валодае ўладай. Людзі ў такіх выпадках нярэдка мяняюцца, як адбылося, здаецца, з Гамсахурдзіа. Грузіны прыязджаюць і трактуюць сітуацыю па-рознаму, мне цяжка меркаваць, дзе там праўда, аб'ектыўная ісьціна, дзе палітычная гульня...

Але вяртаюся да пытаньня. Напэўна ж, людзям не падабаецца, калі некага, як, скажам, Ельцына, бесцырымонна душылі. Але пры ўсім тым гэта невырашальны момант. Хоць біяграфічны факт можа адыграць сваю ролю ў нейкія вельмі істотныя перыяды — ну, напрыклад, у час выбараў.

*— Дарэчы, якой Вам бачыцца перспектыва Вярхоўнага Савета?*

— Яе няма: так званы парламент поўнасьцю ў руках камуністаў. Мы сьведкі пастаянных парушэньняў заканадаўства Прэзідыумам — партыйная наменклатура робіць тое, што хоча, не зважаючы на здаровы сэнс, сумленьне. Гэта яна са сваім нацыянальным нігілізмам разбурыла нашую культуру, пазакрывала беларускія школы, аплявала нашую гісторыю, Бацькаўшчыну, растаптала таленты. Зьдзейсьненае мае дакладную назву — этнацыд. Супраць нацыі. Я заўважыў; толькі заходзіць у Вярхоўным Савеце размова пра культуру, як прадстаўнікі партыйнай большасьці кідаюць пустыя размовы паміж сабой, загортваюць кніжкі, газеты і агрэсіўна-прыдзірліва ўслухоўваюцца ў кожнае слова, рыхтуюцца да адпору. Адно слова «культура» выклікае ў іх нянавісьць. А, крый Божа, скажуць нешта ў абарону беларускага слова, запатрабуюць карыстацца ім на сесіі — усчынаецца сапраўдны вэрхал. Толькі на Беларусі прагаласавалі за тое, каб сесіі вяліся не на дзяржаўнай мове — дзе яшчэ сустрэнеш такі маразм? Гэта пазіцыя людзей злобных, антыкультурных, ненавісных да свайго народу. З-за такіх дэпутатаў Бацькаўшчына ў бядзе, аднак людзі таго не разумеюць.

Калі палітычная, сацыяльная сітуацыя будзе разьвівацца больш востра, то паўстане пытаньне аб роспуску Вярхоўнага Савета. Я не выключаю такой магчымасьці. 84 працэнты дэпутатаў — камуністы, больш за дзве трэція — апаратная, прамысловая, аграрная, ваенная, пеньсіянерская ды іншая наменклатура. У такой сітуацыі дэпутатам Народнага фронту трэба было вызначыць сваё становішча й палітыку. Мы ўтварылі фракцыю — 27 з 345 чалавек. А неўзабаве і апазіцыю, калі далучыліся яшчэ дзесяць чалавек, якія ў Фронт не ўваходзяць, але падтрымліваюць нашы асноўныя тэзісы. Вырашана было займацца канструктыўнай апазіцыйнай дзейнасьцю — распрацоўваць свае праекты законаў і прапановы. На працягу дзвюх сесіяў вялася такая работа. Усяго выдалі каля двух дзесяткаў законаў па асноўных пытаньнях. Нават кансерватыўная большасьць Вярхоўнага Савета вымушана прызнаць: выкананы яны на высокім прафесійным, лагічным узроўні. Тым ня менш ніводны з гэтых дакументаў не прайшоў — праціўнікаў большасьць, яны ціснуць нас кнопкамі для галасаваньня. Зьява фенаменальная: усімі прызнаецца высокая якасьць законапраектаў апазіцыі, але паколькі большасьць дэпутатаў не думаюць пра народ, то

паслухмяна выконваюць волю ЦК, кіруюцца клопатамі пра захаваньне свайго статус-кво, і ўсё тут...

Такім чынам, зараз трэба мяняць тактыку, бо каму па душы Сізіфава праца? Дарэчы сказаць, заканадаўчая дзейнасьць вельмі цяжкая. Мне шмат дзе даводзілася працаваць, але тут асаблівы выпадак.

— *Але ж ён таксама дае Вам плён?*

— Так, мы набылі вопыт, адшліфавалі свае веды, панацьці. Я гляджу на фракцыю — вырасьлі літаральна ўсе! Ва ўсіх адносінах: інтэлектуальна, палітычна, як асобы... Гэта проста радасна. Бо працавалі дзень і ноч. З другога боку, людзі так і ня бачаць ад таго вялікіх вынікаў. Ну, удалося Дэкларацыю аб незалежнасьці прыняць, яшчэ там некалькі момантаў было, калі малымі сіламі мы дабіваліся перамог, ёсьць такое мастацтва... На Захадзе апазіцыя з дзесяці працэнтаў ня ў стане ўвогуле ўплываць на ход падзеяў, а мы ўсё ж мелі свой голас. Калі ня цалкам, то хоць па кроплі павышалі якасьць законаў.

Але час паказаў: губляць столькі энергіі з такім невысокім ККД сэнсу няма. Увогуле атрымліваецца, што мы нейкім чынам інтэлектуальна мацуем сваіх праціўнікаў, яны як бы паразітуюць на нашай дзейнасьці. Відаць, трэба заняць больш жорсткую пазіцыю. Канструктыўнасьць у нейкіх асноўных пытаньнях, астатняе — крытыка і арыентацыя на работу з выбаршчыкамі. Трэба распускаць гэты Вярхоўны Савет, ён нібы мёртвая скула. Кіруе ўсім ЦК КПСС–КПБ. Бо гляньце: нават калі законы і прымаюцца, але партыі не падыходзяць, то яны проста не выконваюцца. Таму што ўся выканаўчая ўлада ў адных руках. Такім чынам, «недапрацоўкі» камуністаў-заканадаўцаў перакрываюцца актыўнасьцю камуністаў-выканаўцаў. А паспрабуй зьвярнуцца ў суд ці пракуратуру — дык і яны ў тых самых руках. Таталітарная структура засталася і працягвае функцыяніраваць па сваіх законах. Яе проста неабходна ліквідаваць — праз дэмакратычныя рэформы і адпаведныя дэмакратычныя законы, праз свабоду. Цераз сцьвярджэньне правоў чалавека.

— *Зянон Станіслававіч, мы і так перабралі дамоўлены час, таму літаральна пару пытанняў з такой нелюбімай Вамі асабістай афарбоўкай. Вы лічыце сябе іншадумцам?*

— Гэта для мяне абраза. Я — чалавек, які мысьліць нармальна. Гэта іншыя жывуць па законах краіны крывых люстэркаў. Хоць па іх логіцы «люстэркавы» якраз Фронт са сваімі ідэямі.

*— Можна колькі слоў пра Вашу сям'ю, блізкіх, знаёмых? Хто фармаваў Ваш светапогляд?*

— Я жыў у нармальных умовах, сярод нармальных людзей. Таму і ўспрымаю чалавечыя каштоўнасьці станоўча. Усе нашы сваякі-мужчыны загінулі на фронце. Выхоўвалі мяне мама з бабуляй. Як кажуць, даўся ім у знакі — рос неслухам, але стараўся вучыцца... Калі немагчыма было цярпець болей маё свавольства, то бабуля чытала выхаваўчую міні-лекцыю, дзе самымі страшнымі былі словы-прысуд: «Камуніст ты!»

*— Што, у яе вельмі складаны лёс?*

— Бачыце, у нас, на Віленшчыне, камуністаў, асабліва за Сталіным, ніхто не ўспрымаў, іх лічылі нелюдзямі. Усю сістэму ў нас не ўспрымалі — гэтыя Саветы, калгасы, райкамы... Дарэчы, я не сказаў, што на маю радзіму Віленшчыну чырвоныя прынесьлі свой «парадак» пазьней, адсюль і такая рэакцыя насельніцтва. З Саветамі да нас у мястэчка прыехалі новыя, «савецкія» людзі. Як жа яны адрозьніваліся ад карэнных жыхароў! Пілі гарэлку, лаяліся, кралі...

*— Як, дарэчы, мястэчка называлася?*

— Суботнікі. Да «вызваленьня» там не было таго бруду, мярзотнасьці, п'янства, брыдкаслоўя, разбэшчанасьці. Усё гэта ішло з усходу, з Масквы, ад бальшавікоў.

*— Вы карэнныя жыхары Суботнікаў?*

— Мае бацькі, дзяды, прадзеды па бацьку і па маці родам адтуль, а ўжо дзед выехаў у Вільню. Паколькі дзеда бальшавікі забілі, у 39-м, а на вайне і бацька загінуў, то бабуля вярнулася назад, у мястэчка. Суботнікі, дзе я нарадзіўся, вучыўся, за 80 кіламетраў ад Вільні.

Канешне, чалавеку важна, у якой сям'і, у якім асяродзьдзі ён вырас. Цяпер, між іншым, другое значыць больш, чым першае. Раней прыярытэты стаялі па-іншаму, бо не было адкрытай інфармацыі, радыё, тэлебачаньня, усёй сёньняшняй прапаганды. А зараз праз сістэму інфармацыі асоба проста зьнішчаецца. Інфармацыйны паток шкодны, калі ён льецца без адбору ва ўсе мазгавыя ячэйкі. Тады не застанецца месца для ўспрыманьня іншых сігналаў са сьферы пазнаньня.

Асаблівая небясьпека чакае дзяцей. Яны зусім па-іншаму мысьляць і ўспрымаюць. Бо гэта іншы сьвет, іншыя людзі. Яны — цуд. А яго такім вось чынам губяць. Страшна за нас, яшчэ страшней за будучае пакаленьне. Мы не прапануем яму нічога гуманнага, сапраўды дзіцячага — усё такое бяздушнае, палітызаванае, машыннае...

— *Ці ёсць для Вас нейкі надзвычайны ідэал? Светлы, добры, спагадлівы... Размова пра чалавека, які адным сваім існаваннем саграває душу.*

— Мне прыемна з усімі добрымі людзьмі.

— *Я чуў пра ўпартае змаганне маладога Зянона Пазьняка за стары Мінск. Не нагадаеце тую пару?*

— Горад разбуралі, помнікі зьнішчалі — трэба было ратаваць. У шасьцідзесятых архітэктура, культура былі для мяне аматарствам, а потым сталі прафесіяй. Я заставаўся верны ёй ці ня дваццаць гадоў, пакуль не заняўся палітыкай. Супакойвае тое, што цяпер ужо няма такіх дзікунскіх разбурэньняў, як раней. Няма таго мэтанакіраванага, прадуманага, пасьлядоўнага варварства ў зьнішчэньні горада Менска. Старога Менска. А руйнавалі яго ўмела, зь веданьнем справы, як усю нашу культуру — дзьвесьце гадоў. Асабліва ў бальшавіцкі час. Што зусім крыўдна — найбольш завіхаліся пасьля вайны. Тады ў параўнаньні з 30-мі было татальнае зьнішчэньне даўніны. Памяці нашае сталіцы. Праўда, «хітруны» ўсё сьпісвалі на немцаў. Выкарысталі вайну да апошняй ідэалагічнай кроплі. Хоць стары Менск у ваеннай віхуры ўвогуле ўцалеў. Асноўныя помнікі і забудовы вакол плошчы Свабоды засталіся неразьбітымі. Шмат было цэлых дамоў і на вуліцы Савецкай, цяперашнім Ленінскім прасьпекце. Разбомбленае вельмі нават падлягала ўзнаўленьню. Але дзесяткі цэленькіх дамоў пайшлі пад знос у імя дурной ідэі: зрабіць шыкоўны праспект імя Сталіна. Архітэктарам паставілі такую задачу, і яны ўсяго за два месяцы (!) накідалі эскіз-ідэю адразу ў сорак чацьвёртым годзе... Так пачалося зьнікненьне дзесяткаў дамоў-помнікаў. На рагу вуліцы Купалы і праспекта стаіць зараз штаб ваенна-паветраных сіл, а тады там быў будынак рэальнага вучылішча. Моцны, прыгожы такі двухпавярховы асабняк! У стылі класіцызму. У ім выкладалі выдатныя педагогі, сярод іх, дарэчы, настаўнік Янкі Купалы. Але разбурылі, паставілі вось у цэнтры штаб... І так спрэс па ўсім старым горадзе. Колькі, напрыклад, дамоў зьнішчылі, калі ўзводзілі няўклюдны будынак КДБ.

— *Вось тады, мабыць, Вы і заняліся фатаграфіяй?*

— Куды раней, зь дзяцінства. Памятаю, быў зусім малы і ўбачыў на малюнку, як дзеткі фатаграфуюць. Мяне тады аж затрэсла. У сёмым класе маці купіла апарат, толькі выйшла якраз першая «Смена». Так на доўгія гады фатаграфія стала сэнсам майго жыцьця. Нас зь сябрам уладкавалі на вучобу да старога майстра, і ён цэлае лета вучыў бачыць

і здымаць. Добра вучыў, дзякуй. Між іншым, пасьля таго навучаньня здавалі спецыяльны экзамен, атрымалі нават пасьведчаньні аб набыцьці аматарскай «прафесіі». Такім чынам, я пачаў здымаць адразу, без памылак.

— *Зноў вяртаюся да старога Мінска: казалі, Вы нават спалі ў тых будынінах, якія вызначалі пад знос, узначальвалі пікеты...*

— Хапіла ўсяго. Але наконт «спаньня» — прыдумкі. Арганізоўваў і пісьмы, і людзей, і прэсу. У 69-м годзе нават у «Правде» надрукаваўся! Што на той час для чалавека абсалютна невядомага было проста немагчыма. Але ўчарашні студэнт здолеў зьмясьціць артыкул, ды які — пра зьнішчэньне Нямігі. Супраць дзікунскага яе разбурэньня.

— *Цікава, як зрэагавалі?*

— Для цяперашніх людзей, асабліва маладых, тое будзе нават незразумела. Увесь ЦК бегаў, як ашпараны — крытычнае выступленьне «Правды» на месцах успрымалася нібы рашэньне Палітбюро. Усе дрыжэлі, панаваў вэрхал і шок. Артыкул выратаваў тэатр Янкі Купалы — яго ўжо планавалі зьнесьці. І сквер, што побач, лёг бы пад сякерай. Аднак «Правда» тады мела страшную моц, нашы Герастраты адмовіліся ад сваіх намераў. Што да лёсу Нямігі, то яе разбурэньне аддалілі на некалькі год. Казалі, Машэраў пакляўся: усё роўна зруйную! І зруйнаваў... А тэатр не ўдалося. Бо ў артыкуле я зрабіў наступны акцэнт: акрамя Усебеларускага кангрэса, тут адбываліся таксама і буйныя бальшавіцкія мерапрыемствы. Разумееце: «Правда» піша — разбураюцца помнікі Савецкай улады! Ну як супраць гэтага? Во і здаліся.

— *Раскрыйце сакрэт: хто дапамог прабіцца ў газету нумар адзін?*

— Такім жа карэспандэнтам па Беларусі, як вы, быў тады Генадзь Бураўкін, а галоўным рэдактарам «Правды» М. В. Зімянін. Адно наклалася на другое і артыкул зьявіўся, адыграў сваю станоўчую ролю. Падпісаць яго я папрасіў для большай важкасьці свайго сябру, вядомага мастака Лявона Баразну, ён старэйшы за мяне. У 69-м мне было толькі дваццаць пяць...

— *Такім чынам, усё жыццё — барацьба. Дзеля чаго?*

— Дзеля свабоды. Гэта для мяне. А другі ваюе за кілбасу. У нармальным грамадзтве задавальняюцца і яго, і мае патрэбы. Што да розьніцы паміж намі двума, то, на жаль, зямляк мой не разумее: без свабоды кілбасы яму ня мець.

у лагеры яму дадуць баланду. А для мяне «сацыялістычны лагер», Сіблаг, Карлаг, Дальлаг — адно і тое ж. Аснова ўсяго — дабра, працы, заможнасьці — свабода, свабодны, вольны, творчы чалавек. На гэтым, я ўжо казаў, пабудаваны Сусьвет. І калі ў нейкіх яго структурах — ці ў сацыяльных, ці ў іншых гэтага няма, пачынаецца дэградацыя. Прынцып універсальны. Будзе ён мець пад сабой рэальную, законную, а не дэкларатыўную аснову — усё іншае дасягаецца самім чалавекам, залежыць ад яго працы, розуму, карпатлівай працы...

* * *

Калі я выключыў дыктафон, мой суразмоўнік у чарговы раз пашкадаваў на дарма патрачаны час:

Колькі ні пераконваў, што гутарка для кнігі ў пэўным сэньсе падагульняе шлях, пройдзены лідэрам Фронту, а таму непазьбежныя магчымыя паўторы некалі ім ужо сказанага; што глыбінныя праблемы філасофіі, культуры, тэатра, якія па-ранейшаму востра хвалююць яго, павінны легчы ў адну з некалькіх пачатых кніг, доктарскую дысертацыю, але Зянон Пазьняк толькі выразна махаў рукой...

Ужо ў дзьвярах, на разьвітаньне, ён сказаў:

«А ўвогуле я раблю зараз зусім не сваю справу. Маім было і застаецца тое, што жыло ў душы, не давала спаць па начах, мучыла гадоў пятнаццаць... Кажу пра Курапаты. Калі мне толькі-толькі стала вядомай праўда пра той страшны зьдзек над народам, над памяцьцю некалькіх пакаленьняў, я сказаў сабе: «Ты павінен расказаць пра яе людзям — рэспубліцы, усяму сьвету. Аб гэтай жудаснай трагедыі цэлай нацыі павінны ведаць усе!

У глыбіні душы разумеў: адужаць такую задачу мне, звычайнаму чалавеку, мабыць не па сілах, бо ад той праўды скалануцца не проста душы чалавечыя — пачне трашчаць Сістэма. Яна ўсё зрабіла, каб зьнішчыць сьляды магілак, і надалей будзе імкнуцца захоўваць сваю страшную тайну.

Але мне ўдалося, здавалася, немагчымае. Сёньня не адна Беларусь — сьвет ведае пра Курапаты. І таму я шчасьлівы чалавек. Не вядомасьць мне была патрэбна — мной кіраваў абавязак душы. Вядомасьць... Пра тое вунь ужо зьявіліся кнігі, а я практычна нічога не напісаў, хаця ні ў кога няма багацейшага матэрыялу, чым у мяне...

Я шчаслівы і тым, што да драбніц ажыцьцёўлена начамі

выпакутаваная мною ідэя помніка-крыжа ў Курапатах, што ён зроблены па маёй задуме, пастаўлены і асьвечаны пад сьцягамі, як гэта і ўяўлялася мне доўгімі гадамі пошуку праўды... Я нёс яго, той крыж пакут, ад пачатку і да самага канца — ён мой. За ім маё змаганьне за сацыяльнае выжываньне, тры мае выключэньні з інстытута, звальненьні з працы, страчанае здароўе, зьнявагі за роднае слова, за Бога, за песьні... Гэтыя гуны, бесы на нашай Зямлі, што стралялі ў патыліцу людзям...

Але мне нічога не шкода. Бо галоўная справа жыцьця зробленая: шлях да свабоды адкрыты. Веру: яна прыйдзе на Беларусь у славе і без крыві».

*Сакавік, 1991*

# Змест

ВАСІЛЬ БЫКАЎ. Яны маўчаць не схацелі . . . . . 3

ЮРИЙ ХОДЫКО. Трагедия, когда исчезает народ, нация . . . . . . . . . . . . . . 5

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ. Ідэі сацыяльнай дзяржавы, сацыяльнай справядлівасці — адвечныя . 31

АЛЕСЬ ЕМЯЛЬЯНАЎ. Жыве Беларусь! — вось сьвяты лозунг нацдэмаў... . . . . . . . . . . 55

ВАЛЕНТИН АКУЛОВ. Нам нужно вновь попасть во временной поток . . . . . . . . . . 73

ВІКТАР ІВАШКЕВІЧ. Перамога дэмакратыі непазбежная, як смерць... . . . . . . . . . . . 101

МИКОЛА ШЕЛЯГОВИЧ. У нашего дела — космический знак . . . . . . . . . . . . . 123

УЛАДЗІМІР АРЛОЎ. Я нарадзіўся ў год смерці Сталіна 147

СЕРГЕЙ НАУМЧИК. Свобода читать, свобода говорить, свобода думать — и мужество не врать . . 178

ВІНЦУК ВЯЧОРКА. Будучая Бацькаўшчына — незалежная, некамуністычная, нетаталітарная 197

МИХАИЛ КУКОБАКА. Принудительно меня упрятали за решетку на 17 лет, принудительно и помиловали . . . . . . . . . . . . 223

СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ. Нягледзячы на ўсё, жыву надзеяй на лепшае . . . . . . . . . . 244

МІХАСЬ ТКАЧОЎ. Не зрабіць зла свайму народу . . . 264

ЗЯНОН ПАЗЬНЯК. Аснова дабра, працы, заможнасьці — свабода, свабодны, вольны, творчы чалавек . . . . . . . . . . . . . . 288

**Уліцёнак А. Л.**

**У 48** Іншадумцы = Мыслящие иначе/Прадм. В. У. Быкава.— Мн.: Беларусь, 1991.— 311 с.: іл.

ISBN 5-338-00851-3.

Беларусь традыцыйна лічылася «самай стабільнай» рэспублікай краіны. Шлях яе бачыўся многім прамым і ясным, скіраваным аднойчы і назаўсёды. Але ці так гэта?

Мэта кнігі Аляксандра Уліцёнка — вуснамі саміх іншадумцаў раскрыць рэальны спектр поглядаў, супярэчлівых імкненняў, пазіцыю новых грамадскіх сіл у абнаўленні рэспублікі, паказаць знутры сітуацыю, у якой складваецца яе рэальная шматпартыйнасць. Аўтар прапануе чытачу гутаркі ў тым парадку, у якім праходзілі сустрэчы. Тэксты аўтарызаваныя, уключаючы і арфаграфію.

Кніга разлічана на масавага чытача.

**У** $\frac{0803010403-160}{М\ 301(03)-91}$ **БЗ 49—91** **ББК 66.3(2Б)**

Массово-политическое издание

Улитенок Александр Леонидович

МЫСЛЯЩИЕ ИНАЧЕ

Минск, издательство «Беларусь»
На белорусском и русском языках

Масава-палітычнае выданне

Уліцёнак Аляксандр Леанідавіч

ІНШАДУМЦЫ

Рэдактар К. П. Гарэлік
Мастак, мастацкі рэдактар А. А. Кулажэнка
Тэхнічны рэдактар Я. С. Шляшынская

Здадзена ў набор 19.04.91. Падп. да друку 11.09.91. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура тып Таймс. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 16,38. Ум. фарб-адб. 16,59. Ул.-выд. арк. 17,0. Тыраж 10 000 экз. Зак. 5493. Цана 1 р. 90 к.

Ордэна Дружбы народаў выдавецтва «Беларусь» Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Дыяпазітывы тэксту падрыхтаваны на Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінаце МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

Друкарня «Перамога». 222310, Маладзечна, вул. В. Таўлая, 11.

